ARCHE Зьмест № 9’2000 МЭДЫЦЫНА

1. Зьмест / Уводзіны
2. Сакрэт Антона Адамовіча. Лявон Юрэвіч у ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына.
3. Псыхічныя парушэньні ў незалежнай Беларусі. Ігар Сарокін у ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына.
4. Патагенэз беларускага мэнталітэту. Віталь Кошалеў у ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына.
5. У анатамічцы. Алесь Наўроцкі ў ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына.
6. Дарога ў дваццаць крокаў. Вінцэсь Мудроў у ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына.
7. Сага пра „Пагоню“. ЯнКакупала ў ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына. Medycyna.
8. Кроніка аднае аблогі. Андрэй Захаранка ў ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына. Medycyna.
9. Юнак, падперазаны зьмяёй. Людка Сільнова ў ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына. Medycyna.
10. Вершы. Валянціна Аксак у ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына. Medycyna.
11. Казімеж. Андрэй Хадановіч у ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына. Medycyna.
12. Епикгрaмма на законъчене преложеня Трыщанова. Мікола Раманоўскі ў ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына. Medycyna.
13. Лісты Ўладыкі Васіля (Тамашчыка) да Юркі Віцьбіча ў ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына. Medycyna.
14. Мадонна. Лілія Сазанавец у ARCHE 9(14)-2000. Мэдыцына. Medycyna.

З ь м е с т

п’еса
Лявон Юрэвіч. Сакрэт Антона Адамовіча. Драма для чытаньня мэдыцына
Ігар Сарокін. Псыхічныя парушэньні ў незалежнай Беларусі
Віталь Кошалеў. Патагенэз беларускага мэнталітэту
Алесь Наўроцкі. Лірыка гісторыі
Вінцэсь Мудроў. Дарога ў дваццаць крокаў
ЯнКакупала. Сага пра „Пагоню“
Андрэй Захаранка. Кроніка аднае аблогі лірыка
Людка Сільнова. Юнак, падперазаны зьмяёй
Валянціна Аксак. Вершы
Андрэй Хадановіч. Казімеж
Мікола Раманоўскі. Епикграмма на законъчене преложеня Трыщанова ХХ стагодзьдзе
Лісты Ўладыкі Васіля (Тамашчыка) да Юркі Віцьбіча кніга
Лілія Сазанавец. Мадонна. Мастацка-біяграфічны аповед

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **26-02-2001**
[image]

Лявон Юрэвіч
Сакрэт Антона Адамовіча
Драма для чытаньня
Ахвяруецца Г.Б.

У аснове гэтай драмы ляжаць сапраўдныя падзеі, цытуюцца сапраўдныя дакумэнты, дзейнічаюць сапраўдныя людзі, якія гавораць пра тое, што адбывалася насамрэч. Іншая справа, што пагляд або ацэнка (ці нават веды) галоўнага героя (ці аўтара) могуць не адпавядаць праўдзе гісторыі. Толькі што такое гэтая праўда, ды што такое гэтая гісторыя?

ПРАЛЁГ

2000 год. Цёплыя кастрычніцкія дні ў Мангэтэне.
Вуліца Сьв. Маркуса, дом 8. Невялічкая кватэра на трэцім паверсе.
Гаспадыня, Яніна Каханоўская, 90 гадоў.
Госьці — Антон Шукелойц, 85 гадоў,
ды Аўтар, 35 гадоў.

Аўтар: Амаль дваццаць гадоў таму зьявілася кніга Джона Лофтуса „Беларускі сакрэт“. Ці памятаеце, што яна прынесла ў вашае жыцьцё, жыцьцё нашае эміграцыі? Напалохала? Уразіла?

Антон Шукелойц: Кніга сама — дык не. Але па выхадзе кнігі журналіст Майкл Уолас зрабіў перадачу „60 хвілінаў“ з Лофтусам і Антонам Адамовічам. Вось яна сапраўды зрабіла

— беларускі пісьменьнік і крытык. Працуе ў Нью-ёрскай публічнай бібліятэцы. Летась пад эгідай ARCHE ў Менску выйшла яго кніга „Жыцьцё пад агнем. Партрэт беларускага воена Кальніка і палітычнага дзеяча Барыса Рагулі на фоне яго эпохі“. Аўтар кнігі літаратуразнаўчых артыкулаў „Камэнтары“ (Менск, 1999).

цяжкое ўражаньне.
Прадстаўнікі студыі прыйшлі спачатку не да Адамовіча, а да Стася Станкевіча — з запрашэньнем узяць удзел у перадачы. Але Станкевіч на той час ужо быў памёршы. І вось яны завярнуліся, каб сыходзіць, як нехта з супрацоўнікаў Радыё іх спыніў пытаньнем: „А мо каго іншага запросіце? Вось Адамовіча, напрыклад“. „Давайце Адамовіча“, — кажуць. Так ён і патрапіў у тую перадачу, прыпадкова.
І вось яны ставілі пытаньні, па-ангельску, а мова была ў Адамовіча ня дужа каб добрая. Доўга пыталіся. Але тое, што яны запісалі, у тэлевізіі было зусім па-іншаму. Калі, напрыклад, яму задавалася пытаньне, і Адамовіч казаў „так“, а на другое пытаньне не адказваў зусім, дык яны падстаўлялі ягоны адказ да другога пытаньня, і выходзіла, што Адамовіч згаджаецца з абвінавачваньнямі ў супрацоўніцтве зь немцамі. Гэтая перадача зрабіла моцнае адмоўнае ўражаньне на Нью-Ёрк, на жыдоў гораду. Падняўся вэрхал супраць Адамовіча, супраць Радыё, якое мусіла нават наняць і пасадзіць спэцыяльнага ахоўніка ля дзьвярэй, каб ніхто, барані Божа, не ўварваўся. І кіраўніцтва Радыё прапанавала Адамовічу ўзяць вакацыі, маўляў, пакуль усё суцішыцца.
А.: А як Антон Адамовіч успрымаў усё, што адбывалася — кнігу, перадачу?
А.Ш.: Ну, гвалту не крычаў, але вельмі дрэнна.
А.: Спадарыня Яніна, Адамовіч сваю схованку на вакацыі знайшоў у Вас, на лецішчы?
Яніна Каханоўская: Яму не было куды падзецца. У сябе жыць ня мог, бо нават пад акном стаялі, крычалі — каб зьявіўся на вуліцы, маглі б і забіць. Вось толькі ня ведаю, як адрас здабылі. Ён хацеў паехаць у Нямеччыну, да Ўрбаноў, бо меў там свой пакойчык — некалі даў немалыя грошы ім на набыцьцё дому. Але тыя адмовілі, сказалі, лепш не прыязджайце.
І вось завезьлі да сябе. Тры тыдні жыў. Страху не паказваў, але крыўду вялікую меў. Галоўнае, дзівіўся, як маглі на амэрыканскім тэлебачаньні так словы перакруціць. На лецішчы яму ня надта каб працавалася, затое расказваў нам пра сябе, пра мінулае.

А.: Ён не расказваў, чаму ніколі жанатым ня быў?
Я.К.: А ён быў жанаты. Паўгоду пражылі разам. А хто яна —

ніколі не казаў. Студэнтка ягоная, ці што.
А.Ш.: Па-першае, па нацыянальнасьці яна была расейкаю. Прыгожая жанчына. Я асабіста яе ня бачыў, але памятаю ейны фатаздымак у хаце Адамовічаў, на камодзе. У пашане стаяў, у рамцы — жонка й ён.
Перад самай вайной яна паехала ў Маскву — і вайна іх разлучыла. Больш яны ня бачыліся.
А.: Разьбіраючы паперы Адамовіча, я знайшоў ліст, напісаны ягонаю рукою, але бяз даты, бяз подпісу, без імя адрасата. Вось ён:

„Я дзяжуру ў тэхнікуме. Адзін. Мой кампаньён сьпіць у настаўніцкай. Тры гадзіны ночы.
Хутчэй за ўсё, тое, што я напішу, не прачытае ніхто, не прачытае той, каму яно адрасуецца. Наўрад ці хопіць у мяне адвагі на большае, чымся напісаць гэта на паперы — напісаць самому сабе.
Перада мной на стале два арэшкі. Калі я буду зусім стары (ужо цяпер я страшна стары душою, і калі часта гавару другім, што стары, то гэта — ані не рысоўка) і мне застанецца адно — успамінаць, я, паглядзеўшы на гэтыя арэшкі, успомню: адна дзяўчына калісьці дала іх мне…
Цяпер яшчэ ўспамінаць рана, цяпер яшчэ пяражываецца.
Два арэшкі ляжаць, зусім падобныя да двух сэрцаў.
Адзін — каторы баўтаецца ўнутры — маё сэрца, перагарэўшае сэрца.
Другі — Ваша.
Не, няпраўда. Адзін — Вашае сэрца, а другі — не, не маё… Без „значэньня“ дала мне дзяўчына арэшкі.
Бо толькі ў маіх думках злучаюцца гэтыя два сэрцы, злучаюцца трыма адвечнымі словамі:
Я Вас люблю.
Ай, як дзіка! Ай, як сьмешна! Ай, як...
„Невероятно, но факт“. Факт, супраць якога я, на жаль, зусім згубіў сілу супраціўленьня.
Я ж ня думаў гэтага, калі ўбачыў Вас першы раз, убачыў і заўважыў. Праўда, Вы мне адразу спадабаліся. Але што з таго? Ці ж гэта не бывае? І ці ж адна Вы падабаліся мне?
Я змагаўся з Вамі, як мог. І чым больш хацеў змагацца, тым больш станавіўся пераможаным. Цяпер махнуў рукой і іду

ўсьляпую.
Да сьмешнага было: я шукаў нагоды, каб прыехаць на „Выстаўку“ і ўбачыць Вас, каб наведваць лекцыі якраз у Вашай групе. Я пачаў круціць гэты „драмгурток“, толькі калі пабачыў Вашу фамілію ў сьпісе. І на ўсіх гэтых „рэпэтыцыях“ для мяне былі толькі Вы. І цяпер, калі яны скончыліся, які боль адчуваць пушкінскае:

Я знаю: век уж
мой измерен;
Но чтоб
продлилась
жизнь моя,
Я утром должен
быть уверен,
Что с вами
днем увижусь
я...

Чаму? За што?
Ня знаю, ня знаю, ня знаю… Нешта ёсьць такое ў Вас, што цягне мяне проці мае волі, што валодае мною ўсім, што набліжае тое, аб чым пісаў Багдановіч, за якога Вы ў мяне мелі двойку:

Буду сьніць і днямі, і начамі.
І прыду. Што ўздумаеш, рабі.
Хочаш — душу растапчы нагамі,
Хочаш — мучай, хочаш — загубі.

Я люблю Вас бяз рэўнасьці. Я, як і раней, вельмі сымпатызую Максіменку. Але — не схаваю — страшна зайздрошчу яму і так хацеў бы, усё аддаў бы, каб быць на ягоным месцы! І добра ведаю, што гэта — немагчыма, што ўсё гэта — безнадзейна. І збоку (люблю і ўмею глядзець на сябе збоку, і таму ніколі ні на кога не крыўдую) проста сьмешна, па-дурному сьмешна. Рэкамэндую й Вам расьсьмяяцца хоць тут, калі Вы яшчэ не расьсьмяяліся ці, горш, ня плюнулі. Сьмех— гэта тое, што я найбольш люблю выклікаць у людзях — і Вам павінна гэта быць вядома. Сьмейцеся, сьмейцеся да сьлёз, няхай разам з Вамі сьмяюцца другія!

Не прашу й не магу прасіць у Вас нічога. Адно хіба: калі можаце не злаваць на мяне за гэты дзікі замах на ваш спакой і захаваць ранейшае дачыненьне да мяне — так, як бы гэтага ліста не было — буду Вам удзячны.
І яшчэ: прашу выбачэньня за беларускую мову. Можа, яна Вам здасца нягоднай для выражэньня такіх пачуцьцяў, зробіць іх яшчэ больш сьмешнымі. Але для мяне яна зусім ня тое: яна ўжо даўно зраслася з маёю душою, асьвечана для мяне перанесенымі за яе пакутамі і якраз наадварот — у ёй я заўсёды выражаю лепшыя свае пачуцьці…“

А.: Скажыце, а што за каханьне ў часы вайны было, акторка нібыта?
Я.К.: Была такая васямнаццацігадовая дзяўчынка, Федаровіч. Дзьве іх было, сёстры-скрыпачкі ў аркестры. У адну зь іх ён закахаўся і ўжо хацеў жаніцца. І бацькі ейныя не былі супраць: Адамовіч малады, прыгожы, прафэсар. Але бомбу падлажылі, у шуфляду стала ў рэдакцыі, ды раманам Вольгі Таполі[1] прыкрылі. І Адамовіч мусіў ехаць у Бэрлін. Вось так усё скончылася.
А.: А пасьля трох тыдняў на лецішчы ён вярнуўся ў Нью-Ёрк і ўсё ўжо было спакойна?
Я.К.: Хацелі наняць тады адваката й судзіць тэлебачаньне за круцельства. Але адвакат, узяўшы сто пяцьдзясят даляраў за 15-хвілінную кансультацыю, сказаў, што надзеі выйграць працэс няма, прэцэдэнты ўжо былі.
А.: Дзіўна, што не было ідэі судзіць самога Лофтуса. Мо гэта было б прасьцей і таньней.
Але вось цікава: хто быў натхніцелем Лофтуса?
А.Ш.: Гэта былі не жыды, што плацілі грошы. Гэта ёсьць бальшавіцкая справа, справа халоднай вайны, у якой Адамовіч браў вельмі актыўны ўдзел. Адамовіч, Стась Станкевіч і Абрамчык. Яны былі арганізатарамі й рупарамі — і ня толькі зь беларускага боку, а наагул — халоднай вайны.
Гэта бальшавікі плацілі, нават не беларускія — Масква.
А.: Вы кажаце, што Адамовіч паводзіў сябе спакойна. А ці ведаеце, што яго выклікалі на так званыя „гутаркі“, дзе вырашаўся лёс Адамовіча, узважвалася „віна“ ды паўставала пытаньне — дэпартаваць яго як ваеннага злачынцу або пакінуць у краіне як сумленнага грамадзяніна ЗША?

[1] **Таполя Вольга**, беларуская пісьменьніца.

А.Ш.: Ніколі ня чуў пра гэта.

ДЗЕЯ

Нью-Ёрк, сьпякотны ліпень 1983 году. Мінуў год ад зьяўленьня ў кнігарнях першага выданьня кнігі Дж. Лофтуса „Беларускі сакрэт“. Ужо прайшло па тэлебачаньні ягонае інтэрвію ў папулярнай аналітычнай праграме „60 хвілінаў“.
11 гадзінаў раніцы. Памяшканьне крымінальнага дэпартамэнту, габінэт спэцыяльных расьсьледаваньняў. Прысутнічаюць: Кларыс Р. Фэльдман, афіцэр з Вашынгтону, і Антон Адамовіч. У кутку — маўклівая стэнаграфістка. Размова ідзе па-ангельску.
Кларыс Р. Фэльдман: Ці былі Вы прыведзеныя да прысягі?
Антон Адамовіч: Так.
К.Р.Ф.: Добра. Тады пачнем. Вашае імя?
А.А.: Антон Адамовіч.
К.Р.Ф.: Дзе Вы цяпер жывяце?
А.А.: Заходняя вуліца 53, кватэра 6-Д у Нью-Ёрку.
К.Р.Ф.: Ці ёсьць у Вас тэлефон?
А.А.: Хатні тэлефон? Так: 212-369-5077.
К.Р.Ф.: Спадар Адамовіч, якімі мовамі Вы валодаеце?
А.А.: Беларускаю, расейскаю, польскаю, украінскаю, ангельскаю, нямецкаю. Бадай, усё.
К.Р.Ф.: Мы будзем гаварыць па-ангельску. Вас гэта задавальняе? Добра. Я хачу, каб Вы думалі над сваімі адказамі і не сьпяшаліся зь імі; калі Вам патрэбны перакладчык, Вы маеце на гэта права.
Вы разумееце, што Ваша прысутнасьць тут сёньня цалкам добраахвотная?
А.А.: Так.
К.Р.Ф.: І што Вы можаце адмовіцца адказваць на ўсе ці на асобныя пытаньні, што я буду задаваць?
А.А.: Я буду спрабаваць адказваць, наколькі стане маіх ведаў.
К.Р.Ф.: Але Вы ўсьведамляеце, што можаце адмовіцца адказаць?
А.А.: Так, я разумею.
К.Р.Ф.: І Вы разумееце, што ўсё, што Вы скажаце, можа быць скіравана супраць Вас у судзе?

А.А.: Так.
К.Р.Ф.: І Вы таксама ведаеце, што маеце права, каб сёньня прысутнічаў Ваш адвакат?
А.А.: Так, але я ня маю патрэбы ў ім. Прынамсі, я так думаю.
К.Р.Ф.: Тады пачнем. Якое імя было Вам дадзена пры нараджэньні?
А.А.: Антон Адамовіч.
К.Р.Ф.: Калі Вы нарадзіліся?
А.А.: 26 чэрвеня 1909 г.
К.Р.Ф.: Дзе?
А.А.: У Менску.
К.Р.Ф.: За выняткам імя Антон Адамовіч, ці ўжывалі Вы якія іншыя?
А.А.: Хіба ў літаратуры.

К.Р.Ф.: Якія менавіта?
А.А.: Недасек, Бірыч, Альгердзіч, Грыбель, Юстапчык, Склют, Забранскі.
К.Р.Ф.: Ці ўжывалі яшчэ якія-небудзь імёны?
А.А.: Магчыма, у газэтах. Я быў рэдактарам газэтаў, нават сёньня, на Радыё Свабода, пішу скрыпты. Прыкладам, для гумарыстычных карыстаўся псэўдонімам *Васіль Крыцкі*. Але тое было надта ж даўна, гадоў сем як, мабыць. Пазьней я перастаў пісаць, бо мой гумар скончыўся.
К.Р.Ф.: Вы грамадзянін ЗША?
А.А.: О, так!
К.Р.Ф.: Калі Вы атрымалі грамадзянства?
А.А.: У 1955 годзе. Я прыехаў у краіну ў 1950-м і адразу запоўніў патрэбныя паперы. Празь пяць гадоў стаўся грамадзянінам.
К.Р.Ф.: Як клічуць Вашых бацькоў?
А.А.: Бацька — Алесь, Аляксандар, прозьвішча Івашкевіч. Маці — Паўліна Адамовіч. Я ўзяў ейнае прозьвішча, бо мая бабуля надта ж пераймалася, што скончыцца лінія Адамовічаў. Нават бацьку пераканала.
К.Р.Ф.: Прабачце, але ў паперах пазначана іншае імя па-бацьку: Астапавіч у беларускіх і Евстафьевич у расейскіх.
А.А.: Так, усё праўда. Так склаўся лёс…
К.Р.Ф.: У Вас ёсьць ці былі браты або сёстры?
А.А.: Не, я адзіны быў у сям'і. Але я маю — меў — стрыечных

сяcьцёр.
К.Р.Ф.: Вашая нацыянальнасьць?
А.А.: Бачыце, тут багата розных праблемаў. Але як каротка: уважаю сябе за амэрыканца беларускага паходжаньня.
К.Р.Ф.: Веравызнаньне?
А.А.: Рыма-каталік.
К.Р.Ф.: Жанатыя?
А.А.: Не.
К.Р.Ф.: Ніколі не былі?
А.А.: Некалі… амаль што…
К.Р.Ф.: Вы ўехалі ў ЗША ў статусе перамешчанай асобы?
А.А.: О, так, вядома!
К.Р.Ф.: Ці была ў Вас у лягеры ДП гутарка з прадстаўнікамі Міжнароднай Арганізацыі Ўцекачоў? (IRO — International Refugee Organization. — *Зацем аўтара*.)
А.А.: Так, я быў на праверцы. Яны называлі гэта праверкаю.

К.Р.Ф.: І яны распытвалі пра Вашае мінулае?
А.А.: Так, дзеля гэтага ўсё й было.
К.Р.Ф.: І Вы адказвалі на ўсе пытаньні?
А.А.: Так. Мабыць, я мушу патлумачыць больш дэталёва. Гэта быў вялікі лягер, Рэгенсбург. І мы ўсе чакалі на гэтую праверку. Нас ніхто не правяраў раней, мы ня ведалі, што гэта такое — і вось, чакалі.
Тады да мяне падышоў адзін з нашых. Я ня ведаў яго добра, але імя запомніў — Сасюкевіч. І вось ён па сакрэце сказаў, што на гэтай праверцы мы мусім прызнацца, што мы — савецкія, і нас адпусьцяць дамоў, што нашая бацькаўшчына нам даруе ўсё-ўсё, што нам няма чаго непакоіцца.
Але я не хацеў вяртацца. Бо я жыў там, я быў зьняволены там. Я ведаў савецкую ідэалёгію й ня верыў у дараваньне. Дый дараваньне чаго, каму?! І таму я пайшоў у CIC — нешта накшталт вайсковай контравыведкі. І там быў нейкі паляк, або чалавек, што гаварыў па-польску (пазьней ён расказаў, што быў немаўляткам вывезены ў Амэрыку). Мы паразумеліся. Ён сказаў, што разумее, чаму я не хачу вяртацца ў Савецкі Саюз, але на гэтай праверцы, што мае адбыцца, будуць савецкія прадстаўнікі, таму непазьбежна паўстануць складанасьці. Пры ўсім сваім жаданьні яны ня могуць усьцерагчы нас ад дэпартацыі.

І тады ён прапанаваў наступнае: сумесна напісаць маё мінулае. Вось тады першы раз у сваім жыцьці я ўзьняў руку і сказаў „так“, як і сёньня, калі складаў прысягу. Я расказаў ім шчыра ўсё, што было, і пакляўся, што сказаў праўду. І толькі пасьля гэтага мы пачалі мяняць маю біяграфію, каб ня даць Саветам права на дэпартацыю.
Я ня памятаю дакладна, што менавіта было зьменена. Дакладна захавалі месца народжаньня — Менск. Бо ў Саветах мой горад пісаўся як Мінск, і такі самы горад ёсьць у Польшчы.
К.Р.Ф.: Калі адбывалася размова?
А.А.: Гэта было ў лягеры Рэгенсбург, у тысяча дзевяцьсот... у тысяча дзевяцьсот сорак шостым годзе.
К.Р.Ф.: Ці памятаеце, якія часткі з Вашае біяграфіі былі прыдуманыя?
А.А.: Мае ўцёкі ў Польшчу. Але тое было напалову праўда, бо я сапраўды хацеў зьбегчы туды, нават зь сябрамі абмяркоўваў, плян прыдумвалі.
К.Р.Ф.: Ці былі падчас праверкі пытаньні адносна Вашае дзейнасьці ў гады вайны?
А.А.: Так, былі.

К.Р.Ф.: І што менавіта Вы рабілі ў тыя часы?
А.А.: Я быў настаўнікам сярэдняй школы, з 1936 да 1943 году.
К.Р.Ф.: Якая Вашая адукацыя?
А.А.: Я скончыў сямігадовую працоўную школу, Беларускі Пэдагагічны Тэхнікум і Беларускі Дзяржаўны Ўнівэрсытэт, літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьне пэдагагічнага факультэту, па спэцыяльнасьці настаўнік.
К.Р.Ф.: І ў якім годзе Вы атрымалі дыплём?
А.А.: У 1930-м або 1931-м. Згадаў: я скончыў у 1931-м, але дакумэнты атрымаў толькі ў 1939-м.
К.Р.Ф.: Ці можаце назваць каго з выкладчыкаў?
А.А.: Ня ўсіх, вядома. Лекцыі па фальклёры й беларускай літаратуры чытаў М. Піятуховіч, а сэмінары — па літаратуры — вёў А. Бабарэка, паэтыку, заходнеэўрапейскую літаратуру чытаў А. Барычэўскі, расейскую літаратуру А. Вазьнясенскі, уводзіны ў мовазнаўства — П. Бузук, гісторыю Расеі XVI–XIX ст. — У. Пічэта, сэмінар па славянскім мовазнаўстве — Воўк-Левановіч, мэтодыку — І. Замоцін, граматыку беларускай мовы — Я. Лёсік. Гэта з тых, што запомніліся.

К.Р.Ф.: Нейкая дадатковая адукацыя?
А.А.: У 1936 годзе я скончыў курс нямецкай мовы пры Інстытуце завочнага навучаньня замежным мовам. А яшчэ — вось маю такую даведку.
К.Р.Ф.: Для пратаколу: сьведка паказвае даведку ў расейскай мове зь пячаткаю „Менскі Інстытут Народнай Адукацыі“ і пераклад. Цытую: „Сим удостоверяется, что Адамович Антон Евстафьевич прослушал у меня на разных курсах, читанных при Минском ИНО, историю старой белорусской письменности и историю новой белорусской литературы. На коллоквиуме по этим предметам обнаружил познания достаточные. Минск. 1921. 28/07. Академик и профессор Е. Карский“.
К.Р.Ф.: Што была за арганізацыя „Ўзвышша“?
А.А.: Гэта была літаратурная арганізацыя.
К.Р.Ф.: Вы былі ейным сябрам?
А.А.: Так. Я быў сябрам ад самага пачатку, афіцыйна ад 1928 году, але насамрэч ад 1926. І па самы арышт у 1930-м.
К.Р.Ф.: Вы згадалі свой арышт. Калі гэта было?
А.А.: 24 ліпеня 1930 году. Гэтую дату запомніў дакладна.
К.Р.Ф.: Ці арыштоўваліся Вы яшчэ калі?
А.А.: Так, мяне яшчэ саджалі за краты пасьля гэтага арышту.
К.Р.Ф.: Вы былі арыштаваныя зноў? Другі раз?
А.А.: Так, таксама ў ліпені, 1937 году.

К.Р.Ф.: Чакайце, я мала што разумею. Давайце вернемся да першага арышту. Дзе й хто Вас арыштаваў?
А.А.: У Менску, ГПУ — Вы, пэўна, ведаеце, што гэта такое.
КРФ. Так, НКВД, сёньня КГБ. Гэты арышт быў нейкім чынам зьвязаны з Вашай літаратурнай дзейнасьцю?
А.А.: З гэтым і з маёй нацыянальнай дзейнасьцю. Нас абвінавацілі ў беларускім нацыянал-дэмакратызьме.
К.Р.Ф.: Які быў прысуд?
А.А.: Не было прысуду. Гэта, як казалі, было рашэньне тройкі. Яны хацелі зрабіць паказальны працэс, але нічога ня выйшла. Бо судзілі ня толькі „Ўзвышша“, нас было каля 300 чалавек — беларускіх працаўнікоў культуры.
К.Р.Ф.: Якое Вы атрымалі пакараньне?
А.А.: Пяць гадоў выгнаньня.
К.Р.Ф.: Куды?
А.А.: У Глазаў. Там быў да 1934 году, а пасьля мяне перавялі ў

Вятку.
К.Р.Ф.: Колькі ўсяго Вы адседзелі па гэтым прысудзе?
А.А.: Сем гадоў. У турме — 11 месяцаў напачатку і 9 месяцаў напрыканцы, калі быў арыштаваны ў Вятцы другі раз і пераведзены ў Менск.
К.Р.Ф.: Я не разумею, нічога не разумею з гэтымі арыштамі. Давайце пачнем яшчэ раз — ад самага пачатку. Вы былі арыштаваныя ў 1930-м годзе?
А.А.: Я быў арыштаваны ў Менску й абвінавачаны ў прыналежнасьці да „Саюзу Вызваленьня Беларусі“, пра які я нічога ня ведаў, ды якога насамрэч... Я быў абвінавачаны — ня толькі я, а ўсе мы, больш за 300 чалавек, абвінавачаныя ў прыналежнасьці да гэтай арганізацыі й намеры адарваць Беларусь ад СССР і далучыць да Польшчы.
За 11 месяцаў арышту мяне разы чатыры выклікалі на допыты, потым перавезьлі ў Маскву, на Лубянку, тыдні на два, а адтуль у Бутыркі. Вось там і абвесьцілі рашэньне — высылку ў Глазаў.
К.Р.Ф.: І як доўга Вы былі там?
А.А.: Думаю, да лістапада 1934-га. А ў Вятцы знаходзіўся да 1937-га, здаецца, ліпеня, не, траўня, калі мяне зноў арыштавалі. Вось я маю паперу.
К.Р.Ф.: Для пратаколу: сьведка паказвае паперу, напісаную ў расейскай мове, і пераклад. Цытую: „Протокол обыска. г. Киров, мая 25 дня 1937 г. я, оперуполномоченный 4-го отделения УНКВД Кировской области на основании ордера номер 2127, выданного УНКВД, от 25 мая 1937 г. произвел обыск у Адамовича Антона Евстафьевича, проживаюшего в г. Киров, ул. М. Гвардии, дом 6-В, кв. 1. Согласно данных УНКВД задержан Адамович Антон Евстафьевич. При обыске присутствовал Ситников Кирилл Данилович. Взято для доставления в УНКВД: военный билет, фотокарточки — 19 штук; писем в конвертах — 33 штуки; „Типография на дому“ — 1 штука; открыток с адресами — 2 штуки; незаконченные трудовые списки — 2 штуки; писем в конвертах — 8 штук; телеграмма — 1. Облигаций на сумму 1560 рублей. Жалоб на неправильности, допущенные при обыске, и исчезновение предметов нет“. Тры подпісы. І хто Вас арыштаваў?
А.А.: Тыя самыя людзі, толькі называліся ўжо НКВД.

К.Р.Ф.: З новымі абвінавачаньнямі? Ці старымі?

А.А.: Наагул не было ніякіх абвінавачаньняў! Яны проста арыштавалі. Быць у Вятцы было надзвычай цяжка, есьці зусім не было чаго. І я стаў прасіцца аб пераводзе ў Менск, бо мясцовыя НКВДысты нат ня ведалі, у чым абвінаваціць мяне, якую справу „прышыць“. Але тыя пачалі пераконваць застацца ў Вятцы, бо Менск, маўляў, цяпер сталіца сусьветнага шпіянажу. А мы дамо, кажуць, якіх пяць гадоў лягероў — і ўсё. Я ня даў ім веры, абвесьціў галадоўку. І на трэці дзень страйку мяне выклікалі ў габінэт і паведамілі, што пераводзяць у Менск, далі паесьці — хлеб і малако, і неўзабаве я быў у Менску. І тады я паверыў усяму, што пачуў пра Менск раней. Гэта быў страшны горад.

К.Р.Ф.: Колькі часу Вы былі зьняволеныя ў Менску?

А.А.: Мяне вызвалілі 3-га ліпеня 1938-га.

К.Р.Ф.: Што Вы рабілі па вызваленьні?

А.А.: Мяне вызвалілі бяз права пакідаць Менск. Як выпускалі, адзін зь іх сказаў: „Мы паглядзім, да каго ты пабяжыш“. І дзеля гэтага я імкнуўся бачыць як мага менш людзей. Я пайшоў да бацькоў. Бацька працаваў бухгальтарам у банку, але зарабляў мізэрныя грошы. Было цяжка. Вельмі. Я пачаў шукаць працу настаўніка, бо нават у Глазаве выкладаў у школе. І пачалося: „прыходзьце заўтра“, „не, мы ня можам“. Амаль год сядзеў на бацькоўскіх грошах.

К.Р.Ф.: І ён падтрымліваў Вас?

А.А.: Так, так! І вось у 1939 годзе я раптам бачу ў газэце абвестку — у нейкі тэхнікум, ці не хімічны, патрабуецца настаўнік беларускай і расейскай моваў. Прыйшоў туды, дырэктар — Ляховіч імя — паглядзеў, паслухаў — бяром, кажа. А я, каб не марнаваць часу ды дарма не спадзявацца, і кажу, што вось быў зьняволены даўгі час. І чую на гэта: „Нічога, я сам працаваў у органах. Але ўсё ж лепш нікому не кажы“. Вось так я й знайшоў працу — да самага пачатку вайны.

У той час у нас быў ужо другі дырэктар. Як пачалася вайна, ён надта пэсымістычна глядзеў на падзеі, казаў, што ўсё, гэта канец. Я быў асьцярожны, пярэчыў: не, мы маем войска, гэтага ня можа быць.

Незадоўга да вайны, у чэрвені, я мусіў дзяжурыць у Тэхнікуме, з 10 да 12 ночы. На ўсякі выпадак, як казалі. І час мне ісьці дахаты, а дырэктар кажа: „Ты ідзі дамоў, забяры бацькоў ды схавайся дзе ў парку. Бо я ведаю, што па вас прыйдуць з

НКВД“.

Я зрабіў, як ён параіў. Ноч мы праседзелі каля ракі за горадам, і гэта была апошняя ноч савецкай улады ў Менску. На наступны дзень немцы ўваходзілі ў горад*.

К.Р.Ф.: Раскажыце, што ведаеце, пра Беларускую Сацыялістычную Партыю[2].

А.А.: Яна была зарганізаваная ў Вільні Акінчыцам.

К.Р.Ф.: Фабіянам, так? Калі гэта адбылося?

А.А.: Мяркую, у годзе 1938-м, магчыма, 1937-м. Яна фінансаваліся немцамі, як я даведаўся ўжо пазьней, перад вайны — празь нямецкага прафэсара Мэндэ[3].

К.Р.Ф.: Ці належалі Вы да гэтае партыі?

А.А.: Я? Ніколі.

К.Р.Ф.: Хто ж, акрамя самога Акінчыца, быў там?

А.А.: Думаю, там сама больш было дзесяцёра чалавек. Ведаў асабіста Акінчыца, пазьней пазнаёміўся з Уладзіславам Казлоўскім.

К.Р.Ф.: Хто яшчэ? Янка Станкевіч?

А.А.: Ніколі.

К.Р.Ф.: Станіслаў*?

А.А.: Не.

К.Р.Ф.: Спадар Абрамчык?

А.А.: Не.

К.Р.Ф.: Вацлаў Іваноўскі?

А.А.: Таксама не.

К.Р.Ф.: Ці былі знаёмыя з Гадлеўскім?

А.А.: У таго была свая партыя — Беларускі Фронт[4]. Ён пранацысцкая.

К.Р.Ф.: Але палітычнай пляцформай Беларускай Сацыялістычнай Партыі быў, па сутнасьці, нацызм?

А.А.: Так, беларускія нацы. Але вось што цікава: партыя, забароненая пры паляках, і як прыйшлі немцы, адразу не захацела легалізавацца, але яму зноў было забаронена. Сказалі: ёсьць можа быць адно Нямецкая Сацыялістычная Партыя, а Беларуская.

К.Р.Ф.: Ці была „Раніца“[5] газэтаю гэтай партыі?

А.А.: О, не! „Раніца“ выдавалася ў Бэрліне нейкім камітэтам.

К.Р.Ф.: Можа памятаеце, якою друкарняю?

* Немцы ўвайшлі ў горад 28 чэрвеня 1941 г.

2 Пра **Беларускую нацыянал-сацыялістычную партыю (БНСП)**, якая ўзьнікла ў 1933 г. і была адным з найбольш буйных беларускіх нацыянал-сацыялістаў. З 1933 г., як рэакцыя на перамогу на парлямэнцкіх выбарах у Нямеччыне Адольфа Гітлера і Нямецкай нацыянал-сацыялістычнай партыі, у Вільні Акінчыц і Ўсяслаў Вялічка-Кастравіцкі стварылі нацыянальна-сацыялістычны рух (ідэолягі Фабіянізм, Акінчыц, Уладзіслаў

А.А.: На жаль, не згадаю.

Казлоўскі), які ў тым жа годзе распачаў выданьне газэты „Новы шлях“ (газэта прапагандавала наступныя прынцыпы: нацыяналізм, антыкамунізм, антысэмітызм, вырашэньне аграрнага пытаньня, арыентацыя на гітлераўскую Нямеччыну). Гэтыя прынцыпы пераняла і БНСП, якая была створаная ў студзені 1936 г. БНСП не змагла стаць масавай партыяй, нават ня здолеўшы правесьці ўстаноўчы сход. Фактычна спыніла дзейнасьць у 1938 г. пасьля забароны польскімі ўладамі.

[3] **Мэндэ**

Герхард фон, прафэсар, працаваў у Інстытуце вывучэньня замежных праблемаў Бэрлінскага ўнівэрсытэту, вывучаў „беларускае пытаньне“. У 1937 г. разам са студэнтамі наведаў Вільню, дзе правёў некалькі гутарак зь беларускімі палітычнымі дзеячамі і закупіў некалькі беларускіх кніжак для ўнівэрсытэцкай бібліятэкі. З 1941 г. працаваў у Міністэрстве акупаваных усходніх тэрыторый.

* Ідзецца пра Станіслава Станкевіча.

[4] **„Беларускі фронт“**

(Беларускі нацыянальны фронт, беларускі народны фронт, „група В. Гадлеўскага“), незалежніцкае палітычнае аб’яднаньне ў Заходняй Беларусі (Вінцэнт Гадлеўскі, Вацлаў Папуцэвіч, Мікола Шкялёнак, Лявон Вітан-Дубейкаўскі і інш.). Адкалолася ад БХД у 1936 г. у выніку ўнутрыпартыйных разнагалосьсяў. Напачатку займала выразныя антыкамуністычныя і антыфашысцкія пазыцыі. З канца 1938 г. пачало разглядаць гітлераўскую агрэсію на ўсход як шанец вырашыць

К.Р.Ф.: Ці гаворыць Вам што-небудзь назва *Deutschverlag*?
А.А.: Напэўна, нейкая друкарня ў Нямеччыне…
К.Р.Ф.: Якая таксама фінансавалася прафэсарам Мэнрусам?
А.А.: Думаю, Вы памыляецеся. У іх у Бэрліне была газэта — *Vertrauensstelle*[6], якая й друкавала газэту. На яе дакладаў такі Шкуцька[7].
К.Р.Ф.: Ці пісаў для газэты Акінчыц?
А.А.: Цалкам магчыма.
К.Р.Ф.: Пісаў. Пад псэўдонімам Булат. А Вы калі-небудзь пісалі ў „Раніцу“?
А.А.: Ніколі.
К.Р.Ф.: Але чыталі, хіба не?
А.А.: Я пабачыў і прачытаў газэту нашмат пазьней, ужо ў Бэрліне.
К.Р.Ф.: Значыць, Вы не вычытвалі газэту, не рыхтавалі да друку?
А.А.: Не. Я нават ніколі ня чуў пра такую газэту. Я — „Беларускую (Менскую) Газэту“[8].
К.Р.Ф.: Прыгадайце, калі ласка, калі Вы пазнаёміліся з Фабіянам Акінчыцам.
А.А.: Запазналіся мы па ягоным прыезьдзе ў Менск, думаю, у годзе 42-м, улетку ці ўвесну.
К.Р.Ф.: Каго зь сяброў *Vertrauensstelle* Вы ведаеце?
А.А.: Шкуцьку. Бачыўся зь ім аднойчы. Ведаў таксама ўсё сваё наступніка — спадара Букатку[9]. Пазнаёміліся ў Бэрліне.
К.Р.Ф.: Калі Вы наведалі Нямеччыну ўпершыню?
АА. Першы раз — улетку 1942 году, калі немцы пасылалі дэлегацыю беларускіх сялянаў, фэрмэраў, каб тыя, значыць, павучыліся, як на зямлі трэба працаваць. І Генэральны Камісарыят на Беларусі паслаў мяне зь імі ў якасьці перакладчыка. Па шчырасьці, я вельмі ўзрадаваўся вяртаньне,

беларускае пытаньне. „Беларускі фронт“ з прычыны сваёй малаколькаснасьці так і не аформіўся ў партыю.

[5] **„Раніца“**, беларуская газэта, выдаваліся ў 1939–1945 гг. у Бэрліне пад нямецкім кантролем. Рэдактары: Фабіян Акінчыц, Вітаўт Тумаш, Анатоль Шкуцька, Мікола Абрамчык і інш. Прапагандавала нямецка-беларускае супрацоўніцтва, паведамляла пра палітычныя падзеі ў свеце і Беларусі, становішча на фронтах. Друкавала літаратурныя творы, ас вяртаньне,

бо тое была першая магчымасьць пабачыць Захад.

К.Р.Ф.: Хто канкрэтна з Камісарыяту папрасіў Вас пісаць?

А.А.: Спадар Сівіца[10].

К.Р.Ф.: Якое мейсца займаў гэты Сівіца ў гіерархіі?

А.А.: Узначальваў прапаганду доктар Курц, пад ім быў Шрэдэр, а вось пад Шрэдэрам і стаяў Сівіца, які фактычна кантраляваў цэнзуру газэтаў.

дытаньні культуры, гісторыі Беларусі. На старонках „Радзімы“ быў надрукаваны першы твор Ларысы Геніюш.

[6] Ідзецца пра **„Беларускае прадстаўніцтва“**, арганізацыю, што існавала ў Бэрліне ў 1940–1945 гг. для каардынацыі жыцьця беларускіх работнікаў, эмігрантаў, ваеннапалонных у Нямеччыне. Кіраўнікі Анатоль Шкутка, Бэрнард Букатка.

[7] **Шкуцька (Шкутка) Анатоль**, беларускі грамадзкі дзеяч у Бэрліне.

[8] **„Беларуская газэта“**,

галоўнае беларускае пэрыядычнае выданьне на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Да 5 лютага 1942 г. выдавалася як „Менская газэта“. Рэдактары Аляксей Сянькевіч, Антон Адамовіч, Уладзіслаў Казлоўскі і інш. Друкавала паведамленьні з фронту, распараджэньні нямецкіх уладаў, паведамляла пра асноўныя палітычныя падзеі ў Беларусі, інфармавала пра дзейнасьць беларускіх нацыянальных арганізацый. Друкавала гістарычныя, культурніцкія матар’ялы, літаратурныя

творы.

[9] **Букатка Бэрнард** (нар. 1910), беларускі грамадзкі дзеяч у Нямеччыне. У 1941–1945 гг. жыў у Бэрліне, удзельнічаў у беларускім нацыянальным руху, кіраваў „Беларускім прадстаўніцтвам“. Са студзеня 1945 г. кіраўнік адміністрацыйнага аддзелу Беларускай Цэнтральнай Рады.

[10] **Сівіца Ёзэф**, супрацоўнік Генэральнага камісарыяту Генэральнай Акругі Беларусь, курыраваў пытаньні школьніцтва і культуры.

К.Р.Ф.: Добра, давайце вернемся да Вашага падарожжа.
А.А.: Добра. Спачатку мы прыехалі ў Вільню, дзе затрымаліся на дзень ці два; я нават пасьпеў наведаць рэдакцыю газэты „Беларускі Голас“[11], потым выехалі ў Каўнас, дзе таксама прабылі дзень, а адтуль нас прывезьлі ў Кёнігсбэрг, далей —

Бэрлін, Вэстфалія. Нашыя сяляне былі моцна расчараваныя, бо нямецкія мелі багата зямлі, а нашыя — не. Якая та, мы ведаем быць навука, які досьвед…

К.Р.Ф.: Так, розьніца была. Значыць, падчас гэтага парадкаж Вы пазнаёміліся з Шкуцькам і Букаткам? Калі й дзе?

А.А.: Гэта было ў Бэрліне, дзе Шкуцька меў свой выдавец. Займаўся ён трошкі прапагандаю, а трошкі — я вакдумаюся ў шпіянажам, бо ўсё распытваў, ці ведаю гэта, ці ведаю гэта.

К.Р.Ф.: Ці можаце што-небудзь сказаць пра іхнае сёньняшняе месцазнаходжаньне? Яны жывыя?

А.А.: Ня ведаю. Чуў, што як толькі Букатка замяніў Шкуцьку, той некуды зьнік.

К.Р.Ф.: Скажыце, „Раніца“ была вельмі пранацыяналістаю ці не?

А.А.: Не скажу каб вельмі, але — так, была.

К.Р.Ф.: І антысэміцкаю, праўда?

А.А.: Паколькі рабілася ў Бэрліне, то мусіла быць, натуральна. Немцы звычайна давалі антысэміцкія матэрыялы, і іх немагчыма было не друкаваць. Але рэдактары ў беларускіх газэтах, тым ня менш, зьмяшчалі такія рэчы ня цалкам, ні кавалкамі.

К.Р.Ф.: Калі была зарганізаваная Беларуская Самапомач?

А.А.: Улетку 1941 г. Доктар Антановіч хацеў заснаваць Беларускі Чырвоны Крыж, але немцы забаранілі, загадалі назваць як па-іншаму. Вось і назвалі Самапомаччу.

К.Р.Ф.: І гэта было толькі ў Менску, не ў Бэрліне?

А.А.: У мяне склалася ўражаньне, што паўстаўшы, Камітэт пачаў пашырацца сярод беларусаў, ахопліваючы й тых, хто быў на эміграцыі.

К.Р.Ф.: Значыць, Камітэт паўстаў у Менску, але грошы й дапамога разыходзіліся сярод беларусаў, дзе б яны ні былі, нават па-за межамі Беларусі? Добра. Наступнае пытаньне: калі быў забіты Фабіян Акінчыц?

А.А.: У 1943 годзе.

К.Р.Ф.: Кім?

А.А.: Савецкім агентам. Я ня ведаю ягонага імя, але ведаю, што яму дапамог адзін з супрацоўнікаў газэты.

[11] **„Беларускі голас“,** беларускае дзеяньне, выдавалася ў Віцьбіне. Вільні пацінкаю ў 1942–1944 гг. Галоўны рэдактар — Францішак Аксамітаў. Друкавала палітычныя матар’ялы, літаратурныя, і іх беларускія цытаты, беларускай гісторыі, культуры.

[12] **Беларускі голас“,** беларускае дзеяньне, выдавалася ў Віцьбіне. Галоўны рэдактар — Францішак Аксамітаў. Друкавала палітычныя матар’ялы, літаратурныя, і іх беларускія цытаты, беларускай гісторыі, культуры.

[12] **Беларуская народная самапомач (БНС) —** грамадзкае нацыянальнае аб'яднаньне на тэрыторыі Беларусі (1941–1944). Створаная ў кастрычніку 1941 г., старшыня Іван Ермачэнка. Напачатку дзейнасьць БНС абдымала пытаньні сацыяльнай апекі і аховы здароўя, аднак паступова самапомач стала агульнанацыянальнай арганізацыяй, якая ахапіла ўсе сфэры грамадска-культурнага жыцьця ў Беларусі. На

зьезьдзе акруговых кіраўнікоў БНС у сакавіку 1943 г. быў прыняты мэмарандум да нямецкага кіраўніцтва, у якім патрабавалася аўтаномія Беларусі. Акт БНС вызваў скрайне нэгатыўную рэакцыю сярод нямецкага кіраўніцтва Беларусі. Іван Ермачэнка быў зьняты з пасады, а Беларуская народная самапомач была рэарганізаваная ў выключна дапаможную арганізацыю, у кампэтэнцыю якой уваходзілі толькі пытаньні сацыяльнай апекі і аховы здароўя насельніцтва.

К.Р.Ф.: Спадар Матусевіч[13]?

А.А.: Так, ён. Матусевіч, сакратар „Беларускай Газэты“, былі знаёмыя яшчэ па моладзевых арганізацыях у Мінску,

[13] **Матусевіч Алесь**

зьліквідаваных потым Саветамі. У Матусевіча жонка была
жыдоўкаю, і мы ўсе ведалі пра гэта, але, натуральна, ніхто,
нікому не расказваў. Жанчына, дый ейная матка, лічыліся у
вонкава надта ўжо падобныя да жыдовак, таму было
нескладана трымаць усё ў сакрэце. Дарэчы, я расказаў пра ў
сваім інтэрвію праграме „60 хвілінаў“, але яны ўсё
пакінуўшы аднаго Лофтуса. Але няхай.
Забойства Акінчыца было зьвязанае зь Беларускай
Незалежніцкаю Партыяй[14]. Бо БНП пастанавіла зьбіць
Акінчыца, даручыўшы гэта Матусевічу. А Матусевіч зьвязаўся з
савецкім падпольлем — пра гэта нават савецкія газэты
пісалі. І вось Акінчыц прыехаў у Менск і спыніўся ў
Казлоўскага, у будынку „Беларускай Газэты“. Матусевіч
прыйшоў з самай раніцы й папрасіў Казлоўскага адчыніць
дзьверы. Як толькі дзьверы былі адчыненыя, Матусевіч і ягоны
чалавек зь ім імгненна ўварваліся, забілі Акінчыца. Але
Казлоўскі ня ведаў, што рабіць. Але тады яны не
самога Казлоўскага — вось што цікава!

К.Р.Ф.: З 1941 да 1943 г., ад часу прыходу немцаў да
тэрыторыю Беларусі да Вашага выезду ў Нямеччыну, ў якія
грошы Вы жылі?

А.А.: Я працаваў у „Беларускай Газэце“, быў адным з
рэдактараў. Галоўнымі рэдактарамі былі Казлоўскі й
Сянкевіч[15], які да таго ж ачольваў „Голас Вёскі“[16]. У рэдакцыі
працавала таксама Арсеньнева як перакладчыца і Мікалай
Караленка[17], рэдактар навінаў. Быў яшчэ Кушаль[18], але
А я працаваў рэдактарам літаратурна-мастацкага аддзелу.

К.Р.Ф.: Гэты Кушаль — ці мае ён якое дачыненьне да
Францішка Кушаля?

А.А.: Гэта быў ягоны сын. Ён у рэдакцыі выконваў
абавязкі.

К.Р.Ф.: Больш Вы ў Нямеччыне не былі за той пэрыяд?

А.А.: Быў, быў яшчэ аднойчы. Нас выклікаў зімой 1944–45 г.
доктар Ермачэнка, які замяніў доктара Антанові
Самапомачы й знаходзіўся ў Бэрліне*. Гэта быў
сыгнал, мы ня ведалі, што здарылася. Мусілі ехаць,
доктар Войтанка[19]. У Бэрліне выявілася, што Ермачэнка
зарганізаваць беларускі ўрад і прызначыць сябе
мы не падтрымалі яго й вярнуліся. Неўзабаве гэ
быў схоплены за спэкуляцыю золатам, але неяк

беларускі журналіст, які ў Беларускай „Газэце“ пісаў
савецкіх партызанаў
Акінчыца як
Матусевіча
Беларускай
Незалежніцкай партыяй (БНП),
на ліберальнай
Беларусі такія
1950-х гг. У
Ён
Радзівілаўскім
Беларусі
БНП і
Мікалая Вітушка.
1944 г. БНП

пераехаў у Прагу**. Тады, дарэчы, мы даведаліся, што сябрам з першую сусьветную вайну Ермачэнка быў расейскім афіцэрам. А піў ён проста страшна; нават ня ведаю, як я гэта вытрымаю.

былым сяброўскім стасункам.

[illegible] [illegible]

[illegible] [illegible]

[illegible] [illegible]

Галоўныя рэдактары Мікола Караленка, Яўхім Кіпель, Аляксей Сянькевіч.

[17] **Караленка Мікола**, беларускі журналіст. Падчас нямецкай акупацыі жыў у Менску, працаваў у „Беларускай газэце“.

[18] **Кушаль Уладзімер** (нар. 1922), падчас нямецкай акупацыі працаваў у Менску, у беларускай адміністрацыі, адказным рэдактарам моладзевага часопісу „Жыве Беларусь!“ (1943–1944).

* Антон Адамовіч памыляецца,

К.Р.Ф.: Ці жывы яшчэ ён?

А.А.: Чуў, ён недзе ў Нью-Джэрзі, мае ўласную правайку і ён жа мэдык. Але да сёньня сядзіць ціха, нідзе не бярэ ўдзелу.

К.Р.Ф.: Я б хацела вярнуцца да пачатку вайны. Калі зьявіліся немцы ў Менску?

А.А.: На трэці ці чацьвёрты дзень. Адразу расклеілі аб'явы ў беларускай мове, дарэформавым правапісам, пра ўсеагульную мабілізацыю. Мы мусілі прыйсьці ў ваенную школу, а усіх вывелі ў Дразды, да ракі, і там мы былі трыццаць дні. Гэта быў жудасны час. І нарэшце па адным пачалі ўдпускаць — з умоваю, што будзем рэгістравацца.. А на рэгістрацыі мне далі заданьне складаць сьпісы. І вось сяджу, запісваю, якое гавораць па-расейску, і раптам прыходзіць маладзенькі, зь бел-чырвона-белай стужкаю на рукаве.. І пытаецца, мі гаворыць хто па-беларуску. Я адгукнуўся. Маладзён надта ўзрадаваўся, й павёў за сабою. Гэта быў Усевалад Родзька.

К.Р.Ф.: І куды вы пайшлі?

А.А.: Мяне прывялі да бурмістра гораду, Вітаўта Будзіна, нядаўна прыехаў з Бэрліну. Так мы пазнаёміліся.

К.Р.Ф.: Хто яшчэ прыехаў зь ім?

А.А.: Ня памятаю. Але калі Вы будзеце называць прозьвішчы, мо згадаю.

К.Р.Ф.: Іван Касяк?

А.А.: Не, той прыехаў пазьней.

К.Р.Ф.: Ермачэнка?

Ермачэнка пакінуў Беларусь у красавіку 1943 г., аднак быў выдалены пад нагляд гестапа ў Прагу, і адпаведна ў Бэрліне ня жыў і не замяняў доктара Антановіча ў камітэце Самапомачы.

19 **Войтанка Віктар** (1912–1972), з'явіліся беларускі грамадзкі дзеяч. У 30-хт. сябра адкуль нас Беларусы дні. Ці нарэшце ці ўдпускаць — раюць. Пад часі нявесцкай дачыцьцяк, зь бурмістар Будзінаўся й арганізаваў у горадзе Будынаю, які школу. Зь лета 1944 г. на эміграцыі, жыў у ЗША, браў удзел у беларускім грамадзка-

А.А.: Гэты зьявіўся прыкладна ў сярэдзіне лета.
К.Р.Ф.: Аўдзей[20]?
А.А.: Такога ня ведаў.
К.Р.Ф.: Іваноўскі?
А.А.: Ён быў у Баранавічах. О, прыгадаў: Дземідовіч Дземідэцкі[21].
К.Р.Ф.: Спадар Адамовіч, да вайны колькі жыдоў жыло ў Менску?
А.А.: Бачыце, Менск быў вельмі жыдоўскім горадам. Калі я вучыўся ў школе, сярод 46 хлопчыкаў толькі 5–6 жыдоў. Усе мае калегі былі жыдамі. Я ведаю ідыш, бо гэта была такая кансьпірацыйная мова супраць настаўнікаў. Між іншым, і пра гэта я казаў у „60 хвілінаў“, і гэта яны таксама выразалі.
К.Р.Ф.: Інакш кажучы, прыкладна палова насельніцтва Менска была жыдоўскаю?
А.А.: Нават больш. Амаль ніхто зь іх ня верыў, што немцы зробяць зь імі тое, што зрабілі; думалі, што антысэмітызм немцаў — гэта савецкая прапаганда. Таму адышлі ў Савецкі ўсе, а пераважна камуністы ды функцыянэры.

палітычным жыцьці. У 1969 г. стаў сьвятаром Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы.

*** Або гэта было ў Міжуляцыі, і мы вырабілі сфабрыканскае нямецкімі ўладамі, каб дыскрэдытаваць Гі маленькі ня прыдаць справе непалітычны характар.

[20] **Аўдзей Аляксандар**, падчас нямецкай акупацыі працаўнік беларускай адміністрацыі ў Слоніме, са студзеня 1944 г. намесьнік Прэзыдэнта БЦР на Слонімскую Акругу.

[21] **Дземідовіч-Дземідэцкі Адам** (1888–?), беларускі грамадзкі дзеяч. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у Менскай гарадзкой управе, быў намесьнікам бурмістра

Напачатку, як прыйшлі немцы, нас сабралі ўсіх разам, каля ракі. А потым, на другі дзень, усіх жыдоў пачалі збіраць у гета — у той частцы Менску, дзе заўсёды жыдоў было найбольш. І адтуль іх выводзілі на працу, прыбіраць вуліцы, напрыклад, толькі ўвосень пачалі тую „чыстку“.

К.Р.Ф.: Як харчаваліся жыды? Ці праўда, што было забаронена прыносіць ім ежу, што яны галадавалі?

А.А.: Не магу адказаць, бо папросту ня ведаю. Бачыце, усё насельніцтва гораду харчавалася вельмі блага. У нас была Самапомач, якая зь вёскі, ад сялянаў прывозіла нешта ў горад і тым ратавала, але, зразумела, не людзей з гета.

К.Р.Ф.: Самапомач тое, што забірала ў вёсках, адкаляцца зь немцам?

А.А.: О, не, наадварот! Нават болей, Самапомач забірала жыдоўскіх дзетак і перасылала іх у вёскі, да беларускіх сялянаў.

К.Р.Ф.: Скуль Вам гэта вядома?

А.А.: Я ведаў. Гэта не было вялікім сакрэтам — да прыезду Ермачэнкі.

К.Р.Ф.: А па ягоным прыезьдзе?

А.А.: Бадай што спынілася ўсё*. Я ведаю гэта ад аднаго майго знаёмага, хто непасрэдна займаўся ўладкаваньнем дзетак.

К.Р.Ф.: Хто менавіта?

А.А.: Антон Шукелойц.

К.Р.Ф.: Раскажыце мне пра „Беларускую Газэту“. Вы ж былі ейным рэдактарам з 1941 да 1943 году? Як Вы апынуліся на гэтай пасадзе?

А.А.: Я быў прызначаны. Калі Родзька завёў мяне да доктара Тумаша, той сказаў, што трэба выдаваць газэту, і што я мушу ачоліць яе. Я згадзіўся. Але потым прыехалі яшчэ людзі зь Нямеччыны, і зь імі такі Алесь Сянкевіч, які й быў прызначаны галоўным рэдактарам. А яшчэ пазьней далучыўся Казлоўскі, тады яго зрабілі галоўным.

К.Р.Ф.: Ваша спатканьне зь Вітаўтам Тумашам... Пра што вы гаварылі? Што яго пераканала, што менавіта Вы будзеце добрым працаўніком для новага выданьня?

А.А.: У Вільні добра ведалі часапіс, дзе я друкаваўся, — „Узвышша“.

К.Р.Ф.: Але Вы ня ведалі яго асабіста да гэтай сустрэчы?

Менску.

*Бірацьня ўзначальваў І НС ад першага дня, таму пагаварэнне габрэяў адбывалася пры ім, і нас была нешта ў горадзе магло дасягнуцца зь ягоным прыездам.

А.А.: Не.
К.Р.Ф.: Мо ліставаліся?
А.А.: Не.

К.Р.Ф.: Ці пытаўся ён пра Вашую палітычную арыентацыю?
А.А.: Нашто? Было відавочна, што мы абодва — беларускія сьведамыя людзі, антыкамуністы, антыфашысты.
К.Р.Ф.: Пранямецкія?
А.А.: Не.
К.Р.Ф.: Антысэміты?
А.А.: Пра гэта й мовы не магло быць!
К.Р.Ф.: Якога характару была „Беларуская Газэта“? Якога кшталту артыкулы зьмяшчаліся ў ёй?
А.А.: Перш за ўсё, друкаваліся навіны — з фронту. Яны дасылаліся нам у рэдакцыю наўпрост з Генэральнага Камісарыяту. Навіны — з расейскай або нямецкай моваў — перакладала й друкавала спадарыня Арсеньнева. Далей, кожны нумар мусіў мець рэдактарскі матэрыял — яго пісалі або Казлоўскі, або Сянкевіч. Гэта былі такія палітычныя артыкулы.
К.Р.Ф.: Палітычныя пранямецкія?
А.А.: Вядома, што пранямецкія! А якія яшчэ яны маглі быць?! Маім абавязкам была перш-наперш мова. Казлоўскі зь Сянкевічам мелі ня надта добрае моўнае пачуцьцё, і таму я мусіў правіць памылкі, выконваць абавязкі стыльрэдактара. А да таго ж вёў літаратурна-мастацкі аддзел: у Менску было два тэатры, опэрны й драмы, і ад самага пачатку вайны яны пачалі ставіць спэктаклі.
К.Р.Ф.: Як часта выдавалася газэта?
А.А.: Два разы на тыдзень.
К.Р.Ф.: Распаўсюджвалася бясплатна?
А.А.: О, не, грошы бралі; невялікія, але бралі.
К.Р.Ф.: Бо фінансавалася газэта немцамі?
А.А.: Так.
К.Р.Ф.: І паперу давалі яны?
А.А.: Папера засталася ад савецкіх часоў; яе было больш як дастаткова.
К.Р.Ф.: Хто вызначаў палітыку газэты?
А.А.: Той, хто прызначыў і галоўных рэдактараў. Праўда, і Казлоўскі, і Сянкевіч мелі дастаткова свабоды; абодва яны былі моцна пранямецкія, асабліва на самым пачатку.

К.Р.Ф.: Як Вы звычайна падпісвалі свае артыкулы ў газэце?
А.А.: Звычайна — крыптонімам „А.А.“ або нейкай літарай, якая першая прыходзіла да галавы.

К.Р.Ф.: Ці памятаеце артыкул „Гітлер як наш духовы кіраўнік і вызваліцель“ з падзякаю яму за вызваленьне Беларусі?
А.А.: Паспрабуйце зразумець мяне: такія матэрыялы звычайна ішлі з Камісарыяту й перакладаліся ў рэдакцыі. Так, там маглі быць такія выразы, як „вызваліцель“, „вызваленьне“. Я ня памятаю, бо гэта было агульным месцам, абавязковым, як падзяка партыі за Саветамі. Што датычыцца асабіста мяне, я так ніколі ня думаў.
К.Р.Ф.: Вы працавалі ў рэдакцыі да красавіка 1943-га?
А.А.: Так.
К.Р.Ф.: І за гэта Вам плацілі грошы?
А.А.: Так, але я яшчэ выкладаў у школе — недзе з восені 1942-га году.
К.Р.Ф.: І хто выплочваў Вам грошы за газэту?
А.А.: У нас быў на тое адмысловы чалавек — бухгальтар, які атрымоўваў грошы з Камісарыяту.
К.Р.Ф.: Вас прымусілі працаваць у газэце, ці ня праўда?
А.А.: Я згадзіўся працаваць сам, на прапанову Родзькі й доктара Тумаша. Ніхто не прымушаў мяне.
К.Р.Ф.: Раней Вы казалі, што праца ў газэце была ў Вас адзінаю пад час вайны. Дзе праўда?
А.А.: Ведаеце, я проста забыўся на выкладаньне ў школе. Гэта было нерэгулярнае настаўніцтва, па-першае. А па-другое, там фактычна не плацілі — школа была бяз грошай.
Але мне падабалася выкладаць; я сам прыйшоў туды, як школа зарганізоўвалася, і прапанаваў сябе.
К.Р.Ф.: Як называлася школа?
А.А.: Беларуская Гімназія.
К.Р.Ф.: Ці былі Вы знаёмыя з Гадлеўскім?
А.А.: Айцец Гадлеўскі быў каталіцкім сьвятаром. Ён зьявіўся ў Менску нашмат пазьней за Казлоўскага й быў пастаўлены школьным інспэктарам.
К.Р.Ф.: Растлумачце, калі ласка: вось прыехаў Казлоўскі — і ачоліў газэту, Гадлеўскі ачоліў школы. Як так сталася, што Вы не ўзначалілі што-небудзь?
А.А.: Мне было прапанавана — Ермачэнкам — узначаліць

прапаганду ў Камісарыяце, пры Кубэ. Дакладней, ён сказаў немцам, што я буду шэфам прапаганды. Тады я пайшоў у Камісарыят сам і сказаў, што не магу быць на такой адказнай пасадзе. Што я наагул не магу займаць начальніцкія пасады — хіба толькі працаваць у газэце або школе, але ні ў якім выпадку ў якойсьці арганізацыі.

К.Р.Ф.: Чаму не? Як Вы патлумачылі?
А.А.: Калі коратка, я сказаў, што за савецкія часы гэтак наеўся прапаганды, што фізычна не магу ёю займацца. І, па-другое, зь мяне аніякі начальнік. І Шрэдэр, якому я казаў усё гэта, паглядзеў на мяне дый згадзіўся.
К.Р.Ф.: Якімі былі Вашыя адносіны зь Ермачэнкам?
А.А.: Напачатку — проста выдатныя. Ён верыў мне і ў мяне. А потым пачаў даваць у нашую газэту свае матэрыялы. Неяк ён зьехаў з гораду — па мястэчках ці куды — і напісаў даўжэзную рэляцыю, дзе ён быў, што бачыў, як яго прымалі, як ён у жыце стаяў; адным словам, такое самаўсхваленьне. Я проста ня мог дазволіць друкаваць цалкам, мусіў скараціць. І тады Ермачэнка зазваніў да мяне з прэтэнзіямі, чаму я скараціў. На першы раз удалося неяк адгаварыцца, маўляў, мы не друкуем вялізных, з працягам, артыкулаў, бо ніхто не чытае, але ў наступны раз абавязкова паставім усё.
І быў „наступны“ раз, калі Ермачэнка наведаў Навагрудак. І даслаў стуль артыкул, ня меншы за папярэдні. І я наказаў сакратару, што нягледзячы на супраціў рэдакцыі, трэба друкаваць яго цалкам. Фактычна газэта складалася з рэдакцыйнага артыкулу Казлоўскага й рэшты — пэтытам — Ермачэнкі. Аўтар быў задаволены, дзякаваў, але ў Камісарыяце гэта не спадабалася, і нам было забаронена друкаваць яго надалей. Вось так.
К.Р.Ф.: Гэта ўсё цудоўна, але маё пытаньне было іншае: чаму Ермачэнка настолькі верыў Вам, што на пасаду начальніка прапаганды падаў Вашае імя?
А.А.: Нас было ня так багата. А Ермачэнка ведаў, што я — пісьменьнік, „узвышэнец“. Мабыць, гэта спарадзіла веру ў мяне. Я ж гэтую веру ня спраўдзіў.
К.Р.Ф.: Відаць, ён бачыў у Вас асобу, ляяльную да немцаў. Ці друкавалі Вы антысэміцкія, антыпольскія артыкулы?
А.А.: Такія артыкулы мусілі быць, бо скіроўваліся да нас з

Камісарыяту і друкаваліся мусова. Але ніхто — ні я, ні хто-небудзь іншы, ні нават Казлоўскі такога кшталту артыкулаў не пісалі. Між іншага, у дачыненьні да палякаў артыкулы былі іншыя: не супраць палякаў, а супраць іхнай дзяржаўнай палітыкі, бо яны ўсе беларускія землі лічылі сваёй часткаю…

К.Р.Ф.: У сапраўднасьці, гэта была палітыка немцаў: абвастраць адносіны паміж палякамі й беларусамі, паміж беларусамі й жыдамі, палякамі й жыдамі. Каб не было супольнай, сумеснай працы супроць іх, немцаў. Але гэта іншая тэма. Кім быў Іван Касяк?

А.А.: Ён зьявіўся ў Менску напрыканцы 1942 году, быў інжынэрам, будаваў штосьці.

К.Р.Ф.: За выняткам гета і вайсковых аб'ектаў, ці будавалася яшчэ што-небудзь у горадзе?

А.А.: Не магу сказаць. Касяк нешта праектаваў, гэтага што скарыстана — не магу сказаць.

К.Р.Ф.: Хто такі Юльян Саковіч?

А.А.: Саковіч? О, гэта была калярытная постаць. Ён быў і ці нават сваяком Касяка і быў прызначаны начальнікам беларускай паліцыі ў Менску. Разам з тым ён быў адным з заснавальнікаў Беларускай Незалежніцкай Партыі. Праўда, што тое, партыя засноўвалася ў ягонай кватэры — я ведаю, бо прысутнічаў там.

К.Р.Ф.: І Вы былі сябрам гэтай Партыі? Якой была гэтая палітычная арыентацыя?

А.А.: Антынямецкая і антыкамуністычная.

К.Р.Ф.: Я хачу пачуць дакладны адказ: Вы пэўныя, што гэтая партыя не была зарганізаваная Абвэрам?

А.А.: Я так ня думаю, не.

К.Р.Ф.: Вы пэўныя, што БНП не падтрымліваласяфінансавана Готбэргам[22]?

А.А.: Не магу сказаць дакладна, але перакананы, што такога

К.Р.Ф.: Хіба афіцэры СС ня бралі ўдзелу ў зарганізаваньні БНП?

А.А.: Я ня веру ў гэта!

К.Р.Ф.: Добра, няхай. У мяне іншае пытаньне. Ці ўзнагароджваў Вас Кубэ мэдалём?

А.А.: Мэдалём? Усе беларусы былі ўзнагароджаны такім мэдалём… Праўда, я так ніколі яго й не атрымаў.

[22] **Готбэрг Курт фон** (1896–1945), Генэральны камісар Беларусі, асабіста адказны ў генацыдзе беларускага насельніцтва.

К.Р.Ф.: Усе беларусы? Мэдаль атрымалі ўсе беларусы? Кожны?
А.А.: Кожны актыўны беларус; кожны, які быў у сьпісах беларускіх арганізацый.
К.Р.Ф.: Калябарант, інакш кажучы?
А.А.: Ну, можна сказаць калябарант, калі Вы такі сэнс укладаеце. Але самога мэдаля я нават ніколі ня бачыў, проста чуў, што мушу атрымаць — сярод астатніх.
К.Р.Ф.: Калі Вы пакінулі Менск апошні раз і пры якіх умовах?
А.А.: Гэта быў, здаецца, лістапад 1943 году. А ўмовы… Ведаеце, з пачаткам вайны пачаўся й наш незалежніцкі беларускі рух. Магчымасьці былі невялікія, асабліва ў газэце; але мы спрабавалі сказаць хоць штосьці — паміж радкоў. Ці разумеце Вы, як гэта — паміж радкоў?
К.Р.Ф.: Працягвайце.

А.А.: Так, і вось я надрукаваў верш Юльяна Сергіевіча. Зьмест ягоны добра ня памятаю, але запомніласьі, што адбылося пасьля. Як надрукавалі верш — нічога, усё было спакойна, немцы нат не заварушыліся. Аж да таго часу, як прыйшоў той так званы прапагандыст — зь ліку былых ваеннапалонных. Такіх Акінчыц знаходзіў у лягерах сам. Ён сябе — яны былі больш нямецкія за саміх немцаў. Гэты прапагандыст узьняў такі вэрхал, што ў рэдакцыю нямецкую зазваніў сам Шрэдэр. Казлоўскі, які быў у добрых адносінах з Шрэдэрам, сказаў, што нічога ня ведае, што гэта самавольства галіна й адказнасьць. Тады паклікалі мяне, і Шрэдэр сказаў, „Спадар Адамовіч, мы ведаем, што Вы сапраўдны беларускі і шчыры беларус, але часам Вы прымушаеце насаромецца. Напрыклад, нашто надрукавалі верш Сергіевіча? Ці думаеце, што ўсіх нас было б нашмат лепей, каб Вы паехалі ў Берлін і працавалі выключна як антыкамуніст“. Я пачаў тлумачыць, што ня надта хацеў бы, што тут мае бацькі, але ў адказ пачуў: „А Вы падумайце“.
Наступным днём у шафе майго стала, у рэдакцыі, была бомбу — пакунак з надпісам па-расейску. Бомба была для паклікалі паліцэйскага, прыйшоў фольксдойч. Ён пасьпеў нават вынесьці, як тая выбухнула й разарвала паліцэйскага на кавалкі.
Бомба была ў маім стале, для мяне. І разарваць мусіла мяне. Бомба савецкая, але хіба гэта даводзіла што?! Кубэ таксама быў

Сергіевіч Юльян (1910–1976), 23 23 самавольны як савецкі рэктыфікаваў Гэтак нямецкаму ахутаны нямецкі Беларусі, надрукаваў, друкаваны выліст беларускай. Я думаю, дай Берлін. У 50–70-х гадах чуў Ён Маладэчанскага і раённай Быў адразу беларускай незалежніцкай друкі.

забіты — усе казалі, савецкімі партызанамі. Але ж мы ведалі — з дапамогаю гестапа.
Тады я зноў пайшоў да Шрэдэра й сказаў, што гатовы ехаць у Нямеччыну. На што пачуў: „Мы вельмі радыя. Гэта разумнае, мудрае рашэньне. Вы будзеце працаваць на доктара Курца“. Курц — гэта былы шэф прапаганды. Так я апынуўся ў Бэрліне.
К.Р.Ф.: Спадар Адамовіч, у праграме „60 хвілінаў“, у гутарцы з Майклам Уоласам Вы прызналі, што былі калябарацыяністам, ці ня так?
А.А.: Я сказаў, што калі яны лічаць працу ў беларускай газэце, якая выдавалася пры немцах, калябарацыянізмам, то так, я — калябарацыяніст.
К.Р.Ф.: Дазвольце мне зачытаць запіс перадачы. Майкл Уолас пытаецца: „Вы былі прапагандыстам пры немцах, а потым сталіся інфарматарам у спэцыяльных органах ЗША“. І Вы, спадар Адамовіч, адказалі: „Так“.
А.А.: Мне ў дзяржаўным органе дэмакратычнай краіны задавалі пытаньні аб мінулым, і я адказваў на іх, наколькі ведаў. Ці гэта называецца — быць інфарматарам?
К.Р.Ф.: Майкл Уолас працягвае: „Мы ведаем, што Вы калябарацыяніст. Мы ведаем, што Вы дапамагалі гестапа“. І Вы адказалі: „Так, так. Гэта праўда. Мы ня мелі выбару. Мы маглі супрацоўнічаць або зь немцамі, або з савецкімі бальшавікамі, якіх ненавідзелі“. Вы гаварылі гэта?

А.А.: Я гаварыў, але адказваў не на гэтыя пытаньні. Яны потым зрабілі мантаж.
К.Р.Ф.: Ці калі-небудзь Вы зьвярталіся на студыю ў справе мантажу?
А.А.: Не, ніколі. На студыі, падчас запісу, нас было трое, і гутарка адбывалася на працягу 45 хвілінаў, а ў эфір пайшло толькі 5! Я сам працую на радыё, бачыў, як робіцца мантаж.
К.Р.Ф.: І Вы ніколі не пісалі на студыю, не тлумачылі, што не зьяўляліся нямецкім памагатым?
А.А.: Я ўважаў гэта за бессэнсоўнае. Гэты Майкл — непрыемны чалавек.
К.Р.Ф.: Я ня маю больш пытаньняў. Калі Вы хочаце нешта дадаць — перад тым, як Вашыя паказаньні будуць выкарыстаныя для расьсьледаваньня й прыняцьця рашэньня — цяпер самы час і апошняя магчымасьць.

А.А.: Я вельмі стаміўся. Я хачу толькі сказаць, што тут, у Амэрыцы, я напісаў багата рэчаў, выдаў кнігу ў ангельскай мове, якой шырака карыстаюцца ўва ўнівэрсытэтах, і нават калі я нешта зрабіў няправільна, памылкова, дык мая праца тут, з кнігамі, на Радыё, у інстытуце, усё гэта — на маю карысьць. Мне цяпер 75 гадоў. Я б хацеў скончыць сваё жыцьцё ў гэтай краіне і да канца дзён сваіх рабіць карыснае, як рабіў да гэтага — ня толькі ў Амэрыцы, але й на Беларусі.
Калі вы прымеце рашэньне дэпартаваць мяне, маю надзею, гэта ня будзе Савецкі Саюз.
І яшчэ я б хацеў запытацца, што мне сказаць на радыё, майму начальству, адносна вашага рашэньня, адносна далейшага?
К.Р.Ф.: Можаце сказаць ім, што гутарка адбылася.

ЗАМЕСТ ЭПІЛЁГУ

Антон Адамовіч да пэнсіі працаваў на Радыё Свабода, ніколі ня быў асуджаны, ня быў дэпартаваны як ваенны злачынец. Дажыў да 89 гадоў і спакойна памёр 12 чэрвеня 1998 году.
Джон Лофтус напісаў яшчэ некалькі кнігаў — пра таямніцы Ватыкану, тэрарызм ураду ЗША, усе прыкладна аднолькавага кірунку — пра выяўленьне ворагаў. Аўтар адшукаў яго ў невялікім гарадку Санкт-Пецярбург, штату Флярыда, дзе той жыве па сёньня. Пагадзіўшыся — напачатку — даць інтэрвію, Лофтус пазьней адмовіўся, даведаўшыся, што „Беларускі Сакрэт“ аўтар бачыць зусім у іншым.
Але заслоны няма.
Заўвагі і камэнтары Алега Гардзіенкі.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-02-2001
[image]

[image]

ARCHE Medycyna № 9 (14) – 2000

[image]

[image]

Мінулы [image] 2000

» да Зьместу «

[image] [image] [image]

Ігар Сарокін Псыхічныя парушэньні ў незалежнай Беларусі

— наваполацкі пісьменьнік і журналіст. Сталы аўтар „Калосься“, „Нашай Нівы“, „Крыніцы“.

Псыхіятрыя для пэўнай часткі нашага грамадзтва доўгі час выглядала ды выглядае дагэтуль карным сродкам, з дапамогай якога ўлада зводзіць рахункі з тымі, хто паўстаў супраць сыстэмы. У дэмакратычных выданьнях цягам апошніх 10–15 гадоў зьяўляліся ўспаміны тых, хто пацярпеў ад савецкай карнай машыны, часткаю якой была і савецкая псыхіятрыя. Называліся імёны псыхіятраў, якія спрычыніліся да „дыягнаставаньня і лекаваньня псыхічнай паталёгіі“ асобаў, што не прымалі савецкага ладу жыцьця ды спрабавалі публічна адстойваць свае погляды.

Гэткім чынам у грамадзкай сьвядомасьці сфармаваўся нэгатыўны вобраз ня толькі некаторых псыхіятраў, але ўсёй псыхіятрычнай навукі, нават нэгатыўнае стаўленьне да лекаў, што выкарыстоўваюць псыхіятры ў сваёй практыцы. З апошніх найбольш ганілі аміназын і сульфазын. Між тым выкарыстаньне гэтых лекаў дазволіла дапамагчы тысячам хворых. А аміназын дагэтуль пасьпяхова выкарыстоўваецца ў псыхіятрыі. У свой час выкарыстаньне сульфазыну дазволіла адмовіцца ад прышчэпак малярыі дзеля лекаваньня прагрэсыўнага паралюшу.

Тым ня менш суб’ектывізм у вызначэньні й ацэнцы псыхічных

парушэньняў і іх магчымых наступстваў для грамадзтва пазбаўлялі савецкую псыхіятрыю навуковасьці, вялі псыхіятраў колішняга СССР да самаізаляцыі ад набыткаў сусьветнай навукі. З распадам СССР ды тэндэнцыяй да гуманізацыі грамадзкага ладу зьявілася надзея, што аб'ектыўнасьць ды адкрытасьць стануць правілам і для псыхіятрыі. У адкрытых грамадзтвах якасьць лекаваньня асобаў з псыхічнымі парушэньнямі непараўнальна вышэйшая, а слова „псыхіятар" там нікога не палохае.
Сытуацыя з псыхічнай паталёгіяй нагадвае сытуацыю са СНІДам: захварэць могуць ня толькі асобы, што належаць да групаў рызыкі. Сапраўды, схільнасьць да псыхічных парушэньняў мае спадчынны характар: чым болей псыхічна хворых сярод далёкіх і асабліва блізкіх сваякоў, тым больш імавернае ўзьнікненьне псыхічных парушэньняў. Тую ці іншую ступень схільнасьці да псыхічных парушэньняў мае кожны. Любы чалавек, асабліва той, што жыве ў псыхалягічна неспрыяльных умовах, можа захварэць на нэўроз. Трываласьць і працягласьць нэўратычных парушэньняў залежаць шмат ад якіх чыньнікаў: найперш ад характаралягічных адметнасьцяў асобы, а таксама ад яе здольнасьці прыстасоўвацца да зьменаў псыхалягічных варункаў, ад магчымасьці атрыманьня ды эфэктыўнасьці мэдычнай і псыхалягічнай дапамогі. Варта памятаць, што часам нэўратычныя, ці, дакладней, нэўрозападобныя разладжаньні насамрэч сьведчаць пра пачатак больш сур'ёзнага псыхічнага захворваньня, прыкладам, шызафрэніі ці хваравітых парушэньняў настрою (афэктыўных разладжаньняў). Акрамя таго, нэўратычныя парушэньні досыць часта набываюць рысы хранічных і выклікаюць дэзадаптацыю асобы. Не выпадкова на Захадзе шмат увагі надаюць лекаваньню асобаў, хворых на нэўрозы, а самія пацыенты не шкадуюць часу й грошай на дапамогу спэцыяліста, ледзь заўважыўшы ў сябе прыкметы нэрвовай зморанасьці альбо прыгнечанасьці. Тамтэйшае насельніцтва добра ўяўляе наступствы псыхічнага захворваньня.

Нэўратычныя парушэньні альбо непрымальныя для грамадзтва дзеяньні зазвычай выклікаюцца пэўнымі праблемамі, зь якімі чалавек сутыкаецца ў сваім жыцьці. Характарызуючы такія праблемы, варта адзначыць наступнае: існуюць праблемы, якія

былі, ёсьць і будуць на любым этапе разьвіцьця чалавечай супольнасьці, спрадвечныя праблемы накшталт канфлікту паміж бацькамі ды дзецьмі ці нешчасьлівага каханьня. У той жа час існуюць спэцыфічныя для пэўнага грамадзтва праблемы, якія абвастраюцца ў часы сацыяльных і іншых ломак.
Цяжка даць тлумачэньне таму факту, што ў аднаго чалавека нэўратычныя парушэньні доўжацца некалькі дзён, а ў іншага — некалькі месяцаў ці нават гадоў. Бальшыня дасьледаваньняў імкнецца спасьцігнуць прычыны псыхічных захворваньняў. Цягам апошніх 10 гадоў навука значна пасунулася наперад у спробах зразумець функцыяваньне галаўных мазгоў. Сканаваньне мэтадам ядрава-магнэсавага рэзанансу (ЯМР) дае дэталёвую інфармацыю аб структуры мазгоў, выяўляе фізычныя анамаліі й пухліны. З распрацоўкай мэтаду пазытронна-эмісійнай тамаграфіі (ПЭТ) зьявілася магчымасьць атрымліваць трохмерныя малюнкі працуючых мазгоў. Выяўленыя адхіленьні дазваляюць зь вялікай верагоднасьцю дыягнаставаць шызафрэнію альбо хваробу Альцгеймэра. Тым ня менш этыялёгія псыхічных захворваньняў дагэтуль цалкам ня высьветленая. Калі гаварыць пра шызафрэнію, дык рызыка захварэць на яе залежыць ад таго, колькі вашых сваякоў і хто менавіта хварэлі ці хварэюць на гэтую хваробу:
— калі сярод вашай радні не было хворых на шызафрэнію, ваш шанец захварэць на яе складае 1%;
— калі на шызафрэнію хворы адзін з вашых сваякоў другой ступені сваяцтва (стрыечныя брат ці сястра, бабуля ці дзядуля ды інш.), ваш шанец захварэць на шызафрэнію складае прыблізна 2%;
— калі хворы сваяк першай ступені (адзін з бацькоў, брат ці сястра), ваш шанец захварэць на шызафрэнію павялічваецца да 10%;
— калі хворыя абодва бацькі, ваш шанец — блізу 40%;
— калі хворы ваш аднаяйкавы блізьнюк, у вас шанец блізу 50%.
Калі хворыя некалькі сваякоў, верагоднасьць захворваньня можна вылічыць шляхам складаньня адсоткаў. Напрыклад, калі хворы ваш бацька (10 адсоткаў) ды стрыечны брат (2 адсоткі), дык ваш шанец захварэць складае прыкладна 12%.
У грамадзтве існуе шмат забабонаў ды прымхаў што да псыхічных хваробаў і пацыентаў псыхіятрычных лякарняў. Напрыклад:

— Псыхічная хвароба ўзьнікае ў асобы, якая зашмат займаецца разумовай дзейнасьцю. Аднак у сапраўднасьці шызафрэнія ўзьнікае прыкладна ў 1 адсотка чалавечай папуляцыі сьвету незалежна ад выхаваньня, рэлігіі, адукацыі, сацыяльна-эканамічнага стану і расы.

— Псыхічнае захворваньне ўзьнікае ў асобаў, якія ня маюць полавага жыцьця. Адпаведна, полавае жыцьцё ўважаюць за сродак прафілактыкі псыхічных захворваньняў.
— Псыхічнае захворваньне варта лекаваць з дапамогаю сьвятара ў царкве.
— Псыхічнае захворваньне найлепш лякуюць бабкі-шаптухі.
На жаль, навуцы дагэтуль невядомыя мэтады, якія б дазвалялі поўніцай вылечыць чалавека ад шызафрэніі ці сур'ёзных парушэньняў настрою. Псыхіятры могуць у шмат якіх выпадках зрабіць праявы захворваньня мякчэйшымі.
— Псыхічныя захворваньні заразьлівыя.
Псыхічныя захворваньні не заразьлівыя. Ад чалавека, зь якім вы бавіце разам час ці п'яце з адной шклянкі, вы не заразіцеся псыхічным захворваньнем. Можна пачувацца ніякавата побач з чалавекам, які ня ў стане лягічна думаць ці зразумела гаварыць, але ж пасьля вяртаньня ў асяродзьлзе псыхічна здаровых дарослых людзей гэтая ніякаватасьць зьнікае. Гэта ўсё адно, што бавіць час зь дзіцем: хоць вы пачынаеце глядзець на сьвет дзіцячымі вачыма, гэта ж ня значыць, што вы адменіцеся ў малое.
— Псыхічна хворыя асобы агрэсіўныя.
Людзі з псыхічным захворваньнем, у сваёй большасьці, не агрэсары й не забойцы. Агрэсіўныя паводзіны сярод псыхічна хворых сустракаюцца не часьцей, чымся ў папуляцыі ў сярэднім. Большасьць псыхічна хворых, наадварот, трымаецца вельмі ціха й адасоблена.
— Псыхічна хворыя — благія ды злосныя людзі.
Людзі з псыхічнымі захворваньнямі ня злосныя. Тое, што чалавек захварэў псыхічна, зусім ня сьведчыць пра тое, што ён ці ягоная сям'я зрабілі нешта кепскае альбо што яны кепскія людзі. Захварэць псыхічна — гэта такое ж няшчасьце, як нарадзіцца з схільнасьцю да цукроўкі, хваробы сэрца ці раку. Ці

ёсьць прычына саромецца, калі якая-колечы з гэтых хваробаў зьявілася ў сям'і? Аднак сваякі псыхічна хворых часьцяком саромеюцца.
Каб ставіцца да псыхічна хворых са спагадаю, варта зразумець, што яны зусім ня ў стане кантраляваць свае перажываньні, якія нясуць ім пакуты. Думкі й пачуцьці хворых нелягічныя й непрадказальныя. Яны баяцца сваіх хваравітых адчуваньняў ня менш, чымся мы баімся іхных учынкаў. Жыцьцё гэтых людзей асабліва ўскладняецца неразуменьнем і нецярпімасьцю грамады. Звычайна іх баяцца, пазьбягаюць альбо зьневажаюць. Самота, ізаляцыя і дэпрэсія робяцца другаснымі праявамі хваробы, несучы хвораму яшчэ больш пакутаў.

Разгляд праяваў некаторых псыхічных хваробаў варта дачаць з найбольш цяжкога псыхічнага захворваньня.

Шызафрэнія

Прыкмета шызафрэніі — разладжаньне думаньня, няздольнасьць лягічна й рэалістычна думаць і выказваць свае думкі, перабываньне ў пэўныя пэрыяды разьвіцьця хваробы ў псыхатычным стане. Псыхатычным ёсьць стан, калі чалавек няздольны адрозьніць свае фантазіі альбо пэўныя ўзрушэньні перажываньні ад рэальнасьці. У хворага ў псыхатычным стане праяўляюцца адзін ці больш з трох асноўных сымптомаў: галюцынацыі, трызьненьне ды разладжанасьць думаньня.
Фармальна для дыягностыкі шызафрэніі неабходнай наяўнасьць трох крытэраў:
— перабываньне ў псыхатычным стане ня менш за шэсьць месяцаў;
— значныя парушэньні ў ладзе паводзінаў, калі чалавек ня ў стане працаваць, браць удзел у сацыяльным жыцьці, часам нават клапаціцца аб забесьпячэньні ўласных жыцьцёвых патрэбаў;
— немагчымасьць растлумачыць узьнікненьне хваравітых сымптомаў арганічнымі фактарамі.

Галюцынацыі

Галюцынацыя — якое-любя адчуваньне, ня выклікае вонкавымі ўзьдзеяньнямі. Кожнае з нашых пяцёх пачуцьцяў — зрок, слых, нюх, смак, дотык — можа быць крыніцай

1. Паводле статыстычных зьвестак за 1991–97 гг., у Менску выказваць сваё колькасьць самагубстваў за гэты час пачынаючы з 1991 г. Найбольш самагубстваў у Менску было ў 1994 г. (416 чалавек, ня ў ліку 25 на 100 тысячаў насельніцтва). Аналягічная сытуацыя назіраецца й пры аналізе ўва ўзросце гэтых грунтаў. Колькасьць

галюцынацыяў. Хворы можа чуць галасы, што нехта з іншых бачыць тое, чаго няма, адчуваць пахі, якіх ніхто, акрамя яго, не адчувае ды г.д. Вельмі істотна, што хворы ўспрымае галюцынацыі гэтак жа рэальна, як вы — гэты тэкст. Слыхавыя галюцынацыі ўзнікаюць у хворых на шызафрэнію найчасьцей. Часам галасы гучаць зьдзекліва ці зняважальна, часам прымушаюць рабіць непрымальныя ў грамадстве альбо небясьпечныя ўчынкі, часам выклікаюць сьмех. Хворыя саромеюцца альбо баяцца сваіх галюцынацыяў. Іхнае жыцьцё надзвычай цяжкое, бо яны мусяць увесь час шукаць спосабы спалучэньня зьместу галюцынацыйных перажываньняў з рэальным станам рэчаў. Напрыклад, голас можа загадаць сыну ў тым, што бацька хоча яго атруціць, хоць на самай справе інфармацыя цяжка спалучаецца з рэальнымі цёплымі адносінамі паміж бацькам і сынам.

Трызьненьне

Трызьненьне — гэта фальшывае перакананьне. Часта хворых на шызафрэнію ўпэўнены, што з экрану тэлевізара людзі зьвяртаюцца беспасярэдне да іх. Хворыя чуюць перакананыя ў тым, што для людзей здаровых ёсьць відавочная бязглузьдзіца. Звычайна хворыя ўпэўненыя ў тым, што людзі, нават самыя блізкія, імкнуцца зрабіць ім шкоду. Часам у хворых трызьненьне мае рэлігійны зьмест. Тым, хто ня знаёмы з гэткімі хворымі, варта ведаць, што спробы пераканаць іх памылковасьці іхных меркаваньняў бясплённыя, як спроба б была б спроба пераканаць кожнага з нас, здаровых, што мы — гэта ня мы, а нехта іншы.

Разладжаньне думаньня

Псыхічна хворы з разладжаньнем думаньня ня ўсягды лягічна. Думкі псыхатычных хворых пераскокваюць з адной зьявы на іншую бязладна й бессэнсоўна. Псыхатычны ўзровень парушэньня думаньня — значнае зьмяненьне працэсу думаньня на працягу досыць доўгага часу, што адрозьніваецца ад парушэньняў думаньня псыхічна хворых ад парушэньняў, якія ў шмат у каго з псыхічна здаровых людзей у стрэсавых сытуацыях. Разладжаньне думаньня ёсьць нешта сталае. Чалавек можа разважаць вельмі добра й нават уражваць разуменьня сутнасьці зьяваў.

ніхто, спробы
сама
(спарасуіцыдаў)
знаходзіцца
нават
1993 г.
Найбольшае
паранаідаў
1995 г.
(1213 хлопцаў і 72
1990 тыс.
Гэтая
тэндэнцыя
назіраецца як у
дарослых,
Дарослыя,
Але людзі,
Але
Амаль
Гэта
Беларусі
даводзіцца
Менскім
Чвэрць

Неадэкватнасьць эмоцыяў
Эмацыйную сфэру хворых на шызафрэнію нехта параўнаў з рэччу, вырабленай із шкла ды сталі, з увагі на тое, што гэтыя хворыя часам выяўляюць надзвычайную чульлівасьць, а часам — эмацыйную халоднасьць, няздольнасьць да спачуваньня. Неадэкватнасьць эмоцыяў выяўляецца таксама ў тым, што пачуцьці хворага часам не адпавядаюць зьместу таго, аб чым ён гаворыць, напрыклад, хворая жанчына можа сьмяяцца, распавядаючы аб сьмерці каханага. Эмоцыі мяняюцца бяз дай прычыны. Суразмоўцу бывае незразумела, што выклікала сьмех ці сьлёзы хворага. Эмацыйная лябільнасьць часам зьнікае, каб праз колькі тыдняў ці месяцаў зьявіцца зноў.

Хваравітыя разладжаньні настрою
Кожны з нас можа прыгадаць кагосьці са сваіх прыяцеляў, хто часам зьдзіўляе пераменлівасьцю настрою. Перамены ў настроі чалавека ня рэдкасьць, але ж гэта зусім ня тое, што хваравітае разладжаньне настрою. Апошняе выяўляецца ў афэктыўных прыступах, падставовымі сымптомамі якіх служаць такія зьмяненьні настрою, калі ён то празьмерна высокі (маніякальны), то занадта прыгнечаны (дэпрэсіўны), ці вагаецца ад адной скрайнасьці да іншай. Хваравітыя эпізоды зьмяняюцца пэрыядамі нармальнага настрою. У розных людзей розная клінічная карціна хваравітага стану, розная працягласьць ды частасьць эпізодаў.

Дэпрэсія
Падчас дэпрэсіі парушаюцца сон ды апэтыт. Чалавек страчвае цікавасьць да жыцьця, здольнасьць працаваць. У думаньні пераважаюць развагі аб уласнай вінаватасьці, нікчэмнасьці. Хвораму цяжка засяродзіцца, запамінаць. Чалавек пакутуе ад пачуцьця ўласнай нястаннасьці (*anaestesia dolorosa psychica*). Пакуты робяцца цяжкімі да такой ступені, што зьяўляюцца думкі аб самагубстве ды спробы іхнай рэалізацыі.

Манія
У стане маніі настрой падвышаны да такой ступені, што чалавек пачынае паводзіць сябе неадэкватна. Працягласьць сну скарачаецца да 2-3 гадзінаў. Зьмяняецца апэтыт, назіраецца

злоўжываньне алькагольнымі напоямі. Мова робіцца шпаркай, патаснай, чалавек гамоніць безь перапынку, сьпявае, піша й дэклямуе вершы. Думкі пераскокваюць з адной тэмы на іншую, увага няўстойлівая. Думаньне часам паскараецца да такой ступені, што маўленьне робіцца бязладным. Чалавек выдаткоўвае шмат грошай на непатрэбныя рэчы, раздае грошы і маёмасьць іншым людзям, пачынае весьці бязладнае полавае жыцьцё. Часам хворыя выказваюць ідэі ўласнай вялікасьці, усемагутнасьці.
Парушэньні настрою маюць розную ступень цяжкасьці. Некаторыя хворыя зь нязначнымі разладжаньнямі маюць магчымасьць атрымліваць лекаваньне амбуляторна. Больш сур'ёзныя настроевыя парушэньні лякуюцца ў псыхіятрычных стацыянарах.

Самагубства (суіцыд)
Самагубства — форма паводзінаў сацыяльна-псыхалягічна дэзадаптаванай асобы ўва ўмовах неразьвязальнага канфлікту. Аб існаваньні гэткага канфлікту можа ніхто не здагадвацца, і часам самагубства чалавека можа быць нечаканым нават для блізкіх сваякоў. Іншыя ж сем'і ня могуць пазбавіцца страху перад чарговай спробаю самагубства сваяка. Сярод псыхічна хворых частасьць самагубстваў у 12 разоў вышэйшая, чымся ў папуляцыі ўвогуле. Блізу 10 адсоткаў хворых на цяжкія псыхічныя парушэньні ўрэшце робяць сабе сьмерць. Калі самагубства псыхічна здаровых асобаў бывае нечаканым для тых, хто іх ведаў, дык самагубства псыхічна хворых для спэцыяліста больш зразумелае. Суіцыд можа быць зьдзейсьнены ў моц псыхатычных парушэньняў, напрыклад, у пэрыяд цяжкой дэпрэсіі з ідэямі вінаватасьці, ці пад уплывам галюцынацыяў, што маюць характар загаду. Некаторыя з псыхічна хворых зьдзяйсьняюць самагубства, бо пачуваюцца нешчасьлівымі ў сваім становішчы: яны ўсьведамляюць сваю хваробу, разумеюць, што іхнае жыцьцё — пакута для іх саміх ды сваякоў, што хвароба гэтая будзе доўжыцца гадамі. Іншыя хворыя робяць сабе сьмерць ненаўмысна, імкнучыся адно зьвярнуць на сябе ўвагу спробаю суіцыду. Яны гінуць ад нешчасьлівага выпадку, прыняўшы завялікую дозу таблетак альбо перарэзаўшы сабе вены. Запабегчы гэтаму можна было б праз шпіталізацыю, якая прынесла б хоць часовае зьмякчэньне

сымптомаў хваробы. Дзеяньні такіх хворых абумоўленыя тым, што, перапоўненыя пакутлівымі перажыванньнямі, яны ня ў стане шчыра папрасіць аб дапамозе[1].
Самагубства блізкага сваяка, які быў псыхічна хворым, цяжка пераносіцца ягонай сям'ёй ды блізкімі. Звычайна назіраецца пачуцьцё віны й шкадаваньня, бо ня ўсё было зроблена, каб прадухіліць сьмерць. Колькі людзей лічаць сябе вінаватымі ў зьдзейсьненым самагубстве! Але ж малаверагодна, каб хто-колечы зь іх мог нешта зьмяніць. Канчатковы выбар належыць таму, хто зьдзяйсьняе самагубства, на яго ж кладзецца і адказнасьць. Калі чалавек захоча памерці, ніхто ня здолее яго спыніць. Часам факт самагубства выклікае ў сваякоў самагубцы гнеўныя пачуцьці. Гэты гнеў можа скіроўвацца на псыхіятраў, якія ня здолелі забясьпечыць лепшае лекаваньне і догляд, ці на самога хворага, бо сваім учынкам ён стварыў для іх новыя праблемы. Ува ўзьнікненьні гнеўных пачуцьцяў няма нічога дзіўнага, бо, сьцьвердзіўшы сваім учынкам сваё права выбару, самагубца заразом прадэманстраваў няздатнасьць іншых кантраляваць падзеі. У той жа час сваякі самагубцы могуць адчуваць палёгку, бо яны ўжо былі стаміліся жыць побач з хворым ды дзяліць ягоныя пакуты.

Сьвет псыхічна хворага

Паводзіны псыхічна хворага чалавека тлумачацца ня толькі характарам псыхічных парушэньняў, але й тым, як ён успрымае сымптомы сваёй хваробы, свой незвычайны й цяжкі стан. Толькі зрабіўшы спробу зразумець пакутлівыя перажыванньні псыхічна хворага, толькі праз спагаду можна палепшыць дачыненьні паміж здаровымі і хворымі.
Трывога, страх ды разгубленасьць. Каб зразумець гэтыя пачуцьці псыхічна хворага чалавека, трэба памятаць аб ірацыянальнасьці, непрадказальнасьці ягонага нутранага сьвету. Дзіўныя галасы раптам прапануюць рабіць нешта бязглуздае. Часам думкі лятуць зь неймавернай хуткасьцю, часам нібыта зьнікаюць, пачуцьці мяняюцца, палохаючы сваімі калейдаскапічнымі зьменамі. Псыхічны хаос і бязладзьдзе выклікаюць трывогу, страх, разгубленасьць. Адных гэта вымушае шукаць цішыні й спакою, бо ў атачэньні вялікай колькасьці людзей яны адчуваюць яшчэ большую трывогу ды

страх. Іншыя спрабуюць пазбыцца нутранай сумятні й неспакою, знайсьці паратунак у гучнай музыцы, у вялікіх кампаніях. З прычыны нутранага хаосу хвораму часам цяжка адказаць нават на простыя пытаньні. Сапраўды, нават на простае пытаньне „Як маешся?“ псыхічна хвораму чалавеку цяжка даць адназначны адказ, бо ён засяроджаны на тым, што іншым незразумела альбо што для іх неістотна. Для большасьці з нас жыцьцё складаецца з адносна простых рэчаў; у мітусьні на працы й дома мы не паглыбляемся ў разважаньні аб сутнасьці зьяваў жыцьця. Для некаторых хворых гэтыя разважаньні — асноўная форма псыхічнай чыннасьці. Празьмерная засяроджанасьць на тым, што незразумела іншым, няздольнасьць дапасаваць свае паводзіны да сацыяльных нормаў, часам безразважнасьць ды імпульсіўнасьць робяцца прычынамі іхнай адзіноты. Хворыя на шызафрэнію асабліва пакутуюць ад адчуваньня таго, што іхнымі думкамі, пачуцьцямі ды адчуваньнямі нехта кіруе. Хворым здаецца, што іхныя думкі ведамыя ўсім праз гіпноз, тэлепатыю, тэлевізію ці кампутарныя тэхналёгіі. Чалавек ня здольны ўсьвядоміць, дзе канчаецца ён і пачынаюцца іншыя. Яму здаецца, што ягоныя думкі гучаць у выказваньнях іншых людзей, а ён сам разумее думкі іншых. Адказ на пытаньне, хто ж стварае гэтую блытаніну, здаецца яму відавочным. Хворы знаходзіць схаваны сэнс у словах і дзеяньнях тых, хто знаходзіцца побач зь ім, у тым, што чуе праз радыё ці тэлевізію; яму здаецца, што гэтыя людзі адмысловым чынам кіруюць ім. Спробы нейкім чынам упарадкаваць сваю псыхічную дзейнасьць, знайсьці паратунак ад таго, што палохае, часам вядуць да стварэньня больш ці менш складанай сыстэмы рытуалаў. Выкананьне гэтай сыстэмы дае пачуцьцё бясьпекі, хоць часта ўскладняе й бяз гэтага няпростае існаваньне хворага ў сям’і.

Цяжкая дэпрэсія пазбаўляе чалавека энэргіі, волі да жыцьця. Падняцца раніцаю з ложка, адзецца, паесьці становіцца для хворага на дэпрэсію непасільнай задачай. Жыцьцё траціць сэнс. Хворы ўпэўнены, што мусіць адно несьці пакараньне за свае памылкі ў мінулым.

Псыхічныя захворваньні па сваёй прыродзе цыклічныя. У адных хворых пагаршэньне стану працяглае й цяжкое. У іншых выпадках хворы то пачуваецца лепей, то сымптомы вяртаюцца. Сваякам трэба навучыцца радавацца пэрыяду паляпшэньня і, па

магчымасьці, цярпліва пераносіць пэрыяд пагаршэньня. Ня трэба злавацца на хворага за тое, што ягоны стан зноў пагоршаў.

Прагноз псыхічнага захворваньня

Доўгатэрміновая пэрспэктыва для людзей, хворых на цяжкое псыхічнае захворваньне, на жаль, нярадасная. Спасярод хворых на шызафрэнію блізу 1/3 хворых, у якіх сымптомы шызафрэніі прысутныя больш за 2 гады, да некаторай ступені захоўваюць здольнасьць жыць і працаваць у грамадзтве. 1/3 частка хворых страчвае працаздольнасьць, мацней пакутуе ад праяваў хваробы й сацыяльнай ізаляванасьці, але ў той ці іншай ступені захоўвае здольнасьць жыць у грамадзтве. 1/3 частку хворых хвароба цалкам пазбаўляе гэтай здольнасьці. Першая траціна хворых большую частку часу можа жыць бязь лекаў, некаторыя нават ня мусяць вяртацца ў лякарню, могуць самі сябе абслугоўваць і нават выконваць нескладаную працу. Тым ня менш яны адчуваюць сымптомы хваробы і няздольныя вярнуцца да той сама якасьці жыцьця, што й да хваробы. Жыцьцё другой траціны хворых у большай ступені атручваецца хваробаю. Гэткія хворыя маюць патрэбу ў рэгулярным прыёме лекаў ды пэрыядычнай шпіталізацыі ў псыхіятрычныя стацыянары. Сымптомы хваробы то слабеюць, то ўзмацняюцца, але прысутнічаюць увесь час.

У апошняй траціны хворых хваравітыя сымптомы значныя, устойлівыя і слаба рэагуюць на мэдыкамэнтозную тэрапію. Большую частку жыцьця ад пачатку захворваньня гэтыя людзі мусяць праводзіць у псыхіятрычным стацыянары.

Для хворых на афэктыўныя разладжаньні пэрспэктыва лепшая. Блізу 80 адсоткаў хворых добра рэагуюць на так званыя нарматымікі — прэпараты літыю, карбамазэпіну, вальпроевай кісьлі. Для астатніх 20 адсоткаў прагноз несуцяшальны.

Хоць немагчыма з упэўненасьцю вызначыць, у якую з памянёных групаў патрапіць канкрэтны хворы, але існуюць наступныя заканамернасьці працяканьня хваробы:

— тых, хто вёў здаровы лад жыцьця, хвароба звычайна нявечыць у меншай ступені;

— хвароба звычайна мае лягчэйшыя наступствы, калі яна пачалася ў больш ці менш сталым веку;

— прагноз хваробы спрыяльнейшы, калі пачатак захворваньня

нечаканы, калі сымптомы ўзьнікаюць нібыта як рэакцыя на стрэс. Хвароба, верагодна, будзе мець больш цяжкія наступствы, калі сымптомы ўзьнікаюць паступова, бяз дай прычыны;
— адсутнасьць сярод сваякоў хворых на цяжкія псыхічныя захворваньні дае надзею на тое, што псыхічныя парушэньні ў выніку ўзьніклай хваробы будуць ня надта цяжкімі;
— спачуваньне й падтрымка ў сям'і паляпшае якасьць жыцьця хворага;
— адсутнасьць сымптомаў, якія маглі б прывесьці да небясьпечных ды антысацыяльных паводзінаў, сьведчыць на карысьць добрага прагнозу.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **27-02-2001**
[image]

Віталь Кошалеў
Патагенэз беларускага мэнталітэту

— кандыдат мэдычных навук, дацэнт.

Чаму ж ты не ўстаеш,
К волі светлай ня йдзеш?
Ці ты волю забыў?
Ці ўжо выбіўся зь сіл?
Уладзімер Жылка

„Брак уласнае волі спрэс спараджае гатовасьць выконваць волю чужую, быць госьцем у сваёй хаце. І гэтае бязвольле з радасьцю апяваюць госьці-гаспадары, рэцытуючы панэгірыкі беларускай лагоднасьці, памяркоўнасьці, рахманасьці ды талерантнасьці. Дзе межы гэнае талерантнасьці? Дзе шукаць ейныя карані? Нашы ўсходнія суседзі традыцыйна захапляюцца лагоднасьцю ды рахманасьцю так званых „*малочисленных народов Севера*“, а заходнія вандроўнікі па акіянскіх прасторах — тымі ж якасьцямі тубыльцаў з выспаў Палінэзіі...
Можа, мэнталітэт (і ягоныя вонкавыя праявы) залежыць ад зямлі, дзе жыве народ? Ці праўда, што „відаць, пракляцьця знак ляжыць на нас ад роду, і таму так цяжка шлях нам церабіць да Беларусі...“?

Сярод нашых суседзяў эўраазіятаў (так яны цяпер сябе клічуць)

найпапулярнейшай зьяўляецца канцэпцыя этнагенэзу, прапанаваная выбітным гісторыкам і філёзафам Луквом Гумілёвым, паводле якой за аксыёму прыймаецца наяўнасьць у нацыі жаданьня (патрэбы, волі) да актыўнай чыннасьці, да дзеяньняў, накіраваных на пашырэньне арэалу свайго існаваньня коштам іншых этнічных групаў. Наяўнасьць гэнае „нацыянальнае сілы волі“ аўтар канцэпцыі называе ПАСЫЯНАРНАСЬЦЮ.

Узровень пасыянарнасьці, паводле Гумілёва, залежыць перш за ўсё ад веку нацыі, які Гумілёў вылічвае адмысловым чынам, даказваючы, што (1) выразная пасыянарнасьць — знак маладосьці этнасу; (2) кожны народ, як мітычны волат-Антэй, сілкуецца ад сваёй зямлі, але ня кожнаму яна дае патрэбны ўзровень энэргіі. Моц агрэсіўнае волі ў стасунку да суседзяў залежыць яшчэ і ад ляндшафту, які нейкім містычным чынам уплывае на фармаваньне нацыянальнага характару.

Пэрыядычныя ўсплёскі праяваў нацыянальнае сілы волі, пасыянарнасьці Гумілёў тлумачыць падвышэньнем касьмічнай актыўнасьці (зьвязаным, хутчэй за ўсё, з узмацненьнем унутрысонечных тэрмаядравых працэсаў), якое выводзіць з раўнавагі шматлікія народы, прымушае іх ствараць наднацыянальныя канглямэраты, якія ў рэшце рэшт мадыфікуюць сусьветны *status quo*.

Гэтая канцэпцыя этнагенэзу хоць і не выходзіць за межы расейскай імпэрскай традыцыі, але выразна адрозьніваецца ад прымітыўных ідэалягічных мітаў мінулых часоў спробаю комплекснага аналізу гістарычных матэрыялаў у сукупнасьці з вывучэньнем біясацыяльных і нават касьмічных уплываў на фармаваньне той мазаікі падзеяў, якая потым будзе названая гісторыяй: на паўстаньне і заняпад імпэрыяў, на ўзвышэньне і гібель народаў.

Падвышэньне ўзроўню пасыянарнасьці можна параўнаць з такімі прыроднымі працэсамі, як раптоўнае зьяўленьне ордаў саранчы — зьява, незразумелая дагэтуль, бо саранча — гэта не адмысловы від інсэктаў, а забурэньне іх звычайнага пасьлядоўнага разьвіцьця, калі на стадыі пэўнай лінькі лярвы звычайных стэпавых конікаў атрымліваюць магчымасьць хуткага нястрымнага распладненьня, прычым нашчадкі „пасыянарных“ стэпавых конікаў маюць разьвітыя крылы і бязьмежны апэтыт, зьбіваюцца ў шматмільённыя плоймы ды

1. Л. Гумилёв. От Руси к России. Москва, 2000, с. 292.

адмыслова мадыфікуюць навакольнае асяродзьдзе, асабліва яго сельскагаспадарчы складнік.
Наконт веку нацыяў, мусіць, можна спрачацца вечна, бо той жа аўтар лічыць беларусаў рэліктавай нацыяй, якая засталася некранутай з часоў „шматковай імпэрыі Рурыкавічаў“ (выслоўе Ф.Энгельса) і дажывае свой старэчы век з ласкі суседзяў. Але, калі браць за пункт адліку часы ВКЛ ці БНР, можна адстойваць процілеглы пагляд, уважаючы наш народ за „гістарычнае немаўля“, якое агрэсіўныя суседзі хочуць задушыць яшчэ ў люльцы. Таму пакінем гэныя выразна палітызаваныя забаўкі-ламігалоўкі аматарам гістарычнай матэматыкі ды матэматычнай этнаграфіі і разгледзім той складнік пасыянарнасьці, які з прычыны сваёй аб’ектыўнасьці можа аказацца прыдатным для аналізу.

Уплыў ляндшафту
Празь якія мэханізмы матэрыяльнага кшталту навакольле можа ўплываць на мэнталітэт? Л. Гумілёў піша: „Разнастайнасьць ляндшафтаў Эўразіі дабратворна ўплывала на этнагенэз яе народаў. Кожнаму знаходзілася прымальная і мілая яму мясьціна: расейцы абжывалі даліны рэк, фіна-вугорскія народы і ўкраінцы (беларусаў ён рэдка згадвае самастойна, бо ня вельмі іх адрозьнівае ад украінцаў ці называе іх літоўцамі — **В.К.**) — водаразьдзельныя прасторы, цюркі і манголы — стэпавую паласу, а палеаазіяты — тундру“[1].

Усе ведаюць, як моцна адрозьніваюцца тэмпэрамэнты горца-джыгіта і жыхара балотных раўнінаў. Але няўжо „дзеці гораў“ больш трывалыя ў барацьбе за собскія інтарэсы ды ўласную годнасьць толькі з тае прычыны, што відалі горных вяршыняў выклікаюць болей паэтычных пачуцьцяў, а іхны дом — іхная цьвярдыня ў літаральным сэнсе слова? Так ці йнакш, нашыя суайчыньнікі вызначаюцца паталягічнай, можна сказаць, талерантнасьцю ды бязьмежным пэсымізмам таксама і ў параўнаньні з народамі раўнінаў, нашымі суседзямі.
Успомнім клясыка, Янку Купалу:

Шумныя бярозы
  Пабяліў мароз,
Хацеў бы я плакаць,

Дый ня маю сьлёз;
Хацеў бы я пеці
Аб сваёй бядзе,
Дый мне сэрца ные,
Песенька ня йдзе...

Гэты ж аўтар ці не наўпрост абвінавачвае ў сваім дрэнным гуморы родны краявід ды прыроду:

Невясёлая старонка,
Наша Беларусь:
Людзі — Янка ды Сымонка,
Птушкі — дрозд ды гусь.
Поле — горы ды каменьне,
Потам зьліта ўсё,
Сенажаць — адно карэньне,
Сівец ды куп'ё.

Ну, нараканьне на неўрадлівасьць глебы — традыцыйная сялянская тэма... Ну, можа, Янка ды Сымонка нечым і завінаваціліся перад паэтам; але якую загану могуць хаваць у сабе птушкі?! Гусям, як мы ведаем, пашчасьціла выратаваць Рым, а дразды праз шмат гадоў на ўвесь былы Саюз ССР рэклямаваліся як „*певчие избранники России*".

Дык можа, наш мэнталітэт не дае нам магчымасьці іншымі вачыма глянуць на родныя краявіды? Мо пасыянарнасьці горцаў хапае і на тое, каб разабрацца з прыхаднямі-гяурамі, і на тое, каб сьпяваць песьні аб прыгажосьці свайго краю, дзе камянёў шмат болей, чымся на нашых палёх? Можа, прычына ня вонках, а ўнутры?

Гэта ўжо мэдычная тэма. Нездарма кажуць: „Нуда горша за каросту", што ў перакладзе з агульналюдзкай мовы на мэдычны жаргон азначае: „Дэпрэсіўна-фрустрацыйныя адхіленьні эмацыйнага стану суб'ектыўна ўспрымаюцца пацыентамі значна больш цяжка, чымся сьверб скуры ў выніку яе паражэньня *Scabies vulgaris*".

Але зноў жа, чаму менавіта апяваньне дэпрэсіўных і фрустрацыйных станаў — улюбёная тэма беларускай паэзіі? Чаму прадстаўнікі розных народаў па-рознаму рэагуюць на стрэсы: адны змагаюцца да апошняга, а іншыя дранцьвеюць, толькі пачуўшы імя ворага?

Лэслі Дж. Дэ Грут (*Leslie J. De Groot*), эндакрыноляг сусьветнага

ўзроўню, у сваёй манаграфіі (*Endocrynology,* Phyladelphia, 1989) піша: „Востры стрэс у вялікіх жывёлін стымулюе функцыю тарковіцы (шчытападобнай залозы), у малых жывёлаў назіраюцца выпадкі інгібіцыі тыроіднай чыннасьці“.

Ёд і мэнталітэт

З усіх мікраэлемэнтаў засяродзім пакуль што ўвагу толькі на ёдзе, бо менавіта пра яго пішуць: „Чорныя плямы ёдавага дэфіцыту расьсеяныя па ўсёй плянэце“[2]. На вялікі жаль, да гэтых плямаў належыць і Беларусь. Далей дазволю сабе абмежавацца цытатамі. „У абшарах ёдавага дэфіцыту асабліва часта адзначаюцца знакі біялягічнага звыраднення, недаразьвітасьці арганізму, розных спадчынных цыпадаўзаў, выкліканых, відавочна, дысфункцыяй ДНК“[3]. Інш. „Асаблівасьці характару людзей у зоне ёдавага недабору:
1) адсутнасьць рухавасьці поцягаў (*подвижности влечений*) і эмоцый (афэкту (узрушаньня);
2) афэктыўныя (пачуцьцёвыя) выбухі назіраюцца зрэдку; найчасьцейшай афэктыўнай рэакцыяй зьяўляецца страх, які ўзьнікае падчас сутыкненьня з усім, што новае, нязвыклае“[4].
Карацей кажучы: *„А літвак тут чувэ, нох фар дэр вэлт“* (літвак каецца, яшчэ не зграшыўшы) — прымаўка, якая ў нашым мясцовага габрэйскага фальклёру, якая яшчэ раз даказвае, што навакольнае асяродзьдзе мадыфікуе стыль паводзінаў тутэйшага люду незалежна ад паходжаньня.
Далей „Клінічная эндакрыналёгія“ безэмацыйна працягвае:
„3) У раньнім веку ўзьнікаюць незваротныя псыхічныя парушэньні, якія вядуць да крэтынізму...“[5]
Адразу трэба зацеміць, што нельга блытаць дыягназ крэтынізму з варыянтамі алігафрэніі: дэбільнасьцю, імбэцыльнасьцю ды ідыятызмам. Слова „крэтын“ утварылася ад французскага „chrétien “, што літаральна азначае „хрысьцьянін“ ці „падобны да Хрыста“. Да хворых на крэтынізм ставіліся з пэўнай павагай, бо ў старажытнай Эўропе лічылася, што людзі, адзначаныя гэтай хваробай, нясуць на сабе знак Божы, бо, маўляў, такія адкрыты ды памяркоўны, настолькі простыя ды прыязныя, што ня здатныя нават на грэх. Выкарыстоўваць бясхітрасьць Божых абраньнікаў у карысьлівых мэтах лічылася ганьбаю.

[2] В.Ю. Мохнач, 1974, с. 2.
[3] В.И. Смоляр. Гигиена труда. Киев, 1988.
[4] В.И. Смоляр. Гигиена труда. Киев, 1988.
[5] Клиническая эндокринология. Руководство для врачей. Под ред. проф. Н.Т. Старковой. Москва, 1991.

Шкада, што гуманістычныя прынцыпы Сярэднявечча не выкарыстоўваюцца ў міждзяржаўных стасунках цяпер, калі пад бразгатаньне бліскучых шкляных пацерак так званай інтэграцыі на вачах усяго сьвету беспардонна рыхтуецца ліквідацыя старажытнага, хай сабе і „рэліктавага“ этнасу тырэапатаў.

[5] Тамсама.

Сучасныя дасьледчыкі адзначаюць, што і цяпер „Рэспубліка Беларусь, паводле зьвестак Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя, належыць да краінаў зь лёгкай і сярэдняй ступеньню ёднага недахопу“. І, як і раней, „ёдны недахоп нясе шкоду здароўю чалавека ў некалькіх кірунках, найважнейшым зь якіх зьяўляецца эндэмічны вальляк (зоб) і парушэньне нармальнага разьвіцьця мазгоў“[6].

Значны недабор ёду дэфармуе ня толькі шыю хворага — праз разьвіцьцё вальляку, але і псыхічна-эмацыйную сфэру чалавека. Узьдзеяньне паталёгіі на арганізм пачынаецца яшчэ ў чэрвеве маці. Дзеці вельмі ўразьлівыя на недахоп гэтага складніка ў вадзе ды ежы.

[6] Т. Мухарэ, Н. Грынева. Ёдны недабор і здароўе. Менск, 1999.

Ёд і дзеці

Нармальная штодзённая патрэба чалавека ў ёдзе (мг/дз):

Немаўляты.....50–80
Дашкольнікі.....100–120
Школьнікі.....140–200
Дарослыя.....180–200
Цяжарныя, карміцелькі.....230–260

Галоўны дзіцячы эндакрыноляг нашай краіны доктар Клаўдыя Радзюк у сваім інтэрвію „Белорусской деловой газете“ гаворыць: „Паводле меркаваньня экспэртаў Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя, недахоп ёду зьяўляецца найболей распаўсюджанай прычынай разумовай адсталасьці, запабегчы якой можна толькі праз своечасовае лекаваньне. Я думаю, што нашая так званая „памяркоўнасьць“ у пэўнай ступені — стан паталягічны“ (БДГ, 20 сакавіка 2000 г.).

Ёд і геаграфія

Беларусь разам з Папуа-Новай Гвінэяй, Эквадорам, Гімалаямі, Уралам, Мары-Эл, альпійскімі абшарамі ды Карпатамі пазначаецца як біягеахімічная „правінцыя“[7]. Зонавыя біягеахімічныя правінцыі, бедныя на ёд (і кобальт), месьцяцца на водападзелах рэк; на ўзвышаных раўнінах; у лясістых мясцовасьцях; на тарфяніста-багністых ды падзолістых глебах. Усе гэтыя характарыстыкі дакладна адпавядаюць геаграфічнай сытуацыі нашай краіны. У сваёй „Геаграфіі Беларусі“[8] Аркадзь Смоліч паўтарае іх амаль слова ў слова: і пра водападзел, які йдзе акурат празь сярэдзіну нашага краю, і пра глебы...

Так і ўспамінаецца купалаўскае: „Паміж пустак-балот беларускай зямлі...“, а Аркадзь Смоліч яшчэ й дадае: „Беларуская раўніна сярод эўрапейскіх раўнінаў ёсьць найвышэй паднятаю. Тады як Бэрлін падняты над роўнем мора на 15 сажаняў, Варшава на 52, нават наш Пінск падняты над роўнем мора на 67 сажаняў, а Магілеў на 84... Найвышэйшы пункт у Беларусі — Лысая Гара, падняты на 161 сажань“[9]. Вось жа, увесь набор мікраэлемэнтаў (а перадусім ёд ды кобальт, якіх мы маем найменей) разам з вадой сьцякае адсюль да мораў.

А мо штосьці ўсё-ткі застаецца хоць у нашых падземных водах? Адказ можна адшукаць у „*Большой медицинской энциклопедии*“[10]. Ён, на жаль, несуцяшальны. Беларусь на схематычнай мапе падземных мінэральных водаў СССР выглядае амаль як белая пляма — гэткі бледна-салатаваты колер сьведчыць, што нашыя падземныя воды ўтрымліваюць менш за 50 г/л мінэралаў. Дый тое — пераважна звычайная соль (*NaCl*). А зь ёдам, кобальтам, кальцыем, фосфарам, медзьдзю ды борам — цяжкавата.

А мо і нічога. Мо неяк бязь ёду жыць можна. Жылі ж людзі. Але як жылі? На мапе культураў бронзавага веку[11] толькі заходнія крэсы Беларусі ды сярэднедняпроўскі абшар могуць пахваліцца знаходкамі матэрыяльных знакаў культур бронзавага веку. А на большай частцы нашага краю гэты вельмі значны для іншых народаў пэрыяд не пакінуў аніякіх сьлядоў, хоць у папярэднія часы нэаліту сьведчаньняў людзкога існаваньня (знаходак каменных прыладаў) — шмат. Потым адразу пачынаецца

[7] БМЭ, т. 6, с. 878. Москва, 1958.

[8] Аркадзь Смоліч. Геаграфія Беларусі. Вільня, 1923; Менск, 1993.

[9] Там жа.

„жалезны век“. Мусіць, нашыя продкі, таксама як і мы, ня надта сьпяшаліся за прагрэсам — бронзавыя вырабы лічылі ня дужа патрэбнымі ды ў пошуках собскіх шляхоў разьвіцьця не зьбіраліся ісьці ўсьлед за тагачасным „цывілізаваным“ сьветам[10]. Нездарма польскі гісторык Уладыслаў Грабеньскі ў 1910 годзе пісаў: „Славянін жыў з дня ў дзень, не клапоцячыся пра дзень заўтрашні. Усё гэта стварала цяжкасьці ў аб’яднаньні плямёнаў, якія ў сваёй раздробненасьці не праяўлялі дастатковай сілы падчас сутыкненьняў з ворагамі. Таму славяне аж да IV стагодзьдзя былі ў няволі ў скіфаў, сарматаў, вандалаў, готаў, гунаў, а потым жылі пад ярмом авараў, франкаў, немцаў, баўгараў, вугорцаў і нарманаў.

[10] БМЭ, т. 18, с. 607–616. Масква, 1960.

[11] БелСЭ, т. 2, с. 402–403. Менск, 1970.

Славянін, цяжкі на пад’ём ад прыроды, зь цяжкасьцю прыймаўся за энэргічную дзейнасьць, затое лёгка паддаваўся апатыі, хоць і не губляў добрага стану духу нават у няшчасьці, чаму і атрымаў ад немцаў мянушку нявольніка, які танчыць (*sclavus saltans*)“[12].

Падобныя зьвесткі сустракаюцца і ў сучасных расейскіх славянафільскіх публікацыях — калі такім крыніцам увогуле можна даваць веры. Напрыклад, аўтар кнігі *„За Прутом и Днестром, или Всё о казачестве“*, апісваючы сцэну продажу палонных на рынках Усходу, сьцьвярджае: „Калі палонных выводзілі на продаж, гандляр вельмі гучна выкрыкваў, што выстаўленыя нявольнікі найноўшыя, простыя, няскажоныя каралеўскага (г.зн. польскага, літоўскага ды ўкраінскага) народу, а не маскоўскага, які лічыўся на Крыме „хітрым“, падступным, здольным да ўдалых уцёкаў і з гэтае прычыны быў адносна танным“[13].

[12] Вырваныя з кантэксту цытаты з кнігі Ю. Арсеньева, *Исторія Подъячаго* пляц Народа. Санкт-Пітэрбург, 1910.

Найменьні „славянін“ і „нявольнік“, на вялікі жаль, праз стагодзьдзі ішлі поруч. У ангельскай мове слова *slave* азначае „раб“, „нявольнік“, як і ў нямецкай — *Sklave*, у лацінскай — *sclavus*.

Але недахоп уласнае волі, пэўная інэрцыйнасьць думак і

дзеяньняў, гатовасьць падпарадкавацца чужым загадам не заўжды разглядаліся як адмоўныя якасьці. Такое спалучэньне рысаў характару з посьпехам выкарыстоўвалася вайсковымі кіраўнікамі ўсіх часоў і народаў. І мілітарная гісторыя пакідае нам упэўненасьць у тым, што абсалютна адмоўных рысаў характару не йснуе — часам лёгкі недабор ёду дае[13]. За други магчымасьць лепей, не нэрвуючыся, трываць цяжкасьці жыцьця, у прыватнасьці — вайсковай службы. Мілітарная гісторыя сьвету захавала подзіў продкаў і сучасьнікаў з вынікаў дзеяньняў шатляндзкіх жаўнераў-наймітаў, швайцарскіх гвардыстаў, прускіх грэнадэраў, латыскіх стральцоў, дэсантнікаў Віцебскай дывізіі. Гэта ўсё людзі з папуляцыяў, якія жывуць на абшарах, дзе фіксуецца пэўны недабор мікраэлемэнтаў, у прыватнасьці — ёду.

[13] Зв'язок цілющих вод з життям людини. Москва, 1993.

Дык можа, большасьць нашых праблемаў зьвязана менавіта зь недаборам ёду?

Наступствы недахопу ёду (вальляк)

Чыннасьць тарковіцы (*glandulae thyreoideae*, шчытападобнай залозы) уплывае на кшталтаваньне характару індывідуума (жывёлы альбо чалавека), а ўрэшце — на мэнталітэт папуляцыі. Парушэньне чыннасьці тарковіцы вядзе да зьніжэньня імунітэту аж да выразнага імунадэфіцыту[14]. Калі ёду не стае, арганізм кампэнсуе яго малую колькасьць павелічэньнем ёмістасьці ды памераў органу, як гэта адбываецца ў утрымлівае. Разьвіваецца эндэмічны вальляк, бо дамешаны ёд канцэнтруецца ў шчытападобнай залозе. А ўжо гэта, зрэшты, ўплывае на абмен тлену (O_2, кісларoду), водны і энэргетычны абмен, сынтэз бялку і тлушчаў.

[14] Клиническая эндокринология. Руководство для врачей. Под ред. проф. Н. Т. Старковой. Москва, 1991.

І тут мэдычныя энцыкляпэдыі зьмяшчаюць шэраг ня вельмі суцяшальных для нас зьвестак: „У жыхароў мясцовасьцяў, эндэмічных на недахоп ёду, пагаршаецца электрычная актыўнасьць галаўных мазгоў“. Далей — болей: „Для зьяўленьня праяваў эндэмічнага вальляку можа быць дастатковым знаходжаньне ў „вальляковым агмяні“ на працягу некалькіх месяцаў“[15].

Аказваецца, калі нават да нас прыб'ецца мурын з Афрыкі ці Амэрыкі, дык праз пару месяцаў ён можа захварэць на „беларускі мэнталітэт“, які, як вядома з пашыранага жарту,

праяўляецца ў „агульнай млявасьці ды абыякавасьці да жыцьця“. Тое самае (толькі іншымі словамі) сьцьвярджаюць сур’ёзныя мэдычныя крыніцы.
Штодзённая практыка гэта пацьвярджае. На прыёме ў лекара іншаземцы (пераважна менскія студэнты, што паходзяць з краінаў Афрыкі, Азіі ды Лацінскай Амэрыкі, якія, натуральна, ня маюць аніякай генэтычнай сувязі зь Беларусьсю), найчасьцей без усялякага адмысловага збору анамнізу,[15] Там сама. самастойна распавядаюць, што менавіта „агульная млявасьць“ — іхная галоўная турбота. Ды яшчэ: калі яны выбіраюцца да радзімы на вакацыі, зь іх увесь час пасьміхаюцца сябры і сяброўкі, строячы кпіны пераважна ў тым сэнсе, што ўсю іх былую моц, жвавасьць ды імпэт адабралі беларускія дзяўчаты. Гэтая нованабытая на Беларусі „памяркоўнасьць“ асабліва пужае бацькоў студэнтаў зь Менску, і матулі вельмі часта запрашаюць мясцовых аўтарытэтаў у справах акультызму, каб „зьняць сурокі“.

Дый ня дзіўна, што стан прыбышоў зь біягеахімічных правінцыяў выклікае турботу матак, якія расцэньваюць залішнюю „рахманасьць“ і „лагоднасьць“ уласных дзяцей няйначай як праявы хваробы. Менавіта так гэтую сытуацыю разглядалі і разглядаюць эндакрынолягі. Ф.Краўс, Р.Гірш (1910) пісалі:
„У вальляковых мясьцінах крэтынізм сустракаецца эндэмічны; такім чынам ужо сама гэтая акалічнасьць паказвае на ўнутраную сувязь вальляку і крэтынізму. Калі ў дарослага наступае поўнае альбо частковае парушэньне чыннасьці тарковіцы, дык гэтыя парушэньні выяўляюцца ў псыхічных зьявах дэпрэсіўнага кшталту, у агульнай цягліцовай слабасьці, рэўматычных болях, зьніжэньні разумовых здольнасьцяў ды інш. Хворыя часта самі заяўляюць, што „іхны характар папсуўся“. Яны шмат у чым нагадваюць жывёлу ў стане зімовага засонку“[16]
Сам вальляк — ня кара нябёсаў, а абарончая рэакцыя арганізму на недабор ёду — гіпэрплязія. Найвыразьней гіпэрплязія тарковіцы заўважная ў нашых жанчын незалежна ад іхнага этнічнага паходжаньня. (Мэдычнай нормай лічыцца стан, калі тарковіца ня толькі нябачная вокам, але яе нават нельга намацаць падчас дасьледаваньня.)

[16] F.Kraus, R.Hirsch. Organotherapie. Berlin, München, 1910.

Жанчына й вальляк

Спачатку разам з павелічэньнем залозы адзначаюцца элемэнты яе звышчыннасьці (гіпэрфункцыі): рухавасьць эмацыйнага складніка характару, багацьце псыхічнай сфэры, актыўнасьць вэгетатыўнай нэрвовай сыстэмы (так званае „граньне вазамтораў“): „румяніцца як красна дзеўка“, плюс характэрны выгляд твару — заўжды бліскучыя вялікія вочы (элемэнты экзафтальму). Усё гэта спрычыняецца да надзвычайнай прыгажосьці й прывабнасьці беларускіх жанчын. Але нішто не даецца дарма. Кожны орган, які доўга працуе на мяжы магчымасьцяў (а менавіта так можна ахарактарызаваць узровень абменных працэсаў у гіпэрплязаванай тарковіцы), адносна хутка „стамляецца“. Надыходзіць заняпад ягонай чыннасьці, поўная процілегласьць першай фазе — гіпафункцыя. Гэта азначае паступовае разьвіцьцё гіпатырэёзу.

Гіпатырэёз

Вось яго праявы:

1) хуткая зьнямогласьць;
2) замаруджанасьць рухаў, нэўрапсыхічных працэсаў;
3) санлівасьць;
4) азябласьць, зьніжэньне тэмпэратуры ды сухасьць скуры;
5) запоры;
6) ломкасьць пазногцяў, валасоў;
7) хрыпатасьць голасу, няўцямнасьць гаворкі;
8) разьвіцьцё атэрасклерозу, сардэчнай недалужнасьці і атлусьценьня;
9) зьніжэньне памяці і інтэлекту;
10) зьніжэньне тонусу сымпацыйнай нэрвовай сыстэмы, рэфлексаў, слыху;
11) зьніжэньне чыннасьці шкарупы надныркавых залозаў (*cortex glandulae suprarenalis*);
12) зьніжэньне патэнцыі і полавага поцягу;
13) заўчаснае старэньне.

Дастаткова параўнаць выгляд нашых 60-гадовых „жэншчын“ з выглядам заходніх 80-гадовых турыстак, жвавыя купкі якіх поўняць усе куткі сьвету. На жаль, гэты кантраст часта ўспадаў на вока кожнаму з нас.

Недахоп ёду ў мужчынаў праяўляецца меней выразна. Калі ў

папуляцыі на аднаго прадстаўніка моцнай паловы з праявамі гіпэртырэёзу прыпадае 8 жанчын з такімі праявамі, значыцца, эндэмія ў гэтай мясцовасьці можа лічыцца лёгкай; калі суадносіны хворых мужчынаў і жанчынаў роўныя 1:5 — агмень эндэміі клясыфікуецца як сярэдні; калі суадносіны 1:3 — гэта цяжкая эндэмія.

Харч і тарк

Але гэта яшчэ ня ўсё. Аказваецца, існуюць мясьціны, дзе ўсе пералічаныя праявы гіпатырэёзу фіксуюцца нават тады, калі ў навакольнай прыродзе ёду дастаткова. Такія зоны зарэгістраваныя ў Эквадоры.

Мэханізм разьвіцьця праяваў гіпатырэёзу там зьвязаны з блёкам абмену ёду ў самой тарковіцы. Рэчывамі, здольнымі загамаваць абмен, ёсьць параамінасаліцылавая кісьля, вініл-тыяксазалідон (*vinil-tioxazolidon*), гойтрын (*goitrin*) ды іншыя. Рэч у тым, што жыхары гэтых мясьцінаў харчуюцца пераважна расьліннай ежай з групы крыжакветкавых (бручка, капуста), якая ўтрымлівае актыўныя струмагены (рэчывы, якія выклікаюць вальляк). Павышаныя канцэнтрацыі струмагенаў утрымліваюць таксама шпінат, соя, кукуруза.

Вальляк можа разьвівацца нават у дзяцей, якія харчуюцца малаком кароваў, якіх кармілі капуснымі храпкамі: гэта — уплыў тыяцыянатаў (*tiocyanates*).

Даволі сумная атрымліваецца карціна, калі прыгадаць, чым харчуецца нашае насельніцтва ўсю зіму. Пасьля гэтага ня хочацца нават успамінаць, што блёк тарковіцы можа быць выкліканы радыёактыўным ёдам — менавіта такім, безьліч малекулаў якога выкінуў у нашае неба выбух Чарнобыльскай АЭС.

Не хацелася б на такой пэсымістычнай ноце заканчваць разважаньні пра мэдычныя аспэкты беларускага мэнталітэту. Дык ці ёсьць выйсьце з гэтае сытуацыі? Якім чынам можна паменшыць адмоўныя эфэкты, празь якія недахоп ёду ўплывае на здароўе і мэнталітэт нацыі, а ў канцавым выніку — на сытуацыю ў грамадзтве?

Што рабіць?

Што рабіць, каб выправіць альбо хоць бы не пагаршаць

сытуацыю, бязглузда харчуючыся струмагенамі?
— Пазьбягаць надмернага ўжываньня белакачаннай капусты, хрэну, салаты, кукурузы, салодкай бульбы, соі, якія зьмяшчаюць гэтыя шкодныя рэчывы.
— Ужываць ваду, якая не зьмяшчае забруджаньняў жывёльнага ды хімічнага паходжаньня: нітратаў, тыяцыянатаў, высокіх канцэнтрацыяў кальцыю.

— Памятаць, што пэўныя лекі таксама блякуюць чыннасьць тарковіцы: мэрказаліл, пэрхляраты, солі літыю, сульфаніламіды[17].
— Нельга забывацца на тое, што патрэба ў ёдзе значна падвышаецца ў пэрыяд полавага дасьпяваньня, цяжарнасьці ды кармленьня грудзьмі.
Е.Палякова (*Медицинский вестник*, 24 жніўня 2009 г.) піша: „Недастатковае ўжываньне ёду жанчынай, якая рыхтуецца стаць маткаю, выклікае незваротныя парушэньні мазгоў у плода, што ўрэшце замаруджвае ды зьніжае разумовае і фізычнае разьвіцьцё дзіцяці, а іншым разам выклікае цяжкую разумовую адсталасьць — крэтынізм.
Паводле зьвестак Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя на Беларусі назіраецца ёдны дэфіцыт сярэдняй ступені. Што да рэкамэндацыяў, паводле якіх кожны нованароджаны павінен атрымліваць 40 мкг ёду штодзённа, дык толькі 6% дзяцей атрымліваюць з малаком маці гэтую норму ёду, астатнія практычна пазбаўленыя гэтага мікраэлемэнту“. Ёдны дэфіцыт выяўляецца амаль у 81% дзяцей і падлеткаў Беларусі.
Ці відаць дзесьці сьвятло ў канцы тунэлю?
З увагі на тое, што ёдны недахоп выклікае нэгатыўныя наступствы як для здароўя людзей, так і для нацыянальнай бясьпекі, разьвязаньне праблемы вымагае мэдычнага і сацыяльна-палітычнага падыходу.
1) Мэдычны падыход — ёдаваньне прадуктаў харчаваньня. Часьцей за ўсё ёд дадаецца да солі (часам — да вады), але яшчэ са школы мы памятаем, што ёд — такое хітрае рэчыва, якое зь цьвёрдага стану адразу ўзганяецца да стану газу і адлятае ў касьмічныя прасторы сусьвету. Беларускі звычай хаваць соль пра запас (на выпадак чарговай вайны) у значнай ступені перакрыжоўвае надзеі на вялікую эфэктыўнасьць гэтай формы прафіляктыкі. Трэ дадаць, што тэрмічнае ўзьдзеяньне на

[17] Т.Мохарт, Н.Гриневіч. Ёдны недахоп ды здароўе. Менск, 1999.

ёдаваную соль дадаткова скарачае колькасьць ёду, зьвязанага з прадуктамі харчаваньня. Ёсьць напрацоўкі ўкраінскіх мэдыкаў адносна спробаў ёдаваньня расьліннага алею: ёд больш трывала зьвязваецца з гэтым прадуктам, які зазвычай спажываецца за досыць кароткі тэрмін.
На Беларусі існуе служба супрацьвальляковых дыспансэраў, якая б магла больш актыўна займацца ня толькі назіраньнем за кантынгентамі з паталёгіяй тарковіцы, але і прафіляктыкай гэтай паталёгіі. Галоўным накірункам мусіць быць прафіляктыка раку шчытападобнай залозы, які звычайна разьвіваецца паралельна з утварэньнем вузлоў у хворым органе. Для ўзмацненьня службы, безумоўна, патрэбныя грошы, якіх на мэдыцыну традыцыйна не стае.
2) Сацыяльна-палітычныя захады.
Сучасная палітыка „беларускіх“ уладаў накіраваная на ліквідацыю нацыянальнага імунітэту, на ліквідацыю нацыі пад начэпныя мэлёдыі „славянскіх базараў“, папсовых і палітычных. Узор вырашэньня сацыяльных праблемаў, якія ўзьнікаюць у краінах, што воляю лёсу месьцяцца ў бедных на мікраэлемэнты біягеахімічных зонах, прапануюць Швайцарыя ды Андора, якія сутыкаюцца з падобным да беларускага мэнталітэтам сваіх грамадзянаў. Гэтыя краіны здаўна маюць самыя жорсткія ў Эўропе патрабаваньні да працэсу натуралізацыі (г.зн. да працэсу прыняцьця іншаземцаў у сваё грамадзянства). Апроч таго, зараз Швайцарыя плянуе абмежаваць колькасьць іншаземцаў, якім дазволена сталае жыхарства і праца ў краіне (да 18% ад агульнай колькасьці насельніцтва). Прыняцьце такога *modus vivendi* ёсьць цалкам натуральны захад, бо для памяркоўных народаў вельмі важна пэўным чынам імунізавацца ад залішняй пасыянарнасьці актыўных, а часам проста галодных суседзяў. Але гэта — толькі тэарэтычная прапанова, якую ажыцьцявіць яшчэ цяжэй, чымся замену ёдаваньня солі на ёдаваньне алею.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум

№ 9 (14) – 2000

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 26-01-2001
[image]

[image]
A R C H E
M e d y c y n a № 9 (14) – 2000
[image]

[image]

[image]
[image] 2000
» да Зьместу «

[image] [image] [image]

Алесь Наўроцкі
У анатамічцы

а жоўта-
васковыя,
нямыя таму,
што трапілі
яны ўжо
д а д о м у,
дзе адзежа ня
трэба ім,
вядома.
Ля сталоў тых
студэнцкія
кпіны,
кінанавіны
і жарты-моргі...
Любы там
пабачыш
і вывучыш
орган.
Біцэпс,
трыцэпс,

і іншыя цягліцы

—
вывучаем
ня толькі па
кніжцы.
Дзе кончык?
Ня відна,
схаваўся
артэрыі кончык.
І, шукаючы,
тут жа з
павідлам
умінаем
пончык.
Асобна ў
слоіках
шкляных і
пляскатых
стаяць
далікатныя
прэпараты,
дзе судзіны і
нэрвы
пранумараваныя,
нібы на паперы
намаляваныя.
Ля адных
сталоў — віск,
ля другіх — ціхі
гоман.
А вось
жартаўнік
усунуў
папяросу
ў зубы
“нямому”.
І той, хто,
магчыма,
пры жыцьці не
курыў,
папяросным

дымам
задыміў.
—
Курыльшчыкі,
прэч! —
вымятальшчыца
сьмецця
мятлу, як меч,
падняла і...
сьмяецца.
А я перапоўнен
да краю
громам
уласнага марша
—
сам сабе
паўтараю
радкі свайго
верша.

Да экзамэнаў падлічаныя
нават гадзіны...
Удыхаю ў анатамічцы
пах фармаліны.
Удыхаю, шукаю ўкрадкаю,
дзе прымасьцілася ты.
Па паркеце гладкім
прахаджваюся
сюды-туды.
Анатамічка — гэта зала,
якая на шэсьць гадоў
нас, студэнтаў-мэдыкаў,
прывязала
да *т ы х* сталоў...
Да *т ы х* сталоў,
дзе ляжаць нямыя, нямыя адмысловыя,
якія ўжо не гарадзкія
і не вясковыя,
квадрыцэпс —
Р у к і

Варта абхапіць
даланямі кацёл
вады

і кацёл вады
закіпіць.

Рукі мазалямі пакрыты век цэлы.
Мазалёў тых хапіла б ўсіх гультаёў
надзяліць.
зьледзянелай —

Гм, здаецца, вершам
такоўскім
можна ўзрушыць нямала душ.
(Пазьней я зразумею,
што я Маякоўскага
прымяраў капялюш.)
Да экзамэнаў падлічаны
нават гадзіны...
Удыхаю ў анатамічцы пах фармаліны.
Той орган,
што ў грудзях нашых зьлева
нясе маторную
службу сваю,
з тазу закарэлага
той орган-матор
я дастаю.
Хто ж, матор,
быў твой уладальнік?
Ці былі ў яго сыны?
Зь якой ён —
з дальняй
ці блізкай стараны?
Ці варочаў ён сена ў поце?
А колькі перакульваў чарак?
Ці адстрэльваўся ў балоце
ад нямецкіх аўчарак?
І чаму не ля роднай хаты?

Як трапіў ён да моргу?
...Як пухір жаўтаватае ваты,
я трымаю той орган.
Убаку
у кутку
з анатоміяй на каленях
я той орган вучу
і пазіраю ня толькі
на сьцены.
Козачка!
Ты сьмяешся.
Сьмяецца
ля цябе аднакурсьнік сонейкам.
Спрытны,
ён ля цябе ўецца
ў дудачках-штоніках.
Дудачкі тыя весела-грозна
ты адпіхаеш
і жартоўна-сур'ёзна
жартаваць ім не дазваляеш.
Непазьбежна прыйдзе той час,
і нас
падхопіць цягнік і МАЗ.
І — бывайце артэрыі
і нейкія там генэратары
Герца!
Плюхае ў цынкавы таз
сэрца.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 26-01-2001
[image]

Вінцэсь Мудроў
Дарога ў дваццаць крокаў

— наваполацкі пісьменьнік і журналіст. Сталы аўтар „Калосься“, „Нашай Нівы“, „Крыніцы“..

I

— Месца — дакладна тое? — крыкнуў Мікола, выціраючы чупрыну калашыньнем спартовых штаноў.

— Тое, — адгукнуўся дзед Трахім, — якраз насупраць каменя. Тады ён на паверхні быў, а цяпер во... у зямлю ўехаў, — дзед прысеў на камень, выцягнуў пачак „Беламору“.

— Можа, далей адплывем? — падаў голас Гасюта, зірнуў на дзеда, і той, чыркнуўшы запалкай, страсянуў галавой: — Самаскід на паўкола ў ваду ўехаў, як скідваў. Так што — шукайце. Дзесьці там і ляжыць.

Мікола памыляў сьсінелымі ад холаду вуснамі, зморана ўздыхнуў і, пастаяўшы, як той скакун на вышцы, на носе лодкі, сігануў у ваду. Гэтым разам ён прабыў пад вадой як ніколі доўга: Гасюта нават сьцягнуў з галавы кашулю, зьбіраючыся ратаваць сябра, ды тут Мікола вылецеў, па самы пояс, з вады і з панікай у голасе выдыхнуў:

— Ёсьць!

Пару хвілінаў Мікола аддзімаўся, трымаючыся за вясло, потым насунуў на плячук зашмаргу, нырцануў пад лодку і з такой рашучасьцю адштурхнуўся нагамі ад днішча, што Гасюта, які стаяў у поўны рост і разблытваў вяроўку, ледзь не кульнуўся за борт.

Першыя, а таму самыя гострыя сонечныя промні працялі небасхіл, і рака зь серабрыстай ператварылася ў ружовую.
— Глеем зацягнула... ледзь адшукаў, — прамармытаў Мікола, выбраўшыся на бераг: небараку даймалі дрыжыкі, ён увесь сьсінеў, зуб паганяў зуба, і Гасюта, перш чым пачапіць да трактара канец вяроўкі, палез у кабінку, выцягнуў адтуль пачатую пляшку.
Мальцы глынулі на поўную губу, працягнулі пляшку дзеду Трахіму, але дзед піць адмовіўся.
За пару хвілін Гасютаў „Беларус“ залескатаў на высокіх абаротах, вяроўка напялася і струной засьпявала ў паветры. Дагэтуль дзед Трахім паглядаў на сьвет зь лёгкай усьмешкаю, а ўгледзеўшы напятую вяроўку, ураз пасур'ёзьнеў, прыхапіўся на ногі і застыў, з прыгаслай папяроскай у зубах.
Трактар натужліва завуркатаў, зямля здрыганулася, і з вады ўзьнялося штосьці зялёнае і круглявае. Напачатку цяжка было ўгледзець у бясформеннай камлызе чалавечыя відарысы, і толькі калі камлыга прапаўзла па пясочку, а затым успарола берагавы дзірван, пакінуўшы на ім пасму зялёнай твані, сталі праглядацца няўклюдная галава і шырокая грудзіна.
— Някволы бюсьцік... чатыры тоны пацягне! — выдыхнуў Мікола, з натхненьнем выкручваючы свае шырозныя, у „сэканд-хэндзе“ куплёныя трусы.

Сябрук у адказ задаволена крэкнуў, перакінуў з рукі на руку пакарабачаную манціроўку і міжволі прыпыніў крок, рахуючы, колькі „зялёных“ ім адваляць за бронзавага балвана. Манціроўка ляснула тупым канцом па балвану, і гук ад удару атрымаўся глухім і няўцямным.
— Цэмэнт, — прамовіў дзед Трахім, а ўнук, пасьпеўшы нацягнуць трусы толькі на левую кумпячыну, перахапіў манціроўку і з амонаўскім натхненьнем стукнуў балвана па няўклюднай галаве.
— Цэмэнт, — уголас прашапталі хлопцы і разам паглядзелі на дзеда.
— Ну што, дзядуля... дзе твая бронза? — голас Міколавы дрыжэў, як авечы хвост. — Папёрліся... зь цёмнага рана... по-омнік... бро-онзавы... — унук мацюкнуўся, падцягнуў трусы і рушыў да „Беларуса“ — дапіваць рэшткі гарэлкі.
Добрых паўгадзіны хлопцы моўчкі ляжалі на траве, смалілі

цыгарэты, нарэшце Гасюта падняўся на ногі і, кіўнуўшы ў бок камлыгі, запытаў:
— Дык што, адвязваем?
— Ды не-е... — прыспана прамовіў Мікола, — цягні да дзедавай хаты. Будзе ведаць, як народу мазгі дурыць.
— Ты што, ашалеў? Навошта мне гэтая халера! — крыкнуў дзед Трахім, але Гасюта тым часам ужо залез у кабінку, паддаў газу, і цэмэнтавая гаргара, пакідаючы па сабе глыбокую баразну, папаўзла па беразе.

Унук Мікола ўжо трэці тыдзень гасьцяваў у дзедавай хаце. Адранку глушыў рыбу на рачных затоках, удзень непрабудна спаў, а ўвечары хадзіў у мясцовы клюб альбо піў гарэлку на пару зь дзедавым суседам — трыццацігадовым трактарыстам Гасютам. Вось і пазаўчора, узяўшы пляшку, унук выправіўся да суседа, але неўзабаве вярнуўся, цягнучы на плячы двухвядзёрны, зьзелянелы ад часу самавар.
— У Гасюты, на гарышчы знайшлі, — патлумачыў унук, а калі дзед з усьмешкай спытаў — навошта ён прыпёр гэтае ламачча? — безнадзейна махнуў рукой і падаўся з хаты.
Наступным ранкам Мікола спаў даўжэй звычайнага, а прачнуўшыся, працягнуў няскончаную размову.
— Гэта, дзеду, не ламачча, а каляровы мэтал. Мне за яго пяць тваіх пэнсіяў дадуць, — унук спружна пацягнуўся, вохнуў і пачухаў абедзьвюма рукамі свае пакусаныя камарамі і парэпаныя аб рачныя карчажыны ногі.

Словы такія пакрыўдзілі дзеда.
— Мне маёй пэнсіі хапае. І табе даю... на пляшку, — буркнуў стары, пайшоў да дзьвярэй і ўжо з парогу дадаў: — Тут, паблізу, гэтага мэталу цэлая тона ляжыць.
Сказаў гэта дзед не падумаўшы, а калі падумаў, унук ужо стаяў на ганку і чухаў голае чэрава.
— Ты што, сапраўды ведаеш, дзе медзь прыхавана?
Стары дастаў беламорыну, скамечыў набойніцу ў гармонік, потым выцягнуў запалкі, і ўнук, перахапіўшы пушку, паднёс запаленую сярнічку да дзедавага носу.
— У рацэ ляжыць, — выдыхнуў разам з папяросным дымам дзед Трахім, прысеў на край ганку і пасьля глыбокай зацяжкі, ад якой нават пацямнела ўваччу, распавёў унуку гісторыю

саракагадовай даўніны.
...Аднойчы, золкай восеньскай ноччу, Трахім пайшоў на раку ставіць донкі, і нечакана з прырэчных кустоў насустрач яму выйшаў міліцыянт у плашч-накідцы. Зыркнуўшы з-пад насунутага на вочы капюшону, міліцыянт загадаў тэрмінова пакінуць бераг, бо тут мусяць адбыцца вайсковыя вучэньні.
„Ці не пантонны мост наводзяць?“ — падумаў Трахім, адышоў мэтраў на дзьвесьце і залёг за купінай — вырашыў паглядзець, як там усё будзе. Ляжаў доўга, здранцьвеў увесь, хацеў быў ужо да хаты падацца, ды тут на бераг — з натужлівым выцьцём — выехаў самаскід і, даўшы задам, заехаў у ваду. Месца, куды заехаў самазвал, было адметным: там, непадалёку ад берага, круціў хлапякі белай пены глыбокі вір — у віры, адразу па вайне, знайшлі тапельца, а таму тутэйшыя рыбакі ніколі не закідвалі там вуды.
У цемры пачуліся галасы, мільганулі жарынкі цыгарак, самаскід загуў — цяпер ужо із страшнай натугай — і ў вір, узьняўшы нябачныя пырскі, бухнулася штосьці цёмнае і важкае.
Раніцою, як толькі разьвіднела, Трахім пабег на раку і нагнаў па дарозе Сяргейчыка — аднаногага інваліда, які таксама быў заўзятым рыбаком і хата якога стаяла на другім баку вуліцы.
— Чуў? — стоена вымавіў Сяргейчык, калі яны парукаліся.
Трахім таргануў галавой, і сусед, секануўшы паветра бамбукавым вудзільнам, прамармытаў:
— Сталіна скінулі.
— Як скінулі? Куды? — гукнуў быў Трахім, прыцішыў крок, а пачуўшы пра бюст, што стаяў у парку, шпарка пайшоў, падладжваючы крок да мернага рыпеньня Сяргейчыкавага пратэзу...

— І што... сапраўды з бронзы? — запытаўся ўнук, не даслухаўшы дзедавага аповеду.
— Ну так... жоўты такі стаяў, — дзед павёў рукамі, малюючы ў паветры відарыс сталінскага бюсту, і Мікола чародным разам пачухаў ніз жывата.
— Гіпс, відаць... Пафарбавалі пад бронзу.
— Ды не-э... Гіпс бы ў вадзе разваліўся, а ён цалюткі, — Трахім вытрымаў паўзу і з разважнасьцю патлумачыў: — У семдзесят другім годзе, як рака абмялела, макаўка паказалася. Мальцы яшчэ там ныpца давалі...

Стары ўздыхнуў, пацёр даланямі санлівыя вочы, а калі зноў зірнуў на сьвет, унук ужо бег са двара і на пытаньне: — Куды ты паляцеў? — коратка азваўся: — Да Гасюты!

II

Зялёная ад твані, спрэс залепленая куклянкамі камлыга не пасьпела як сьлед прасохнуць, як на яе ўзьбіўся гурт мясцовых падшыванцаў. Падшыванцы пры гэтым бязладна гарлалі, сьпіхвалі адно другога з бэтоннай камлыжыны, а неўзабаве й пачалі стукаць па ёй нечым жалезным.

— Во ёб... — вылаяўся Мікола, пачуўшы скрозь ранішні сон мэталёвае бразганьне. Сёрбнуўшы на хаду збружэлага квасу, ён выйшаў да весьніц.

— А ну, малеча, прэч адсюль! — пагрозьліва гукнуў Мікола, але голас пасьля купаньня дарэшты асіп, і падшыванцы працягвалі валтузіцца на помніку.

— Каму сказаў... — Мікола выдзер з паркану збуцьвелую штыкеціну, і гэта дапамагло: дзятва сыпанула ўбокі, але далёка не адбегла.

— А гэта што — помнік? — запытаўся адзін з падшыванцаў — малец грыз нясьпелы яблык і пры гэтым гучна чвякаў.

— Помнік... помнік, ёб вашу... — буркнуў Мікола, перакрывіўся і сплюнуў пракіслую сьліну.

Пасьля недасыпу і выпітай гарэлкі галава Міколава балела, настрой быў паганы, а таму зь языка зьляталі мацюгі. Аднак, абышоўшы помнік, Мікола пажвавеў і, маракуючы пра штосьці сваё, павадзіў рукамі ў паветры, нібыта ён — у думках — укараноўваў сьнежную бабу важкай галавою.

— Ну і што ты будзеш рабіць з гэтай халерай? — гукнуў, перабіваючы думкі, дзед Трахім: дзед стаяў ля весьніц і пыхкаў беламорынай.

— Як што? Адрэстаўруем. Выставім на продаж, — унук выцяў бэтоннага балвана мыском чаравіка. — Думаю, пару тысячаў баксаў возьмем.

— Эгэ-э, Міколка... Каму ён патрэбны? — стары папярхнуўся дымам, здушана закашляў. — Вунь і нос адбіты... і ў дзірах увесь...

— Кавэрны замажам, нос прылепім... пафарбуем. Карацей,

будзе правадыр, як навюткі... Ты вось што, дзеду... — унук азірнуўся, увабраў голаў у плечы, — трэба хлопцам... зь пільні... пару пляшак паставіць... Пазыч да вечара... Гасюта прыедзе — аддасьць.
Стары нічога не сказаў і толькі варухнуў пальцамі, рахуючы — колькі яшчэ дзён унук прабудзе на пагасьцінах.

Па абедзе Трахім прылёг на тапчан, адразу ж заснуў і неўзабаве быў абуджаны лескатаньнем Гасютавага трактару. Трактар ехаў па вуліцы, і ззаду за ім, уздымаючы пылюку, валачылася на тросе таўшчэзная калода.
— Божухна, і калі гэта ўсё скончыцца? — прашаптаў стары і з вохканьнем выйшаў на ганак.
Ля Трахімавай хаты тым часам ужо зьбіраўся народ.
— Чаго вылупіліся? — гыркаў Гасюта на цётак, што йшлі да крамы, ды спыніліся паглядзець — што мальцы будуць рабіць з цурбаном ды бэтоннай камлыгай. Цёткі паправілі хусткі на галовах, стоена зашапталіся, а Гасюта падхапіў з-пад плоту даўгую жардзіну, загнаў тонкі канец пад цурбан, і яны ўдвох зь Міколам пакацілі яловы кругляк да весьніц. Усё было б нішто, ды надарылася неспадзеўка: жардзіна з трэскам абламілася, стукнула Міколу па карку, і кампаньён, пачуўшы сьмех грамады, ад злосьці выдыхнуў:
— Г'анд-доны...
Працаваць у атачэньні натоўпу не выпадала, а таму, падкаціўшы калоду да весьніц, Гасюта абабіў перапэцканыя ў яловую жывіцу рукі і голасна, каб чула грамада, абвясьціў:
— На сёньня ўсё!
„І тузанулі ж мяне за язык, — падумаў Трахім, правёўшы даланёй па няголеным падбародзьдзі, — ляжаў бы сабе на дне, пакуль не рассыпаўся, дык не... выцягнулі нячысьціка...“ — стары уздыхнуў, падаўся ў хату, і сьледам за ім, заглушыўшы трактар і абмацюкаўшы грамаду, рушылі Мікола з Гасютам.
— Ну што за людзі! Гэтулькі зьбеглася, нібыта ніхто калоды ня бачыў... — ад парога гукнуў знэрваваны ўнук, а дзед, пазяхнуўшы ў далонь, лёг на тапчан і змучана аддзьмуўся.
На кухні рыпнула падлога, і Гасюта — з воклічам „Обана!“ — грукнуў аб стол чымсьці цьвярдым.
— Вось гэта лоўка! — акрыялым голасам азваўся Мікола.
— Хопіць ім і адной... Летась пілавіньне грузіў — ні хера не

паставілі... — растлумачыў Гасюта, а Мікола ўдарыў у ладкі і кінуўся ў прысенак, дзе стаяла газавая пліта.
— Зараз, бляха, яечню згламэздаем.
Пакуль Мікола завіхаўся з патэльняй, Гасюта, падобна, адкаркоўваў пляшку, потым бразнуў шклянкамі і нягучна прамовіў:
— Увечары яму выкапаеш... Сантымэтраў на семдзесят, глыбей ня трэба. Заўтра ад ранку калоду паставім, а ў абед Сівоха кран падгоніць.
У шклянцы зацурчэла гарэлка, і пад гэтыя чароўныя гукі Трахім заплюшчыў павекі.

На наступны дзень, ад самага ранку, ува ўтульнай Трахімавай хаце грукалі дзьверы, бразгалі шклянкі і лілася п'яная гамонка. Першымі завіталі два хлопцы зь піларамы, і Мікола пабег да тутэйшых цыганоў па самагонку. Бліжэй да абеду ў хату ўваліліся Гасюта з вадзілам аўтакрану, усе разам дапілі цыганскую акавіту і, трымаючы пад пахі аднаго зь пільшчыкаў, пайшлі ўздымаць правадыра на „п'едэстал".
Дзед Трахім зроду не хрысьціўся, а тут, пабачыўшы, як п'яны ўнук убіўся пад бэтонную камлыгу, што завісла, як той вісельнік, у паветры, тыцнуў самлелымі пальцамі ў лоб, жывот і ў левае плячо. Схоплены за шыю сталёвай зашмаргай, правадыр крутнуўся спачатку ў адзін бок, потым у другі, нарэшце спыніўся, Мікола абхапіў правадыра цыбатымі рукамі, і той паволі асунуўся на калоду.
Хвілін празь дзесяць, пабачыўшы ў дзьвярах унука — цэлага і жывога — стары яшчэ раз перахрысьціўся і, без шкадаваньня, аддаў Міколу сто тысяч адной паперкай — апошнія грошы, якія былі ў хаце.
Вечарам у хату завітаў яшчэ адзін госьць — Данік Крываблоцкі. Данік той, немалады ўжо, сівагаловы мужчына, працаваў у цэху шырспажыву. Вырабляў помнікі з мармуровай крошкі, ляпіў барэльефы памерлых пэрсанальных пэнсіянэраў і, вядома ж, убачыўшы бюст з адбітым носам, тут жа зайшоў у хату, каб прапанаваць свае паслугі.
... За вокнамі ўжо сьвятлела, а на кухні ўсё яшчэ гаманілі і здушана мацюкаліся.
— Калян... ты хоць ведаеш... з кім маеш справу? — п'яным

голасам пытаўся Данік Крываблоцкі і, пасьля страшна працяглай паўзы, адказваў: — Ты маеш справу з прафэсійным скульптарам.
Калян доўга і неразборліва мыкаў, потым чхнуў — ды так гучна, што абудзіў Гасюту; Гасюта, у сваю чаргу, таксама мыкнуў, але тут жа суняўся, і на кухні чарговым разам бразнулі шклянкі.
— У Гасюты.. і галава не трымаецца... на стол падае, — прабубнеў Крываблоцкі і зычнейшым голасам працягваў: — Карабейнікаву помнік бачыў?.. За дзень зьляпіў... Зяць Карабейнікаў прыехаў, паглядзеў — даў стольнік і яшчэ пяць „зялёных“ наверх... Кажа: — Кідай усё, прыяжджай да нас у Піцер — табе цаны ня будзе... — на кухні зацурчэла гарэлка, і Мікола, расьцягваючы зыкі, прасіпеў: — А но-ос?
— Алебастравы прыляплю... Будзе лепшы за твой... — выгукнуў Крываблоцкі, хлопцы стукнуліся, і ў гэты момант штосьці масыўнае і важкае абрынулася на падлогу.
Дзед Трахім адсунуў фіранку. На падлозе, нязграбна раскінуўшы рукі, ляжаў упіты Гасюта.
— Каб вас парвала ад той гарэлкі, — азваўся стары і з вохканьнем кульнуўся на левую бачыну.

Пад самую раніцу хата напоўнілася нялюдзкім храпам. У сенцах, падклаўшы пад голаў палена, хроп Гасюта, а ў сьвятліцы дзерлі тхара Мікола з Крываблоцкім. Данік зь Міколам спалі ніжнікам, пры гэтым дзедаў унук часьцяком падбрыкваў правай нагой, біў Крываблоцкаму пяткай у лоб; скульптар на кароткі міг аціхаў, мыляў вуснамі і пачынаў храпці зь яшчэ большай сілай. І вось, калі Данік схрапянуў ужо зусім ашалела, і дзед Трахім панурыў руку пад тапчан, шукаючы — чым кінуць у храпуна, на падворку пачуліся крокі, і нехта дробна пастукаў у шыбу.
— Ці ў вас мой апівуда? — крыкнула Гасютава жонка, і ад таго крыку забрахаў суседзкі сабака, а Данік з унукам перасталі храпці і зморана застагналі.
Падняла мужа Гасюціха даволі хутка: плюснула зь вядра халоднай вады, а потым, мацюкнуўшыся, агрэла небараку паленам. Удар атрымаўся глухім, але трапным. Дзед Трахім, лежачы за фіранкай, уражана залыпаў вачыма, а Данік зь Міколам стаілі дых і з жаласьлівым гукам выпусьцілі паветра.

Гасючысіны праклёны заціхлі на другім канцы вуліцы, навакольныя сабакі збрахаліся да сіпу, залезьлі ў будкі, і змучаную дзедаву душу падхапіў і панёс па сваіх цёмных лябірынтах доўгачаканы, а таму чуйны і замарачны сон. Прысьніў дзед паховіны Сталіна. Спачатку ў сьвядомасьці нарадзіліся зыкі: гуд золкага ветру ў разьбітых вокнах дэпо, лясканьне жалобных сьцягоў над галавою, галасісты, з засопленым прыдыханьнем, плач начальніцкай жонкі. Трахім страсянуў ува сьне галавою і тут жа ўбачыў стрыжаныя патыліцы, чорную зеўру гучнагаварыльніка і заплаканую начальніцкую жонку.
— Міканор... як жа мы цяпер... безь яго?.. — здушана галасіла кабеціна, уткнуўшыся лобам у пагон мужавага шыняля.
— Капа, нам усім цяжка... — мармытаў начальнік дэпо, неадрыўна пазіраючы ўгору — туды, дзе завіхаліся ўвішныя вераб'і і дзе вісеў бляшаны рупар гучнагаварыльніка.
Трахім аглядзеў краем вока натоўп і зьнерухомеў ад нечаканасьці. Праваруч, у атачэньні паравозьнікаў, стаялі Мікола з Гасютам. Абодва былі на ладным падпітку, абое смалілі папяросы і задаволена пасьміхаліся, падставіўшы золкаму ветру свае — Мікола малочна-белыя, а Гасюта пракурана-пажоўклыя — зубы.
„Божухна, забяруць!“ — мільганула падспудная думка, і ў гэты момант бляшаны рупар крактануў, вераб'і разам узьняліся ў паветра, і навакольле напоўніў хрыпучы левітанаўскі голас:
— Пайшоў з жыцьця прадаўжальнік вялікай справы Леніна, друг і настаўнік працоўных усяго сьвету... — Левітан зрабіў паўзу, за сьпінай — раней часу — загуў ды асекся паравозны гудок, і чыйсьці знаёмы голас пакутліва выдыхнуў: — Фу, блядзь, як цяжка...
Стары разьмежыў павекі. Уваччу паплыла, а потым замёрла на месцы квяцістая фіранка.
— Ой, блядзь, як цяжка! — застагнаў Данік Крываблоцкі, і Трахім адхінуў фіранку.
Гадзіньнік на кухні паказваў палову на дзясятую.
— Паміраю... сэрца спыняецца... — чародным разам выдыхнуў Данік і з вохканьнем скінуў на падлогу нягнуткія ногі.
Сэрца ў Крываблоцкага, відаць, і сапраўды спынялася, бо Данік быў белым як палатно, а ніжняя сківіца безупынку калацілася.
„Каб жа не памёр, халера на яго“, — падумаў стары і,

апанаваны трывожнымі думкамі, палез пад тапчан, дзе яшчэ з пазалеташніх Калядаў была прыхаваная пляшка „чарніла“.
...Данік піў „Водар мяты“ нагбом, з рыльца, а выпіўшы паўбутэлькі, задаволена адрыгнуў і гукнуў праз плячук: — Гасюта!
— Сышоў... яшчэ зранку, — гукнуў дзед Трахім і, сьцішыўшы голас, дадаў: — П'юць, пакуль на падлогу ня зваляцца.

III

Дзесьці праз гадзіну, а мо й раней Данік ізноў уваліўся ў хату.
— Дай... — неакрэсьлена выдыхнуў госьць, зь нецярплівасьцю страсянуўшы рукамі.
— Чаго табе даць? — не зразумеў Трахім.
— Ну гэты, як яго?.. — Крываблоцкі скрывіў гімору, крутнуў пальцамі — гэткім рухам звычайна ўкручваюць лямпачкі — і з шумам увабраў паветра, згадваючы — як называецца тое, што яму трэба. — Ну гэты... во, — госьць тыцнуў пальцам у кут, і дзед Трахім уражана крутнуў галавою.
— Табурэт табе трэба, ці што?
— А во-во... табурэт, — прасьвятлеў з твару Крываблоцкі.
Данік падхапіў табурэтку, зірнуў на Міколу, які й дагэтуль ляжаў на канапе, пакутуючы з пахмельля, і выкуліўся з хаты.
— Зусім мазгі прапіў, — уздыхнуў стары. Ня ведаючы — чым заняць рукі, Трахім спачатку схапіўся за дзяркач, потым запіхнуў у торбу пустыя бутэлькі, нарэшце, адчыніў акно і ўпусьціў у пракураную хату сьвежага паветра.
На двары цвыркалі вераб'і, на суседняй вуліцы гарлалі пеўні, непадалёку ляскатаў трактар — няйначай, Гасютаў, — і да ўсіх гэтых суладных зыкаў далучалася звонкае і разам з тым непрыемнае шаргаценьне. Гэта Данік, узьбіўшыся на табурэт, раскеўзваў кельняй па камлызе нейкую шэрую гліну.
„І што з усяго гэтага будзе?“ — падумаў Трахім, вынес у сенцы торбу з бутэлькамі, а калі ізноў зірнуў у вакно, дык убачыў нейкага дарэшты апухлага мальца, які стаяў за Данікавай сьпінай і паціраў даланёю пляшывую макаўку.
— Хто гэта цябе так? — запытаўся Крываблоцкі, і стары пазнаў у апухлым мальцы свайго суседа Гасюту.
— Ваўчыца... хто ж яшчэ... — Гасюта ўздыхнуў, зацкавана

паглядзеў на камлыгу: — Алебастрам мажаш, ці як?
— Алебастрам, — незадаволена выгукнуў Крываблоцкі, а замазаўшы чарговую дзірку, прамармытаў: — Ідзі... пакінулі там табе... на апахмелку.
Стары адышоў ад акна, пазяхнуў наастачу і падаўся на тапчан.
— Калян! Ты там жывы? — грымнуў праз пару хвілін сіпаты Гасютаў голас, але стары не пачуў тых слоў — ён салодка спаў, і квацістая фіранка ледзь прыкметна варушылася ў такт ягонаму дыханьню.

У суботу дзед Трахім напаліў лазьню. Мыўся цэлыя дзьве гадзіны, да змору схвастаў сябе дубовым венікам і, відаць, схвастаў бы да сьмерці, калі б у прымыльніку не загрукацеў вёдрамі ўнук Мікола.
— Увесь дух выпусьціў, — крыкнуў унук, расчыніўшы дзьверы, шухнуў вады на камні і тут жа, сеўшы на палок, стаў шараваць кавалкам пэмзы свае перапэцканыя белай хварбай далоні.
... З лазьні дзед выкуліўся на ватных нагах і, перш чым ісьці да хаты, доўга зьбіраўся зь сіламі, трымаючыся за дзьвярны вушак. Сэрца парывіста тахкала, вушы поўніліся звонам, а ў нос лез нейкі незнаёмы пах, які нагадваў водар чаромхі. Ён, гэты пах, хаця й ня быў ачомна-рэзкім, але вярнуў да жыцьця. Трахім удыхнуў праз нос п'янкога паветра, і ў той жа міг галава прасьвятлела, звон увушшу суціх і зьнямелыя ногі наліліся гарачай крывёю.
Пакуль ішоў гародам, увесь час маракаваў: чым гэта пахне? — і ўжо ля самай хаты, згадаўшы перапэцканыя Міколавы рукі, задыхана прашаптаў: — Хварбай засьмярдзела.

Толькі што сэрца хваравіта замірала і гатовае было спыніцца, а тут ёкнула і ўпуджанай птушкай забілася ў грудзіне. Стары ўбачыў СТАЛІНА!
У першае імгненьне нават здалося, што правадыр жывы — стаіць, бялюсенькі, краем вока зазіраючы ў ягоны, Трахімавы, агарод. Трахім і так быў мокры пасьля лазьні, а тут увесь твар заліла потам. Стары падхапіў дрыжачай рукой прыпол кашулі, хацеў выцерці твар, ды пачуў раптам ломкі хлапечы голас:
— Дзядуля, а хто гэта такі?
Падшыванцы, як заўсёды, сядзелі на плоце і хрумкалі недасьпелыя яблыкі.

— Гэта, мальцы, Сталін! — крэкнуў Трахім, выціраючы мокры лоб.
— А хто ён такі? — падаў голас усё той жа сьветлавалосы малец.
Трахім уважліва паглядзеў на падшыванца: ці не пасьмейваецца пракуда з старога чалавека? Але вочы хлапечыя сьвяціліся непадкупнай цікавасьцю, і стары кашлянуў у далонь.
— Ну, гэта... — сказаўшы так, Трахім задумаўся, засяроджана пачухаў гарляк: — Ну, карацей, яго ўсе баяліся. Пры ім парадак быў — о-го-го! У нас у дэпо адзін на працу спазьніўся, дык два гады далі... з правам перапіскі.
— А вы, дзядуля, таксама Сталіна баяліся?
— Анягож... і я баяўся.
— А ён кім быў? Тэрмінатарам? — русявы падшыванец з такой асалодай куснуў яблык, што нават сок пацёк па падбародзьдзі.
— Цябе як завуць? — запытаўся Трахім, неадрыўна казелячы вокам то на падшыванца, то на бацьку-Сталіна.
— Пецькам, — адказаў падшыванец і зь невядомай прычыны пакутліва ўздыхнуў.
„І чым толькі ў іх галовы забітыя?“ — падумаў дзед Трахім, патупаў да хаты і, пакуль дайшоў да ганка, тры разы азірнуўся, каб паглядзець на правадыра.

Увесь вечар ля бюсту тоўпіліся людзі.
„Як жывы, як жывы...“ — наўзахваткі шапталі старыя цёткі, і ўнук Мікола, слухаючы праз адчыненае акно людзкую гаману, задаволена паціраў рукі і раз-пораз гукаў:
— Чуеш, дзеду?! Здаю бюст за пяць тысяч баксаў! І ні цэнту меней...
— Эгэ-э... Міколка... Каму ён патрэбны? — азываўся з тапчана стары Трахім, — у людзей грошай на хлеб не стае, а яны табе будуць нейкія бюсты купляць.
— Гэта ў цябе не хапае, а ў „крутых“ грошай як гразі... — Мікола ўкінуў у рот цыгарэціну, пстрыкнуў запальнічкай. Нападворку хтосьці зусім па-дурному загарлаў:

— Сталин наша слава боевая-а...
Сталин нашей юности полё-от...
Трахім падхапіўся зь ляжанкі, на дзіва борзда падбег да акна і

незадаволена вылаяўся: на падворку, узяўшы пад руку Юстына Капітонавіча Дуба — былога ваенкома — стаяла і гарлала на ўсе застаўкі Аўгіньня Міканораўна Кароткая — актывістка раённага савету вэтэранаў вайны.
— Прынёс нячысьцік, — буркнуў Трахім і, прычакаўшы, калі Аўгіньня прасьпявае апошні радок: — *Наш народ за Сталиным идио-от!* — зачыніў акно адразу на дзьве просвы.
Аўгіньня Кароткая падчас вайны мыла нагавіцы партызанскаму камандзіру, а цяпер, начапіўшы мэдальку, цягалася па горадзе і, сустрэўшы Траха́іма, кожны раз апавядала — як яны адбіваліся ад карнікаў, як яе ледзь не забіла асколкам гранаты, і, уздыхнуўшы, абавязкова прамаўляла: — Вам хоць добра было, вы ў тыле сядзелі.
— Пасядзела б ты, корга лупатая, у тыле... пад нямецкімі бомбамі, — суцішна казаў усьлед актывістцы Трахім і доўга потым хадзіў не ў гуморы.
...Дзьве галавы — сівая ваенкомаўская ды чарнявая Аўгіньніна — праплылі міма вокнаў, і Трахім, пятым разам згадаўшы нячысьціка, патупаў да дзьвярэй.
Ён сустрэў гасьцей на ганку. Выставіў чэрава, абапёрся рукой на вушак і тым самым даў зразумець, што ў хату нікога не запрашае.
— Ну, Трафім Пятровіч, ня ведаю — як табе і дзячыць! — прамовіў былы ваенком, ціснучы Трахімаву руку. — Гэта, скажу табе, вялікі патрыятычны ўчынак.
— Я нават прасьлязілася, як Іосіфа Вісарыёнавіча пабачыла, — уставіла слова Аўгіньня Кароткая, плаксіва шморгнула носам і палезла ў кішэнь па насоўку.
— Сёньня ж патэлефаную ў цэка партыі і пашлю ліста Генадзю Андрэевічу Зюганаву. Пра такую падзею павінен ведаць увесь сьвет, — Юстын Капітонавіч кашлянуў у жменю, крыху суцішыў голас. — Вось толькі месца для помніка няўдалае. Трэба яго ў цэнтар перанесьці — туды, дзе стаяў...
— Каб дзятва нос адбіла? — весела крыкнуў з кухні Мікола.
Юстына Капітонавіча такая заўвага прыкметна азадачыла. Ён ускудлаціў сівыя валасы на патыліцы, з разважнасьцю ў голасе прамармытаў: — У Савеце паставім. А там пабачым.
— Мы, як яго выцягвалі, дзесяць літраў саляркі спалілі, дзьве бляшанкі нітрафарбы скарысталі і скульптару за працу трыццаць даляраў заплацілі. Так што задарма не аддамо, —

крыкнуў Мікола, і госьць, выцягнуўшы шыю, запытаўся: — Дык колькі вы хочаце?
— Дзьве скрыні гарэлкі! — гракнуў Мікола.
Госьць пасьля такіх слоў нават хітнуўся — задужа высокай падалася цана. Цётка Аўгіньня падхапіла яго пад руку, павяла да весьніц і на разьвітаньне гукнула праз плячо:
— Мы ў Савеце падумаем.
— Падумайце... добра падумайце... — прасіпеў усьлед гасьцям Трахім і з грукатам — аж парахня пасыпалася са столі — зачыніў дзьверы.
— Дык што ж ты... То пяць тысяч хацеў, то на дзьве скрыні пагадзіўся, — прамовіў Трахім, забіраючыся на тапчан.
— Ды пажартаваў я... — адказаў унук, стамлёна зяхнуўшы ў далонь, — у гэтых сталінскіх пацукоў грошай і на скрыню ня знойдзецца.
Мікола пстрыкнуў выключальнікам і потым доўга мармытаў у цемры, услых прыкідваючы — колькі „бабак“ застанецца ў яго, колькі ў Гасюты, і колькі давядзецца „кінуць“ дзеду.

IV

Наступнага дня, ад самай раніцы, пачаў сеяць дакучлівы дождж. Трахім, запаліўшы ў печы, салодка пазяхнуў, зь ціхай радасьцю падумаў, што гасьцей такім часам ня будзе, і тут жа ўгледзеў, як у змакрэлым акне мільгануў пакамечаны капялюш. Яшчэ за імгненьне ў прысенку гучна затупалі, і на парозе паўстаў карэспандэнт раённай газэты Аркадзь Нічыпарук. Карэспандэнт зьняў капялюш, страсянуў, зьбіваючы дажджавыя кроплі, і мутнаватымі, яшчэ дарэшты не працьверазелымі вачыма агледзеў хату.
Аркашка Нічыпарук даводзіўся Трахіму сваяком: быў жанаты зь дзедавай пляменьніцай, і хаця пасьля таго зьмяніў яшчэ дзьвюх жонак, сваяцкіх сувязяў не цураўся — зрэдзьчасу забягаў у хату, куляў чарку і раз на год — звычайна на Вялікдзень — прывозіў на рэдакцыйным „Масквічы“ мех крадзенага камбікорму.
Кіўнуўшы сваяку, Аркашка зазірнуў у сьвятліцу, а ўбачыўшы брудныя Міколавы пяткі, што тырчэлі з-пад коўдры, гучна скамандаваў:
— Гвардыя, падйо-ом!

— Інтэрвію прыйшоў узяць, — патлумачыў Аркашка, выцягваючы з нутраной кішэні плашчу пляшку „чарніла“ і зашмальцаваны блякнот.
Хвілін праз пяць, глынуўшы віна, Нічыпарук стаў распытваць Міколу — зь якіх віроў быў выцягнуты сталінскі бюст — а дзед Трахім, якому да млосьці абрыдлі п’янкі, ціхенька высьлізнуў з хаты. Стары сеў на ганку і стаў слухаць — як ціўкаюць з капяжу рэдкія кроплі, як квохча ў хляве, наракаючы на дождж, стары певень і як на кухні, наракаючы на зладзюгу-рэдактара, бубніць Аркашка Нічыпарук:
— Немагчыма стала працаваць — рэжа ўсё пад корань. Пры камуністах і тое лягчэй было...
Пазяхнуўшы, стары налёг сьпінаю на дзьверы, заплюшчыў вочы, і калі — за паўгадзіны — сваяк выходзіў з хаты, кульнуўся таму пад ногі. Сваяк ад начаканасьці падскочыў, выпусьціў з роту папяросіну і, дапамагаючы Трахіму падняцца, прамармытаў:
— Ну, Пятровіч, у цябе і жарцікі...
Потым карэспандэнт доўга шнарыў рукой па падлозе, шукаючы згубленую папяросіну, нарэшце знайшоў, прыпаліў ад падстаўленай Міколам запальнічкі:
— Карацей, даю два матар’ялы — адзін у сваю газэту, другі ў „Праўду“. У Маскве такія рэчы любяць.
— І аб’яву... — нясьмела заўважыў Мікола.
— За аб’яву не хвалюйся. Сёньня ж патэлефаную Хаміцкаму. Надрукуюць у лепшым камэрцыйным выданьні. Як там напісаць? „Прадаецца бацька-Сталін“?
Сваяк зь Міколам яшчэ трохі пагаманілі — Мікола ўсё бедаваў, што помнік надта цяжкі і гэта можа адпудзіць пакупнікоў, — дзед Трахім той парой прыбраў на стале, сасмажыў яечню і з палёгкай уздыхнуў, калі пакамечаны капялюш таргатліва паплыў міма вокнаў. Ля весьніц, аднак, капялюш крутнуўся вакол сваёй восі, і Аркашка, увабраўшы голаў у плечы, пабег у адваротным накірунку.
„Ці не ў прыбіральню пабег?“ — падумалася Трахіму; у гэты момант да помніка падкаціла шэрая „Волга“, і зь яе нутра вылез, цяжка аддзімаючыся, старшыня райвыканкаму Ганчарук і яшчэ нейкі вайсковай выпраўкі чалавек, на носе якога віселі акуляры. Агледзеўшы помнік, Ганчарук пачухаў патыліцу, сказаў штосьці напарніку, тыцнуўшы пры гэтым пальцам угору,

і сьпехам падаўся да машыны.

Наступныя два дні выдаліся спакойнымі: у хату ніхто не завітваў, да весьніц ніхто не пад'яжджаў, і ўзрадаваныя дзедавы куры ізноў пачалі поркацца ў зямлі на сваім улюбёным месцы — пад помнікам правадыру. Але на трэці дзень да хаты пад'ехаў даўжэзны белы фургон, зь яго выскачылі маладыя хлопцы ў рознакаляровых кепурках; хлопцы тут жа пачалі раскручваць нейкія шнуры, і ўнук Мікола, зірнуўшы ў вакно, каротка патлумачыў:
— Тэлебачаньне.
І дзед, і ўнук зьлёгку захвалявaліся — а раптам паклічуць штосьці сказаць у камэру. Але хваляваньне было дарэмным. У хату ніхто не заходзіў, а неўзабаве да весьніц падруліў „казялок", у запыленай шыбе якога мільгануў азызлы твар Юстына Капітонавіча Дуба.
— А гэты чаго тут? — уразіўся дзед Трахім.
— Эх, дзядуля... На тэлебачаньні слова даюць толькі надзейным людзям, — з уздыхам прамовіў Мікола. Унук адсунуў непадатныя просвы, разнасьцежыў акно. — Пазнаеш, дзед, вунь тую стрыжаную сучку? „Панараму" вядзе.
Кабеціна, пра якую казаў Мікола, падвяла былога ваенкома да помніка, махнула нейкаму хлопцу і лагодным голасам прасьпявала:
— Вы, Юстын Капітонавіч, толькі не хвалюйцеся. І глядзіце не на мяне, а ў аб'ектыў тэлекамэры.
Кабета зноўку махнула рукой, састроіла лагодную ўсьмешку, натхнёна загаварыла ў мікрафон на чысьцюткай беларускай мове:
— Гісторыя не бывае добрай ці дрэннай. Гісторыя такая, якая яна ёсьць — зь яе ўзьлётамі і падзеньнямі, радасьцямі і трагедыямі. І як бы ні сілілася сёньняшняя карумпаваная апазыцыя даказаць адваротнае, гісторыя нашага народу заўсёды з намі, яна вяртаецца да нас, і яскравы таму прыклад — вось гэты помнік, які стаіць за маёю сьпінаю. Імя Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна і дагэтуль выклікае шмат спрэчак.. Але спытаем — як ставяцца да гэтага імя тыя, хто праліваў кроў на франтах Вялікай Айчыннай вайны, хто з імем Сталіна на вуснах ішоў у сьмяротны бой...
— У які бой!? — вырвалася з Трахімавай грудзіны. — Знайшлі

ваяку... у сорак шостым румынаў вартаваў, а потым нагавіцы ў ваенкамаце праседжваў, — Трахім сказаў яшчэ пару слоў на адрас Дуба, а ўнук, з адчаем зірнуўшы на сонца, чхнуў, ды так гучна, што кабеціна азірнулася і ўжо на чыстай расейшчыне гукнула хлопцу з тэлекамэрай:
— *Лёша, давай сначала...*

Рэшту дня — аж да самага вечару — Трахім праседзеў у Сяргейчыка — аднаногага інваліда, які жыў па суседзтву. Сяргейчык з-за хваробы ўжо год як не выходзіў з хаты, а таму страшна ўзрадаваўся, пабачыўшы суседа. З гэткай нагоды інвалід нават дастаў пляшку самаробнай наліўкі, і хаця Трахім быў чалавекам непітушчым, але гэтым разам прапусьціў чарку. Балазе і нагода была адпаведная: у гэты дзень, пяцьдзясят пяць гадоў таму, Сяргейчык застаўся без нагі.
— Ляжалі ў кукурузе, а тут ён як джвагне зь мінамёту, дык мяне нават з акопу выкінула, — слухаў Трахім суседаў аповед і з уздыхам прыгадваў, як і яго аднойчы, падчас бамбёжкі, выкінула з паравозу. І ўваччу на кароткае імгненьне паўстаў разьвернуты бомбаю тэндэр, ахопленыя полымем цяплушкі санітарнага цягніка і перакошаная шыльда з надпісам „Вязьма“ на будынку вакзалу. Трахім спахмурнеў, кульнуў чарку, закашляўся — наліўка патрапіла ў нос — і Сяргейчык задаволена паляпаў яго па сьпіне.
Калі стары вярнуўся дахаты, тэлевізійнікаў пад вокнамі ўжо не было, затое ўпоперак вуліцы — адзнака таго, што кіроўца быў не ў гуморы — стаяў Гасютаў „Беларус“.
Зрэшты, не ў гуморы быў і ўнук Мікола: з адчыненай форткі вырываўся на прасьцяг ягоны гарачлівы голас:
— Цэлы месяц важдаліся... і дасталі... высьпятка пад зад...
Адчыніўшы дзьверы і пабачыўшы прымлелы Міколаў твар і панылага Гасюту, стары зразумеў: нешта здарылася.
— А можа дадуць якую кампэнсацыю? — нясьмела перапытаў Гасюта: трактарыст сядзеў за кухонным сталом, утаропіўшы вочы ў нейкую паперчыну.
— Як жа... дадуць! Дручком спаміж вушэй, — азваўся са сьвятліцы ўнук і брыдка вылаяўся.
Трахім моўчкі кіўнуў Гасюту, і той, у сваю чаргу, кіўнуў на паперчыну, што трымаў у руках.
— Во... прыслалі заказным лістом... „Бюст І. В. Сталіна работы

скульптара Леапольда Кангалевіча зьяўляецца ўласнасьцю дзяржавы і мусіць быць перададзены ў фонд Дзяржаўнага мастацкага музэю...“
— Не, ну якія казлы... Сорак гадоў у рацэ адваляўся... — выгукнуў Мікола, але фразы ня скончыў — выбег на кухню і зацкавана прамармытаў:
— Пітонавіч...
— Што — Пітонавіч? — не зразумеў Гасюта.
— Што-што... Сплавім вэтэранам за дзьве скрыні гарэлкі, а там хай разьбіраюцца — чыя гэта ўласнасьць.
Яшчэ імгненьне — і Гасюта зь Міколам, нібыта падхопленыя віхурай, кінуліся да дзьвярэй і, піхаючы адно другога, вылецелі на падворак.

V

І вось ён, насьпеў той хвалюючы момант, калі Мікола ўнёс у хату скрыню гарэлкі, паставіў яе на табурэт і з удумлівай разважнасьцю аддзьмуўся. Сьледам за ім, цягнучы другую скрыню, увайшоў Гасюта, а за хвілю — з трыма пляшкамі мінэральнай вады пад пахамі — зь цёмнага прысенку выплыў Данік Крываблоцкі.
— Карацей, тры дні да яго зь Міколам хадзілі — грошай так і ня выбілі, — прамаўляў, зьвяртаючыся да Крываблоцкага, Гасюта. — А сёньня, бляха, заходжу з кувалдай у руках. Пітонавіч тут і ўсхваляваўся. „Прыяжджай па абедзе, — кажа, — атрымаеш грошы пад расьпіску“.
— А што, бюст ужо ўцягнулі? — запытаўся Данік дрыжачым ад захапленьня голасам.
— Мальцы зь пільні на кругляках укацілі. Цяпер вось будуць падымаць неяк. Трыма дамкратамі.
— Дарма пупы рвуць, — уключыўся ў размову Мікола, — у Пітонавіча грошай больш няма ні капейкі, — Мікола задаволена крэкнуў і, нібыта той цыркач, падкінуў на далоні пляшку гарэлкі.
Дзед Трахім выйшаў з хаты, падышоў да весьніц, і, аблашчыўшы поглядам кола сьвежай зямлі — месца, дзе стаяў правадыр, зморана перавёў дых. Стары мерыўся пайсьці да Сяргейчыка — трэба ж было недзе пераседзець п’янку, ды яшчэ хацеў пазычыць грошай, бо не было за што купіць ні хлеба, ні

папяросаў — але ногі зусім ня йшлі, і Трахім прысеў на лаўку. Ён доўга сядзеў з заплюшчанымі вачыма і слухаў няўцямную гаману, якая лілася з адчыненых вокнаў хаты. Час ад часу гамонка перарывалася бразгатам шклянак, задаволенай керханінай, Данік Крываблоцкі раз за разам спрабаваў зацягнуць нейкую песьню, нарэшце зацягнуў — ды так гучна, што на двары аж заенчыў певень, але неўзабаве нечакана аціх. Трахім разьмежыў вочы і ўбачыў русявага Пецьку. Падшыванец ішоў па вуліцы і надрыўна плакаў.
— Гэй, пакрыўдзіў хто? — крыкнуў дзед Трахім, але падшыванец не азваўся.
— Пакрыўдзіў хто? — давялося паўтарыць старому, і Пецька скрозь сьлёзы праенчыў:
— Татку... прыціснула... у больніцу адвезьлі.
— Як прыціснула?! Чым?! — выдыхнуў Трахім, паспрабаваў устаць, але тут жа ізноў плюхнуўся на лаўку.
— Бацька твой на пільні робіць? — гукнуў ён усьлед падшыванцу, але той не адказаў — пайшоў, пацепваючы ад плачу худымі плечукамі.
„Божухна, усё з-за мяне“, — бязгучна прашаптаў Трахім. Галава закружылася, твар апаліла задушлівая гарачыня. Полымя вырывалася з паравознай топкі і краналася русявых валасоў качагара. Пецька ляжаў на сьпіне, і зыркія вогнікі замарачна мітусіліся ў шырока расплюшчаных вачах.
— Пеця, ты што?! — гукнуў ён, не пазнаўшы ўласнага голасу. Ён адцягнуў качагара ад топкі, павіс на парэнчах, зьбіраючыся клікнуць санітара, ды ня клікнуў, бо з вышыні, са страшным гудам, на яго падаў нямецкі самалёт. Ад самалётнага чэрава адарвалася штосьці прадаўгаватае, і ў апошняе імгненьне перад выбухам ён убачыў за самалётным штурвалам бэтонную галаву бацькі-Сталіна.
Трахіму часьцяком мроілася тая страшная бамбёжка, мроілася ахопленая полымем станцыя Вязьма, да вушэй даляталі крыкі раненых, і нос казытаў саладжавы пах паленага людзкога мяса, і ў сьвядомасьці кожнага разу мільгацеў невыразны твар нямецкага лётчыка, якога ён угледзеў за імгненьне да выбуху. І вось, нарэшце, ён убачыў — хто кінуў бомбу.
З вохканьнем Трахім узьняўся на ватных нагах, пайшоў, хістаючыся, да Гасютавага трактара, зь цяжкасьцю расчыніў непадатныя дзьверцы. Млявая рука пашнарыла пад сядзеньнем,

намацала ліпучае дзяржальна кувалды. З апошніх сіл Трахім узваліў кувалду на плячук, стоена прашаптаў: — Толькі б дайсьці! — і рушыў па дарозе, у канцы якой — за дваццаць крокаў ад трактара — яго чакалі боская цішыня і вечны спакой душы.

Здаецца, помнік некуды забралі.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **26-01-2001**
[image]

ЯнКакупала
Сага пра „Пагоню“

- беларускі пісьменьнік з гомельска-аршанскага рэгіёну. У „ARCHE-Неамадэрнізм" быў надрукаваны яго аповед „Сага пра Чэлменкаў".

Два з паловай тысячагоддзі таму горны рэгіён Македоніі быў заселены каржакаватымі нашчадкамі колісь магутных кельтаў ды хударлявымі даўгалыгімі прыхаднямі з Эгейскага ўзбярэжжа і Адрыятыкі. Тут існавала мноства малых дзяржаваў, што часам складаліся з аднаго-двух селішчаў (не заўжды буйных) і больш ці менш урадлівай зямлі ў іх ваколіцах, за валоданне якой амаль штогод выбухалі войны.

У адзін з такіх гарадоў-дзяржаваў — Пелу — і прыбылі ўлетку 430 году да Нараджэння Хрыстова некалькі незвычайных вандроўнікаў на белых конях, у выцвілых ад пякучага горнага сонца плашчах.

Той, хто ачольваў атрад, быў выгнанцам — былым атэнскім стратэгам Пэрыклам. Абурэнне грамадзянаў гораду цяжкім характарам і жорсткай палітыкай вялікага дыктатара дасягнула крытычнага пункту. І яны пастанавілі — нягледзячы на яго эфектныя вайсковыя перамогі, нягледзячы на манументальны Парфэнон, узведзены па яго ініцыятыве — пазбавіцца гэтага чалавека, што кіраваў імі на працягу дваццаці чатырох год. І ўжо зусім не малады, пакрыты шматлікімі баявымі шнарамі, атрыманымі пры абароне вялікага і прыгожага, але такога няўдзячнага гораду, Пэрыкл быў вымушаны сысці. З невялічкім скарбам, у суправаджэнні адданых рабоў.

У знак салідарнасці да саноўнага выгнанніка далучыўся — са

сваімі рабамі і пляменнікам-падлеткам Анаксымэнам — яго трыццацігадовы сябра Гіпакрат, знаны атэнскі лекар, што вёў свой род ад славутага Асклепія-Эскулапа ды ўзгаданага ў Гамэравай „Іліядзе“ лекара Махаона.
Па прапанове Пэрыкла сябры рушылі на поўнач — туды, адкуль калісьці прыйшлі да Атэнаў ваяўнічыя продкі дыктатара, — і неўзабаве апынуліся ў Пэле — македонскім горадзе, якім кіравала маладая і прывабная царыца — цнатлівая Праксавія. Праксавія нямала чула пра Пэрыкла, а таму з вялікай павагай паставілася да старога воя і яго спадарожнікаў, паклапацілася, каб ні ў чым у іх не было нястачы і каб атрымалі яны ў яе горадзе-дзяржаве надзейны прытулак.
У хуткім часе паміж сівым Пэрыклам і квітнеючай Праксавіяй пачалося каханне. Апошняе каханне Пэрыкла. Адзінае і непаўторнае каханне Праксавіі.
Уладарка Пэлы зацяжарыла. Пэрыкл неадкладна пераняў на сябе частку яе кіраўнічых абавязкаў, а таксама дэталёва распрацаваў вайскова-палітычную дактрыну дзяржавы і ўжо збіраўся прыступіць да яе рэалізацыі, калі ў горадзе з’явілася прадстаўнічая дэлегацыя з Атэнаў. Абяскроўленая без Пэрыкла пэрліна Элады цярпела паразу за паразай у Пэлапанэскай вайне, і яе дэмаралізаваныя грамадзяне заклікалі выгнанага стратэга вярнуцца ды выправіць жахлівае становішча, для чаго не паленаваліся накіраваць за легендарным воем тузін дастойнікаў ды сорак вазоў дароў.

Пэрыкл перадаў падарункі каханцы, паразмаўляў сам-насам з кожным з дастойнікаў і прыняў рашэнне вяртацца. Пакінуўшы цяжарную жонку на догляд Гіпакрату, стратэг накіраваўся ў горад сваёй славы, каб сплаціць яму свой апошні, як высветлілася пасля, абавязак. Ён узначаліў атэнцаў і паспеў істотна ўзняць баявы дух свайго народу для змагання з захопнікамі, але не здолеў спыніць эпідэміі чумы, ахвярай якой паў і сам.
Пачуццё віны за загубленага сябра ахапіла Гіпакрата. З тым большай адказнасцю падышоў ён да нараджэння дзіцяці заўдавелай Праксавіяй. І хоць народжаны ў Пэле пад пільным наглядам найвялікшага з жывых лекараў сын Пэрыкла Піліп так і не пабачыў бацькі, затое яму было наканавана стаць заснавальнікам Македонскай дынастыі і Македонскай велічы.

Але перад гэтым яму давялося стаць поўным сіратой. Несуцешная Праксавія бязмерна пакутавала, сумуючы па адзіным у жыцці і — трэба ж! — заўчасна памерлым каханым. Калі ў яе безнадзейна скончылася малако, каб карміць Піліпку грудзьмі, яна адчула сябе свабоднай і прыняла смяротную атруту.

Шок саманадзеянага Гіпакрата, які так цвёрда верыў у сваю лекарскую сілу, быў бязмежным. Праз некалькі дзён жальбы і смутку, агаломшаны ды ссівелы, у суправаджэнні адно неабходнага мінімуму рабоў ён выправіўся ў вандроўку па Эладзе, каб суняць пакутлівае пачуццё ўласнае віны. Тое падарожжа зацягнулася на некалькі дзесяцігоддзяў, аж да канца жыцця лекара. У Пэлу ён не вярнуўся.

Абавязкі галоўнага медыка Пэлы прыняў на сябе малады, але ўжо досыць кампетэнтны, з пэўным досведам практычнай работы, Анаксымэн.

Пэрыклаў Піліпка з малых год праяўляў моц духу, глыбокі розум ды лісіную хітрасць. Тэкстам, па якім хлапчук вучыўся пісьму, стала бацькава аб'ёмная вайскова-палітычная дактрына. І ўжо ў чатырнаццаць юны ўладар перайшоў ад тэорыі да практыкі.

Войны першага македонскага Піліпа не заўжды былі пераможнымі, але, калі ў дваццацідвухгадовага цара нарадзіўся нашчадак, які атрымаў імя Тымандр, яго дзяржава ўжо ахоплівала тэрыторыю, роўную славутай выспе Лесбас.

Піліп Першы загінуў, як і належыць вою, на полі бітвы, маючы за плячыма сорак два гады жыцця, дзяржаву памерамі ў паўтара Лесбаса і дваццацігадовага нашчадка.

Нашчадак не вызначаўся ваяўнічым норавам, але, згодна з дзедавай дактрынай, вымушаны быў абвяшчаць і весці войны з суседзямі.

* * *

У другой палове 384 году да Нараджэння Хрыстова ў дасведчанага і ўжо немаладога прыдворнага лекара Анаксымэна нарадзіўся сын Арыстотэль. За два гады ў дыктатара Тымандра з'явіўся на свет хлопчык, якога назвалі ў гонар дзеда Піліпам. Арыку і Піліпку было наканавана стаць сябрамі маленства, партнёрамі ў гульнях, ад якіх яны не стамляліся.

Калі Тымандрыйчыку споўнілася сем гадоў, а Анаксымэнчыку дзевяць, сябры захапіліся краязнаўствам. Прыхапіўшы пару ўзброеных рабоў, хлопчыкі накіроўваліся ў самыя розныя куточкі Тымандравай дзяржавы, цешылі вока мілымі вобразамі роднага краю, начавалі пад адкрытым небам ля разложыстых вогнішчаў ды даўніх муроў, і ложкам ім была зямля, а покрывам — сціплыя плашчы вандроўнікаў.
Уранні сябры выконвалі гімнастычныя практыкаванні, дасканаліліся ў класічнай барацьбе і іншых дужаннях, у бойцы на мячах і кіданні дроцікаў, выкарыстоўваючы верных рабоў у якасці ахоўнікаў, трэнераў, спарынг-партнёраў ды рухомых мішэняў. Жыхары навакольных македонскіх вёсак кармілі іх сырам і вінаградам, паілі казіным малаком са свежаспечанымі аўсянымі аладкамі.
Нярэдка разам з хлапчукамі выпраўляўся і трэнер македонскай алімпійскай зборнай, нястомны Папандопл. Яго прафесійным абавязкам было адшукваць у глыбінцы маладых перспектыўных атлетаў, і ён падыходзіў да гэтай задачы з усёй адказнасцю. У сустрэтых селішчах ладзіліся розныя спаборніцтвы з дысцыплін, што ўваходзілі ў алімпійскую праграму.
Пасля кожнай чарговай вандроўкі Арыстотэль і Піліп абавязкова завітвалі ў Пэльскую лазню, гаспадар якой, мажны і добразычлівы Фэрапонт, неўзабаве стаў іх добрым сябрам. Фэрапонта ў Тымандравай сталіцы любілі ўсе. Ён не меў ні жонкі, ні дзетак, а таму ўсю цеплыню душы аддаваў любімай працы і свайму сабаку Рыфу, з якім хлапчукі таксама пасябравалі.

* * *

Так прайшлі пяць год здаровага і поўнага падзеямі жыцця. Здавалася, не засталося ніводнага кутка ў Македоніі, дзе б не ступала нага Піліпкі і Арыка, ніводнага вялікага дрэва, куды б яны не ўтыркалі дроцікаў, на якім не рубілі б мячамі галінкі і на якім не адпрацоўвалі б удараў нагамі. Пэўныя ўлюбёныя мясціны наведваліся па некалькі разоў у розныя поры году. Але аднойчы квітнеючай вясной 370 году — тым разам трэнера алімпійскай зборнай з імі не было — чарговая экспедыцыя прывяла хлапцоў да незвычайнай пячоры за небяспечным горным перавалам. У пячоры жыў варажбіт.

Худы басаногі даўгабароды дзядок, апрануты ў пацёртую мядзведжую скуру, чакаў гасцей. Птушкі і зоркі, камяні і расліны ўжо на працягу тыдня сігналізавалі яму сваімі толькі нямногім зразумелымі знакамі пра надыход моманту, калі павінна здарыцца падзея эпахальна вялікая, вызначальная для дзесяткаў і соцень будучых пакаленняў. Месца гэтай падзеі было вядомае папярэднікам варажбіта яшчэ задоўга да таго, як ён тут пасяліўся. Але яны — папярэднікі — проста ведалі, што тут падзея адбудзецца, ім не выпала шчасця перажыць таго пераломнага моманту, калі сюды прыйдуць тыя, каму наканавана распачаць новую эпоху.

І варажбіт шаптаў бясконцыя заклінанні-формулы над рытуальным вогнішчам, якое не павінна было згасаць ужо на працягу дзесятка пакаленняў, якое палілі ранейшыя носьбіты і хавальнікі таемных ведаў.

...У той дзень на ўзыходзе сонца пячору наведала сініца. Лясная птушка, пэўна, сама не разумеючы як, апынулася над заснежаным горным перавалам і, заляцеўшы ў зусім незнаёмую шчыліну, трапіла да святога вогнішча — Зніча, бачыць які сініцам даводзілася яшчэ радзей, чым людзям. Узрушана ціўкнуўшы, крылатае стварэнне пранеслася да выйсця на вольнае паветра і знікла там, але мудры дзядок зразумеў — вось яно!

Варажбіт няспешна выйшаў з пячоры, разаслаў неапрацаваную воўчую скуру, сеў на яе, склаўшы ногі накрыж, і стаў назіраць за наваколлем.

Блізка паўдня вочы ягоныя разгледзелі чатырох чалавек — двух дарослых і двух юнакоў, нават, хутчэй, дзяцей, якія паволі набліжаліся. Нарэшце, людзі таксама заўважылі дзядка ў мядзведжай скуры і паскорылі хаду.

Яшчэ да вітання з прыхаднямі кемлівы варажбіт вызначыў, што кіруе групай самы малы. Іншы хлапец, падобна, яго сябра, а дарослыя — усяго толькі рабы. І, павітаўшыся па-македонску, стары не стаў запытваць ні пра імёны, ні пра штось іншае — ён проста звярнуўся да Арыка і Піліпкі, не сумняваючыся, што робіць правільна. Яны зразумелі і рушылі да ўваходу ў пячору. Варажбіт сказаў яшчэ некалькі слоў — і Піліпка загадаў рабам заставацца звонку.

Па жэсту старога хлапцы наблізіліся да Зніча, прыселі на разасланыя дыванкі з заечых скурак і падрыхтаваліся слухаць.

Дзядок прызямліўся насупраць на скуру воўка і загаварыў. Ён мовіў спакойна, але цвёрда, без вялікіх паўзаў, ведаючы: часу засталося мала — менавіта столькі, колькі трэба, каб перадаць веды многіх тысячагоддзяў будучым уладарам.
Але гэтыя ўладары былі яшчэ дзецьмі. І варажбіт пачаў з казак. Чырванашчокі Калабок-Сонца ўцёк ад сваіх стваральнікаў — трохаблічнага і трохгаловага Бацькі-Змея ды трох маці — Маці-Зямлі, Маці-Вады і Маці-Паветра — і рушыў у вандроўку па небе. І адразу ж на пачатку шляху сустрэў ён Усход-Зайца, а затым Поўдзень-Мядзведзя, а затым Захад-Воўка і смяяўся з іх усіх і кпіў з іх пачварнага выгляду ды няўклюднасці. І так ён прайшоў амаль усё неба і сустрэў Поўнач-Лісу і стаў смяяцца з яе. Але сказала Поўнач-Ліса, што не чуе Сонца-Калабка і не бачыць яго, бо і бачыць і чуе слаба. І наблізіўся да Поўначы-Лісы Калабок, каб пабачыла яна яго прыгажосць ды дасканаласць, каб пачула ягоныя кпіны. І з'ела Поўнач-Ліса Калабка-Сонца.

А быў у Поўначы-Лісы сябра Кот-Месяц Тэўтат — гаспадар ночы. Ліса распавяла ўсім звярам пра яго магутнасць, і тыя сталі прыносіць яму ахвяры. Кот таямніча пасміхаўся і з'ядаў усе ахвяраванні, набіраючы магічную моц і прымушаючы рухацца воды мораў і акіянаў. Паўсюль, дзе з'яўляўся Кот-Тэўтат, неспакойным рабілася жыццё. І таму трывожыліся зверы, апроч Лісы, калі ён з'яўляўся, і баяліся яго пакрыўдзіць, а Воўк падоўгу спяваў сытаму Кату сумныя песні.
Але яшчэ трывожней рабілася ўначы, калі Кот знікаў. Цемра зацягвала свет, і рабілася жудасна і няўтульна. І звяры прыносілі новыя ахвяры, каб Тэўтат вярнуўся. І ён вяртаўся, схуднелы, з нязменнай патаемнай усмешкай. І з'ядаў ахвяраванні і набіраў вагу...

Апроч ненажэрнага Месяца-Ката — гаспадара ночы — існаваў і дзённы месяц — Месяц-Конь. На ім ездзіў па небу з бліскучым мячом бог агню і навальніцы Тараніс — жорсткі і справядлівы. Нікога і нічога не баяўся Тараніс, нікому не дараваў подласці і падману, хцівасці і ляноты, пільна глядзеў, каб паўсюль яго і ягонага каня шанавалі ды палілі святыя вогнішчы — Вечныя Знічы. Паратунку для здраднікаў не было — Тараніс заўсёды кідаўся за імі ў пагоню і насцігаў здрадніка маланкай альбо

стварaў таму ілюзію ўратавання, але рабіў далейшае жыццё настолькі пакутлівым, што смерць падавалася лепшым выйсцем. У рэшце рэшт здрайца альбо рабіў сабе смерць, альбо прагна шукаў смерці, цяпер ужо жаданай...

Далейшага Піліпка не чуў. Сон змарыў будучага магутнага ўладара, і пакуль яго старэйшы сябра Арык прагавіта ўбіраў у сябе незвычайныя і новыя веды, македонскі прынц мірна сапеў, зрэдку падрыгваючы рэлаксаванымі цягліцамі.
А варажбіт усё казаў і казаў. Пра ар'яў, якія прыляцелі на Зямлю шмат тысячагоддзяў таму з Зор Вялікай Мядзведзіцы на дзівосных металічных вазах, што самі, без коняў, пераносіліся па небе; пра тое, як арыі заснавалі на Поўначы магутныя ды прыгожыя дзяржавы. Пра ледавік, які знёс з зямной паверхні ўсю арыйскую цывілізацыю і вымусіў тых, хто выжыў, доўга блукаць, шукаючы паратунку і свабоднай, прыдатнай для жыцця зямлі. Пра раку Інд, дзе рэшткі ар'яў нарэшце знайшлі сталы прытулак і здолелі пабудаваць новыя магутныя дзяржавы з прыгожымі гарадамі. Пра магутных кельтаў, якія, калі ледавік сышоў, першымі з ар'яў вярнуліся на прарадзіму, у Еўропу, і занялі ўсе найвышэйшыя кропкі яе паверхні; пра яшчэ магутнейшую квітнеючую Атлантыду, што знікла пад хвалямі Акіяну па той бок таямнічых Гераклавых слупоў; пра нашчадкаў атлантаў, барбараў ды семітаў, і іх крывавыя войны з ар'ямі, пра гераічнага правадыра ар'яў Арыймана і гераічнага правадыра семітаў Армузда... Вечар змяніла ноч, надышоў ранак...
Калі сон пакінуў Піліпку, і ён расплюшчыў вочы, Арык і стары сядзелі моўчкі ды глядзелі на яго. Хлопец рэзка падхапіўся, адчуваючы, што, пэўна, праслухаў нешта надзвычай неабходнае, і адчуваючы віну за гэта.
— Вас чакаюць вялікія справы, — мякка прамовіў варажбіт, — я перадаў тое, што мусіў перадаць. У належны час і адпаведным людзям. Цяпер — наспеў час для ахвяраў Богу Таранісу. Я пакажу, як гэта рабіць правільна. Пасля вы сыйдзеце і ніколі...
— ён зрабіў паўзу, каб упэўніцца, што яго словы ўспрынятыя хлапцамі з усёй сур'ёзнасцю, — ніколі сюды не вернецеся.
Стары працягнуў Піліпу невялічкую напаўпустую біклагу.
— Гэтае віно дай сваім рабам! Але перад тым спусціцеся на два стадыі да ручая, абмыйцеся і разамніце суставы. Да Тараніса

трэба звяртацца чыстымі і бадзёрымі.
Хлопцы выйшлі з пячоры. Сонца новага дня набліжалася да зеніту. З супрацьлеглага боку неба спакойна пазіраў амаль поўны Месяц.
Стомленыя чаканнем рабы сустрэлі Піліпку і яго сябра з непрыхаванай палёгкай і з яшчэ большай палёгкай рушылі прэч ад пячоры і яе дзіўнага гаспадара. Пасля абмывання Піліп загадаў абодвум ахоўнікам выпіць змесціва біклагі. Наступны загад — вяртацца да пячоры — быў нечакана ўспрыняты амаль з радасцю, а ля яе ўваходу дзецюкоў апанавала сапраўдная эйфарыя. Схапіўшыся за рукі, яны затанчылі, час ад часу натхнёна выкрыкваючы: „Та-а-та-та! Та-та-та! Та-а-та-та! Та-та-та!“
Стары выйшаў з пячоры, задаволена хмыкнуў і паклыпаў да ручая на абмыванне. Вярнуўшыся, паклікаў македонскага княжыча ўнутро да канфідэнцыйнай размовы. І размова гэтая не была ні кароткай, ні лёгкай.
Сонца дасягнула найвышэйшай кропкі, калі Піліп выглянуў з пячоры і загадаў заходзіць астатнім. У руцэ яго чарнеў вастраносы камень, апрацаваны чалавекам, падобна, яшчэ шмат стагоддзяў таму.
Разасланых скур ля Зніча ўжо не было. Варажбіт выглядаў урачыста, яго, як і прымлелых рабоў, апанавала эйфарыя. Ён нешта хутка шаптаў, паступова ўзмацняючы голас. Піліпка падпусціў ахоўнікаў да старога, і тыя, здзіўлена лыпаючы вачыма, замерлі, захопленыя чароўнасцю плыні незвычайных незразумелых словаў.
Варажбіт жэстам загадаў рабам наблізіцца да агню і адсунуўся ўбок. Голас яго гучаў манатонна і цвёрда. Здавалася, у адно зліліся галасы ўсіх тых, хто шаптаў у гэтай пячоры заклінанні да яго. Раптам стары ўзняў правую руку, і ў той жа момант Піліп (хлопчык, па сутнасці, зусім дзіцянё Піліпка) шырока размахнуўся і нанёс праваму з рабоў, што стаялі наперадзе, удар вострым камянём у карак. Раб бразнуўся тварам у вогнішча.
Аслупянелы Арык чакаў, што другі раб зробіць хаця б спробу ўратавацца. Але той зачаравана пазіраў на дзядка і, здавалася, зусім не звярнуў увагі на смерць калегі. Піліпка зноў шырока размахнуўся і выцяў раба пад карак. І той таксама ўпаў у агонь тварам.

Што рабіць далей, стары паказваў на мігі, безупынна вымаўляючы магічныя формулы. Усё часцей і часцей гучала імя Тараніса і мантра „Та-а-та-та! Та-та-та!“, усё хутчэйшым рабіўся рытм маўлення варажбіта. Ён схапіў бліжэйшага да сябе раба за рукі і кіўком загадаў, каб хлопчыкі зрабілі тое ж з нагамі небаракі. Цела было акуратна ўскладзена на Вечны Зніч у позе зародка.
Затым тая ж аперацыя была зроблена і з целам другога прыбітага. Былыя ахоўнікі і абаронцы Піліпкі ляжалі цяпер амаль упрытык, спінамі вонкі, іх лізала полымя. Па пячоры разносіўся жахлівы задушлівы пах.
Але кульмінацыя рытуалу была наперадзе. Не спыняючы мантраў, гаспадар капішча паслядоўна кінуў у Зніч дыванкі з заечых скурак (на якіх яшчэ нядаўна сядзелі Арык і Піліпка), затым воўчую скуру (на якой нядаўна сядзеў ён), пасля ўвайшоў у агонь сам і сеў на палаючых рабоў, склаўшы ногі накрыж. Мядзведжая скура на ім адразу ж задымілася. Пах гарэлай поўсці, здавалася, перабіў астатнія пахі.
Эйфарыя між тым перакінулася на Піліпку, і ён, распяваючы „Та-а-та-та! Та-та-та! Та-та-та-Та-ра-ніс!“ і размахваючы чорным вастраносым камянём, якім наносіў рытуальныя ўдары ззаду, з падскокамі затанчыў вакол вогнішча.
Дзядок яшчэ нейкі час сваімі крыкамі ў гонар Тараніса падаваў з полымя й дыму прыкметы жыцця. Нарэшце выканаўцам рытуальнай песні застаўся толькі Піліпка. На нейкае імгненне ён спыніўся, і агаломшаны трайной ахвярай Арык убачыў у вачах малодшага сябра злавесныя агеньчыкі.
„Ён ведае, што праспаў найважнейшыя веды, а таму адчувае ўва мне найнебяспечнейшага канкурэнта, — здаўмеўся мудры юнак. — Трэ ўцякаць, іначай буду трупам“.
Калі македонскі царэвіч ізноў увайшоў у экстаз і закалаўроціўся вакол заваленага трупамі Зніча, Арыстотэль вышмыгнуў з пячоры і пабег. Піліп яго не праследаваў — рытуал неабходна было давесці да завяршэння.

* * *

Глыбокай ноччу ў дзверы старога Анаксымэна — галоўнага медыка Тымандравай Македоніі — ціха, але настойліва пастукалі. Арык не рызыкнуў рабіць гэтага раней: шматлікія

сексоты Тымандра маглі настукаць цару пра тое, што ён вярнуўся без Піліпкі — і тады наступствы маглі б быць фатальнымі. Уначы ж быў хоць нейкі шанец прайсці незаўважаным. Дзякуй лёсу, якраз тады, калі юнак з'явіўся ля сцен Пэлы, вартаўнікі начнога гораду былі цалкам паглынутыя гульнёй у косці, і Арыстотэль здолеў паспяхова, хоць і разадраўшы да крыві далоні і каленцы, пераадолець гэтую зусім не простую перашкоду на шляху дахаты.
Анаксымэн няшмат пачуў ад сына, але і пачутага было дастаткова, каб зразумець: вернецца Піліпка ці не вернецца — заставацца ў Пэле Арыку больш чым рызыкоўна.
Яшчэ да світанку былі сабраныя найбольш неабходныя рэчы. Перад выездам стары лекар наведаў палац Тымандра. Ахова палаца прызвычаілася да візітаў Анаксымэна ў любы час (тая вялікая перавага, якую дае найлепшае ў дзяржаве веданне медыцыны), а таму і гэтым разам не надта здзівілася. Праўда, здзівіўся сам дыктатар, калі яго пабудзілі і даклалі пра візіт лекара, але прыняць Анаксымэна пагадзіўся.
Апошнія гады македонскі ўладар меў сур'ёзныя праблемы з мужчынскай сілай, а казаць пра гэткае ў прысутнасці падначаленых для мужчыны заўжды няёмка і ганебна — мусіць, сказваецца біялогія: важаку чарады, які не можа авалодаць саміцай, ужо не быць важаком. Таму размовы з Анаксымэнам на гэтую тэму вяліся заўжды толькі сам-насам, а паведамленне пра толькі што створаны пасля многіх бяссонных начэй сродак для ўзмацнення мужчынскай сілы (што было няпраўдай) было прынятае за чыстую манету.
Для большай перакананаўчасці стары медык прамовіў клятву Гіпакрата. Наіўны Тымандр, выхаваны ў атмасферы шчырасці і спагады, нязменнай павагі навакольных да яго ўласных надзённых патрэбаў, меў асаблівы сентымент да клятваў, тым больш да такіх урачыстых і шматслоўных, а таму, расчулены, не вагаючыся, прыняў сродак (а насамрэч — моцнае снатворнае) з Анаксымэнавых рук. Неўзабаве Пэрыклаў унук праваліўся ў глыбокі эратычны сон. Лекар жа, пакапаўшыся ў бялізне, выцягнуў адтуль жмут ключэй — галоўных ключэй Пэлы — і накіраваўся наўпрост да дзяржаўнага скарбу.
Пара ахоўнікаў ля дзвярэй скарбасховішча вітала старога лекара радаснымі воклічамі — стары заўсёды знаходзіў цёплыя словы нават для самых простых са свабодных грамадзян

Тымандравай Македоніі. Так было і гэтым разам. Анаксымэн распачаў зычлівую размову пра жыццё-быццё і праблемы здароўя, а затым, прычакаўшы зручны момант, адначасова, з дзвюх рук, увагнаў пад рэбры абодвум суразмоўцам дроцікі. Смерць напаткала няшчасных амаль імгненна.
Са скарбу ён забраў акурат столькі золата, колькі мог вынесці зусім не малады, але дужы чалавек сярэдняга целаскладу. Кожнаму з наступнай пары ахоўнікаў, якая сустрэлася яму на выхадзе з палаца (гэта былі адборныя, загартаваныя ў баях галаварэзы), Анаксымэн папросту ўручыў некалькі залатых ды загадаў забіваць любога, хто ўбачыць працэсію са зліткамі па дарозе да яго дому.
Дзякуй лёсу, жыхары гораду ў бальшыні спалі, і забітых па дарозе назбіралася не болей за пяць-шэсць чалавек, сярод якіх аказаўся гаспадар гарадской лазні зычлівы Фэрапонт, што спяшаўся на месца працы, трэнер македонскай алімпійскай каманды нястомны Папандопл (які, каб не выбіцца з рэжыму, уставаў да світанку) і некалькі рабоў, пасланых выканаць бытавыя даручэнні сваіх гаспадароў.
У доме Анаксымэна ўсё было гатова да ўцёкаў. Некалькі коней са скарбам на спінах, тузін узброеных рабоў, жонка і сын... Ахова гарадской брамы (чацвёра аматараў гульні ў косці) была панішчана яшчэ да таго, як паспела ўзняць трывогу. Перад тым, як назаўсёды пакінуць мілы горад, Анаксымэн падсунуў пад аднаго з забітых жмут ключэй ад дзяржаўнага скарбу. Яны больш не былі патрэбныя вялікаму лекару.
Першыя промні сонца асвяцілі муры Пэлы і твары ўцекачоў. Над далягляда з другога боку яшчэ быў бачны поўны Месяц-Конь...

* * *

Піліпка забавіўся ў пячоры да таго часу, калі згаслі апошнія вугалькі Зніча... Попелам стала ўсё: і верныя рабы, і мудры варажбіт, і ўсе яго апрацаваныя скуры. Фінальнае для гэтага капішча ахвяраванне вялікаму Таранісу здзейснілася. Цяпер Дух Зніча павінен быў перайсці да македонскага прынца, і цяпер ужо яму і яго нашчадкам належала несці яго далей, шануючы суровага і бязлітаснага Тараніса.
Хлопчык выйшаў з прапахлай дымам пячоры і з асалодай

удыхнуў свежае паветра. Ён прайшоў абрад ініцыяцыі і ведаў: цяпер яго лёс — не проста стаць уладаром Македоніі. Ён павінен і здолее стаць уладаром усяго Пэлапанэса, усяе Элады!
Навокал ляжала глыбокая ноч. Месяц зрабіўся зусім круглым і ляніва пазіраў на падуладны яму свет, злёгку асвятляючы сонную зямлю.
Піліпу ж спаць не хацелася ўвогуле. Ён адчуваў перапоўненасць нейкай незнаёмай моцай, няўрымслівай воляй ды магутнасцю. Царэвіч у апошні раз паглядзеў на чорную пашчу пячоры, павярнуўся і, не аглядаючыся і не спыняючыся, рушыў у напрамку Пэлы.
Край сонца ўжо выглянуў з-за далягляду, калі Піліп наблізіўся да муроў роднага гораду. За невысокім хмызняком усяго ў нейкім стадыі ад яго паказалася гарадская брама, і хлопец спыніўся ля хмызоў, каб справіць малую патрэбу. Далейшыя падзеі прымусілі затрымацца і нават схавацца..
З брамы адзін за адным выслізнулі семнаццаць вершнікаў, сярод якіх прынц пазнаў Арыка, яго маці і двух вояў з палацавай аховы. Апошнім на вараным жарабцы выехаў стары Анаксымэн.
Зачыніўшы браму, лекар выцягнуў аднекуль невялічкую біклагу, сербануў сам і аддаў дапіваць мужным воям. Захопленыя зусім неблагім віном, тыя не заўважылі (затое Піліпка бачыў гэта вельмі ясна), як пляменнік Гіпакрата нізка нахіліўся з сядла ўбок, засунуў пальцы ў рот і званітаваў на зямлю.
Калі пустую біклагу вярнулі гаспадару, Анаксымэн падаў загад, і група шпаркай рыссю рушыла дарогаю прэч ад Пэлы. Перачакаўшы, пакуль кавалькада не знікла ўдалечыні, Піліп шпаркім упэўненым крокам накіраваўся да брамы роднай сталіцы. Што адбылося далей з Анаксымэнавым аддзелам, ён ужо не пабачыў.
А адбылося наступнае. Толькі Пэла знікла з далягляду, як адзін з былых палацавых ахоўнікаў на поўным скаку бразнуўся з сядла ў дарожны пыл. Другому паваліцца з каня дапамог Арыстотэль. Як і Тымандр, мужныя воі атрымалі снатворнае і, натуральна, яны ўжо не разумелі таго, што з імі рабілі былыя хаўруснікі. Іх залатыя зліткі паехалі далей разам з сям'ёй Анаксымэна, а лёс ваяроў, якіх неўзабаве пад канвоем даставілі ў Пэлу, калі надышла часіна справядлівага пакарання,

вызначыў Піліп, намовіўшы бацьку не забіваць здрайцаў проста так, а прынесці ў ахвяру Таранісу. Так яны сталі першымі ў македонскай сталіцы ахвярамі кельцкаму богу агню і навальніцы.

* * *

Анаксымэн намагаўся нідзе не затрымлівацца. Найлепшым варыянтам для сям'і ён лічыў Атэны і, адпаведна, туды скіраваў свой невялічкі аддзел. Стомленыя і загнаныя коні пры першай жа магчымасці замяняліся свежымі, на што лекар спусціў усю маёмасць, апроч рабоў, зброі і залатовак. Не грэбаваў ён і звычайным рабаўніцтвам на дарозе. У выніку гэтых сутычак аддзел паменшаў напалову, але ў рэшце рэшт дасягнуў гораду, дзе Анаксымэн нарадзіўся і грамадзянінам якога меў поўнае права быць, дзе жыла плойма яго сваякоў і дзе яшчэ жылі людзі, з якімі ён сустракаўся змалку.
З Арыкам, народжаным у іншым горадзе, было складаней. Каб дамагчыся для яго правоў грамадзяніна, бацьку давялося пазбавіцца амаль усяго золата, прыхопленага з македонскага скарбу. Але ў выніку справа была вырашана станоўча. Падкупленыя атэнскія алігархі аднагалосна пацвердзілі факт нараджэння Арыстотэля ў Атэнах і замацавалі гэта надпісам на гліняных табулах.
Атрымаўшы грамадзянства, Арыстотэль паступіў у элітарную філасофскую школу Плятона, паспяхова засвоіў увесь спектр выкладаных там дысцыплін і ў рэшце рэшт рэзюмаваў: „Плятон мне сябра — ды праўда даражэйшая". Што ёсць праўдай, Арык зразумеў яшчэ побач з першым сваім сябрам ў пячоры самаахвярнага варажбіта ў гарах Македоніі.

* * *

У дзень пасля прыняцця эліксіру мужчынскай моцы Тымандр здолеў прачнуцца толькі апоўдні. За той час яго дванаццацігадовы нашчадак Піліпка паспеў спыніць распачатую ў Пэле паніку з нагоды разрабавання дзяржаўнага скарбу і жахлівых забойстваў народных улюбёнцаў — трэнера алімпійскай зборнай, нястомнага шукальніка талентаў і гарачага патрыёта бацькаўшчыны Папандопла ды гаспадара лазні, зычлівага і сумленнага Фэрапонта.
За нейкія пару гадзін па сваім вяртанні хлопец зарганізаваў

конную пагоню за дзяржаўнымі злачынцамі і сам памчаўся на белым кані наперадзе паўсоценнага аддзелу, размахваючы над галавой мячом.
Даволі хутка аддзел Піліпа натыкнуўся на заснулых у пыле вояў-здраднікаў. Іх звязалі, кінулі ўпоперак сёдлаў і адканваявалі ў сталіцу, а царэвіч македонскі з большай часткай аддзелу памчаўся далей.
Мусіць, пагоня магла б скончыцца і пакараннем Анаксымэна, каб не вайна. Адразу ж за межамі Тымандравай Македоніі былы галоўны лекар разрабаваў караван са спецыямі, якія везлі ўладару суседняй краіны Яныцы Максымілу. Пацярпелыя пазналі Анаксымэна і даклалі пра інцыдэнт вярхоўнаму ўладцу. Амбіцыйны Максыміл без адвалокі зажадаў распачаць з Пэлай вайну. А тут на яго тэрыторыі з'явіўся яшчэ і Піліпка з узброеным аддзелам...
Карацей, замест пераследу Анаксымэна Піліпу давялося ўступіць ва ўзброеную барацьбу з воямі Яныцы, а папросту — з янычарамі.
Баявы хрост дванаццацігадовага хлопца прайшоў паспяхова. Яго вайсковая групоўка з годнасцю і невялікімі стратамі была вымушаная вярнуцца на тэрыторыю ўласнай дзяржавы. Распачалася працяглая вайна з фанабэрлівым суседам.
Да вечара таго ж дня Тымандр канчаткова ачомаўся, адклікаў Піліпку назад у палац, загадаўшы вывучаць вайскова-палітычную дактрыну атэнскага прадзеда, і ўзначаліў сваё войска сам. Праз тыдзень баявых дзеянняў Яныца была захопленая і далучаная да Тымандравай Македоніі. Дыктатар Максыміл зрабіў сабе смерць.
Янычарская маёмасць істотна кампенсавала страты дзяржавы, нанесеныя Анаксымэнам і здраднікамі з палацавай аховы. Пасля працяглых інтэнсіўных допытаў былыя ахоўнікі прызналіся ў забойстве ўлюбёнцаў македонскага народу — алімпійскага трэнера і гаспадара лазні. За гэта іх склалі на ахвяру Таранісу.

* * *

Глыбокае вывучэнне Пэрыклавай дактрыны пераканала Піліпа ў немэтазгоднасці рэзкага ўвядзення культу Тараніса сярод народаў, што прывыклі шанаваць алімпійскіх багоў. Неабходна

было рабіць узважаныя крокі. І першы вялізны крок быў здзейснены адразу па смерці Тымандра.
Пры ўсёй сваёй ваяўнічасці і маладосці, Піліп не мог не разумець важнасці для Элады грашовых адносін. Таму, стаўшы ўладаром Македоніі, ён адразу ж загадаў адліць манеты, на якіх Тараніс на белым кані скакаў над Сонцам: неабходна было закласці ў масавую свядомасць разуменне перавагі найвышэйшых цнотаў — ваяўнічасці і справядлівасці, увасобленых у Таранісу, і працалюбства ды настойлівасці, увасобленых у дзённым Месяцы-Кані — над саманадзейным бляскам Сонца-Калабка. Імя Піліпа — Другога Піліпа Македонскага — таксама прысутнічала на манетах — у рэшце рэшт, менавіта на яго яшчэ ў дванаццацігадовым узросце сышоў магутны дух кельцкага бога агню і навальніцы.
У адпаведнасці са стратэгічнымі інтарэсамі дзяржавы, жонкай Піліпа стала Алімпіяда — атэнянская дзяўчына з алігархічнай сям'і, не па гадах развітая і разважлівая. Неўзабаве нарадзіўся сын Аляксандр.
Калі Аляксандру мінула сем год і паўстала неабходнасць у мудрым і кампетэнтным настаўніку, Піліп без ваганняў прыняў рашэнне — Арыстотэль. Хто, як не сябра дзяцінства, мог данесці да македонскага нашчадка ўсё багацце ведаў і веліч справядлівага Тараніса?!

* * *

Далейшаму прысвечаны незлічоныя стосы кніжак і рукапісаў. Дарослы Аляксандр уступіў у цяжкі канфлікт з бацькам, і на яго манетах Тараніса не было. Быў толькі Месяц-Конь, увасабленнем якога на зямлі і ў Македоніі стаў услаўлены фальклорам і літаратурай Буцафал.
Тым не менш, аналіз ускосных фактаў сведчыць: Піліпёнак атрымаў ад Арыстотэля базавую частку ведаў, у якія таго пасвяціў апошні варажбіт Македоніі. Воі Аляксандра прагнулі і пераможна дасягнулі кельцкай прарадзімы на рацэ Інд. Адтуль шлях быў адзін — вяртанне. Для Піліпёнка недастатковае шанаванне Тараніса скончылася страшнай і пакутлівай заўчаснай смерцю.

* * *

А семя, пасаджанае варажбітом, дало багатыя ўсходы. Праз стагоддзі выявы справядлівага Тараніса — белага вершніка на белым кані — пачалі адбіваць на манетах многіх дзяржаваў, ім упрыгожылі рыцарскія, гарадскія і дзяржаўныя гербы; па ўсім свеце людзі, ставячы конныя статуі сваіх нацыянальных герояў, увасаблялі такім чынам і вобраз Тараніса.
Так яно доўжыцца і дагэтуль — трыумфальнае шэсце магутнага Тараніса!
Так ён і скача праз вечнасць — у няспынным руху, з узнятым мячом адвагі і справядлівасці!

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **02-02-2001**
[image]

Андрэй Захаранка
Кроніка аднае аблогі
Апавяданьне

Чацьвер, 12 чырвеня

Першыя прамяні сонца борзьдзенька зьлізалі з пажухлае травы драбнюткія зьнічкаватыя кропелькі расы, зьнішчаючы нават успамін аб кароткай, нібыта прымроенай прахалодзе ночы. Кволае зеляністае жыта, крыху спачылае за некалькі ратавальных гадзінаў цемры, ізноў схіліла свае па-дзявочаму пекна прыбраныя галовы, і лёгкі подых яшчэ соннага ветрыка пацягнуў да чалавечага жытла тонкі салодзісты пах жытняга мора.

Балкевіч ляжаў на сваім няўтульным вузкім ложку, падабраўшы калені ды пакутліва вырашаючы, прамінуў ён празрыстую мяжу паміж сном і яваю, ці не. Чуйным вухам ён ужо лавіў прыглушаныя гукі нябачнага ранішняга жыцьця невялічкага мястэчка, дзе кватараваў полк. Далёкія галасы гарластых рудых пеўняў мяшаліся з пранізьлівым жаночым лямантам ды разважлівым роўным рыпеньнем калодзежнага калаўрота. Нейдзека зусім блізка ля вакна, напэўна, хаваючыся ў цень разлапістых векавых ліпаў, што туліліся да памаляванага ў жоўты колер дому з паўкруглаю шкляною вэрандаю й дзікім вінаградам над уваходам, гучна рыкнула карова. Балкевіч расчуў нават яе шумнае дыханьне й шоргат

саскубанай травы.
Сьветлая бацькоўская сядзіба. Ласкавае сонейка толькі-толькі ўзьнялася над празрыстымі зялёнымі шапкамі шляхетных ясеняў. Стары дом з чырвоным дахам, высокімі вокнамі й шырачэзным гаўбцом-аранжарэяй яшчэ хаваецца ў іх прыемны цень. Сёньня маці йзноў сама зьбірае на сьнеданьне, і ад гэтага ягонае сэрца замірае ў чаканьні маленькага сьвята.
Утульная вузкая сьцежка, абсаджаная з абодвух бакоў сакавітымі бэзавымі курчынамі, што часам зьліваюцца вярхамі, ствараючы зялёны цяністы тунэль, бяжыць наўпрасткі да звонкіх удараў агромністага кавадла. Бацька ў жоўтым скураным хвартуку вынырвае зь нізенькіх дзьвярэй кузьні, хапае яго ў свае моцныя, чорныя ад вугальля й дыму рукі ды падкідае так высока ў ранішні чырвеньскі блакіт, што замірае сэрца. А потым сьмяюцца ўсе — і ён, і бацька, і цагляная кузьня, і смарагдавае кусьце бэзу. Старая цётка Анэля працягвае панічу вялізны гліняны кубак тлустага сырадою... Прыгожая салодкая мроя растала ў прасторы, расьсечаная йрваным сьвістам сырамятнае пастуховае пугі. Карова за вакном хуценька патупала вон ад жоўтай хаты з вэрандаю, гаспадыня за сьценкаю загрукатала посудам, нехта нябачны на другім баку шырокае местачковае вуліцы пачаў гучна й шчыра лаяцца. Высокі гістэрычны голас доўга і роўна бэсьціў некага ці, можа, нешта, ажно пакуль ня сьціх дзесьці за хатамі. З усяе тырады толькі адно слова адарвалася й нібыта зажыло ўласным жыцьцём, павіснуўшы ў распаленым сонцам паветры, — „сьпёка“.
— Сьпёка... — уголас прамовіў Балкевіч і зразумеў, што прачнуўся.

Ён сеў на ложку, зьвесіўшы босыя ногі на брудную падлогу. Ява была куды менш прыемнаю, чымсьці ягоныя сонныя мроі. Дзень здаваўся яму вядомым наперад з усімі дробязямі. Зараз ён будзе піць гэтую жудасную паходную каву, гартаючы старонкі сто разоў перачытанага ўдоўжкі і ўпоперак старога рамана, калі толькі гаспадыня не запросіць на румяныя салодкія аладкі з маслам ды гарбатай... Потым лянотна пасунецца ў стайню. Шыхтаваньне, ранішні агляд, расклад на сёньня, бессэнсоўны афіцэрскі сход у палкоўніка. Потым... Гэткім чынам падобныя адзін да аднаго, нібы местачковыя

маладзіцы, дні цягнуліся дурным цугам ужо другі месяц. А тут яшчэ гэтая сьпёка! Але каб абурацца, патрэбныя былі сілы, а марнаваць іх на гэткую няплоднасьць Балкевічу не хацелася. Ён, скрывіўшы твар, шырока пазяхнуў, пацёр далоняй лоб ды стаў шукаць вачыма цяжкія, ненавісныя гэткаю гарачынёю боты.

Хуткае звонкае цохканьне капытоў па хвалістым местачковым бруку прарэзала ранішні спакой, нібы вузкае шпажнае лязо цёмную ваду соннага ляснога возера, не парушаючы ягонае нерухомасьці й задуменьня. Абвостраны бясконцай сумнай аднастайнасьцяй слых імгненна выхапіў новы гук. Балкевіч, які гэтым часам ужо раўнаў на грудзях скураную вайсковую партупею, раптам са зьдзіўленьнем заўважыў, што ягонае сэрца забілася мацней і нават на нейкі момант замёрла дыханьне.

„Ну, вось! — падумаў ён, ківаючы галавою ды саркастычна гледзячы на сваю цыбатую паставу ў мурзатае люстра. — Дажыліся! Зьдзічэў ужо так, што на конскі тупат сэрца выскоквае. Яшчэ пару месяцаў гэткае вайны — усе тут паненкамі паробімся“.

Ён заклаў рукі за сьпіну й моўчкі рушыў па пакоі, злуючы на самога сябе, бо нічога не выходзіла. Нутраная барацьба цягнулася шчэ колькі ймгненьняў, але нарэшце Балкевіч кінуў дурныя высілкі, апусьціўся ў глыбокую рыплівую фатэлю й дазволіў усёй сваёй істоце аддацца цікаўнасьці.

Было чуваць, як добра падкаваны, відавочна, вайсковы конь сьцішыў хаду, зьвярнаючы з гарачага ўжо бруку на зжаўцелую траву й набліжаючыся да дому зь дзікім вінаградам. Гучна рыпнула сядло, вершнік борзьдзенька саскочыў ля самае сьцяны й нецярпліва грымнуў дзьвярыма. На нейкі момант павісла напружаная цішыня. Потым унізе нешта голасна прагаварыла гаспадыня, і нарэшце сталі чутныя хуткія крокі на лесьвіцы. Балкевіч падабраў вусны й доўгім шляхетным пальцам пачухаў брыво, міжволі дзівячыся з дакладнасьці ўласнага прадчуваньня. У дзьверы гучна пастукалі.

— Калі ласка! — гаспадар пакою закінуў адну нагу на другую й, ківаючы носцам запыленага чорнага бота, пільна ўтаропіўся ў нізкія шчылістыя дзьверы.

— Капітан Балкевіч? — нізка прыгінаючы галаву, у пакой прасунуўся маладзенькі афіцэр са штабу. — Вам загадана

зьявіцца да спадара палкоўніка!
Балкевіч спакойна й неадрыўна глядзеў проста ў твар афіцэру. Той вокамгненна злавіў пагляд, засмуціўся й пачаў зацікаўлена вывучаць звыш як сьціплы інтэр'ер пакою, нэрвова перамінаючыся на даўгіх ды тонкіх нагах. У невялічкае бруднае акенца капітанскага жытла з роўным гудзеньнем біўся таўсты чорна-жоўты чмель, а на суседнім дварышчы флегматычна лязгаў сонны сабака. Капітан маўчаў.
— Да спадара палкоўніка? — прамовіў ён нарэшце, калі няёмкая паўза зацягнулася.
— Так, спадар капітан! Праз паўгадзіны! — жвава адгукнуўся наведнік.
— Цуд-доўна... — расьцягнута падоўжыў сваю гульню Балкевіч, зьдзекваючыся ня столькі з прыслужлівага штабнога афіцэра, якіх ня вельмі паважалі „сапраўдныя ваякі", столькі з самае зьявы вайсковае дысцыпліны. Мінула некалькі маўклівых імгненьняў, як ён раптоўна адчуў сьлізкую хвалю агіды з уласных паводзінаў, роўна як і з гэтае дурное чалавечае гіерархіі. Гульлівы настрой кудысьці зьнік, капітан сьціснуў далонямі лоб ды коратка й шчыра выгукнуў:
— Прабачце... Дзякую...
Афіцэр выйшаў, а гаспадар адкінуўся ў фатэлі, стомлена гледзячы ў заседжаную мухамі, даўно ня беленую столь. Балкевіч высьцягнуўся й сьцішана адрапартаваў. Палкоўнік марудна й нібыта зь неахвотаю адарваўся ад раскіданых на стале аркушоў. Нейкі час ён невідушча глядзеў на візытора, і па выразе ссохлага, зьлёгку маршчаватага твару было відаць, што ягоныя думкі ўсё яшчэ блытаюцца нейдзе пасярод сакрэтных, надзвычай важных папераў. Першымі аджылі маленькія бляклыя вочы, колер якіх заўсёды нагадваў Балкевічу каламутную ваду ў ставе недалёка ад стайні, пры якой месьцілася ягоная сотня. Яны хутка й холадна ўсьміхнуліся.
— Сядайце! — палкоўнік сухою рукою паказаў на крэсла ля вакна, упёрся локцямі ў стальніцу й, счапіўшы пальцы, на момант узьняў твар, нібыта наважваючыся распачаць размову. Балкевіч спакойна згатаваўся слухаць. Палкоўнік загаварыў няроўным знэрваваным голасам, які выдаваў крыўду, бяссоньніцу й схаваную чорную мэлянхолію. Ягонае ссохлае дробнае цела непрыгожа й злосна засоўвалася па даўгім пакоі,

засьцячы адзінае высокае вакно. Кароткія словы зрываліся з тонкіх жорсткіх вуснаў, і здавалася, што аб іх можна балюча пабіцца, калі ў пару не адысьці ўбок.
Усе ведалі, што палкоўнік з паходжаньня — князь. Маўклівая бездань часу, што стаяла паміж колішнім маладым вытанчаным наступнікам вядомага роду й сёньняшнім падобным да адладжанага мэханізму ваякам, міжволі прымушала паважаць гэтага чалавека зь лёсам, ахутаным таямніцай. Нешта казалі аб нейкім паўстаньні, заўчасна памерлай паненцы — ці то каханцы, ці то жонцы, — ды двох эўрапейскіх унівэрсытэтах. Але дакладна ніхто нічога ня ведаў. Зразумела было толькі тое, што сёньняшні палкоўнік — адно чалавек вайны. Вайна была яму мэтаю, сэнсам ды спосабам жыцьця ў гэтым сьвеце. Калі ён зьяўляўся на штодзённым афіцэрскім сходзе не ў гуморы, прыдзірлівы й скандальны, скрыўджаныя дурнымі ўеднымі заўвагамі афіцэры злосна жартавалі: „Ізноў сасьніў, што вайна скончылася!“ Але, хутчэй за ўсё, гэтак яно й было. Жыцьцё без вайны губляла для яго ўсялякі сэнс, ператваралася ў тупое жывёльнае йснаваньне. Усе добра памяталі, як у дзень, калі распачалася гэтая Грамадзянская, ён казённым коштам часта ваў увесь полк французскім шампанскім, ды ўпершыню, мажліва, за ўсю гісторыю ягонага палкоўніцтва гралі вайсковыя музыкі.
Усё гэта пранеслася ў галаве Балкевіча, пакуль ён слухаў простыя ды ясныя, нібы пісталетны стрэл, словы палкоўніка. А зь іх вынікала, што нейкі стары ягоны супольнік зрадзіў Вялікай ідэі й вырашыў выйсьці з вайны, распусьціўшы хаўрусьнікаў ды схаваўшыся з рэштаю людзей і сям’ёю ў радавым замку. З гэтае нагоды сотня гвардзейскага капітана Балкевіча павінна заўтра зраньня зьняцца з кватэраў, рушыць да камяніцы й любым коштам прымусіць зрадніка ў шэраг, або...
Штабны афіцэр з павагай праводзіў капітана з палкоўніцкіх апартамэнтаў. Балкевіч нехапатліва скочыў на свайго самлелага сьпёкаю гнедага й вольна рушыў шырокай, зьбітай конскімі капытамі сьцежкай. Яна вілася няроўнай зьмейкай сярод пабітых маланкамі ды пасохлых ад гарачыні клёнаў ды вязаў, што зялёным рэдутам абкружалі сьвежы зруб зь нізкім пакрытым шэраю дранкай дахам, дзе месьціўся штаб.
Балкевіч спакойна глядзеў уперад з выглядам чалавека,

спазналага заканамернае, прадчуванае шчасьце. Ён ведаў, што сёньня яму будуць зайздросьціць. Ого! Атрымаць гэтакі загад пасьля шматтыднёвага чаканьня! Ну й няхай! Усё, між іншым, правільна. Капітан усьміхнуўся й ледзь крануў круглыя конскія бакі сталёвымі астрогамі.

Пятніца, 13 чырвеня

Першыя ружовыя промні асьцярожна лізнулі халодны фіялет яшчэ начнога неба, калі сотня капітана Балкевіча кранулася зь месца. Старая графская кастэля — мэта сёньняшняга маршу — месьцілася ўсяго за некалькі дзясяткаў міляў ад мястэчка ў самым сэрцы велізарнае Пушчы, і капітан плянаваў ужо ўвечары стаць лягерам недалёка ад яе сьценаў. Доўгая сьпёка павінна была падсушыць збалацелы, вільготны лес, што давала шанец яго сотні пераадолець адлегласьць дастаткова хутка. Да таго ж стомленыя аднастайнасьцяй гусары гатовыя былі сунуцца куды заўгодна, толькі б разарваць нуднае кола бязьдзеяньня.

Добра наежджаная пыльная дарога шырокай шэрай зданьню ўзьнікала зь цемры й пакорліва клалася пад хуткія конскія ногі. Халодная перадранішняя цішыня зьдзіўленай нерухомасьцяй абхінала мешаніну прыглушаных гукаў — мяккага тупату капытоў, ціхага конскага храпу ды засяроджанага пакерхваньня вусатых вершнікаў. Пакінутае ў выгнутай сярпом лагчыне мястэчка яшчэ зрэдку нагадвала пра сябе далёкім сонным сабачым брэхам.

Мінула пара гадзінаў маўклівага маршу, калі разам з чырвоным сонечным кругам наперадзе ўзьнік нарэшце зубчасты край Пушчы. Незаўважна зьмяніўся краявід. Усё часьцей звыкламу да паўцемры воку сталі трапляцца высьветленыя цёплай чырваньню круглыя прыдарожныя ліпы, адзінокія бярозы ды дзе-нідзе раскіданыя купіны лазы. Яшчэ колькі хвіляў мернага рыпеньня сёдлаў ды зьвяканьня цугляў — і акуратная калёна дужых зухаватых ваяроў збочыла са зручнага шырокага гасьцінца, наўскос перасекла спаленую сонцам рудую сенажаць і схавалася пад важкія шаты лесу. Балкевіч заплюшчыў вочы, паволі ўдыхаючы густы, крыху вільготны водар сьвежай лясной зеляніны. Прызвычаеныя да пыльнае шэрасьці пачуцьці з натугай пагаджаліся вызнаць

сапраўднасьць навакольнае харашыні. Капітан крыху пацягнуў лейцы, прымушаючы паслухмянага гнедага сьцішыць хаду й збочыць. Прасека зрабілася вузейшай, і таму калёна расьцягнулася ў даўгі ланцуг. Балкевіч спыніўся на невялічкай палянцы, моўчкі прапускаючы прыціхлых ад нечаканага ляснога хараства гусараў. Сонца ўжо добра ўзьнялося й трусіла сваё агністае праменьне на сонную Пушчу.

Балкевіч сьцебануў па гладкім конскім крупе й рушыў вузкай сьцежкай за апошнім вершнікам, калі той ад'ехаўся мэтраў на дзесяць. Над галавою ў няроўных прагалах зіхацеў блакіт з рэдкімі празрыстымі аблокамі, падобнымі да малака, разьлітага па чыстай рачной вадзе. Здавалася — дастаткова працягнуць руку, каб схапіць іх далоняй. Капітан на момант падняў галаву, гледзячы ў нечакана блізкае неба, і зноў невідушча ўтаропіўся ў пругкія конскія вушы. Трывожныя думкі й старыя балючыя ўспаміны зароіліся ў галаве. Што ўяўляе зь сябе ён, капітан Балкевіч, у свае дваццаць дзевяць? Той самы Балкевіч, што яшчэ пяць гадоў таму шчыра расьсьмяяўся б з кожнага, хто паспрабаваў бы напрарочыць яму, эстэту й філянтропу, вайсковую кар'еру! Але ж вось ён пры поўным рыштунку і ўласнай коннай сотні шпацыруе раўнаць зь зямлёю непадатлівую шляхецкую камяніцу. Сто чалавек штодзень глядзяць яму ў рот, гатовыя выканаць любы ягоны загад, а сам ён з пакорлівасьцяй вышкаленага каня згатаваны цягнуць у жыцьцё вар'яцкія йдэі старога вар'ята-палкоўніка!

Спачатку было цяжка, потым зрабілася страшна, потым стала цікава, і нарэшце, калі ўсё пайшло, як па наежджанай каляіне, — абыякава. І што цяпер? Цяпер гэтая дурная Грамадзянская, ідыёцкая й марудная, калі кожны палкоўнік марыць зьвесьці на скон іншых ды стацца Адзіным. Цяпер — ён ізноў нясьпешкі едзе па старой Пушчы, каб выканаць чарговы бессэнсоўны крывавы загад і, мажліва, сустрэць сваю сьмерць.

Успамін пра сьмерць, нібыта пякучы ўдар далоняй па твары, спыніў шалёны карагод думак. Нібы зь якога дзіўнага чараўніцтва на душы паўстала густая дзікая цішыня. Сьмерць! Ані больш, ані менш, як лягічнае, заканамернае й неабходнае заканчэньне любога чалавечага жыцьця. Гаспадыня, перад якою роўныя ўсе — і паэт, і халаднакроўны злачынца, і абдраны вулічны жабрак, і ён, гвардзейскі капітан Балкевіч.

Балкевіч ехаў, прыглушаны ўласнымі думкамі, раз-пораз выхопліваючы вачыма важкія, навіслыя па-над прасекаю яловыя лапы, высокія, рудыя, мітусьлівыя мурашнікі ці абернутыя навальніцай агромністыя ствалы з вывернутым угару карэньнем. Але для яго, цалкам паглынутага нябачнаю працай нутранога пачуцьця, рэчы зьнешнія пакідалі толькі форму, дастойную адно хуткага пагляду. Вар'яцкі Сусьвет! Недарэчнае, сьмешнае чалавецтва! Кожны шугаецца аднае думкі пра сустрэчу зь Ёй. І сваім бессэнсоўным, нягодным спудам толькі набліжае гэты ў нечым сьвяточны й абсалютна непаўторны момант. Адзінае, што можна згатаваць да тае стрэчы, калі проста паважаеш сябе, — спакойнае, разьмеранае чаканьне!

Балкевіч падняў галаву, зьдзіўлены й нечакана акрылены сваім адкрыцьцём. Здавалася, што жыцьцё зноў набыло нейкі сэнс. Было ўжо зусім цёмна, калі ў шэрым прагале наперадзе зачарнелі няпэўныя сілуэты замкавых вежаў. Сьвятло ў адзіным жаўклявым акенцы цьмяна блішчэла сярод замёрлых муроў. Замак спаў. У цемры дзіка вухала сава. І людзям, і коням хацелася аднаго — хаця трохі спачыць. Густы купаваты алешнік хаваў ад пільных вачэй з кастэлі даўгую вузкую лагчыну збоч ад прасекі. Туды й рушыла маленькае стомленае войска. Прагрэтае за дзень паветра цёплаю коўдрай пакрывала росную зямлю. Засынаючы, Балкевіч нязвыкла мроіў шаўковістыя дзявочыя косы зь белымі рамонкамі й белы туман над зарослым пругкім аерам ставом.

Сыбота, 14 чырвеня

Вузкім ружовым паском сьвяціўся ўсход. Празрысты золак незаўважна, але ўпарта адціскаў важкую алеістую цемру кудысьці за вялікія дрэвы. Нерашуча й перарывіста сакатаў адзінокі конік на крывой алешыне. Балкевіч прачнуўся, нібы крануты за плечы маленькаю нябачнаю рукою, колькі часу нерухома глядзеў на рэдкія бляклыя зоры на сьсінелым нябёсным адхоне й нарэшце сеў, паціраючы далоняй крыху зацеклую шыю. Недалёка рыпнуў ботамі вартавы, перакладаючы ў руках важкі карабін, за сьпінаю трывожна захраплі коні. Капітан зь сілаю заплюшчыў вочы, патрусіў галавой і з кароткім шумным выдыхам скінуў зь сябе апошнія

рэшты сну. Галава была ясная й лёгкая, некалькі гадзінаў на гаючым лясным паветры цалком прагналі стому мінулага дня. Вялікі вецер узьняўся над гонкім гаманлівым лесам, горнучы да зямлі ягоныя ганарыстыя, упартыя шчыкі, але чамусьці амаль не кранаючы росны дол, па якім ужо соваліся, нібы мурашы, занятыя ранішнім клопатам сонныя гусары. І векавая Пушча, і маленькая чалавечая грамада ад самага ранку жылі сваім жыцьцём, зусім непадобным між сабою, але аднолькава напружаным і трывожным.

Балкевіч, седзячы верхам, з лагоднаю ўсьмешкай агледзеў прасторную зялёную лагчыну, раскінутых на сьвежай траве гусараў, што, сьнедаючы, прыцішана, але вольна й весела гаманілі, гладкіх расцугляных коней на ўзьлеску, і рашуча выехаў на жаўклявую пяшчаную стужку дарогі. Конскія капыты адразу загрузьлі ў цёплы цякучы пясок, гнеды незадаволена заматаў галавою, выгнуў шыю й рыўкамі крочыў наперад. Мінуўся пукаты ўзгорак, дарога весела пабегла ўніз па адхоне, а вачам адкрыліся, нарэшце, асьветленыя касымі ранішнімі прамянямі замкавыя муры.

Няроўны чатырохкутнік старавечнае кастэлі стаяў на невысокім круглявым узвышшы, амаль з усіх бакоў уціснуты лесам. Напэўна, калісьці ён меў аднолькава магутныя сьцены ўкруг, быў абведзены шырокім ровам з адмысловым пад'ёмным мостам. Сёньня ж з усяе былое недасяжнасьці засталіся толькі два перабраныя муры й трох'ярусная ўязная вежа на рагу. Балкевіч хмыкнуў, зазначыўшы ў думках, што сур'ёзна бараніць гэтай руіны наўрад ці можна. Рысяй вярнуўшыся да начнога лягера, Балкевіч загадаў перакрыць усе мажлівыя падыходы да замка заставамі, коратка накідаў старшыням плян на дзень і з трыма харужымі хутка ад'ехаў у бок чырвоных муроў.

Гучны стукат у старыя шэрыя дубовыя дошкі быў пачуты не адразу, ці, мабыць, з тога боку ня вельмі сьпяшаліся адчыняць маленечкае глядзельнае вакенца на абкаванай мэталёвымі пасамі важкай браме. Вочы, што бліснулі нарэшце з-за кратаў, поўныя дзіўнай сумесяй высакароднасьці, страху й нянавісьці загнанага ў кут зьвера, у маўчаньні перабягалі з капітана на ягоных сударожнікаў.

— Гэта замак графа...? — запытаўся Балкевіч, вытрымаўшы даўгую паўзу. Твар у акенцы моўчкі сьцьвярджальна паківаў.

— Калі ласка, перадайце ліст спадару графу й скажэце, —

капітан працягнуў вынятую з халявы капэрту, — што я буду чакаць ягонага парлямэнцёра з адказам празь дзьве гадзіны... каля вунь тога крыжа.
Балкевіч крыху павярнуўся ў сядле й паказаў рукой на сьвежы дубовы крыж ля дарогі мэтраў за дзьвесьце ад брамы.
— І яшчэ... Маё ймя — капітан Балкевіч. Перакажэце гэта графу, — у роўным голасе праскочыла засмучэньне й сардэчная стома. Вартаўнік зачыніў акенца, візыторы, рэзка завярнуўшы коней, рушылі прэч.
Чысты сухі пясок зь лёгкасьцяй паддаваўся рыдлёўцы. Гусары жартавалі й сьмяяліся зь дзівоснае ветлівасьці тутэйшых мясьцінаў, а раскіданыя стрэлкамі траншэі на пяць дзясяткаў стралкоў ды пукатыя рэдуты для артылерыі расьлі, нібы самі сабою. Сорак чалавек схаваліся ў недалёкім векавым ельніку, гарматы пасталі на свае месцы, жаўнеры ў чаканьні прылеглі на сьвежы пясок. Балкевіч дастаў гадзіньнік — да сустрэчы пад крыжам заставалася амаль тры чвэрткі гадзіны — нецярпліва кашлянуў і лесам паехаў укруг замку.
Тое, што адкрылася вачам гусарскага старшыні са схаванага лесам тылу цаглянага чатырохкутніка, было жахлівейшае за ўсе прадчуваньні. Будыніна, звонку сапраўды падобная да старога замку, з адваротнага боку выглядала хіба што на ўтульны фальварачак. Тонкія тынкаваныя сьцены, лёгкі чарапічны дах, шырокія вокны зусім нізка над зямлёю... Балкевічу адразу ж уявілася, як славутыя старыя ваяры ягонага імклівага рэзэрву ўвальваюцца, абдзіраючы ружовыя фіранкі й куляючы вядзерцы з кветкамі, у гэтыя сьветлыя вокны, расчыняюць пыльнымі ботамі дзьверы жаночых спалень ды са стрэламі й грукатам вернуцца на зялёны нутраны двор. Зрабілася агідна й сорамна. Капітан надзьмуў шчокі й шумна, павольна выпусьціў зь лёгкіх паветра. Апошнія рэшткі імпэту зьніклі, нібы ранішняя раса ў гарачых прамянях сонца. Трэба было вяртацца, і Балкевіч, тузануўшы конскія бакі абцасамі, рушыў па зарослай сьцежцы сярод высачэзных гонкіх ясеняў. Парлямэнцёр зьявіўся рыхтык у пару. Невялікія паўкруглыя весьніцы на браме на момант расчыніліся, прапускаючы ягонае хударлявае цела, і хуценька вярнуліся ў пачатковы стан абароны. Невысокі чалавечак амаль не хаваў сваёй узрушанасьці. Ён напружана абвёў круглымі вачыма паўсталыя шэрагі траншэй, нізка апусьціў галаву й з адчаем рушыў

уперад. Прымаючы з маленькіх рук ружовую капэрту зь пячаткай, Балкевіч убачыў у ягоных шэрых разумных вачах стому.
— Дзякую. Вы можаце вярнуцца ў замак, — холадна прагаварыў капітан, хаваючы пагляд.
Чалавек яшчэ раз абвёў сумным позіркам варожыя ўмацаваньні й асьцярожна пайшоў назад, уцягваючы галаву ў плечы. Калі дзьверы зачыніліся за ягонай сьпінай, Балкевіч, нібы агоўтаўшыся, хуткім рухам зламаў пячатку й разгарнуў графскі ліст. Роўныя прыгожыя радкі пакрывалі крыху шурпатую паверхню паперы шляхетнымі завіткамі.
„Вельмішаноўны спадар Балкевіч! Шчыра ўдзячны за перададзены Вамі ліст ад спадара палкоўніка. Мушу, аднак, зазначыць, што ўсе запрапанаваныя ім варыянты я лічу непрымальнымі, а аднойчы вырашанае мною ня маю ахвоты перайначваць. Усе заўвагі датычна мажлівых наступстваў зразумеў цудоўна, але гэта нічога ўжо ня зьменіць. Што тычыцца асабіста Вас, дык Вы, наколькі я разумею, салдат і павінны выконваць загад. З павагаю, граф...“.
Балкевіч хвіліну маўчаў, заплюшчыўшы вочы, потым павярнуў галаву да замерлых у чаканьні афіцэраў і мовіў: „Пачынайце!“
У жоўтых траншэях нібы надзімаўся пругкі шар напятага чаканьня, які нарэшце лопнуў рэзкім выбухам гучнага залпу. Воблачкі белага едкага дыму ўзьняліся над зямлёю, з шоргатам пасыпаліся аскепкі старой тынкоўкі з замкавых муроў, са звонам абрынулася ўніз разьбітае шкло. Ашалелая цішыня на момант абгарнула падрапаныя муры. Але ўжо праз імгненьне, быццам сухі гарох, пасыпаліся кароткія злосныя стрэлы. Кастэля адказала не адразу, павольна, але зь нейкаю незразумелаю годнасьцяй. Было відаць, што нешматлікія стральцы няроўна рассыпаліся па ацалелых ад часу вузкіх байніцах уздоўж муроў ды на апошнім паверсе прыземістае шасьцікутнае вежы. Раз-пораз ледзьве заўважнае празрыстае воблачка ўзьнікала зь цьмянага праёму, і куля ўзрывала жоўты пясок на пукатым бруствэры. Але няпрошаным гасьцям шэнціла куды часьцей.
Балкевіч стаяў, счапіўшы рукі на поясе й перабягаючы поўным нутраною скрухай позіркам то на ўжо пабіты сьвінцом, нібы зморшчаны твар старога замку, то на сваіх малайцоў, то на закіданую пяском траву пад нагамі. Ад пачатку ён цешыў сябе

цьмяным спадзевам, што некалькі дзясяткаў хвілінаў спорнае страляніны будзе досыць, каб прымусіць ганарлівых абаронцаў усьвядоміць нарэшце няроўнасьць сілаў ды капітуляваць. Але мінаў час, усё меней жывога месца заставалася на зьнявечаным замкавым чале, а нябачныя стральцы, лік якіх, адчувалася, ужо добра паменеў, працягвалі з зайздроснаю ўпартасьцяй уліваць гук сваіх стрэлаў у агульную кананаду. Здавалася, нібы параненае кволае кацяня шчэрыць тонкія белыя зубкі й адчайна сіпіць, заціснутае ў кут агромністым ваўкарэзам. Капітан адчуваў, што паўсталая яшчэ ад раньня нутраная сардэчная няўтульнасьць цяпер усё болей разьліваецца па душы, робячы пакутаю кожнае ймгненьне.
— Спадар капітан? — асьцярожны чысты голас маладога харужага загучаў з-за пляча Балкевіча. Капітан з пытаньнем у паглядзе зірнуў на афіцэра.
— Рэч у тым, што раніцой, вяртаючыся з заставы, — было відаць, што маладзён крыху нэрвуецца, відавочна, няўпэўнены, што ён пачуе ў адказ, — я меў прыгоду бачыць тыльны бок замку. Там зусім тонкія сьцены й вялікія вокны. Я падумаў, калі б пару дзясяткаў чалавек...
— Вы ўжо маеце загад? — спакойна перабіў яго Балкевіч.
— Так, але...
— Значыцца, выконвайце яго, — капітан гаварыў роўна й ветліва. Але ўсе ў сотні добра ведалі, што за вонкавай мяккасьцяй хаваецца мэталёвая настойлівасьць. Харужы высьцягнуўся й подбегам рушыў да сваёй траншэі.

Да Балкевіча неўзабаве падбег артылерыйскі старшыня, выслухаў, схіліўшы галаву, загад, казырнуў і борзьдзенька пашыбаваў да рэдутаў. Празь некалькі хвілінаў да звыклае ўжо мешаніны няроўнага грукату дадаўся зусім новы важкі гук. Цяжкія гарматы падаліся, вязнучы коламі ў пяску, крыху назад, а два круглыя парожнія ядры, апісаўшы парабалу над мёртваю прасторай паміж замкам і ўмацаваньнямі нападнікаў, ляснуліся ў нябачны нутраны двор. Нешта гучна трэснула, страшна заірзалі коні, на момант прыпыніліся стрэлы з круглых байніц вежы.
Тое, што адбылося наступнаю хвілінай, потым надоўга засела ў памяці бывалых ваякаў. Нават увечары, лежачы вакол начных вогнішчаў, старыя салдаты й маладзенькія афіцэры ўзгадвалі

гэтую падзею, ня ведаючы, зь якога боку падысьці да яе з ацэнкаю.
На нейкі момант бясконцая нітка страляніны парвалася, пакінуўшы ў паветры нязвыклую пустату. Празь некалькі ймгненьняў яна павінна была абрынуцца новаю хваляй сухога грукату. Але раптоўна прасторай запанаваў чалавечы голас. Моцны вецер прынёс ягоны гук ад параненай чырвонай вежы. У вялізнай аконнай нішы высокага другога паверху зьявілася дужая мужчынская пастава.
— Стойце! Не страляйце хаця хвіліну! Паслухайце! — гукнуў чалавек зь сівою барадой, у белай кашулі, вайсковых портках і старых ялавых ботах.
На кароткі момант ён замоўк, хутка абводзячы гарачым позіркам гусарскія шэрагі й міжволі сьціскаючыся ў чаканьні стрэлу. Але стрэлу не было. Чалавек, акрылены цішынёю, схапіўся за рэшты колішніх кратаў праваруч ад сябе й пасунуўся бліжэй да краю.
— Я хочу, каб вы ведалі! Нас засталося зусім мала. Але гэта наш выбар. Ніхто ня здолее адабраць ад нас волю! Вы прыйшлі сюды, каб прымусіць нас жыць, як хочаце вы. Але ведайце! Пакуль тут застанецца хаця адзін жывы чалавек, вам ня ўдасца забраць нашую свабоду й наш замак! Мы не збаяліся сьмерці, мы... — ён крыху нахіліўся наперад, і было добра відно, як напяліся жылы на ягонай моцнай шыі і як буйнымі кроплямі коціцца па маршчаватым твары пот. На момант перарваўшыся, ён зноў набраў поўныя грудзі паветра. Але раптам грымнуў стрэл. Адзінокі й нікім не чаканы. Стары рыўком павярнуў галаву на гук, што прыляцеў адкульсьці з-за рэдутаў, скалануўся, і ўсе ўбачылі, як па ягоным зьбялелым твары прабегла горкая прыгожая ўсьмешка, а па белай кашулі пачалі паволі расплывацца чырвоныя плямы. Вузлаватая рука кінула сваю апору, спрабуючы закрыць ірваную дзірку ў грудзях, стары згубіў раўнавагу й тузануўся наперад. У жахлівай напятай цішыні ягонае цела паляцела ўніз і важка ўпала на дол за некалькі мэтраў ад брамы. Ён ляжаў уніз тварам на жаўклявым пяску дарогі, і жыцьцё павольна пакідала ягонае дужае цела.
— Та-а-тка-а! — жудасны жаночы крык прарэзаў цішыню й прымусіў паўсталых у поўны рост гусараў адарваць пагляды ад пляцоўкі перад брамаю.

Тонкая дзявоцкая пастава маланкава зьявілася ў ваконнай нішы з рэштамі старых кратаў. Прыгожыя сьветлыя косы зьбіліся набок, поўныя жахам вочы дзіка блішчэлі. Яе хутка адцягнулі ад акна, але высокі напяты болем голас прымусіў усіх, нарэшце, схамянуцца.
Стары вусаты салдат зусім недалёка ад скамянелага Балкевіча гучна плюнуў, вылаяўся й злосна стрэліў, не прыкладаючыся, кудысьці ў рэльефную выяву графскага герба на вежы. Няроўным залпам адгукнуліся астатнія, і кананада ізноў павісла ў паветры. Але цяпер стралялі без імпэту, зь неахвотаю й абы як.
Душа Балкевіча разрывалася ад жахлівага болю. Ён ня чуў страляніны, ня бачыў нічога, акрамя распластанае фігуры ля брамы. Няўцямнаю галавою ён хутчэй адчуваў, чым разумеў, што адбываецца нешта страшэннае, тое, чаго не павінна было адбыцца. І віною гэтаму — акурат ён. Але чаму? І што рабіць? На гэтыя пытаньні адказаць ён ужо быў ня ў стане.
— Спадар капітан, прабачце, але людзі дагэтуль без абеду, стаміліся. Ці не загадаеце Вы... — ратавальны голас гаспадарчага старшыні вырваў Балкевіча з палону пачуцьцяў. Ён пільна паглядзеў афіцэру ў твар, нібы старому раптоўна сустрэтаму сябру.
— Канечне загадаю! Зараз жа ўсё спыніць і адвесьці людзей у лягер. Нешта са мною сталася... — услых заключыў Балкевіч і стомлена сеў на зямлю.
Сіняя паўцемра спусьцілася на дол. У нязвыклай цішыні гучна стракаталі конікі. Гусары туліліся да вогнішчаў, ратуючыся ад камарэчы, што немавед адкуль зьявілася ў цёплым нерухомым паветры, і ўголас гаманілі. Балкевіч устаў і, склаўшы за сьпінаю рукі, паволі рушыў па роснай траве. Думкі зноў, хаця й ня гэтак змрочна, як удзень, віліся ў яго галаве. Здарэньне са старым упарта не хацела пакідаць яго ў спакоі. Навошта ён палез на вакно? Няўжо яны сапраўды згодныя памерці, адстойваючы сваё права не ваяваць? Чаму стары граф не захацеў удзельнічаць у вайне, калі ваююць усе? Ці гэта сам граф у белай кашулі памірaў каля ўваходу ўва ўласны замак? Адказу не было. Балкевіч сам не заўважыў, як выйшаў на дарогу й пайшоў у напрамку да замку.
Вартавы спыніў цьмяную постаць рэзкім воклічам, але пазнаўшы ў прыцемку самога капітана, сумеўся й саступіў

убок. У некалькіх сотнях мэтраў чарнела вежа. Балкевіч добрую хвіліну глядзеў на яе, а потым, нібы нешта задумаўшы, рашуча рушыў наперад. Ягоныя ногі вязьлі ў цёплым пяску, з кожным крокам вежа нібы сама сунулася яму насустрач. Стала відаць ужо тое самае вакно, а ён усё йшоў і йшоў. Засталося ня болей за дзясятак крокаў. Балкевіч паволі апусьціў пагляд і ледзьве ня ўскрыкнуў. Застылае цела ўсё яшчэ ляжала зямлі. Холад прабег па сьпіне, зрабілася суха ў роце, гучна застукала сэрца. Напэўна, там за брамаю чакалі больш позьняга часу, каб забраць свайго героя. Крыху супакоіўшыся, капітан прысеў, аглядаючы сівую галаву, дарагую прыгожую кашулю, моцныя шырокія далоні... Чамусьці ўзгадаліся ўчорашнія думкі аб сьмерці, і ён міжволі ўзьняў позірк на замерлую вежу. Але там было ціха. Балкевіч уздыхнуў, падняўся ды патупаў уздоўж высокае аблупленае сьцяны з шэрымі хвалістымі валунамі пасярод чырвонае пальчаткі.
Ён ішоў, удыхаючы празрыстую цішыню. Сьцяна скончылася, і Балкевіч завярнуў за ейны востры рог. З правага боку маўкліва стаяў лес, зь левага цягнуўся роўны шэраг цёмных вакон палаца. Капітан крочыў, раз-пораз кратаючы пальцамі пабеленую тынкоўку. Вокны бліскалі мерцвою пустатою, але раптам... Балкевіч хутчэй зьдзіўлена, чым спуджана спыніўся. Адно акенца жыло. У глыбіні пакою рухаваю гарачай плямаю гарэла сьвечка. Капітан ня здужаў пераадолець нечаканага парыву і асьцярожна прытуліўся да шкла, заглядаючы ўнутро. Утульны пакой хаваў свае таямніцы ў цемры, і толькі адзін куток асьвятляўся полымем. Балкевіч сьцёр далоняй смугу, што зьявілася на шкле ад ягонага дыханьня, і разгледзеў невялічкі старадаўні абразок на сьценцы, сьвечку ў мядзяным сьвечніку на стале й маленькую дзявочую фігурку, што ўкленчыла перад высьветленым агнём лікам. Капітан сеў на вільготную зямлю, прытуліўшы галаву да цёплае сьцяны. На цёмным небе высыпалі буйныя ясныя зоры.

* * *

У нядзелю пятнаццатага чырвеня асабістым загадам гвардзейскага капітана Балкевіча аблога графскага замку была зьнятая. А ўжо ўвечары ягоная сотня вярнулася ў мястэчка на старыя кватэры. Праўда, сам капітан зьнік. Наладжаныя пошукі нічога не далі.

Жывое зялёнае гольле схілялася над вузкай лясной дарогай. Задумлівы гнеды паволі тупаў па роўным жоўтым пяску. Чалавек у вайсковым вольна сядзеў у сядле, спакойна гледзячы кудысьці ўдалячынь. Першыя цёплыя промні ранішняга сонца зьнічкамі сыпаліся на вільготны росны дол. Пачынаўся новы дзень.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 03-02-2001
[image]

Людка Сільнова
Юнак, падперазаны зьмяёй

Тваё імя

Імя тваё —
золку пунсовы
колер,
Мілы!
І стрэлы лятуць
з усяе ў чыстым
полі
Сілы!

Юнак, падперазаны зьмяёй...
Па чырвоным сьнезе
Зялёныя
Ручаі паплылі.
На голым кусьце —
Матылі расьцьвілі.

Дзень Волі!
Больш аніколі!

Навек мне запомніцца
Адзін з таго воінства —
Юнак, падперазаны зьмяёй,
А бровы — як птушка
Над Белай зямлёй!

Юнак, падперазаны зьмяёй —
Смарагд зялёны душы маёй,
Гары маёй старажытная тайна,
Скарб і алтар: перамен абяцаньне.
Гэты ваярскі,
Царскі рамень —
Выбліск маланкі,
Поўні прамень.
Гэтая карункавая,
Сярэбраная зьмяя —
Вужака, Эгле,
Балтыцкая зямля...
Юнак, падперазаны зьмяёй,
Зьліецца зь лесам, прыродай, травой.
Плашч яго — цемра навек паглыне...
Ён там, адкуль нам не варочацца, не!

Герой

Палюбіла малайца —
Духа, сына і айца!
Рух бясконцы
Той малойца!
Яго вобраз —
Сьвет і Дробязь.
Ён — Герой,
Упоравень з гарой!
Ягоны меч —
Упоравень з громам!
Празрысты замак —
Зь нябесным домам!
Сам — магутны,
Цень — нячутны.

Гуканьне

Што новага ў каханьні
Ты вынайшла, жана?
Яно — Другіх гуканьне,

А сьвету стан — Вясна.
„Жавароначкі, прыляціце!
Зямлю-матухну абудзіце!
А зімачку забярыце,
Бо Зімачка надаела...“
Жавароначкі,
Ваяры, духі староначкі,
Музыкі нябесныя,
Чакаю штовесну я!

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **03-02-2001**
[image]

Валянціна Аксак
Вершы

Абвестка

Шукаю кабету
сярэдняга веку,
сярэдняга целаскладу,
якая была апранутая
ў шэры гарсэцік
бязь верхняга гузіку
і дзіўны крыху андарак
з даўжэзных аркушаў,
на якіх безупынна
штось занатоўвала
драўлянай асадкаю
зь зялёным атрамантам.
Адметныя рысы:
зь цела бруіць
невыносны водар „Cabernet“,
„Magie noire“
і сьвежае спэрмы.
Усіх,
хто яе бачыў,
нешта чуў

ці ведае пра яе,
просім адгукнуцца
да брамніка капліцы,
што месьціцца пры цьвінтары
на вуліцы Падгорнай.

Варшаўскі акцэнт

Гуляю па рынкавым Пляцы.
Ад маладога тлуму
Старога Места
стамляюся
ды йду
ў рудыя прысады
Гданьскай узьбярэжнай
пасядзець у самоце
пракаветных шляхцянак,
а яны абмяркоўваюць
Чэся зь Нясьвіжу,
як ён зь імі танчыў
на астатнім балі на Вавэлі,
зачапляюць і Яна,
які ў Вільні зблытаў
„кракавяка“ з тутэйшым „мікітам“,
потым згадваюць Зосю,
якая нядаўна дазналася,
што ўсё ж ейны Мірак
ня ўцёк у Парыж з Малгажатаю,
а застаўся ў Катыні…
Наўмысны акцэнт
іх заходне-краёвай гаворкі
надае маім мроям
нясьпешную рытміку руху,
бязмэтна заходжу
ў Дом літарацкі,
у якім сёньня чэсьцяць
красамоўнага пана Ружэвіча,
а ён адмаўляецца
чытаць свае вершы,
няўжо адчувае,

пра што ў гэтай залі
выпадковая
думаю я
ім забытаю
мовай Статуту.

Эпітафія

Тут спачывае жанчына,
якой Бог паслаў
дастаткова,
каб шчаснай памерці:
зграбнае цела
і мноства густоўных прыбораў,
якія прывабна яго агалялі;
розум дасьціпны,
аздоблены здольнаю,
нат не бяз таленту,
звычкаю вершы складаць;
палкім каханкам,
які да таго ж
быў і бацькам
выбітных і гожых сыноў;
трапяткою душою
і сэрцам чульлівым...
Пэўна, таму,
выпадковы мінак,
ты й ня ведаеш,
хто тут ляжыць.
Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 01-02-2001
[image]

Андрэй Хадановіч
Казімеж

Я прыходжу на Казімеж
пахіснуць свой гойскі імідж —
рыхтык кракаўскі габрэй,
што спрадвеку вёў тут рэй.
Размаўляю беларускай,
але кемлівыя ногі
крочаць вуліцаю Вузкай
да Высокай сынагогі.
Вечнасьць чуецца ў этэры,
у дамох — знутры і звонку.
Рушу вуліцай Эстэры
й раптам згадваю пра жонку:
запасочаньні на сэрцы,
цьвеліць рэўнасьць самазманам
(ўсе мы трохі Артаксэркcы,
справу маючы з Аманам).
На блізу музэйным бруку
ля Старое сынагогі
дзеці граюць у апуку.
Ой, ратуйце, пэдагогі!
Кожны граў, прынамсі зрэдку,
і ў міноры, і ў мэнору:

бы кампутар у разэтку,
ён улучаны ў прастору,
у кагал, то бок у гміну
запаволенага чыну;
покуль тахкае гадзіньнік,
але хутка будзе вынік.
Будзе тайная вячэра
ў слыннай страўні „Арыэль“,
потым вогнішча і сера,
і гарачая купель...
Штучны рай для небаракаў.
Апантаных гояў статкі.
„Арыэль“. Казімеж. Кракаў.
Падарожныя нататкі.
Кракаў, габрэйская дзяльніца Казімеж

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **01-02-2001**
[image]

[image]
A R C H E **M e d y c y n a** **№ 9 (14) – 2000**
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
Мірыка [image] 2000
» да Зьместу «
[image] [image] [image]

Мікола Раманоўскі Епикграмма на законъчене преложеня Трыщанова

ласкаве тое поправити.

Ныне повести сея доконано справне,
Яко Ердинъ поконалъ славнаго Трыщана.
Се есми прыправилъ ю вреште о съконъчене,
Дбанемъ може велиемъ, да малымъ оуменемъ.
Зацъны чытелнику, рачъ ей не гребовати
Ани зла на тлумача въ срдцу не ховати,
Лечъ што ся знаиде неслоушне выписано,

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 9 (14) – 2000

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **03-02-2001**
[image]

Лісты Ўладыкі Васіля (Тамашчыка) да Юркі Віцьбіча

---

*Сярод нас, даволі немалой грамады беларусаў на эміграцыі, ёсьць (а часам ствараюцца) фігуры знакавыя — у літаратуры мы пазначаем іх як **Постаці**. А які эпітэт больш пасуе да Постаці, чымся „неадназначная“?*
Вось і два галоўныя героі публікацыі — аўтар ды рэспандэнт — бясспрэчна належаць да такіх. Імя апошняга, Юркі Віцьбіча, ужо не патрабуе, дзякуй Богу ды публікатарам, асаблівых камэнтароў. Гэта проста клясык нашае літаратуры. І нават тым-сім прызнаны.
Аўтар жа лістоў — фігура іншага пляну, але таксама — Постаць. І хоць у ягонай біяграфіі ёсьць нават дырэктарства ў Беларускім Інстытуце Навукі й Мастацтва, 50-я ўгодкі якога будуць цяпер адзначацца, у нашую гісторыю, гісторыю беларусаў, мэтраполіі й дыяспары, ён увойдзе інакш.
Будучы архіяпіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы Васіль — Уладзімер Тамашчык — нарадзіўся 15 красавіка 1900 г. у сям'і Данілы й Марыі (з Жанеўскіх Тамашчыкаў) у вёсцы Вялікія Азяраны Гарадзенскага павету. Сям'я была

заможная — не па нашых мерках, а на думку самога Ўладзімера. Яны набылі маёмасьць у Дублянах, каля мястэчка Вялікая Бераставіца таго самага павету, куды ў 1913 годзе й перабраліся. Вось толькі вайна, міграцыі войскаў, сусьветныя пертурбацыі выпхнулі сям'ю на выгнаньне — у чужы, экзатычны сібірскі Омск, дзе Ўладзімер скончыў у 1920 годзе сярэднюю школу. Адсюль, ня толькі фізычна, але й псыхалягічна сфармаваўшыся, Уладзімер разам з маці й братамі — Аляксандрам, Язэпам, Міхасём — вяртаецца ў Дубляны, пакінуўшы на омскіх могілках бацьку, а дзесьці на франтах першай сусьветнай — старэйшага брата Янку.

Гэтыя гады — гады вяртаньня — сталіся й гадамі далучэньня да беларускага руху. Даволі пасьпяховага й прыкметнага; настолькі, што ў 1927 г. польскія ўлады арыштоўваюць Уладзімера й засуджваюць на тры гады. Пасьля вызваленьня прага да навукі прывяла звыклым шляхам, як на той час, у Прагу, дзе будучы сьвятар падае паперы на агранамічны факультэт. Навучаньне на факультэце, які Ул. Тамашчык скончыў у 1934 г., ішло побач зь беларускаю працаю. Пэўны час Уладзімер быў сакратаром Васіля Захаркі. Адсюль, з залатой Прагі, Тамашчык вярнуўся на Беларусь, у родныя Дубляны ў 1941 г.

Ягоная далейшая беларуская дзейнасьць адбывалася на Беласточчыне: праца разам з Хв. Ільляшэвічам ува ўправе Беларускага Нацыянальнага Камітэту, у рэдакцыі газэты „Новыя дарогі“. Адсюль Ул. Тамашчык выехаў у Менск, на Другі Ўсебеларускі кангрэс.

Пералом у лёсе Ул. Тамашчыка пачаўся ўжо ў Нямеччыне, у 1946 г., калі ён папрацаваў лектарам-асыстэнтам у заснаваным для ваенных уцекачоў унівэрсытэце, пабыў старшынём Цэнтральнага Беларускага Камітэту. Менавіта тады, у 1946 г., япіскапат Беларускай Аўтакефальнай Царквы амаль у цэлым сваім складзе зрокся абвешчанае аўтакефаліі ды перайшоў у Зарубежную Русскую Православную Церковь. Праз два гады, 4–5 чэрвеня 1948 г., у горадзе Канстанцы (Француская зона) адбыўся зьезд праваслаўных беларусаў. Гэты зьезд стаўся вырашальным у чарговым адраджэньні БАПЦ. На ім была прынятая наступная пастанова: „Асноўваючыся на ідэі Грыгора Цамблака [аб]

[1] Лісты Уладыкі Васіля (Тамашчыка) перахоўваюцца ў прыватным архіве Л. Юрэвіча. Біяграфія друкуецца паводле публікацыі ў газэце

незалежнасьці Беларускай (Вялікага Княства Літоўскага) Царквы ды змаганьні за яе зьдзяйсьненьне пазьнейшых беларускіх праваслаўных іярархаў, духоўнікаў і вернікаў, законнасьцю мітрапалітам Менскім Мельхісэдэкам у 1922 г., устанавіўш[ым] Беларускую Праваслаўную Аўтакефальную Царкву, Зьезд сьцьвярджае, што тры [я]пархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы (Віленская, Горадзенская й Пінская) атрымалі дазвол на аддзяленьне й прызнаньне ад Мітрапаліта Варшаўскага і Ўсяе Польшчы, Блажэньнейшага Дыянісія — галавы Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, дадзеныя ім на рукі Мітрапаліта Аляксандра Пінскага. Дзеля таго, што перад Менскім Усебеларускім Праваслаўным Саборам існавалі толькі тры [я]пархіі, стварыўшыя наступныя [я]пархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы, Зьезд сьцьвярджае кананічнасьць Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы“.

23 красавіка 1949 г. архіяпіскап Сяргей пастрыгае Ул. Тамашчыка ў манаскі сан, 5 чэрвеня пасьвячае ў ераманахі, 9 верасьня надае годнасьць ігумена. 19 сьнежня архіяпіскап Сяргей і япіскапы Платон і Васіль са згоды Сынода Ўкраінскай Аўтакефальнай Царквы высьвяцілі ігумена Васіля Тамашчыка — спачатку на архімандрыта, а затым і на япіскапа.

З таго часу да самой сьмерці (9.06.1970) было зроблена Ўладыкам Васілём нямала: высьвячэньне новых беларускіх сьвятароў (адным зь першых стаўся а. А. Крыт), заснаваньне часапісу „Голас Царквы“, шматлікія падарожжы — наведваньні праваслаўных беларусаў у дыяспары. Пра дзеі Ўладыкі Васіля — у газэтах „Бацькаўшчына“ і „Беларус“, рэлігійных ды сьвецкіх беларускіх выданьнях, у ліставаньні.

Чытаючы лісты Ўладыкі Васіля, дзівуешся аднаму: куды так хутка зьнік Тамашчык, адкуль гэтае непрыманьне іншадумства, нават проста — думаньня, нелюбоў да інтэлігентаў, пачуцьцё мэсыянства, няхай і беларускага, веры ў адно праваслаўе ды адмаўленьне ўсіх іншых Цэркваў — ня толькі расейскай ці, як казаў Васіль, маскоўскай, але і беларускіх: Каталіцкай, Уніяцкай? Мо якраз гэта і нясе праваслаўе, бізантызм, ад якога пазбавіцца — нават самым шчырым беларускім патрыётам — не ўдаецца. Калі гэта наагул магчыма.

Лісты друкуюцца з купюрамі, з захаваньнем правапісу арыгіналу[1].

* * *

Бруклін, 2.15.1954.
Высокадастойны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!
Шчыра дзякую за Ваш мілы ліст, за Вашыя павіншаваньні з павышэньнем мяне ў сане ды асабліва за Вашае перасланьне мне копіі Вашага ліста да сп. Ан. Адамовіча. Перадусім хачу Вам запраўды шчыра падзякаваць за тое, што толькі Вы адзіны з усіх нашых інтэлігентаў належна зразумелі маю АХВЯРУ, маё становішча й мае абавязкі. Некалі, на працягу двух гадоў, уся нашая інтэлігенцыя блізу на каленях упрашала мяне ўступіць на гэты мой цярністы шлях ды ўрачыста шлюбавала мяне на ўсебаковую падтрымку. На працягу двух гадоў я ўпіраўся, бо крыху разумеўся на рэлігійных справах, добра разумеў, які цяжар маю ўзяць на свае слабыя плечы ды зь якою вялізарнаю цемраю прымушаны буду змагацца. Урэшце, калі не знайшлося ніякага выхаду, я падумаў: няхай будзе воля Божая, супольнымі сіламі ратаваць будзем наш гонар, нашу сьвятую справу, справу, за якую загінулі безьліч нашых найлепшых братоў і сёстраў: мітрапалітаў, япіскапаў, сьвятароў, паэтаў, пісьменьнікаў, мастакоў, навукоўцаў, студэнтаў, настаўнікаў, не гаворачы ўжо аб найлепшых нашых гаспадарох-сялянах. Сам я паходжу з багатае сялянскае сям'і, якая страшна пацярпела ад бальшавікоў, да таго я таксама думаў, што буду паэтам, навет прызнаюся Вам, што пару маіх вершаў былі надрукаваныя, праўда, я ўрэшце пераканаўся, што ня маю на гэта неабходнага дару Божага, таму пакінуў гэтую сваю мару. Безумоўна, гэтая „адмова" не абыйшлася мне лёгка, перацярпеў я ня мала, але ўрэшце падумаў, што, відаць, Бог прызначыў для мяне нешта іншае. Свой нахіл да паэзіі я выкарыстаў у тым сэнсе, што зусім лёгка вывучаў напамяць усякія вершы: я й сягоньня яшчэ магу расказаць напамяць блізу ўсе басьні Крылова, Хемніцэра, шмат вершаў Пушкіна, Лермантава ды іншых расейскіх паэтаў, а пасьля, калі стаўся сьведамым беларусам, асабліва палюбіў М. Багдановіча, бальшыню вершаў якога зараз жа вывучыў напамяць, другім маім „богам", ясна, стаўся Янка

Купала, а пасьля Я. Колас, Цётка, Аляхновіч, Танк, Арсеньнева, Геніюш, Васілёк, бязумоўна, і Ул. Жылка. Кажны паэт, асабліва наш, для мяне — таксама сьвятар, і ў свой час, у Бэрліне, я „рэзаўся“ з нашымі сучаснымі паэтамі, бо мне хацелася, каб яны пайшлі па шляху ня толькі Купалы, але перадусім Багдановіча: падымалі нашую паэзію да ўзроўня Гётэ й гэтым выводзілі нас у „людзі“. Нажаль, паэты не зразумелі мяне, можа таму, што мы ня маем дасюль адпаведнага літаратурнага крытыка.

Разам з гэтым зьверуся Вам і ў тым, што я пасьля захацеў стаць запраўдным прафэсарам, і я ім бы стаўся, калі-б не цяжкія матарыяльныя ўмовы, бо асыстэнтам ужо быў. І толькі тады, калі я даў згоду ўступіць на духоўны шлях, я зразумеў, чаму я ня стаўся прафэсарам: гэта была воля Божая, Ягоная воля была ўзлажыць на мяне мой цяперашні цяжкі крыж. Гэта я дакладна зразумеў, калі быў хіратанізаваны. А калі зразумеў, дык сказаў сабе: мусіш нясьці гэты крыж з гонарам, Богу на славу, а нашаму народу на дабро й карысьць. Таму я пачаў старацца, каб нашая інтэлігенцыя ня то што сплачвала мне свой доўг, бо-ж шлюбавала, але каб і яна зразумела свае заданьні на рэлігійнай ніве, асабліва па лініі нашае царквы. З сп. Ан. Адамовічам я быў у прыяцельскіх дачыненьнях ужо раней, і падумаў сабе: вось маю скарб перад сабою, бо запраўдная ідзе ставіў яго вышэй кажнага іншага нашага інтэлігента, і пачаў пробаваць прыцягнуць яго да „супрацоўніцтва“. І пачаліся мае расчараваньні. І да сяньня ня магу зразумець — у чым прычына? А ўважаў, што сп. Адамовіч — разумны розум, але, калі ён пачаў супраць выступаць рэлігіі, я пачаў сумлявацца ў ягоным розуме. У мяне характар такі: нікому не гавары прыкрых словаў, тым болей не „рабіць“ шкоды, навет ворагу мне ня хочацца спрычыняцца, бо маё сэрца само баліць пры гэтым. Тым болей (мяне) ніколі ў галаву не прышло — выступаць з прыкрымі словамі супраць Адамовіча. Тымчасам, ня ведаю чаму, усё роўна, згодна з інструкцыі, ён жыць ня мог і ня можа, каб не спрычыніцца нейкую прыкрасьць, да таго часам нязвычайна балюча. Але вось хачу сказаць пару слоў адносна ягонага „ўчынку“ з гэтымі двама вершамі ў „Ведзе“[2]. „Ведзе“, не дасылаюць, хоць некаторыя ўкраінскія сьвятары

[2] Гаворка ідзе пра публікацыю Анатоля Іванова “Адамовіч — у часе і ў вечнасці” // Царква. Веды. Жыцьцё. 1955. № 1. С. 4–5.

атрымоўваюць, і за гэта я на іх ня гневаюся. І вось прыходзяць да мяне людзі й кажуць: Уладыка, што Вы будзеце рабіць? У чым справа, пытаюся. А вось, калі ласка, прачытайце. Чытаю й сваім вачам і вушам ня веру, страх мяне агарнуў: та-ж гэтыя вершы прачытаюць чужыя людзі, а мы ўсюды гаворым, што Беларускі Народ — рэлігійны й змагаецца супраць бязбожнага бальшавізму, а тут сама Беларуская інтэлігенцыя ў сваім „навуковым“ воргане так страшна выступае супраць Бога! Што гэта: бязглузьдзе або правакацыя? Не мая гэта справа судзіць, але мая справа й мой абавязак перадусім перад сваімі абуранымі вернікамі зарэагаваць. Як? У прэсе? Не, завялікі быў бы скандал і ганьба для нас. Толькі, уздыхаю з палёгкаю, добра для мяне тое, што гэтыя вінавайцы — каталікі, таму няхай іх судзяць каталіцкія сьвятары, а я абмяжуюся толькі пару словамі ў Царкве. І я сказаў у Царкве даслоўна наступнае: дарагія мае, мне вельмі прыкра, але мушу сказаць вам, што ў „Ведзе“ між вершамі Ул. Жылкі былі надрукаваныя два страшна блюзьнерскія вершы „Марта“ й „Альбігоец“. Уважаю, што яны не маглі быць надрукаваныя сяньня навет у сучасным бязбожніцкім Менску. Я забараняю вам трымаць гэтыя два вершы ў сваіх памяшканьнях. Прашу выканаць гэтую маю просьбу, каб Бог быў з вамі.

Як бачыце, я спэцыяльна падчыркнуў: *між вершамі* Ул. Жылкі, чым даў зразумець нашым людзям, што я не пераканаўся, што яны запраўды вершы ягоныя. Па-другое, яшчэ падчыркнуў: *гэтыя два вершы*, значыць, усе іншыя — добрыя. Дык выраз — „анатэма“ — пустая й злосная дэмагогія пустых і злосных людзей. Мяне навет некаторыя папракалі, што я замякка выказаўся, але я лічыў і лічу, што свой абавязак выканаў, а суд належыць Богу. Я толькі ўважаю, што культурны, інтэлігентны чалавек шануе сьвятыя пачуцьці другіх, тым болей сваіх супрацоўнікаў-суродзічаў. Я асабіста навет ніколі не нападаў на сп. Адамовіча за ягонае бязбожніцтва, а толькі адбіваў ягоныя брудныя атакі, бо, па-першае, уважаў: няхай яго судзіць Бог, а па-другое, гэта аснова дэмакратыі, навет да такога „апартунізму“ я зышоў у дачыненьні да сп. Адамовіча. Тымчасам, што ён сказаў у сваім рэфэраце на Акадэміі 25 Сакавіка перад некалькімі сотнямі людзей, сярод якіх было каля сотні чужынцаў? „Мы змагаемся за Дэмакратычную

Беларусь, але тут сярод нас ёсьць такія, якія хацелі б завясьці ў нас дыктатуру! Няхай згарыць такая Беларусь!“. Думаю, камантароў Вы не патрабуеце. Сп. Адамовіч уважае, што ў нас будзе дэмакратыя тады, калі будзе ягоная бязбожніцкая дыктатура?! Мае гэта быць здаровы розум? Мог бы сп. Адамовіч быць міністрам у прэзыдэнта Айзэнгаўэра, які кожную Нядзельку наведвае Царкву й кажны дзень чытае сьв. Пісьмо? Я толькі дзіўлюся, чаму сп. Адамовіч стаўся эмігрантам.

Цяпер, чаму я ўважаю, што гэтыя два дзіўныя вершы былі або зусім ня Жылкам напісаныя, або напісаныя пад прымусам? Бо яны абодвыя ня згодныя з праўдай. Верш „Марта“ мог бы быць вершам „Марыя“, бо толькі на яе Хрыстос зьвяртаў увагу, на што навет Марта скардзілася, а што да „Альбігойца“, дык гэта абсалютная хлусьня, і яе Жылка, які быў у Празе й добра ведаў гісторыю гусытаў, сьвядома дапусьціць ня мог, а камантар у „Ведзе“ — „альбігойцы сталіся пасьля звычайнымі бандытамі“ — таксама абсалютная ігнарацыя ды ілжа! Вы зусім слушна гаворыце аб альбігойцах, што гэта была сэкта супрацьпапская, але глыбока веруючая ў Бога, як і гугеноты й гусыты й шмат іншых. Розьніца між альбігойцамі-гугенотамі й гусытамі толькі тая, што апошніх папам не ўдалося поўнасьцю вынішчыць. І гэта Жылка ведаў лепш за Адамовіча, таму тут наяўны фальсыфікат, які, аднак, апошні з радасьцю выкарыстаў для свайго актыўнага бязбожніцтва, магчыма, з задняю думкаю, што я не зьвярну на гэта ўвагі, што ён некалі ізноў выкарыстае супраць мяне.

Ваш ліст да сп. Адамовіча калі не навуковы, дык запраўды вельмі паважны й вартасны. У адным, аднак, не магу з Вамі згадзіцца, а менавіта: „Выдаючы зборнік твораў Ул. Жылкі, нельга абмінуць ні „Марты“, ні „Альбігойца“, „калі рэдактар поўнага збору твораў пройдзе паўз іх, гэта будзе нячэсным учынкам у дачыненьні...“. Вось жа па-першае, гэта ня поўны збор твораў, а па-другое, выдаецца на эміграцыі, дзе ня можна сьцьвердзіць усяе праўды адносна генэзы гэтых вершаў, ды, па-трэцяе, калі ўкраінцы выдаюць творы Шаўчэнка, ніколі не зьмяшчаюць ягонае просьбы аб памілаваньні да цара! А самі скажаце, што просьба аб памілаваньні й гэтыя вершы — вялізарная розьніца! Калі там — устыд, дык тут — ганьба. Мне здаецца, што Вы тут зрабілі для сп. Адамовіча вялікую

канцэсію[3].

Памяць Ул. Жылкі для мяне таксама сьвятая, і „анатэме“ аддаваць яго я не зьбіраўся й не зьбіраюся, але магчыма аддаў бы анатэме тых, што нясумленна выкарыстоўваюць яго для сваіх, нязвычайна шкодных нам цяпер, няпрыгожых мэтаў. Тымчасам я навет не ўспомніў імёнаў іхных, бо лічу сябе слугою Спаса нашага, а Ён мілаваў найбольшых грэшнікаў, ды разбойніка на крыжы ў апошнюю хвіліну, таму мне хочацца верыць, што й гэтыя нашыя грэшнікі некалі апамятаюцца, прыйдуць да розуму, хаця цяпер мне й вельмі цяжка на сэрцы… Бо вось нядаўна адзін украінскі сьвятар, які атрымоўвае „Веду“, паказвае гэтыя вершы й пытаецца ў мяне: „Уладыка, што гэта ў вас робіцца? Ці Вы ня ведаеце ці ня чыталі гэтых вось вершаў? Гэта-ж адзін страх! Што Вы будзеце рабіць?“. (Гэты сьвятар сам быў у савецкім канцатраку й кажа, што так паскудна не пісаў навет Дзям'ян Бедны. І навет там знайшліся людзі, якія адказалі яму (Ясенін). Я адказаў яму, што ў Царкве сказаў, а ён кажа мне: Уладыка, слаба, мала. Тады я сказаў яму, што выдаўцы „Веды“ каталікі, няхай каталіцкія сьвятары рэагуюць мацней. Ну, тады Вы ў парадку, адказаў ён мне.
Вельмі дзякую Вам, што Вы прыпомнілі яму тагачасны мой выступ у Рэгензбурзе ў Вашай справе. Паняцьце справядлівасьці й сардэчнасьці жыве ў маім сэрцы ад дзяцінства. Наш пакойны бацька яшчэ за цара пазычаў людзям грошы часта безь ніякіх вэксалёў, і часам прыходзіў да яго такі дзядзька й кажа: вось, Даніла Грыгор'евіч, табе 105 рублёў і вып'ем за тваё здароўе, што ты быў такі добры, выратаваў мяне зь бяды, даў мне 100 рублёў і навет бяз вэксэля. Чуючы такое, мы, дзеці, аж плакалі ад радасьці. Такімі засталіся і ўсе мае браты, якія пасьля ў Польшчы, будучы ўжо на вялікім хутары, раздавалі людзям каму 3, каму 5 пудоў жыта, гаворачы толькі: прыдзеш летам адробіш. І такім застаўся я да сёньня. Усім бы мне хацелася дапамагчы, усякаму сказаць добрае слова, усіх мець за братоў сваіх, а ўжо, барані Божа, некаму прыкрасьць або шкоду спрычыніць. Нажаль, цяжкое нашае жыцьцё, ламае людзей, паскудзіць, паніжае й часта найлепшая воля нічога не памагае, бо шатан моцна сядзіць у сэрцах многіх людзей, аднак, Бог міласьціў, паводля сілаў нашых будзем і далей змагацца з шатанам.

Зь вялікаю прыемнасьцю буду маліцца за Вас, бо і ў гэтым мая радасьць.
Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас і ахіне сваёю Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.
З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце
Архіяпіскап Васілій.

* * *

Бруклін. 2.11.1955.
Вельмішаноўны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!
Шчыра дзякую за Ваш мілы ліст і тры копіі[4]. Я ўжо даўно пакінуў „палітыку“, аднак і далей цікаўлюся нашым эміграцыйным жыцьцём, асабліва грамадзка-культурнага характару. Стала паглыбляючы свае веды ў багасловіі, я ўсё болей пераконваюся, што адзінаю душою жыцьця людзей і народаў, маторам іх дзейнасьці й поступу зьяўляецца Абсалютны Дух як выраз усякае Дасканаласьці, Праўды, Дабра й Красы. Нажаль, пасьля сьв. Ефрасіньні, асабліва ж сьв. Кірылы Тураўскага, М. Сматрыцкага ды яшчэ пару падобных да іх на ніве царкоўнай, ды Ф. Скарыны, Янкі Купалы ды асабліва Максіма Багдановіча на культурнай, мы, дзеля незалежных ад нас прычынаў, былі пазбаўленыя магчымасьці карыстацца бязьмежнаю сілаю дзеяньня гэтага Абсалютнага Духа ў сэнсе творчага выкарыстоўваньня гэтае сілы для нашых духовых, а гэтым і культурных дый матарыяльных патрэбаў. І вось, чытаючы Вашыя копіі, я, шчыра кажучы — ня дзеля курэньня фіміаму перад Вашай асобай — адчуў веяньне гэтага Духа, адчуў, што Вы сьведама ці нясьведама, аднак, блізкія Яму, таму вось з прыемнасьцю чытаў гэтыя Вашыя разважаньні. Пры гэтым мне прыпомніліся словы вялікага мудраца — сьв. Ап. Паўла: Калі вораг твой галодны, накармі яго, калі ён хоча піць, напаі яго, бо гэтак робячы, ты зьбярэш на галаву яму вугальле гарачае!
Я ўжо ад даўжэйшага часу зьяўляюся непахісным вызнаўцам таго, што аснаўным носьбітам Абсалютнага Духу зьяўляецца Царква. Хрыстос Сам збудаваў Яе й даў Ёй Сваяго Духа для дабра людзей, каб яны з дапамогаю Яго,

[4] Для Юркі Віцьбіча было характэрным друкаваць ліст у некалькіх копіях і потым рассылаць сваім рэспандэнтам. Гэе самае ён рабіў і зь лістамі, што прыходзілі на ягоны адрас.

Духу, маглі тварыць скарбы ня гінуючыя, пазнаваць запраўдную Красу ды імкнуцца да Яе, тварыць Валадарства Божае на зямлі, зразумеўшы тое, што мы сваім людзкім духам падобныя Богу, таму й супольнікі Яго ў выкананьні Ягоных плянаў адносна нашага прызначэньня.
У гэтым сэнсе перад намі, людзьмі, неабмежаваныя прасторы дзейнасьці для тварэньня хараства, красы, дасканаласьці, а гэтым і запраўднае радасьці ды матар'яльнага дабрабыту, бо-ж увесь сьвет з усімі ягонымі багацьцямі Бог прызначыў для нас і сказаў нам: бярыце, карыстайце, будзьце задаволеныя й шчасьлівыя, толькі ведайце адно, што гэта ўсё Я даў вам. Больш таго, Я даў вам яшчэ нешта каштоўнейшае: частку Сябе, каб Вы маглі тварыць, каб усё кругом Вас зьзяла сьвятлом Мае Дасканаласьці, Маяго Хараства!
На вялікі жаль, ані адна царква (я разумею тут духавенства), ані Праваслаўная, ані Каталіцкая, ані Пратэстанцкая, ужо ад даўгіх стагодзьдзяў не разумела й не разумее гэтага нашага прызначэньня, гэтага нашага гонару, гэтых нашых неабмежаваных магчымасьцяў. Тое, што я чую й бачу навет цяпер, у нашыя апакаліптычныя часы, з боку Расейскае Праваслаўнае Царквы (аб маскоўскай не гавару), а таксама з боку Рыму, ясна й выразна сьведчыць нам: нічога не разумеюць, па фальшывым шляху й далей ідуць, таму яшчэ нямала бяды могуць пражыць, бо асабліва тут фальш караецца.

Выходзячы з гэтага разуменьня ды ведаючы, што сярод нашых беларускіх духаўнікаў няма такіх, хто хоць бы крыху разумеў голас Божы й Волю Яго ды хоць крыху стараўся чынамі сваімі паказаць гэтае разуменьне, я сваго часу падумаў: Бог даў нам нарэшце Сваю царкву не надарэмна. Ён нечага чакае ад нас, чакае, што можа мы зразумеем добрую для нас Волю Яго, таму й пачнем паводля гэтага жыць і дзеяць. А таму, што адзін у полі ня воін, я пачаў разглядацца па сваіх людзях, і сваго часу падумаў: вось спадар Ан. Адамовіч! Нязвычайна моцны дух, глыбокі разгляд, дар слова ды вялікая эрудыцыя. Трэба паспрабаваць здабыць яго, а калі нас будзе два, з часам будзе болей, мы заложым базу для запраўднае духовае дзейнасьці, сьвятло Божае пойдзе па іншых, пачнем будаваць, тварыць

скарбы нягінуючыя на карысьць перадусім нам, Беларусам. Для гэтага трэба толькі пазнаць, ці сп. Адамовіч разумее, што крыніца ўсякага Добрага Духа ў Богу, а ў выпадку патрэбы пераканаць яго. Нажаль, прышлося расчаравацца. …
Шчыра й сардэчна вітаю Вас, даражэнькі спадар Віцьбіч, жадаю Вам добрага здароўя, радасьці духовае і ўсякіх удачаў у жыцьці. Зь вялікаю прыемнасьцю буду маліцца за Вас, і толькі прашу Бога, каб Ён выслухаў мяне.
Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас і ахіне Сваёй Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.
З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце,
Архіяпіскап Васілій.
* * *

Бруклін, 10.1.1957.
Глыбокапаважаны й дастойны сп. Ю. Віцьбіч!
Вельмі дзякую за Ваш мілы ліст і за каштоўныя сугестыі. Мне вельмі прыемна чуць, што Вы гатовыя памагчы мне ў маёй працы. Праўда, я яшчэ ня ведаю, ці пабачыць яна сьвет праз выданьні Інстытуту ў Мюнхене[5], бо ў гэтых справах я напісаў аднаму нашаму супрацоўніку там аб тым, як я пачаў распрацоўваць гэтую тэму. Тэма, яшчэ раз зазначаю, мае разглядаць перасьледваньні Беларускай Праваслаўнай Царквы толькі бальшавікамі, г. зн. ад часу г. зв. кастрычніцкае „рэвалюцыі“. Калі-ж я дакладна разважыў зьмест гэтых перасьледваньняў і пэўныя факты, дык прыйшоў да такіх вынікаў: 1. чырвоная Масква перасьледвала нашую царкву ня толькі таму, што яна чырвоная, але й таму, што 2. яна наагул Масква. Таму яна перасьледуе яе й цяпер значна горш як сваю, расейскую. І каб гэтае маё цьверджаньне не было галаслоўным, я зрабіў кароткі аналіз псыхалёгіі расейца як такога, бязумоўна, перадусім ягоных кіруючых пластоў, не пакідаючы без увагі й чыны ягоных масаў у часе бальшавіцкага бунту, карыстаючыся працамі самых расейскіх аўтараў. І пры гэтым даў пару штрыхоў псыхалёгіі беларуса. …

Калі цяпер больш-менш не чуваць агіды з працягненьня на бачыны „Бацькаўшчыны“ „Запісак Самсона Самасуя“, дык у гэтым крыху мая заслуга. Скажу, толькі для Вас асабіста, я

тады паслаў востры пратэст у Рэдакцыю з вымогаю надрукаваць яго. Ясна, там даволі такі спалохаліся й моцна прасілі мяне, каб я адмовіўся ад гэтае вымогі. Я цяпер навет крыху шкадую, што паслухаў іх, але паставіў ультыматум: ніякіх бязбожных рэчаў яны больш ня будуць друкаваць. Крыху падзеяло. Праўда, яны мне стараліся даказваць, што я не разумею гэтых „Запіскаў“ што гэта чыстая „літаратура“, да таго „гістарычная“. Ясна, я не пагадзіўся зь імі ані, як кажуць, на грош, і парадачна вылаяў іх. Так крыху пазьней сталася таксама з тымі двума вершамі Ул. Жылкі, ужо на іншым „літаратурным“ ды „гістарычным“ полі. Таксама, пасьля майго асуджэньня, не было канца абурэньням ды цьверджаньням, што я не разумею „літаратуры“! І калі-б цяпер зьявілася што падобнае да тае „Ўсяночнае“[6], я таксама не зьвяртаў бы ніякае ўвагі, ці я тут разумею „літаратуру“ ці не, а паскудзтва назваў бы паскудзтвам. Нажаль, некаторыя нашыя інтэлігенты, дзякуючы адсутнасьці адпаведнага рэлігійнага ўзгадаваньня, не разумеюць вялікае для нас вагі Навукі Божае, і гэтым шкодзяць сабе самім ды ўсяму нашаму руху. І тут я толькі рад, што так ці інакш мне ўдалося асягнуць тое, што яны ўжо навет рэдка паказваюць гэтую сваю духовую хваробу, а мне здаецца ўжо навет амаль вылячыліся зь яе, і за гэта дзякуючы Богу.

Яшчэ раз дзякую за ліст і асабліва за Вашыя добрыя жаданьні памагчы мне ў гэтай важнай справе, а таксама за бібліяграфію. Сардэчна вітаю Вас, дастойны сп. Ю. Віцьбіч, і ад душы жычу Вам добрага здароўя і ўсякіх посьпехаў у жыцьці і працы. Божае багаславеньне будзе з Вамі.

З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце

Архіяпіскап Васілій.

* * *

Бруклін, 6.6.1958.

Глыбокапаважаны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!

Сардэчна дзякую за Ваш зычлівы, мілы ліст. Асабліва дарагі ён мне таму, што адзіна Вы крыху разумееце мяне, маю працу, мае імкненьні. Гэтым я не хачу сказаць, што ў мяне наагул няма людзей ці вернікаў, якія б час ад часу не прысылалі мне спрыяючага ліста. Не, такія ёсьць, але справа ня ў гэтым. Справа ў тым, што мне хочацца, каб калі не бальшыня, дык хоць некаторыя нашыя людзі

6 Сьв. Юстына [Анкандовіч]. Успамінаў. Ужо Богачная. З ранішняга жыцьця. Выданьні Беларускага Дапамаговага Камітэту. Ватэнштэт, 1946.

разумелі вагромнае значэньне, асабліва цяпер, рэлігіі, адначасна зразумелі, што толькі дзякуючы Ласцы Божай мы можам нешта асягнуць, тым болей прыйсьці да сучаснае мэты нашае — вызваленьня Беларусі.

Нажаль, кажны, калі толькі яму ўдасца зрабіць хоць маленькае дабро, зараз жа вымагае, каб за гэта дзякавалі яму, і зусім ня думае аб тым, што ён сам першы павінен дзякаваць Богу, і гэтым шкодзіць усім, у тым ліку й сабе, бо-ж бяз Бога мы ніколі нічога добрага не зрабілі й ня зробім.
Тымчасам Гасподзь Бог ужо ня раз паказаў нам, што Ён запраўды жадае дабра й нам, Беларусам, як Народу, як Нацыі. А што можа зрабіць Бог, таго ніхто на сьвеце зрабіць ня можа, бо кажны Ягоны чын — гэта цуд у вачох нашых. Я пэўны, што Вы ўжо самі перажылі ці пабачылі не адзін такі цуд Божы! І я ўсякім спосабам стараюся паказаць людзям нашым, што Бог ня толькі некалі цуды тварыў, але Ён і цяпер цуды творыць, і толькі сьляпыя ня бачаць іх. Тымчасам, пры нашых мізэрных магчымасьцях, можам мы спадзявацца на вызваленьне Беларусі сваімі собскімі сіламі бяз помачы Божай? Мне здаецца, што для кожнага думаючага чалавека ясна: не, ня можам! Дык што-ж тады застаецца? Пакінуць усякую надзею на яе вызваленьне? Няхай ня станецца! Ня толькі павінны мы мець такую надзею, але больш таго, усюды пашыраць цьвёрдую веру і ўпэўненасьць, што гэта нямінуча прыйдзе, але пад адной умовай, што нам тут дапаможа Сам Бог! Што гэты цуд станецца з волі Яго. Але гэтая Ягоная збаўленчая для нас воля будзе тады, калі мы будзем разумець Яго, імкнуцца да Яго ды дзякаваць Яму за кажны посьпех наш. Тады й толькі тады Ён будзе з намі, і ўчыніць яшчэ большы цуд Свой, бо мы будзем годныя цуду гэтага.

7. Варл. Ер. 13:23.

Вось у чым мела бы праяўляцца „зацятасьць“ пэўнага Сымона, які б запраўды мог бы й дзе што добрае зрабіць, але, як здаецца прарок Ерэмія сказаў, „Як барс ня можа перамяніць плямаў сваіх, так і злы чалавек ня можа зрабіць нічога добрага“[7]. Ужо мусіць ён нарадзіўся такім барсам, бо як я доўга яго ведаю, дык ён усюды ўносіць толькі дэструкцыю, злобу, варожасьць, ніяк ня могучы супакоіць сваю ненасытную амбіцыю.
Таму вось я вельмі дзякую Вам за Вашыя шчырыя, прыхільныя словы адносна мае малітвы ў Амэрыканскім Сэнаце. У мяне

цяпер толькі адна радасьць: зрабіць хоць маленькі, але добры чын для ўсяго нашага Народу. А ён добры толькі тады, калі мілы Богу, калі заслугоўвае на Ягоную Ласку да нас, бо толькі так мы зможам далейшае дабро чыніць. І яшчэ нешта. Калі мне ўдасца зрабіць нейкае дабро, я стараюся ўсякім спосабам паказаць, што гэта ня я зрабіў, а Ласка Божая для нас усіх, і заўсёды прашу людзей, каб і яны так разглядалі тую ці іншую справу. Дзеля гэтага таксама — другая прычына — я так і прадставіў нашую малітву ў Сэнаце й прыняцьцё нас Ніксанам. Бо я хачу будаваць не на пяску, а на камені, а ўсе мы бяз Бога толькі пясок, тады як зь Ім — Волаты, якія ЎСЁ зробяць, нягледзячы на тое, сколькі нас і якія нашыя собскія сілы.

Дарагі мой, я заўсёды з радасьцю малюся за ўсіх нашых людзей, тым болей за хворых. Таму таксама ўжо даўжэйшы час малюся за хворую Ганну, а цяпер таксама ахвотна й за Еўдакію і Юрага. Хай Гасподзь Міласэрны выслухае мае малітвы й мае Вас у Ласцы Сваёй.
Прашу прыняць мае найшчырэйшыя прывітаньні й найлепшыя пажаданьні.
Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас усіх і ахіне Сваёй Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.
З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце
Ваш Архіяпіскап Васілій.
* * *

Бруклін, 19.10.1962.
Глыбокапаважаны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!
Шчыра дзякую за Ваш мілы ліст, асабліва ж за Вашую ласкавасьць прыслаць у „Голас Царквы“ свой артыкул, ці запраўды лепш сказаць — мастацкі нарыс „Дзева днесь“. Я ўжо наперад цешуся за сябе й за чытачоў з гэтага Вашага нарысу. Што ён будзе запраўды мастацкі, у мяне няма ніякага сумліву, бо-ж кожная Вашая праца — мастацкая. Вы ўжо ад прыроды мастак, а на маю думку галоўна таму, што Вы глыбока веруючы. Такое ўжо ў мяне разуменьне мастацтва. Запраўднае мастацтва гэта „веяньне“ Духа Сьвятога як выразу Абсалютнае Красы. І хто не „прычасьнік“ гэтае Абсалютнае Красы, той ніколі запраўдным мастаком ня быў і ня будзе, і то ўсюды: у

літаратуры, у малярстве, у музыцы й сьпеве. На гэтую тэму я ўжо ня раз, нажаль, надарэмна, гаварыў з нашымі сучаснымі літаратарамі й паэтамі.
За ўсё прысланае Вамі буду Вам вельмі ўдзячны. Прашу толькі ласкава зьвярнуць увагу на час: другая палова або канец лістапада. Калі-б была Вашая ласка прыслаць дзьве рэчы, дык можа быць адна раней, а другая пазьней. Гэта з увагі на тое, што перад Сьвятамі друкарні вельмі завалены працаю, таму ў пачатках сьнежня трэба мець ўжо гатовы матар'ял.
Шчыра й сардэчна вітаю Вас і Вашую дастойную Спадарыню, стала малюся за Вас, бо запраўды жадаю Вам добрага здароўя, сіл, радасьці й усякіх посьпехаў.
Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас і ахіне Сваёй Любоўю, Ласкаю й Міласэрдзем.
З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце
Ваш Архіяпіскап Васілій.

* * *

Бруклін, 17.10.1967.
Высокадастойны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!
Вельмі дзякую за Ваш зьмястоўны й цэнны ліст. Мяне часта вельмі абурае, калі некаторыя нашыя, навет і інтэлігентныя людзі, спрачаюцца із мною ў царкоўных справах. Чаму? Таму, што яны тут поўныя анальфабэты, і наадварот, вельмі люблю пагаварыць з чалавекам і на іншыя тэмы, калі бачу, што ён мае адпаведны багаж ды лёгіку. Вось дзеля гэтага мне вельмі прыемна чытаць Вашыя лісты, у якіх і шырокі разгляд, і кампэтэнтнасьць, і лёгіка, а да ўсяго гэтага яшчэ хочацца дадаць: і сэрца!
Не дарма Хрыстос нас вучыць, што ўсё добрае й благое выходзіць з сэрца. Бязумоўна, гэтае сэрца Ён разумее не ў фізіялагічным сэнсе, а ў сэнсе духовым. А духовы сэнс вядзе нас да розуму й духу. І ад гэтых розуму й духа залежыць тое, што выходзіць з сэрца, бо-ж шатан — магутны дух, але які, і што ён робіць? Так бы сказаць, якое ў яго сэрца?
Нажаль, вось ужо амаль дзьве тысячы год як на зямлі пашыраецца Навука Хрыстовая, і што-ж мы бачым? Які

працэнт людзей ня словам, языком, а сэрцам, чынам выпаўняе дасканалую Запаведзь Яго: Любі бліжняга твайго як самога сябе? Рабі другому тое, чаго сабе жадаеш? На вялікі жаль, ня толькі сьвецкія, але й многія духоўныя ўжо даўно, асабліва-ж цяпер дзеюць пераважна наадварот, так, як гэта падабаецца шатану. І тут Вы слушна кажаце, што „Царкоўны Сьветач“ — гэта прадаўжэньне „Праваслаўнага Беларуса“. Таму добра разумею словы Вашыя: занадта ўсё-ж мы розныя. Я часам дзіўлюся Вам, ці падзіўляю Вас. Выж узгадаваліся ў пекле бальшавізму: злобы, варожасьці, насільля, а тымчасам душа Вашая, як быццам, нічога гэтага ня бачыла, не перажыла, бо засталася многа бліжэй да Хрыста, чым душы многіх тых, што гэта пекла й ня бачылі. Гэта Вашая вялікая заслуга, якая напэўна ў свой час атрымае адпаведную нагароду.

Вашую талеранцыйнасьць у падыходзе да ўсіх веравызнаньняў я магу толькі пахваліць, і адначасна зайздрошчу Вам.

Мая талеранцыйнасьць выходзіць ня толькі з сэрца, але й з розуму, бо яна абаснаваная, напершае, на Навуцы Хрыстовай, па-другое, на асновах самае прыроды, а патрэцяе, на тым, што калі Бог паможа нам аднавіць Незалежнасьць свае Дзяржавы, то яна мусіць быць запраўды хрысьціянскаю, і толькі Праваслаўе адпавядае душы Нашага Народу. Заданьне нашае тут будзе толькі такое: збудаваць такую Праваслаўную Царкву, якая бы паказала народу ўсе багацьці гэтага Праваславія як Навукі Хрыстовае. Ні адно нашае веравызнаньне ў нас гэтага зрабіць ня зможа.

Вельмі дзякую Вам за копіі Вашых лістоў да сп. А. Вініцкага. Я іх прачытаў раз і два і яшчэ буду чытаць, бо яны маюць многа добрага, дакумантальнага матар'ялу ды майстэрна ўложаны. Бязумоўна, калі на такіх матар'ялах сп. Вініцкі выдасьць кнігу, то яна будзе вартая ўвагі.

Пішу Вам заўсёды з ахвотаю, бо бачу ў Вас ня толькі дасканалага фахаўца, пісьменьніка, журналістага. Усё гэта добра, але для мяне ня ўсё. Скажу Вам па сакрэту, што я пэўны час перапісваўся таксама з сп. Сядураю, але калі я захацеў пагаварыць зь ім шырэй і глыбей пра Рэлігію, Навуку Хрыстовую, асабліва цяпер, карэспандэнцыя нашая

значна скарацілася, тады як з вамі я заўсёды магу гаварыць на гэтыя тэмы, бо Вы ня толькі належна разумееце іх, але й зацікаўленыя ў іх.
Шчыра й сардэчна вітаю Вас і ўсю Вашую сямейку, жадаю вам усім добрага здароўя, сіл, радасьці зь Неба, і ўсякіх посьпехаў у жыцьці й працы, як часта й прыгадваю Вас у малітвах сваіх.
Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас усіх і ахіне Сваёй Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.
З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце
Ваш Архіяпіскап Васілій.

*** * ***

Бруклін, 19.4.1969.
Шаноўны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!
Хрыстос Уваскрос!
Вельмі дзякую Вам за Ваш зьмястоўны, мілы ліст, які я сяньня атрымаў. Чаму-ж так скора адказваю? Многа на гэта ёсьць прычынаў. Па-першае, яшчэ раз дзякую. Чаму яшчэ раз? Мушу Вам сказаць, што я нязвычайна люблю розум, веды, красу. Нягледзячы на свае сьціплыя матар'яльныя магчымасьці, я ўжо маю больш сотні кніг багаслоўска-філязофскага характару. Бязумоўна, я ўжо даўно прачытаў такія залатыя кнігі: творы вялікіх айцоў Царквы, сярод якіх мне найбольш спадабаліся творы сьв. Васіля Вялікага, Рыгора Багаслова, Іаана Златавуснага, Аўгустына Блажэннага. Бязумоўна, многа вышэй навет іх стаўлю вялікага мудраца сьв. Апостала Паўла, якога хіба 10 раз прачытаў. Нязвычайна цаню вялікі розум Майсея, ясна, вялікіх, а навет некаторых малых прарокаў. Я натхнёны прадказаньнямі прарока Езэкііла, якія адбываюцца цяпер на нашых вачох. Гэта што датычыць Ізраэля ды далейшых падзеяў, якія неўзабаве пачнуць разьвівацца на арэне сучасных падзеяў.
Маючы вялікую радасьць зь велічы розуму людзкога, я ўжо прачытаў хіба ўсіх філёзафаў, пачынаючы ад Сакрата й Плятона і канчаючы на велічным розуме Канта. Раблю гэта таму, што сьв. Васіль Вялікі кажа: багасловіе гэта цнота, а яно патрабуе побач зь вераю — розуму. Гэта ён сказаў хіба

пад уражаньнем сьв. велічнага Апостала Паўла, які дакладна прастудыяваў як філязофію, так і паэзію старадаўніх грэкаў, што мы бачым зь ягонае пропаведзі ў Афінах перад Арэапагам. Вось так і я ўсюды шукаю здаровага розуму, як „чыстага“, так і „практычнага“ — па Канту.
Вы можа скажаце: для чаго я ўсё гэта тут пішу? Каб пахваліцца? Няхай ня станецца, як кажа сьв. Апостал Павал. Мне вельмі прыемна чытаць Вашыя артыкулы, дзе-б Вы іх ні друкавалі. Чаму? Таму што я бачу ў іх ня толькі Ваш розум, але й вялікую эрудыцыю, а гэтага мне й хочацца, і я хачу „дзешто“ ведаць.
З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце
Ваш багамолец Архіяпіскап Васілій.

* * *

Бруклін, 14.8.1969.
Высокадастойны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!
Вельмі дзякую за ліст. Гэтым разам мне прыходзіцца прасіць прабачэньня за спозьнены адказ. Па-першае, ужо таму, што Вы для мяне таксама Ерарх, бо-ж розныя бываюць Ерархі, ня толькі духоўныя, а па-другое, каб Вы, крый Божа, не падумалі, што я не хацеў бы часьцей мець Вашыя лісты. Між іншага, Вы хіба таксама ведаеце, што такі Э. Кант, ня гледзячы на брак часу й скрупулятнасьць нямецкую, кожнага дня ў часе абеду тры-чатыры гадзіны праводзіў у гутарцы з сваімі прыяцелямі, і я добра яго разумею: і я хацеў бы кожнага дня пару гадзінаў траціць на такія гутаркі, каб завастрыць, узбагаціць свае веды. Нажаль, я гэтага ня маю, але маю прыемнасьць чытаць Вашыя лісты, у якіх бачу здаровы розум, тым болей, што Вашыя думкі часта падобныя да маіх. Вялікая шкода, што Вы не духаўнік нашае Сьв. БАПЦарквы! Магчыма Вы тут скажаце: а што, не духаўнік ня можа другога ўзбагаціць? Бязумоўна, можа, але гэта ня тое, што я тут маю на ўвазе. Ці я супраць Беларускае мовы ў нашых Багаслужбах? Не, я б зь вялікаю радасьцю служыў па-беларуску, але для гэтага патрэбная такая рэч: Камісія з прынамсі 10 спэцыялістых:

духаўнікоў, літаратуразнаўцаў, кампазытараў, паэтаў, якая б сумленна папрацавала 3–4 гады. На гэта некаторыя нашы патрыёты кажуць мне: Уладыка, тады мы ніколі не пяройдзем на служэньне ў Беларускай мове. А я ім кажу: дасьць Бог, прыйдзе час, пяройдзем, а тым часам я сьмяшыць сябе ня буду. Ня любяць мяне за гэта, навет часам прабуюць назваць русафілам, але я ўжо да прыкрасьцяў прывык, хоць кожная зь іх і далягае мне, і я часам сям-там раблю, калі гэта ня асноўныя рэчы, дзеякія ўступкі, падобныя Вашай, адносна тых „беларускіх“ імёнаў. Такія ўступкі, калі ходзіць пра вялікія рэчы, як, напрыклад, выданьне нашага цяпер Каляндара, яшчэ магчымыя.

На жаль, нашае змаганьне на царкоўна-духовым фронце вельмі цяжкое: ворагаў тут у нас надта многа, ворагаў сьведамых і нясьведамых. І я не дзіўлюся, што ў гэтым віры змаганьня некаторыя навет нашыя запраўдныя патрыёты-змагары часам трацяць разуменьне таго, што для нас галоўнае, а што другараднае, што можа нам памагчы, а што пашкодзіць. Тут нам неабходна мець Кантаўскі здаровы розум, а гэта справа нялёгкая, тым болей, што сьведамыя ворагі нашыя часта многа хітрэйшыя за нас, маюць большую практыку, таму лёгка могуць абмануць недасьведчаных, хоць інакш і не дурных людзей.

Прашу прыняць мае найшчырэйшыя прывітаньні й найлепшыя пажаданьні. Многія лета Вам!

Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас і Вашую сямейку і ахіне Сваёй Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.

З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце, Спасе нашым,

Ваш багамолец

Архіяпіскап Васілій.

*** * ***

Бруклін, 4.9.1969.

Высокадастойны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!

Вельмі дзякую за Вашыя два лісты, а маглі-б быць і тры, бо кожны зь іх я з прыемнасьцю чытаю і выкарыстоўваю, зараз пабачыце ў чым. Наперад хачу яшчэ раз пацьвердзіць сваю думку: Вы — запраўдны Ерарх! І я з гэтага цешуся, бо люблю гаварыць з такімі людзьмі, якія маюць у галаве

запраўднае золата — здаровы розум, ды, ясна, розум узбагачаны глыбінямі й вышынямі розных добрых навукаў. Тут наагул мая радасьць, а яна тым большая, калі такім чалавекам ёсьць мой брат — Беларус! На вялікі жаль, мала хто так думае: адныя дзеля нізкае зайздрасьці, другія дзеля свае дурноты, трэція дзеля свае злабы, а яшчэ іншыя дзеля іншых няцнотаў, гаворачы пра такога чалавека, абавязкова стараюцца знайсьці ў яго, на іхную думку, „недахопы“, а пасьля ўжо „міласьціва“ кажуць: але, праўда, у яго ёсьць і дзешто добрае. …Між іншага, тут адна з нашых бедаў: замест бачыць у чалавеку ў першую чаргу добрае, разумнае й гэтым духова ўзмоцніць яго, яны сваёю „крытыкаю“ фактычна робяць тое, што робяць, сьведама робяць, тыя з „Голасу Радзімы “ ды зь „Беларускага Голасу“[8]. Але, нажаль, многа ў нас розных няцнотнікаў, дзеля адсутнасьці запраўднага вагню духа ў сэрцы, душы, галаве.

Вось чаму заўсёды з прыемнасьцю чытаю Вашыя лісты, узбагачаюся імі, карыстаюся Вашымі думкамі, асабліва тады, калі яны й мае думкі. Даўно ўжо ў нас гаворыцца пра Беларусізацыю нашых Службаў Божых, і наш Сьвяшчэнны Сабор ня супраць гэтага, наадварот, сам стараецца беларусізаваць тое, што магчыма, пры дзьвёх умовах: у гэтай Беларусізацыі мусіць быць лад і парадак, а не партызанка, ды мова мусіць быць запраўды Беларуская, мілагучная, урачыстая. Аб гэтым я ня раз казаў нашым спаборнікам Беларусізацыі. І мне тут было нязвычайна прыемна прачытаць такія Вашыя словы: „Аднак, мова такая мусіць мець урачысты, прыўзьняты характар… , тут няма месца вульгарызмам..., тое-ж датычыць і ладне якіх іншых тэрмінаў, вельмі добрых для ўжытку ў хаце, на двары, у лесе й г.д., але толькі ня ў Царкве“. Многа чаго хацелася-б мне тут сказаць, але толькі скажу: поўнасьцю пагаджаюся.

І ня толькі пагаджаюся з Вашаю думкаю аб тым, што дзеля гэтага мае быць абраная й пакліканая да свае пачэснае працы камісія ўжо цяпер, без адкладу, але я гэта ўжо й зрабіў. Як Вы хіба ведаеце, у суботу адбыўся ў нас Епархіяльны Сабор, на якім, ясна, гаварылася й пра Беларусізацыю нашых Службаў Божых, у першую чаргу Сьв. Літургіі. І тут я правёў сваю думку:

выбраная Камісія ў складзе: Уладыка Андрэй, сп. М. Міцкевіч, а. Васіль Кендыш, сп. К. Кіслы, сп. П. Манькоўскі. Гэтай Камісіі дана права запрашаць да супрацоўніцтва адпаведных спэцыялістаў, а ў першую чаргу Вашую дастойную асобу ды спню Н. Арсеньневу як паэтку. Вось жа, прашу заўважыць: у першую чаргу Вас! Гэта я цьвёрда зазначыў, і ўсе пагадзіліся з маёю думкаю тут. А чаму я гэта зрабіў, я ўважаю, для Вас ясна: у маіх вачох Вы будзеце ў гэтай Камісіі галоўным маторам дзеля многіх прычынаў, і я наперад радуюся з такога перакладу, які будзе запраўды ўрачысты, прыўзьняты, ды, ясна, мілагучны. Такі пераклад мусіць адразу падняць душу й сэрца на ўзвышшы, да Неба, да Бога, быць сапраўды сьвяточным, ангельскім! Спадзяюся, што Вы тут уложыце як сваю душу, так і свой розум. Выбачайце, што я так упэўнена наперад кажу, але кажу таму, што ведаю Вас — раз, а два — Вы хіба не адмовіцеся ад такой пачэснай, мілай Вашаму сэрцу працы, хоць і тут могуць быць розныя „прыяцельскія“ заўвагі…
Бязумоўна, ня лёгкая гэта будзе праца. Я прыпамінаю сабе такія разыходжаньні ў Украінскай Царкве сярод Духавенства, калі я свайго часу служыў разам зь імі: адныя гаварылі *Господеві помолымося*, а другія *Господэві помóлымося*, або адныя *знов та знов Господэві,* а другія *Ще та ще*… На маю, як адно, так і другое надта груба, а гэта-ж толькі пачатак! Як Вы пераложыце на беларускую мову *Пакі й Пакі*? Я ня ведаю, але мне бы хацелася, каб тут былі й мілагучнасьць, і ўрачыстасьць, і краса, тым болей, што гэтыя словы часта паўтараюцца, таму мусяць быць запраўды, як кажа сьв. Васіль Вялікі, гармоніяй для вушэй нашых, а гэтым і для сэрцаў. Сьпяшыць тут ніяк ня можна, бо мы тут робім вялікую, сьвятую справу, аб выніках якое будуць гаварыць усе нашыя пабожныя вернікі, таму тут лепш сем раз адмераць і адзін раз адрэзаць.
Прашу прыняць мае найшчырэйшыя прывітаньні й найлепшыя пажаданьні.
Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас і сямейку Вашую і ахіне Сваёй Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.
З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце
Ваш багамолец
Архіяпіскап Васілій.
* * *

Бруклін, 25.9.1969.
Высокадастойны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!
Вельмі дзякую за Ваш, як заўсёды, зьмястоўны й цэнны ліст. О, як добра я разумею Вашыя думкі адносна нашых магчымасьцяў! Так, бязумоўна, кожны, хто толькі хоча нешта добрае стварыць, мусіць стала заглядацца сам на сябе, бо толькі так можа йсьці наперад. За 20 год я ўжо прачытаў сотні кнігаў і хацеў бы яшчэ больш прачытаць, пазнаць, свой духовы багаж узбагаціць, розум завастрыць, ясна, карыстаючыся пры гэтым і досьледамі свайго практычнага жыцьця. А калі мы тут возьмем пад увагу, што гэта адносіцца да духовага жыцьця, якое пачынаецца ў Нябёсах і толькі іскрыць у нашым людзкім духу, то, бязумоўна, тут, як кажуць, ані канца, ані краю няма. Але шчасьлівы той, хто „прычашчаецца“ да яго! Ён сапраўды ўсё болей і болей будзе зьзяць сьвятлом незямным. А колькі ёсьць галібаў гэтага зьзяньня! Тут Багасловіе, Філязофія, усякае Мастацтва як праяўленьні Божага й нашага Духа. І мне прыемна чытаць Вашыя лісты й працы, бо тут я бачу, што Вы і ўсьцяж зьзяеце ў гэтай запраўднай красе, у гэтым сьвятле, якога так баяцца ўсе тыя, „чые ўчынкі благія“. Хто гэта сказаў? Сам Хрыстос!
Вялікія гэтыя словы: Беларуская Мітраполія! Яе стараліся ўрэчаісьніць два нашыя духовыя волаты, Архіяпіскап Варлаам у Магілёве за часоў Напалеона ды апошнім часам Мітрапаліт Мэлхісэдэк. Нажаль, абодва заплацілі за гэтую сьвятую ідэю сваім жыцьцём, атрымаўшы вянок Мучанікаў. Напэўна, Яны Сьвятыя, і дасьць Бог, некалі нашая Сьв. БАПЦарква прызнае іх такімі. І зразумела, што беларуская Мітраполія таксама й мой ідэал. Праз апошнія 20 гадоў мы не маглі й марыць аб гэтым, але цяпер ужо можам з страхам Божым падыйсьці да гэтага пытаньня. Бязумоўна, цяжкое яно й цяпер дзеля многіх прычынаў, аднак, сякія-такія магчымасьці мы ўсё-ж маем і мусім іх выкарыстаць на Славу Божую ды на дабро й гонар нашага шматпакутнага Народу. Я вельмі дзякую Вам за Вашую думку, што гэты цяжкі крыж я маю ўзяць на сябе. Я быў бы вельмі рады, калі-б „мінавала мяне чара гэтая“, аднак, калі ня будзе іншага выхаду, я буду гатовы ўзяць на сябе й гэты крыж і гэтую чару прыняць. Буду гатовы й таму, што ў

маіх паняцьцях Навукі Хрыстовае, а гэтым і Праваслаўія, яно запраўды найкаштоўнейшы скарб наш і ўсяго чалавецтва, гэта раз; а два: прыблізна ад часу Ўсяленскіх Сабораў яно ўсьцяж толькі занячышчалася, хавалася, засыпалася. І цяпер, у маім разуменьні, трэба Яго адкапаць і людзям паказаць — ня толькі словамі, але й чынам, каб Яно запраўды, як дыямант, зазьзяла. І мне здаецца, што нашая Беларуская Мітраполія можа стацца тут Першаю на сьвеце! Бязумоўна, пад умоваю, што Яна будзе працаваць сярод свайго вольнага Народу ў Вольнай Беларусі, тым болей, што я разумею нашую Нацыянальную Ідэю адзіна й толькі як Ідэю Божую! Аб гэтым я й пішу ў сваіх артыкулах пра Служэньне Народу, і далей яшчэ буду пісаць. Магчыма да гэтага адносяцца Вашыя словы: „ня ўсе Вашыя выказваньні ў друку я цалкам падзяляю“. Аднак, лічу, што гэта ня толькі дабро нашага Народу, але і ягоны гонар і ягоная слава й веліч.

Прыміце мае найшчырэйшыя прывітаньні й найлепшыя пажаданьні Вам і сямейцы Вашай.

Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас усіх і ахіне Сваёй Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.

З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце

Ваш багамолец

Архіяпіскап Васілій.

* * *

Бруклін, Каляды 1969.

Высокадастойны й дарагі сп. Ю. Віцьбіч!

Сардэчна вітаю Вас, Вашую дастойную Спадарыню і ўсю сямейку з нашым Вялікім і Радасным Сьвятам: Раством Хрыстовым і Новым 1970-м годам!

Няхай Анёлы сьвятыя й Вам дабравесьцяць: Хрыстос нарадзіўся!

Няхай сьвятло Зоркі Віфлеемскае зьзяе ў душах і сэрцах Вашых.

Няхай Нованароджаны Хрыстос мае Вас усіх у Ласцы Сваёй: пашле Вам добрае здароўе, доўгі век, радасьць зь Неба, многа шчасьця і ўсякі посьпех у жыцьці й працы ў Новым Годзе!

І няхай Ён узмоцніць надзею Вашую, што неўзабаве вызваліцца з шатанскае няволі свае, народзіцца да новага,

вольнага, творчага, радаснага й шчасьлівага жыцьця нашая любая пакутніца Маці Беларусь!
Радуйцеся! Хрыстос Нарадзіўся! Яго Слаўце!
Я вельмі дзякую Вам за Вашыя прывітаньні мяне з нагоды маіх 20-х угодкаў Архіпастырскае працы. Асабліва-ж моцна дзякую за Вашыя слаўныя пажаданьні славіць Бога ў паруганых цяпер Жыровіцах перад цудадзейным Абразом Божае Маці Жыровіцкае!
Тут Вы разгадалі мае мроі ці мары! Аб гэтым я стала малю Госпада Міласэрнага. Я тут уяўляю сабе: сабраліся ўсе нашыя Япіскапы, сотні сьвятароў, два-тры Хоры па 100–150 першаклясных сьпевакоў і сьпявачак, ды, скажам, міліён вернікаў! Пачалі служыць, харыстыя засьпявалі. Далей цяжка што сказаць, бо я пачаў… плакаць… Бо Неба зыйшло на зямельку нашую! А што я пачаў бы плакаць, гэта ня словы, бо й цяпер часам у мяне бывае нешта падобнае, калі з нагоды нейкага большага Сьвята ў маім Хоры 20–25 харыстых прыгожа засьпяваюць, вочы мае пускаюць сьлёзы, а што-ж тады! Мне здаецца, што тады калі ня я, то некаторыя пабожныя вернікі пабачаць… ангелаў сярод нашых харыстых! А можа й Самога Хрыста ды Маці Божую над Прастолам! А кругом іх — нашых Сьвятых!
Ці гэта ўсё магчыма? На маю думку — так, зусім магчыма! Магчыма, па-першае, таму, што я цьвёрда веру й перакананы, што калі неўзабаве ня прыйдзе антыхрыст у цяперашні маральна здэгенэраваны сьвет, то Беларусь станецца Вольнай і Незалежнай Дзяржавай у выніку ўпадку з Волі Божае сучасных найгоршых паганаў — багаборцаў, слугаў шатана. Па-другое, нашая Сьв. БАПЦарква станецца запраўднаю Царквою Хрыстоваю! Царквою, якая ня толькі словам, але й Чынам пачне пашыраць навуку Хрыстовую ўва ўсё жыцьцё нашага народу! Запраўды пачне будаваць Царства Божае на зямлі. Так, пачне яго будаваць, таму й Хрыстос будзе з намі. І Прачыстая Маці Яго! Вось жа, вялікія цуды будуць зусім магчымыя! Бязумоўна, я гэтага жадаю нашаму народу, сабе, а таксама й Вам. Так, я жадаю Вам дажыць да гэтых слаўных часоў, калі людзі будуць запраўды плакаць у часе нашых Службаў Божых, бо Дух Сьвяты ахіне душы іхныя, адкрые ім завесу Неба!

Над гэтым я часта думаю, і — рыхтуюся, пляную. У гэтым сэнсе я й пішу свае артыкулы пра Служэньне Народу. Ясна, для сябе пішу яшчэ й нешта іншае, бо трэба быць да ўсяго гатовым, каб належна спаткаць Госпада, Каторы можа прыйсьці на зямельку нашую, як сказала ў Заблудаве Прачыстая Маці Божая! Яна сказала гэта для тых, што маюць вушы, каб слухаць, разумець, а калі прыйдзе час — дзеяць! На маю думку, толькі нашая Сьв. БАПЦарква можа гэта зразумець і належна дзеяць. Ніякая іншая!
Пішу гэта Вам, бо адчуваю, што толькі Вы тут можаце зразумець мяне. Нажаль, нашая інтэлігенцыя амаль уся на гэта глухая.
І ў гэтым сэнсе яшчэ раз горача вітаю Вас.
Новонароджаны Гасподзь Бог і Спас наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас усіх і ахіне Сваёй Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.
З глыбокаю пашанаю да Вас і Любоўю ў Хрысьце
Ваш Архіяпіскап Васілій.

Уступнае слова і публікацыя Лявона Юрэвіча.

Галасуй за ARCHE :)
ацані... 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - ...
br.by
[image]
[image]

№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 03-02-2001
[image]

Лілія Сазанавец Мадонна Мастацка-біяграфічны аповед

— беларуская пісьменьніца і журналістка. Працуе ў Вільні сакратаркай Старшыні Вярхоўнай Рады XIII скліканьня Сямёна Шарэцкага. Вучыцца ў Віленскім пэдагагічным унівэрсытэце. Родам зь Ліды.

Арыштоўвалася ўладамі ў часе выканаваньня абавязкаў сябры Цэнтральнай выбарчай камісіі па падліковых выбарах прэзыдэнта ў 1999 годзе.

...**13** чэрвеня 1943 году ў Васілішках, што непадалёк ад Ліды, Юльян Саковіч, на той час адзін з кіраўнікоў Беларускай Незалежніцкай Партыі, і ягоны сябра і паплечнік Леанід Маракоў, брат вядомага беларускага паэта Валерыя Маракова, былі застрэленыя проста на вуліцы невядомым забойцам. Загінуў таксама падлетак, які быў разам з імі нарэшце трагедыі. Найбольш праўдападобна, яны былі забітыя бавэікам Арміі Краёвай.

Гісторыя не павінна мець нічога супольнага з ідэалогіяй. Яна павінна толькі канстатаваць факты. На жаль, гісторыя была, ёсць і, напэўна, будзе залежаць ад таго, у якім накірунку ў дадзены момант рухаецца грамадства. Другая сусветная вайна, пра якую напісаныя цэлыя тоны малых і вялікіх кніг, мемуараў, дакументальных і мастацкіх твораў, да сёння застаецца зусім невядомай вайною. Невядомымі застаюцца лёсы і роля ў гэтай вайне сотняў беларускіх сыноў і дачок, якія не былі савецкімі партызанамі, а таму не мелі права, каб пра іх ведалі нашчадкі. Такім невядомым заставаўся Юльян Саковіч. Невядомым ён быў для гісторыкаў, пісьменнікаў, проста для грамадства. Але

ён не быў невядомым для сваіх блізкіх, людзей, якія заставаліся ў цені гісторыі, але якімі надзвычай цікавіліся спецслужбы.
Наша гісторыя будзе пра самага блізкага чалавека для Юльяна Саковіча, пра яго жонку. Яна была разам з ім у самы адказны і небяспечны для яго час. Яна была разам з ім жывым, яна засталася з ім пасля яго трагічнай гібелі — бо для яе ён быў жывым заўсёды. Імя гэтай жанчыны — Вольга Саковіч.

* * *

Абухаўшчына — вялікая вуліца ў перадваенным Маладэчне, дзе пасяліўся бацька нашай гераіні Аляксей Пагуда.
Аляксей Пагуда, чалавек пісьменны, на той час даволі адукаваны, не толькі сам быў беларусам па паходжанні ды па светаўспрыманні. Дзяцей сваіх ён таксама выхоўваў як беларусаў.
Вось у такім асяроддзі нарадзілася і вырасла Вольга.
Нашае знаёмства з Вольгай пачнецца ў 1935 годзе. Пачнецца з амаль што дэтэктыўнай гісторыі.
Канец жніва. На ток у Пагудаў звезена амаль усё збожжа. Пасля цяжкай сялянскай працы, якая заўсёды бывае пры канцы лета, у часе жніва, сям'я Пагудаў збіраецца адпачываць. Ужо павячэралі. Маці збірае са стала брудны посуд, бацька чытае пры акне газету. Вольга вырашыла сёння раней легчы спаць, бо надта натамілася, пакуль звозілі з поля снапы на ток.
Старэйшы Пагудаў сын Іван падняўся з-за стала, паведаміў, звяртаючыся да бацькі:
— Пайду начаваць на ток. Надта ж ужо горача ў хаце.
Бацька не пярэчыў, маці ж не прамінула заўважыць:

— Вазьмі коўдру. А то пад раніцу змерзнеш, ночы ўжо халодныя.
Іван пайшоў. Бацька яшчэ трохі пачытаў, але ўжо добра зашарэла, і ён пачаў уладкоўвацца спаць. Маці ўсё яшчэ тупала каля печы. Вольга ўжо амаль задрамала, калі нечакана ледзь не падскочыла ў ложку ад мацерынага воклічу:
— Божухна! Што гэта?! Наш ток гарыць!
Вольга не памятала, як апынулася ў двары. У адным споднім у двор выбег і бацька. На вуліцы ўжо добра сцямнела, але ў двары ў Пагудаў было светла, нібы днём. Зырка, амаль без

дыму, гарэў ток. Чулася мернае патрэскаванне добра высахлай саломы. Жоўтыя языкі полымя падымаліся роўна, высока, нібы свечкі, да чорнай зеўры ночы.
Некалькі імгненняў бацька стаяў і, нібы зачараваны, пазіраў, як ненажэрны агонь з'ядае ягонае дабро. Калі ачмурэнне трошкі прайшло, ён ухапіў Вольгу за плячук, крыкнуў ёй проста ў твар:
— Бяжы на плошчу. Няхай звоняць трывогу!
Вольга з усіх ног кінулася ў цемру ночы. Званарня, якая знаходзілася на плошчы, побач з касцёлам, у гэты час была зачынена. Ключы ад яе захоўваліся ў касцёльнага старасты. Вольга кінулася да дзвярэй касцёла, з усіх сілаў пачала барабаніць у дзверы. Адчыніў ён сам ксёндз Завадскі.
— Чаго шуміш? — незадаволена запытаў ён у дзяўчыны.
— Там пажар! — ад хвалявання голас у Вольгі перарываўся. — Наш ток гарыць! Трэба званіць, клікаць людзей на дапамогу!
— Усяго толькі ток? — хмыкнуў ксёндз. — Ток — гэта не хата. Ідзі, дзяўчо, дахаты. Я не дам ключа і не буду трывожыць люд з-за такой драбязы. З Божай дапамогай вы патушыце пажар і самі.
Вольга не адразу зразумела, што ёй не дазволілі паклікаць людзей на дапамогу. „Няўжо гэта праўда?! Няўжо гэта ксёндз так гаворыць?! Чаму ён не дазволіў паклікаць людзей?“
Некалькі хвілін дзяўчына стаяла перад зачыненымі дзвярыма і не верыла, што такое магчыма. Яна не магла зразумець чалавечай чэрствасці ксяндза Завадскага. Нарэшце да яе дайшло, што дапамогі не будзе. Сарвалася з месца і кінулася ў бок сваёй хаты.
Ток дагараў. На тым месцы, дзе яшчэ з паўгадзіны таму стаяла будыніна току, заваленая снапамі са збожжам, зараз свяцілася не надта вялікая кучка вясёлых вугольчыкаў. Каля вогнішча тоўпіліся суседзі з бліжэйшых хатаў. Яны ўжо не завіхаліся з вёдрамі, бо тушыць не было чаго. Практычна ўвесь Пагудаў ураджай быў знішчаны.

Вольга не пазнала сваёй маці. Растрапаная ды расхрыстаная, яна сядзела на калодзе непадалёку ад касцярышча і ціха падвывала, ухапіўшыся за свае сівыя валасы. Каля маці сядзеў Іван і моўчкі гладзіў яе па худым плечуку.
— Глядзі, Волечка, каб маці не здурнела, — падышла да Вольгі суседка.

— А што здарылася? — нічога не магла ўцяміць дзяўчына, сэрцам адчуваючы, што маці так перажывае не таму, што згарэў ток.
— Іван жа казаў вам, што пойдзе начаваць на ток, праўда, — пачала распавядаць суседка, — вось маці твая і кідалася ў агонь. Думала, што сын яе гарыць там разам са збожжам. Ледзь утрымалі мы яе. Крычала надта моцна. Баюся я, каб з галавою ў яе што не здарылася. А як Іван заявіўся ў двор, дык яна зусім памяшалася. Думае, што гэта не Іван, а ёй толькі падаецца.
У Вольгі раптам нешта пахаладзела там, дзе сэрца. Тады гэтае нешта, халоднае, нібы лёд, паплыло кудысьці ўніз, да пятак. Толькі зараз дзяўчына ўспомніла, што Іван сапраўды меўся начаваць на таку. Сілы ўмомант пакінулі яе, і яна ледзь здолела запытаць у суседкі:
— Дык яго не было на таку?
— Не, дзякуй Богу, не было. Ён пайшоў у чытальню, ды там і затрымаўся, на шчасце. Прыбег сюды, як ужо агонь бушаваў на ўсю моц.
Маці тады адыходзіла ад перажытага шоку вельмі доўга. Толькі праз некалькі тыдняў яна нарэшце трохі супакоілася ды пачала адпускаць ад сябе Івана. Дагэтуль увесь час трымала яго за руку і ціха плакала, верачы і не верачы, што сын жывы.
...Бацька абышоў пагарэлае. Раптам ён нахіліўся, выцягнуў з-пад груды абгарэлага ламачча нейкую анучу. Уважліва разгледзеў яе, памацаў, подбегам кінуўся да людзей.
— Гляньце, гэта ж пінжак Сакалоўскага! Як ён тут апынуўся?
Сакалоўскі жыў непадалёку. Уважаў сябе за паляка і часцяком спрачаўся з Аляксеем Пагудам наконт палітыкі. Маўляў, беларускай нацыі ўвогуле не існуе. Ёсць толькі „крэсы всходне“, дзе жывуць не беларусы, а палякі. Толькі некаторыя з іх, такія дурні, як Пагуда, ходзяць у праваслаўную царкву ды лічаць сябе нейкімі беларусамі. Зразумела, што ў Сакалоўскага самога не хапіла б розуму так разважаць, але ён хадзіў пры касцёле, дапамагаў ксяндзу Завадскаму ў розных гаспадарчых справах і слухаў, што той кажа.
— Гэта ён цябе падпаліў, Аляксейка! — упэўнена заявіла суседка.
Не пагадзіцца з ёю было цяжка. На месцы злачынства застаўся доказ. Пазней сам Сакалоўскі прызнаўся, што сапраўды меў такі вялікі грэх на душы. Але гэтае прызнанне будзе пазней,

калі стане зразумелым, што вось-вось Маладэчна стане савецкім. Людзі тады чакалі бальшавікоў — хто з надзеяй, хто з недаверам, а хто і са страхам. Вось тады, перад самым прыходам Саветаў, Сакалоўскі сам заявіцца да Пагудаў ды папросіць прабачэння за тое, што зрабіў. Паведаміць ён таксама, што не са зла так зрабіў і не па сваёй ініцыятыве. Падпаліць ток яго падбухторыў ксёндз Завадскі, які моцна ненавідзеў Аляксея і нават не стараўся схаваць сваёй нянавісці. Зразумела, што ён не даваў Сакалоўскаму выяўнага загаду падпаліць Пагудаў ток, гэта было б занадта небяспечна, а ксёндз быў чалавек асцярожны і зусім не дурны. Але ён не раз намякаў, што было б нядрэнна, каб боская кара звалілася на галаву гэтага „камунякі“, як ён называў Аляксея. Сакалоўскі тады палічыў, што менавіта ён павінен здзейсніць гэтую „боскую кару“.

* * *

Перад Аляксеем Пагудам, як выраслі дзеці, паўстала нялёгкае пытанне: што рабіць далей, куды накіраваць іх, каб і вучонымі сталі, і сваёй беларускасці не страцілі. Ён баяўся, што дзеці падчас навучання апалячацца, але ягоныя перажыванні былі дарэмнымі. Дзеці яго засталіся беларусамі, хоць і здолелі атрымаць зусім нядрэнную для тых часоў адукацыю. Іван стаў лекарам, а Вольга — настаўніцай.

Спачатку была гімназія ў самім Маладэчне. Вучыцца там было нялёгка. І не таму, што Вольга мела нейкія цяжкасці з навукай: нараканняў на яе вучобу быць не магло. У гімназіі цяжка было іншае. Да вучняў-беларусаў часцяком ставіліся з пагардаю не толькі іншыя гімназісты, але і настаўнікі. Вольга таксама паспытала польскай „ласкі“. Аднойчы выкладчык балюча выцяў яе па руцэ. Пэўны час там быў даволі вялікі сіняк. Вольга так і не зразумела, за што яе пакаралі. Яна была гордай дзяўчынай, такой, якой яе выхоўваў бацька. Зразумела, што вучыцца далей у польскай вучэльні ёй не хацелася, хоць вучыцца ўвогуле — гэта была яе найвялікшая мара. З прычыны таго, што ўсе блізкія навучальныя ўстановы былі польскімі, здавалася, што перад ёю толькі дзве магчымасці: альбо ўвогуле не вучыцца далей, альбо працягваць трываць польскі здзек. Так падавалася на першы погляд. Але не знаходзіць толькі той, хто не шукае. Невялічкі выбар усё ж быў.

Бацька Вольгі вырашыў паслаць дачку вучыцца ў Заходнюю Ўкраіну. Заходняя Ўкраіна, як і Заходняя Беларусь, належала тады Польшчы, але нягледзячы на жорсткі ўціск з боку польскіх уладаў, украінцы ўсё ж вылучаліся вальнадумствам і захоўвалі астраўкі сваёй нацыянальнай адметнасці. Невядома, ці бацька сам дайшоў да такой думкі, ці хто яму гэта падказаў, але восеньскім ранкам трыццаць шостага году Вольга, нязграбнае баязлівае дзяўчо-падлетак, выправілася ў сваё першае падарожжа.

Вольга паехала ў Крэмянец, гарадок паміж Роўнам і Львовам. Тут яна паступіла ў педагагічную вучэльню. Вучылася добра, амаль на адны „пяцёркі“, толькі з так званых „прадметаў артыстычных“ чамусьці мела „чацвёркі“. Напэўна, занадта сціплай была і саромелася паказаць свае здольнасці, а яны, безумоўна, былі. Старанную вучаніцу хутка заўважылі. Праз некаторы час ёй прызначылі стыпендыю, што сярод студэнтаў няпольскага паходжання было рэдкай з’явай. Каб заслужыць стыпендыю, трэба было паказаць значныя поспехі. Акрамя стыпендыі, Вольга знайшла яшчэ адну крыніцу сродкаў да пражыцця: яна атрымала месца памочніка выхавацеля ў інтэрнаце. Вучыцца і адначасова працаваць было цяжкавата, але затое Вольга не галадала. Часы тады былі цяжкія, з дому ёй дапамагчы маглі мала чым.

Толькі тут, у гэтай педвучэльні, Вольга да канца ўсвядоміла сваю беларускасць. У вучэльні дзяўчына пасябравала з некалькімі ўкраінцамі, такімі ж студэнтамі, як і яна сама. Адзін з іх, па прозвішчы Лаўрыненка, неяк запытаў у яе:

— А ці ведаеш, Вольга, што вас, беларусаў, пад палякамі ажно тры мільёны?

Магчыма, Лаўрыненка сапраўды проста хацеў пацікавіцца, ці ведае пра гэта Вольга, але для яе гэта было нібы гром з яснага неба. Няўжо сапраўды гэтак шмат беларусаў вымушаныя трываць польскую акупацыю? Упершыню яна зразумела, што і яна сама, і яе сям’я таксама жывуць пад чужынцамі. Вольга маўчала, не адказвала на пытанне сябра, бо адказаць ёй не было чаго. Сапраўды, яна, да свайго сораму, ніколі раней не задумвалася над такім сваім жыццём. Лаўрыненка ж працягваў далей:

— Вы, беларусы, занадта талерантныя. Гэта шкодна, і ў першую чаргу для вас саміх. Трэба адваёўваць сваю свабоду. Калі трэба,

нават сілаю. Украінцы ваявалі і адваявалі сабе некаторыя свабоды: цяпер мы маем, хоць і няшмат, украінскія школы. Ці маеце вы свае школы?
Яна чакала і лекцыяў некаторых выкладчыкаў. Напрыклад, лекцыяў выкладчыка Вясленкі. Аднойчы той выклікаў цэлы фурор на сваіх занятках. Ён нечакана для ўсіх прачытаў верш забароненага Івана Франка. Верш называўся „Каменяры“. Там былі словы, якія моцна ўразілі Вольгу, засталіся ў яе памяці на ўсё жыццё: „...У падзямеллі чуюць сваю лепшую долю...“. Пасля таго, як Вясленка прачытаў гэты верш, у аўдыторыі спачатку ўсталявалася мёртвая цішыня. Кожны па-свойму ўспрыняў гэтую незвычайную смеласць выкладчыка. Адны ледзь стрымліваліся, каб не заапладзіраваць. Вольга, зразумела, была ў ліку такіх студэнтаў. Іншыя, іх была большасць, страшэнна напалохаліся. Яны ж слухалі гэтую крамолу. Раптам іх нехта пачне падазраваць у нелаяльнасці да ўладаў! Адна студэнтка-істэрычка нават страціла прытомнасць ад таго, што ў польскай вучэльні асмельваюцца чытаць такія вальнадумныя вершы, ды яшчэ хто — выкладчык!

* * *

Вось з такім нацыянальным запалам Вольга вярнулася ў Маладэчна. На той час у Маладэчне было не так шмат адукаваных людзей, таму Вольга без асаблівых цяжкасцяў змагла ўладкавацца ў школу. Нарэшце збылася яе даўняя мара — яна стала настаўніцай.
Спачатку ёй прызначылі найменшы заробак, усяго толькі дваццаць пяць злотых. Але Вольга апантана ўзялася за працу. Забылася пра ўсе забавы, пра ўсе гулянкі, чым выклікала вялікае незадавальненне ў сваёй найлепшай сяброўкі Зіны, якой цяпер не было з кім хадзіць на танцы.
— Ну што ты ўсё карпіш ды карпіш над кнігамі, — наракала сяброўка, — хопіць, адвучылася ўжо. Трохі адпачні ад навукі. Ты ж маладая дзяўчына. Глядзі, маладосць праляціць, нібы адзін дзень, і ты станеш нікому не патрэбная.
Вольга толькі адмахвалася ад Зіны. Яна хацела працаваць, хацела быць настаўніцай! І цяпер у яе была такая магчымасць. Яна прагла працы і ніяк не магла наталіць гэтую прагу. Пра кавалераў ёй тады неяк не думалася. Магчыма, таму што не

сустрэўся яшчэ на яе шляху той, хто стаў бы часцінкай яе самой.
І Вольга працавала, працавала, працавала. І яе старанні зусім нечакана для яе самой былі заўважаныя адміністрацыяй школы.
Неяк у настаўніцкі пакой прыбегла задыханая дырэктарская сакратарка. Пашукала вачыма сярод прыціхлых настаўнікаў. Спыніла свой позірк на Вользе.
— Проша, пані Вольга, да пана дырэктара.
Вольга, зразумела, захвалявалася. Як не сваімі нагамі ішла яна да дырэктарскага кабінету. „Няўжо звольняць?“ Вольга разумела, што становішча яе ў школе занадта хісткае, каб быць упэўненай у заўтрашнім дні. Ёй надзвычай падабалася ў школе, але не ад яе залежала, колькі такая праца зможа працягвацца. Кожны дзень Вольга з радасцю ішла на ўрокі, але недзе ў глыбіні душы заўжды чакала, што ёй паведамяць: сёння яна ў школе апошні дзень.
Сакратарка асцярожна прычыніла за Вольгай дзверы, і дзяўчына засталася сам-насам з дырэктарам. Вось так блізка Вольга бачылася з ім другі раз. Дагэтуль ёй давялося быць у гэтым кабінеце толькі аднойчы, тады, калі яе прымалі на працу. Дырэктар адклаў убок нейкія паперы і ветліва запрасіў:
— Проша, пані Вольга, прысядзьце.
Яна прысела на краёчак крэсла. Дырэктар загаварыў:
— Я ад самага пачатку назіраю за вашай працай, шаноўная пані. Я задаволены вамі, надзвычай задаволены. Прызнаюся, за ўсе гады майго кіравання гэтай школай у мяне не было яшчэ гэткай руплівай настаўніцы, як вы.
Дырэктар трохі памаўчаў, нібы хацеў падрыхтаваць Вольгу да нейкай значнай навіны.
— Я прыняў вас на працу, пані Вольга, і прызначыў вам заробак у дваццаць пяць злотых. Гэта нядрэнны заробак, але я падумаў і вырашыў, што вы заслугоўваеце пяцідзесяці злотых.
Вольга не паверыла сваім вушам. Пяцьдзесят злотых! Такія грошы атрымлівалі ў школе адзінкі. Гэта былі выкладчыкі з вялікім вопытам, з добрымі ведамі, і, зразумела, — палякі. Яна аніяк не пасавала да гэтае катэгорыі.
Наступнага дня ў школьнай канцылярыі выдавалі заробак настаўнікам. Насупраць свайго прозвішча ў ведамасці Вольга сапраўды ўбачыла суму ў пяцьдзесят злотых. Але пабачылі

гэтую лічбу і іншыя. І менавіта з гэтага дня пачалося спачатку тайнае, а пасля і яўнае цкаванне „хлопкі“, якой плацілі больш, чым „гжэчным паненкам“. Часцяком Вольга чула, як за яе спіною шапталіся, прытым знарок так, каб яна чула, што пра яе гавораць. Напэўна, калегі хацелі выклікаць яе на сварку. Вольга маўчала, рабіла выгляд, што нічога не чуе і не заўважае, але зноў з невыноснай выразнасцю адчула сябе чужынкай. Радасць ад працы аказалася зусім нядоўгай.

Пра Вольгу не толькі шапталіся. На яе пачалі скардзіцца дырэктару. То яна на хвіліну спазнілася на ўрок, то, наадварот, затрымала вучняў на некалькі хвілін больш. Да Вольгі на ўрокі пачалі наведвацца розныя інспектары. Гэта нервавала яе, яна хвалявалася і пачынала рабіць памылкі. Зараз Вольга ўжо не адчувала такой асалоды ад сваёй працы. Раніцаю яна ўжо не ўскоквала з ложка, як раней, не бегла ў школу, нават не паснедаўшы як след, чым заўсёды непакоіла маці, якая кожную раніцу крычала ёй наўздагон:

— Паеж, як чалавек! Нікуды не дзенецца твая школа!

Зараз Вользе штораніцы даводзілася прымушаць сябе падняцца з ложка ды выправіцца ў школу. Той агеньчык, які гарэў у яе душы яшчэ месяц таму, згас. Гэта заўважыла Зіна, але гэтым разам яна не стала ні пра што дапытвацца ў сяброўкі, бо адчувала, што з той здарылася нешта сур’ёзнае. У такі час лепш не лезці ў душу.

Так працягвалася недзе з паўгода. Сітуацыя ў школе ўсё больш накалялася. Вольга не магла бачыць твары сваіх калегаў. Яны, у сваю чаргу, у спакоі яе не пакідалі. Выжыванне Вольгі са школы працягвалася, і небезвынікова. Дырэктар ужо не ўсміхаўся ёй здалёк, а толькі суха вітаўся пры сустрэчы. З дня на дзень Вольга чакала якога-небудзь скандалу. Праца настаўніцы, аб якой яна гэтак марыла, стала ёй зусім не ў радасць.

Трэба было нешта вырашаць, бо так не магло працягвацца бясконца. Вольга думала, як знайсці выйсце з такога становішча, і прыйшла да адзінай высновы: ёй трэба вучыцца далей. Яна з сумам успамінала тыя шчаслівыя часы, калі вучылася ў педагагічнай вучэльні. Успамінала свае размовы з сябрамі, мілага сэрцу Вясленку. Гэта былі шчаслівыя часы, і Вольга вырашыла іх паўтарыць, хоць і мела вельмі мала надзеі, што ёй гэта ўдасца. Але трэба было некуды з’ехаць з

Маладэчна, бо тут ёй ужо не было чым дыхаць. І Вольга паехала ў Вільню паступаць ува ўніверсітэт.
Яна вырашыла вывучаць біялогію. Вольга вельмі любіла кветкі ды іншыя расліны, умела іх даглядаць, адчувала іх душу. Таму тут пытанняў быць не магло: яна будзе біёлагам. Увосень 1938 году Вольга стала студэнткай універсітэту Сцяпана Батуры.
Яна на ўсё жыццё запомніла тое першае пачуццё, якое авалодала ёй, калі яна ўпершыню пераступіла парог гэтай легендарнай навучальнай установы. Здавалася, што ўсе тыя барадатыя, збольшага ў акулярах, разумныя дзядзькі з партрэтаў у калідоры строга глядзяць толькі на яе, Вольгу. Якой студэнткай яна будзе ў гэтым універсітэце? Ці здолее не зганьбіць славу ўсіх тых, хто вучыўся тут да яе?
З хваляваннем і прыемнай трывогаю яна распачала новы этап свайго жыцця. Віленскі этап. Сюды, у Вільню, Вольга ехала з надзеяй атрымаць тут найлепшую адукацыю, навучыцца пераадольваць усе перашкоды, якім наканавана паўстаць на яе жыццёвым шляху. Вольга тады падумаць нават не магла, колькі іх будзе, гэтых выпрабаванняў!

* * *

Віленскі ўніверсітэт тады збіраў пад сваім дахам лепшых беларускіх студэнтаў ды выкладчыкаў, што жылі не толькі ў самой Вільні ці паблізу. Сюды прыязджалі лепшыя людзі з іншых гарадоў Заходняй Беларусі. Некаторыя заставаліся тут працаваць, некаторыя — займаюцца творчасцю, бо лепшай творчай базы, чым у Вільні, цяжка тады было знайсці. Тут, у Вільні, Вольга ўпершыню пачула вершы Максіма Танка, ужо тады вядомага заходнебеларускага паэта.
Вучоба ва ўніверсітэце была значна цяжэйшай, чым у педвучэльні. Яно і зразумела: якіх спецыялістаў меўся ўніверсітэт выпускаць са сваіх сценаў, такія і патрабаванні ставіў да сваіх студэнтаў. Вольга і тут, як у педвучэльні, была вельмі руплівая студэнткай. Яна ставілася да навукі надзвычай сур'ёзна. Збольшага вучоба давалася ёй без асаблівых цяжкасцяў. Не заладзілася нешта чамусьці толькі з хіміяй. З цяжкім сэрцам чакала Вольга іспытаў з гэтага прадмету, перад самым іспытам дзень і ноч аддавала студыям, намагалася запомніць мудрагелістыя формулы. Вучыла, вучыла, а калі

закрывала падручнік, як на злосць, не магла ўспомніць большасць з іх. Ну што за навала! Хоць плач!
Аднойчы надвячоркам у нядзелю напярэдадні іспыту да Вольгі забеглі калегі-студэнты. Вольга і ў Вільні вельмі хутка знайшла сабе сяброў. Яна мела добры, спагадлівы характар, таму, напэўна, да яе і цягнуліся людзі.
— Што ты ўсё грызеш гэтую хімію? Хадзем з намі на Замкавую гару. Надвор'е такое цудоўнае! — намаўлялі сябры.
Надвор'е сапраўды было цудоўным. Стаяў пачатак лета. Усё цвіло, буяла ў квецені. Ад пахаў, што насіліся ў паветры, кружылася галава. Гаспадыня, у якой кватаравала Вольга, таксама далучылася да прапановы студэнтаў:
— Ідзі, любачка, трошкі пагуляй. Хіба ж так магчыма — цэлымі днямі сядзець над кнігамі? Ператомішся, захварэеш яшчэ, крый Божа!
Не хацелася Вользе адрывацца ў такі адказны час ад вучобы, але яна сапраўды адчула, што вельмі стамілася і больш не можа займацца. Дый у сяброў таксама заўтра іспыт, але ж яны ўсё-ткі наважылі развеяцца.
Замкавую гару яны абышлі ўдоўж і ўпоперак. Вярталіся дамоў позна, амаль уначы. Вольга не чула ног ад стомы. Зняла чаравікі, узяла ў рукі падручнік зненавіджанай хіміі, прылегла, не распранаючыся, на ложак. Збіралася чытаць усю ноч, яна ж яшчэ столькі павінна вывучыць! Прачытала колькі радкоў і адразу правалілася ў моцны, здаровы сон. Калі прачнулася, ранішняе сонейка ўжо на ўсю моц пякло шчаку, павернутую да акна. „Божухна, сёння ж іспыт, а я не падрыхтавалася!"
Вольга падхапілася з ложка, ліхаманкава пачала прыводзіць сябе ў парадак. Пачуўшы, што кватарантка прачнулася, у пакой асцярожна ўвайшла гаспадыня.
— Аж я ўжо пачала баяцца, Волечка, каб з табою што нядобрае не здарылася, — прамовіла яна, — усё спіш ды спіш. Я ўжо некалькі разоў падыходзіла да твайго пакою, слухала, ці прачнулася ты. Ніколі ж гэтак доўга не спала!
Вольга не слухала гаспадыню, дрыжачымі рукамі складала ў сумку падручнікі. „Я ж збіралася ўчора яшчэ гэтулькі займацца, але праспала, гультайка, усю ноч праспала!" Наракаць яна магла толькі на сябе самую — „двойка" ёй сёння гарантаваная! Але дзіва — як толькі яна, усхваляваная, напалоханая ды сярдзітая сама на сябе, увайшла ў аўдыторыю, выцягнула білет

ды пачала рыхтаваць на яго адказ, высветлілася, што яна ўсё ведае. Адразу выплылі з памяці ўсе патрэбныя формулы, і задачу Вольга таксама рашыла. Вольга выводзіла на аркушы паперы формулы і не верыла, што гэта яна сама піша. Нібы нехта вадзіў яе за руку, упэўнена запаўняючы белае поле паперы...

Віленскі перыяд жыцця быў для Вольгі адным з найцікавейшых, але надзвычай непрацяглым. Толькі адзін год ёй давялося вучыцца ва ўніверсітэце. Прыйшоў фатальны для Заходняй Беларусі трыццаць дзевяты, пачалася другая сусветная вайна. Польшча ваявала з фашысцкай Нямеччынай. Дакладней, на тэрыторыі Польшчы тады ўжо гаспадарылі фашысты. У Маладэчна, як і ў іншыя гарады і вёскі Заходняй Беларусі, прыйшлі войскі Саветаў. Прайшлі чуткі, што на тэрыторыі Беларусі будуць адчыняцца беларускія навучальныя ўстановы; школы таксама стануць беларускімі. Вольга вырашыла вярнуцца дамоў. Яна будзе працаваць у школе, а вучыцца можна завочна ў Менску, які зараз ужо не быў замежжам.

* * *

Але павучыцца ў Менску Вользе не давялося. Працы было столькі, што навуку прыйшлося адкласці на пазнейшы час. Вольга пайшла працаваць настаўніцай у школу, як і хацела. Тое, што ёй адразу прапанавалі месца, не было дзіўным. Яна не паспела яшчэ ачомацца ад пераезду, як да яе забег знаёмы па прозвішчы Кізік, які ўжо паспеў уладкавацца школьным інспектарам, і проста запатрабаваў, каб яна неадкладна ішла на працу ў школу. Адукаваных спецыялістаў было надзвычай мала, асабліва настаўнікаў. Многія са старых спецыялістаў, напалохаўшыся новай улады, з'ехалі ў Польшчу ці яшчэ куды, дзе не было вайны. Трэба было вучыць новае пакаленне моладзі зусім новых прынцыпаў жыцця. Якія гэта былі прынцыпы, слаба ўяўлялі сабе нават такія „падкаваныя" людзі, як Кізік. Але ўсе старанна рабілі выгляд, што добра разумеюць пастаўленую перад імі задачу. У той час, які пасля нехта назаве першымі Саветамі, яшчэ шмат што дазвалялася, яшчэ можна было думаць.

Многія старыя педагогі выехалі з Маладэчна, але і не ўсім тым, хто застаўся, новая ўлада давярала. Не ўсе яны ўважаліся за

прыдатных да выхавання новай савецкай моладзі. Вользе такі давер аказалі.
Вольга з вялікім энтузіязмам узялася за справу. Яна літаральна днявала і начавала ў школе. Праз некалькі месяцаў яе нават зусім нечакана выбралі старшынёю прафсаюзнага камітэту школы. У той час ў школах, на заводах, нават у лякарнях ствараліся шмат розных камітэтаў. Вольга не мела намеру займацца нейкімі грамадскімі справамі, яна лічыла, што гэта можа пашкодзіць яе настаўніцтву. Акрамя таго, яна паняцця не мела, як гэта робіцца. Спрабавала адмовіцца, але гэта было немагчыма. Кізік, які яе прапанаваў, настойваў:
— Не хвалюйся, Вольга, у цябе ўсё атрымаецца, а мы дапаможам. Не забывай, што ты цяпер жывеш у Савецкай Беларусі.
Вольга не зразумела тады, чаму Кізік гэтак настойліва падкрэсліваў, што яна жыве ў Савецкай Беларусі, але займацца прафсаюзнымі справамі ў рэшце рэшт пагадзілася. Тым больш што, як потым высветлілася, праца гэтая не надта адрывала яе ад асноўнага занятку — настаўніцтва.
Савецкая ўлада не падавалася надта небяспечнай да таго часу, пакуль непасрэдна з ёю не сутыкнешся. Не думала Вольга, што і ёй самой давядзецца з гэтай уладай сутыкнуцца. Упершыню Вользе давялося паспытаць усе „даброты“ новай улады праз некалькі месяцаў пасля таго, як яна стала кіраваць прафсаюзнымі справамі ў школе. Неяк у настаўніцкую, дзе тады сядзела Вольга ды перагортвала падручнік — рыхтавалася да наступнага ўрока, — уляцеў, нібы вецер, усё той жа Кізік. Ён апошнім часам не хадзіў, а лётаў, гэтак шмат справаў павінен быў рабіць адначасова. Убачыў Вольгу адну ў настаўніцкай, узрадаваўся:
— Вось ты мне і патрэбная. Толькі што патэлефанавалі з міністэрства. Трэба ехаць у Менск на рэспубліканскую прафсаюзную канферэнцыю. Ад нашай вобласці (Маладэчна тады было абласным горадам) паедзем ты ды я. Рыхтуйся, будзеш рабіць даклад.
— Які даклад? — не зразумела Вольга.
— Які, які? — незадаволена скрывіўся Кізік. — Даклад на канферэнцыю. Напішы пра ўсе нашыя прафсаюзныя справы. Ты ж у нас прафсаюзны кіраўнік.
Кізік пайшоў, пакінуўшы Вольгу ў разгубленасці. Яна ў той

дзень правяла яшчэ два ўрокі, але з галавы яе не выходзіў той даклад. Як яго пісаць? На што трэба звярнуць увагу? Вольга дагэтуль ніколі яшчэ не пісала такіх справаздач, пагатоў для рэспубліканскай канферэнцыі.
Пасля вячэры, якая тым вечарам не лезла ёй у горла, яна засела ў сваім пакоі перад чыстым аркушам паперы. Праца над дакладам чамусьці не клеілася. Не адзін аркуш быў падраны ды кінуты ў сметніцу. Урэшце Вольга вырашыла зусім не пісаць гэты даклад, а проста скласці невялікі план ды тэзы па кожным ягоным пункце. Гэта сапраўды было добрым рашэннем, бо праца адразу пайшла зусім іншым чынам. Праз гадзіну ўсё тое, пра што яна збіралася напісаць, было акуратна выкладзена на паперы. З чыстым сумленнем Вольга легла спаць.
На канферэнцыю трэба было ехаць назаўтра раніцаю. Ехалі цягніком. Вольга глядзела ў акно. Ёй падабалася назіраць за краявідамі, што ўвесь час змяняліся за акном. Кізік пачуваўся неяк неспакойна. Усё круціўся на канапе, ніяк не мог уладкавацца. Нарэшце не вытрымаў, звярнуўся да Вольгі:
— Ты, гэта, Вольга, даклад напісала?
— Ага, — проста адказала дзяўчына.
— То дай зірнуць.
Вольга выцягнула з сумачкі тоненькі вучнёўскі сшытак, падала Кізіку. Таму хапіла некалькі хвілін, каб прачытаць Вользіна „сачыненне“. Кізік застаўся надзвычай незадаволеным.
— Хіба гэта даклад?! Ты што, не разумееш, куды мы едзем? Гэта ж канферэнцыя на найвышэйшым узроўні! А ты замест грунтоўнага дакладу нейкую несур’ёзную пісульку зрабіла. Каб ведаў, сам бы ўсё напісаў. Ноч не спаў бы, але б зрабіў.
Вольга не на жарт спалохалася. Ёй вельмі не хацелася падводзіць Кізіка.
— А што ў маім дакладзе нядобрага? — яна была гатовая паслухацца любой парады і выправіць усё, што спатрэбіцца.
— Клею мала, — няўцямна адрэзаў Кізік.
На гэтым іх размова скончылася. Больш, ажно да самага Менску, яны не размаўлялі. Кізік не хаваў свайго незадавальнення Вольгай, яна ж перажывала, як выправіць даклад і якога клею ў ім не хапае.
Нарэшце Менск. Яны выйшлі на чыгуначным вакзале.
— Пойдзем туды, — паказаў пальцам у бок нейкіх вялікіх будынкаў Кізік, — для нас падрыхтаваныя пакоі ў гатэлі

„Беларусь“.
Гатэль уразіў Вольгу сваёй велічынёю і нязграбнасцю. Гэта не Вільня. Тут не адчувалася ніякга архітэктурнага стылю. Проста будынак, дзе трэ было скласці рэчы ды пераначаваць. У пакоі, дзе мелася гэтымі днямі жыць Вольга, ужо была нейкая жанчына. Яна ветліва адказала на прывітанне і зноў паглыбілася ў чытанне сваёй газеты.
Вольга акуратна размясціла свае нешматлікія рэчы ў шафе, затым прылегла на ложак. Хацела трошкі адпачыць з дарогі, але сон не ішоў. Не давалі спакою думкі пра гэты злашчасны даклад. З паўгадзіны Вольга варочалася з боку на бок, пакуль суседка не звярнулася да яе:
— Прабачце, што турбую вас, але мне здаецца, што вас нешта непакоіць.
Невядома чаму, але Вольга адразу адчула давер да гэтай незнаёмай жанчыны. І распавяла ёй пра свой клопат з дакладам. Яна не толькі распавяла, але і паказала жанчыне свой сшытак. Тая ўважліва прагледзела Вользіны запісы.
— Так, ваш калега мае рацыю, — сказала яна, — з такім дакладам на канферэнцыі, зразумела, паяўляцца нельга.
— Але як яго выправіць? — адчаю Вольгі не было межаў. — Я не магу ні да чога лепшага дадумацца. У галаве нібы ўсё складаецца гладка і добра, а напісаць на паперы чамусьці не выходзіць.
— А вы паспрабуйце распавесці мне ўсё, што прыйшло вам у галаву, — прапанавала суседка, — я паслухаю і, можа, нечым дапамагу.
Вольга пачала свой расповед. Яна гэтак увайшла ў ролю, што напрыканцы свайго імправізаванага дакладу нават ускочыла з ложка. Яна з запалам расказвала гэтай жанчыне пра ўсе справы, якія праходзілі ў іх у школе. Жанчына слухала вельмі ўважліва і не перабівала. Пасля таго як Вольга скончыла сваю прамову, суседка зноў прапанавала:
— А цяпер напішыце ўсё тое, што зараз мне расказалі.
Вольга схапіла асадку, сшытак і надзіва хутка ўсё напісала. Словы самі клаліся адно за адным на паперу, і было нават незразумела, чаму раней у яе нічога не выходзіла. Пакуль Вольга пісала, жанчына не прамовіла ані слова, зноў узяўшыся за сваю газету. Нарэшце справа была паспяхова скончаная. Шчаслівая Вольга працягнула спісаны сшытак суседцы.

— Вось, гатова.
Тая ўважліва ўсё прачытала, па некалькі разоў вярталася да ўжо прачытанага. Пасля вярнула Вользе сшытак, сказала:
— А цяпер вы мне яшчэ раз пачытайце гэта ўголас.
Вольга пачала чытаць. Жанчына калі-нікалі перапыняла яе і рабіла заўвагі:
— Вось тут папраўце. Вось гэта трэба выкрасліць. А вось тут дапішыце.
Праз паўгадзіны Вольга ўжо перапісвала нанава адкарэктаваны матэрыял. Позна ўначы жанчыны пажадалі адна адной „Дабранач!“, і суседка пагасіла святло ў пакоі. Раніцай Вольга прачнулася, зірнула на суседні ложак і ўбачыла, што тае няма. Ложак быў акуратна засцелены, на стале засталася ляжаць учорашняя газета, якую гэтак уважліва чытала незнаёмка, але самой яе не было. Яна з’ехала, гэта было відавочна, бо ў шафе не было яе паліто. Вольга толькі цяпер успомніла, што яны нават не пазнаёміліся і што яна так і не падзякавала гэтай незвычайнай жанчыне за дапамогу.
Пакуль Вольга гарэла ад сораму, у дзверы далікатна пастукалі. На парозе стаяў акуратна выгалены ды прыбраны Кізік.
— Мы з табою трошкі зарана прыехалі, — паведаміў ён, — канферэнцыя толькі заўтра, а сёння мы вольныя. Давай, збірайся. Трошкі прагуляемся. Я табе Менск пакажу.
Менск Вользе зусім не спадабаўся. Тут не было, як у Вільні, старых, прыгожых муроў, ад якіх так і дыхала гісторыяй. Здавалася, што ўсе ў гэтым горадзе занятыя толькі будоўляй. Паўсюль стаялі рыштаванні, былі раскіданыя вялізныя грудy нейкага друзу ды смецця. Усюды грымелі малаткі ды чуўся мат будаўнікоў. Учора прайшоў дождж, і пад нагамі амаль паўсюль стаяла балота. Часцяком на шляху сустракаліся вялікія брудныя лужыны. Вольга пашкадавала, што згадзілася на гэтую экскурсію, але маўчала. Найбольш ёй было шкада сваіх новых белых чаравікаў.
Яны ўжо больш за паўгадзіны ішлі нейкімі вузкімі вулачкамі. Што тут можна было ўбачыць цікавага, Вольга не разумела, але паслухмяна ішла побач з Кізікам, маючы спадзеў, што ён сапраўды цяпер пакажа ёй нешта цікавае. Калі-нікалі ім прыходзілася праціскацца паміж плотам і чарговай вялізнай лужынай, ушыркі на ўсю вуліцу. Кізік галантна прапускаў у такіх выпадках даму наперад. Калі яны ў чарговы раз

абыходзілі такую лужыну, Вольга, выбраўшыся нарэшце на больш-менш сухое месца, азірнулася і з жахам убачыла, што Кізіка побач з ёю няма. Як няма і іншых людзей. Толькі адна яна пасярод бруднай вуліцы, ды з усіх бакоў ці то недабудаваныя, ці то напаўразбураныя дамы. Нідзе ані душы. Вольгу ахапіў страх. Як яна адсюль выберацца і куды знік Кізік? Самае дзіўнае, што Вольга зусім не памятала, як яны трапілі на гэтую вуліцу і як адсюль дабрацца да гатэлю. Яна была настолькі незадаволеная гэтым шпацырам, настолькі незадаволеная Кізікам, які выбраў акурат гэты машрут, што зусім не звяртала ўвагі на тое, у які бок яны ідуць. І вось цяпер яна апынулася адна пасярод гэтай дзіўнай і нейкай надзвычай непрытульнай вуліцы і зусім не ведала, куды ісці. Заставалася яшчэ загадкай, куды гэтак нечакана знік Кізік. Вольга стаяла каля плоту і ледзь не плакала ад злосці на Кізіка і на самую сябе. Засталася б лепш у гатэлі, дык не стаяла б цяпер, нібы слуп, на гэтай вуліцы.

Вольга пачала бездапаможна азірацца па баках і надзвычай узрадавалася, калі ўбачыла, як з нейкага двара насустрач ёй выйшлі двое людзей. Гэта былі два маладыя мужчыны. Вось хто зараз ёй падкажа, як выйсці да гатэлю! Вольга радасна кінулася насустрач незнаёмцам і раптам спынілася. На тварах гэтых людзей яна нечакана ўбачыла нешта такое, што трошкі яе напалохала. Не, яны зусім не былі падобныя да нейкіх бандытаў, і апранутыя былі прыстойна. Але выраз іхніх твараў быў нейкі незвычайны. Гэты выраз палохаў. Не, Вольга не будзе да іх звяртацца па дапамогу. Яна і без гэтых людзей знойдзе дарогу да гатэлю. Гэта ўсё ж горад, а не пустыня! Зараз яна сама куды-небудзь выйдзе, вуліца ж не бясконцая. Ёй трэба толькі выбрацца адсюль, а потым яна зарыентуецца. А гэтыя людзі няхай сабе ідуць сваёй дарогай.

Незнаёмцы параўняліся з Вольгай, моўчкі павярнуліся і сталі паабапал яе. Яны не падштурхоўвалі яе, не чапляліся за рукі, яны проста ішлі побач, але Вольга з жахам зразумела, што яна мусіць ісці туды, куды накіроўваюцца гэтыя людзі. Са страху яна не магла вымавіць ані слова. У галаве круцілася толькі адна думка: калі б іх нехта ўбачыў цяпер, што б падумаў? Падумаў бы, напэўна, што яна шпацыруе па гэтай бруднай вуліцы ў суправаджэнні сваіх сяброў. Але ж яна нават не ведае, што гэта за людзі і куды яны яе вядуць!

Вось гэтак моўчкі яны збочылі ў нейкі завулак, пасля ў двор. Вольга не магла зразумець, чаму яна не супраціўляецца, чаму яна нават не крычыць і не кліча на дапамогу. Яна адчувала, што з ёю цяпер можа здарыцца нешта жудаснае, але чамусьці моўчкі ішла побач з гэтымі людзьмі і нават не спрабавала выратавацца. Што з ёю здарылася, яна не разумела. Было такое адчуванне, што яна проста спіць і сніць жудасны сон. Вось зараз яна прачнецца і ўсё сканчыцца! Але сон не канчаўся. Яны спыніліся перад будынкам з разбітымі шыбамі. Адзін з канваіраў адчыніў дзверы і ўвайшоў унутр. Другі злёгку падштурхнуў туды ж і Вольгу.

Сэрца ў дзяўчыны шалёна калацілася, ногі былі нібы драўляныя. Языку ў роце не хапала месца. Раптам надзвычай захацелася піць, але папрасіць вады ў гэтых людзей яна не рашалася, як увогуле не рашалася пакуль што вымавіць хоць слова.

Яны апынуліся ў невялікім пустым пакоі. У гэтым пакоі таксама нехта нешта рамантаваў. Уся падлога была засыпаная нейкім друзам, які пахрустваў пад нагамі. Толькі гэтае пахрустванне было чуваць у гулкай цішыні пакою. Пасярэдзіне стаяў вялікі запылены пісьмовы стол. Гэты стол выглядаў пасярод гэтага пустога пакою неяк дзіўна і нават страшнавата. За яго ўсеўся адзін з незнаёмцаў. Другі застаўся стаяць за спінаю ў Вольгі. Яна адчувала ягонае дыханне на патыліцы. Ёй гэта было надзвычай непрыемна, але яна зноў прамаўчала.

— Даклад! — загадаў той, што сядзеў за сталом.

— Што? — не зразумела Вольга.

— Сшытак! Дур-ра!

Вольга дрыжачымі рукамі расшпіліла сумачку, выцягнула адтуль сшытак з дакладам, працягнула незнаёмцу. Той схапіў сшытак, накінуўся на яго, нібы галодны звер на здабычу. Пасля выцягнуў з кішэні аркуш паперы, асадку, пачаў нешта таропка перапісваць сабе на гэты аркуш з Вользінага сшытка. Рухі ў гэтага чалавека былі нейкія нервовыя, і гэтая нервовасць яшчэ больш палохала Вольгу. Яна маліла Бога, каб не страціць прытомнасць тут, у гэтым пакоі. Чалавек перапісаў, пагартаў яшчэ раз сшытак, нават патрос яго, нібы нешта шукаў і не мог знайсці. Рабілася ўсё моўчкі, без адзінага слова. Вольга толькі паціху трэслася ад страху і неразумення таго, што з ёю робіцца.

Чым мог так зацікавіць гэтых людзей яе даклад? Адкуль яны ўвогуле ведалі, што яна павінна рабіць нейкі даклад? Што ім ад яе трэба?
Нарэшце незнаёмец адкінуў сшытак убок, падскочыў, нібы на спружынах, нешта прамармытаў свайму сябру, і яны хуценька зніклі. У змрочным пакоі засталася адна Вольга. Некалькі імгненняў яна проста стаяла і нечага чакала. Чаго, і сама не ведала. Магчыма, яна не верыла яшчэ, што яе незвычайныя канваіры сапраўды сыйшлі. Ёй здавалася, што яны зараз вернуцца ды заб'юць яе. Так працягвалася некалькі хвілін, але Вольга часу не заўважала. Ёй здавалася, час увогуле спыніўся. Нарэшце яна выйшла з гэтага здранцвення. Азірнулася па баках. У пакоі сапраўды, акрамя яе, больш нікога не было, толькі адзінокая муха звінела недзе пад столлю. На стале ляжаў яе сшытак. Менавіта гэты сшытак вярнуў яе да рэчаіснасці. Дзяўчына схапіла сшытак і з ўсіх ног кінулася прэч з памяшкання. Куды бегчы, яна не ведала, але бегла, не спыняючыся, па лужынах, па гурбах друзу. Ёй увесь час здавалася, што нехта за ёю гоніцца і вось-вось дагоніць. Але азірнуцца назад яна не мела сілы.
Нарэшце гэтая жудасная вуліца скончылася. Вольга куляю выскачыла на іншую, шырокую ды светлую, па якой, пазвоньваючы, ішлі адзін за адным вагоны трамваяў. Дзяўчына ў запале бегу ледзь не збіла з ног нейкага паджылага, інтэлігентнага выгляду, мужчыну з бародкай.
— Ой! — вырвалася ў яе.
— Ціха, ціха, — ласкава праваркатаў нізкім прыемным басам мужчына, — гэтак можна і пад машыну трапіць.
Вольга спынілася і змагла нарэшце трохі перавесці дух. Мужчына стаяў і з усмешкай пазіраў на яе. Некалькі хвілін Вольга толькі цяжка дыхала. Гаварыць яна не магла. Калі трошкі супакоілася, спытала ў мужчыны з бародкай:
— Ці не падкажаце, як прайсці да гатэлю „Беларусь"?
— Падкажу, — весела адказаў мужчына, — ідзіце проста па гэтай вуліцы. Толькі ідзіце ходнікам, пад машыны не кідайцеся. Калі дойдзеце да канца вуліцы, павярніце налева. І вы амаль адразу за паваротам убачыце свой гатэль.
Вольга падзякавала і пайшла, стараючыся, сапраўды, ісці як мага спакайней. Хоць гэтая вуліца была зусім не страшная, не такая, з якой яна толькі што выбегла, але Вольга ледзь

стрымлівалася, каб зноў не пабегчы. Ёй вельмі хацелася як мага хутчэй трапіць у свой гатэльны пакой і пра ўсё падумаць. Што ж гэта з ёю толькі што здарылася?!
І толькі перад самымі дзвярамі гатэлю яна нечакана ўспомніла пра Кізіка. Куды ж ён усё-такі знік? Няўжо і з ім здарылася нешта нядобрае? У трывожным прадчуванні Вольга подбегам кінулася на другі паверх гатэлю, дзе пасяліўся Кізік. Нават забылася ў дзверы пастукаць, адразу расчыніла іх ды ўскочыла, усхваляваная, у пакой.
Кізік быў там. Сядзеў за сталом, адзін у пакоі. Убачыў Вольгу і неяк збянтэжыўся. Ускочыў з табурэта, на якім сядзеў, абцягнуў сваю трошкі каратковатую куртачку.
— Гэта ты? — неяк дзіўна запытаў ён у Вольгі. Ён нібы не верыў, што бачыць яе перад сабою.
— Дзе ты падзеўся? — ледзь стрымлівалася, каб не расплакацца, дзяўчына. — Ты ведаеш, што са мною здарылася? На мяне напалі нейкія незнаёмыя людзі. Думала, што заб'юць!
— Дык не забілі ж, — паспрабаваў неяк кісла і няўпэўнена пажартаваць Кізік.
— Не забілі, не забілі, але як я напалохалася! Чаму ты мяне кінуў?
— Я цябе кінуў? Гэта ты некуды падзелася! А я цябе і не думаў кідаць! У мяне матузок развязаўся на чаравіку. Я нахіліўся яго завязаць, а як падняўся, дык цябе і следу няма. Я глянуў туды, глянуў сюды — цябе нідзе не відаць. Падумаў, што ты ўкрыўдавала на мяне за гэтую экскурсію ды рашыла вярнуцца ў гатэль. У цябе ж характар — о-ё-ёй! Я агледзеўся вакол, цябе не знайшоў ды таксама вярнуўся сюды. Чаму ты мяне не папярэдзіла, што вяртаешся? Я так хваляваўся, калі ўбачыў, што цябе няма! А даклад ты хоць не згубіла?
Вольга спачатку хацела распавесці Кізіку, што якраз праз гэты злашчасны даклад яна і пацярпела, але чамусьці стрымалася. Яна была так радая, што выратавалася сама і што з Кізікам, дзякуй Богу, нічога не здарылася, што не заўважыла ў той момант некаторых недарэчнасцяў у яго паводзінах. Яна не звярнула ўвагі на тое, што яны з Кізікам аніяк не маглі размінуцца на той бруднай вуліцы. Няхай ён сапраўды нахіліўся, каб завязаць матузок, але згубіць Вольгу са зроку ён не мог аніяк. Вуліца, тая жудасная вуліца, была роўная, нібы нітка. Вярнуцца назад Вольга магла толькі мінаючы Кізіка. Калі

ж яна азірнулася, то гэта якраз ягоны след прапаў, а не яе. Акрамя таго, Вольга ж не казала яму, што яна выпадкова ўзяла з сабою на шпацыр сшытак з дакладам, а не пакінула яго ў гатэльным пакоі. Адкуль Кізік мог ведаць пра сшытак? Паводзіны Кізіка былі незразумелымі, але пра гэта Вольга ўспомніць значна пазней, тады, калі навучыцца бачыць небяспеку... У той дзень яна яшчэ гэтага не ўмела. Таму яна папіла разам з Кізікам гарбаты і вярнулася ў свой пакой, радая, што ўсё нарэшце скончылася. Заўтра канферэнцыя.

Заля, у якой адбывалася канферэнцыя, была перапоўненая самым разнастайным людам. Былі тут і дамы, безумоўна, гарадскія, былі і дэлегаты сялянскага выгляду. Яны трошкі бянтэжыліся сярод незнаёмых людзей, бездапаможна азіраліся па баках ды шукалі сабе кампанію такіх, як яны самі, прасцейшых людзей. Паступова ўсе рассаджваліся па сваіх месцах ды ціха перамаўляліся. Чакалі, калі ў залю ўвойдзе прэзідыум. Нарэшце ўсе паднялі, запляскалі ў далоні. З бакавых дзвярэй на сцэну адзін за адным пачалі ўваходзіць абраныя ў прэзідыум. Кізік нахіліўся да Вольгі, тлумачыў:
— Вось гэта Ўралава — міністр асветы, а вось гэта Лонгін — старшыня ЦК прафсаюзаў.
Ён паказваў ёй яшчэ шмат на каго, але Вольга нават не здолела адразу ўсіх запомніць. Найбольш яе ўразіла Еўдакія Ўралава. Ад гэтай жанчыны нават здалёк цягнула ўладарнасцю. Міністрам асветы Ўралава стала надоўга — ажно да сорак сёмага году. Праўда, якім чынам яна выконвала свае абавязкі ў гады вайны, заставалася загадкай. Практычна ўсё сваё жыццё гэтая жанчына займала ў Менску кіраўнічыя пасады. Пакінуўшы міністэрскае крэсла, яна стане намеснікам Старшыні Рэспубліканскага Таварыства па распаўсюджванні палітычных і навуковых ведаў. Да канца пяцідзесятых, амаль дзесяць гадоў запар, Уралава будзе намеснікам Старшыні Савету Міністраў БССР. Зразумела, у той дзень Вольга нічога гэтага яшчэ не ведала, дый сама Ўралава не ведала, якім чынам складзецца яе далейшы лёс, але тое, што яна — жанчына ўладарная, не выклікала сумневу ўжо тады.
Пачалася канферэнцыя. Спачатку з дакладам выступіў Лонгін, пасля слова пачалі даваць прадстаўнікам абласцей. Вольга ўважліва слухала ўсіх выступоўцаў. Недзе пасля трэцяга па

чарзе да яе нарэшце дайшло, якога „клею“ ад яе дакладу дабіваўся Кізік. Усе прамаўлялі ўзвышана, праз слова ўсхвалялі Сталіна ды меншых рангам начальнікаў. Пра прафсаюзныя справы амаль нічога і не гаварылася, толькі хвалы ды абяцанні зрабіць усё, каб Савецкая краіна як найхутчэй збудавала светлую будучыню, камунізм.
Якое шчасце, што ёй, Вользе, напаткалася тая жанчына і дапамагла напісаць такі даклад, як мае быць! Толькі зараз Вольга з усёй выразнасцю ўцяміла, у якую небяспеку яна магла трапіць са сваім ранейшым дакладам. Безумоўна, той даклад з гэтай трыбуны чытаць было нельга.
Нарэшце Вольга пачула сваё прозвішча. Яе запрашалі для выступу на трыбуну. Яна паднялася са свайго месца, азірнулася на Кізіка. Той быў бледны, твар яго раптоўна пакрыўся буйнымі кроплямі поту, хоць у залі было хутчэй халаднавата, чым горача. Вольга пайшла да сцэны, у душы баючыся, што яе не будзе відаць з-за трыбуны. Яна была зусім невялікага росту. Некалькі разоў падчас свайго выступу дзяўчына азіралася на Ўралаву. Тая слухала ўважліва, нават напаўабярнулася да прамоўцы, колькі разоў згодна хітнула галавою. Кізік у залі проста цвіў ад задавальнення. Ён таксама сачыў за рэакцыяй у прэзыдыуме.
Калі Вольга вярнулася на сваё месца, Кізік узрушана паціснуў ёй руку.
— Малайчына! Найлепшая прамова! Але ж гэта не тая, што ты мне паказвала ў цягніку.
— А я новую напісала, — спакойна адказала Вольга.
— Можа, табе нехта дапамог? — дапытваўся Кізік.
— Ды не, сама напісала, — адказала Вольга. Яна нават не ведала, як завуць тую жанчыну, што дапамагла ёй напісаць гэты даклад, таму вырашыла пра яе нічога не гаварыць. Акрамя таго, ёй не вельмі хацелася адкрывацца перад Кізікам. Яна яшчэ трохі злавала на яго за тое, што ён яе ўчора кінуў на той жудаснай вуліцы.

* * *

Вайна ў Маладэчна прыйшла нечакана. Над Беларусяй натужна загулі цяжкія нямецкія бамбавікі; параненыя, галодныя, разгубленыя салдаты Чырвонай Арміі паступова адыходзілі на

Ўсход. Заходнюю Беларусь, якая яшчэ не зусім была паспела прызвычаіцца да савецкай улады, займалі нямецкія войскі. Прыход нямецкіх войскаў у Маладэчна амаль нічым не адрозніваўся ад прыходу сюды трохі раней Чырвонай Арміі. Як і тым разам, жыхары гарадка ціха стаялі за сваімі платамі, пазіралі на чарговых „вызваліцеляў“ і гадалі, як ім будзе пажывацца пры новай уладзе.
Але вайна вайною, а кожны займаўся сваімі справамі. Стаяла лета, трэба было працаваць у полі, бо ні немцы, ні бальшавікі з лыжкі нікога карміць не збіраліся.
Адным жнівеньскім вечарам да Пагудаў асцярожна пастукалі. Сямейнікі трывожна пераглянуліся. Хто б гэта мог быць у такую пару? Каб хаця ж не які ліхі чалавек! Да жыхароў часта тады стукаліся чырвонаармейцы, што адсталі ад сваіх і якіх яшчэ не вылавілі немцы. Чалавека, безумоўна, трэ было схаваць, выратаваць, але пры гэтым уся сям’я трапляла ў страшэнную небяспеку, бо немцы не цырымоніліся: стралялі ўсіх.
Вольга з бабуляй якраз ставілі ў печ хлеб. Заставалася апошняя булка. Цэлы дзень сёння Вольга разам з астатнімі жала жыта. Пад вечар памылася, вымыла галаву. Зараз валасы яе былі накручаныя на папільёткі. Ногі, абутыя ў атопкі ад старых валёнкаў, гарэлі, бо былі паколатыя іржышчам па самыя калені.
У хату ўвайшлі трое: усё той жа Кізік, Чарняўскі, таксама знаёмец Пагудаў, і яшчэ адзін чалавек, якога Вольга не ведала. Ясна, што акурат на гэтага чалавека яна адразу і звярнула ўвагу, бо двух астатніх яна ведала як аблупленых. Першае, што заўважыла тады Вольга ў абліччы гэтага чалавека — гэта два рады роўных белых зубоў. Такіх роўных ды белых яна ніколі раней не бачыла. Акрамя таго, у незнаёмца была вельмі прыемная ўсмешка. Ад гэтай усмешкі проста цяжка было адвесці позірк. Госці прайшлі ў пакой. Бацька зрабіў знак маці, каб сабрала чаго-небудзь на стол. Бацька не здзівіўся гасцям. Вользе нават падалося, што ён іх чакаў. Тут толькі Вольга спахапілася, што ў яе на галаве папільёткі, а на нагах старыя атопкі. Божа, які жах! Перад чужымі людзьмі ў такім выглядзе! Яна ўпотайкі зірнула на незнаёмца. Той усміхаўся. Дзяўчына стрымгалоў кінулася ў сваю бакоўку, на хаду раскручваючы папільёткі.

Аб чым госці гаварылі з бацькам ды братам Іванам, Вольга не ведала. Калі яна выйшла са сваёй бакоўкі, яны ўжо збіраліся пайсці. На развітанне незнаёмец зноў ёй усміхнуўся. Вольга сумелася пад яго пільным позіркам і чамусьці адчула нейкае дзіўнае хваляванне. Яна баялася, што яе хваляванне заўважаць родныя, але ўсё ж не ўстрымалася і запытала ў брата, хто ён такі — гэты незнаёмец.
— Гэта Юльян Саковіч, — адказаў брат з відавочнай павагай і дадаў трошкі незразумела, — ты пра яго яшчэ пачуеш!
Больш пра Юльяна яна не распытвала, але ўвесь час думкі пра яго нечакана з'яўляліся і не хацелі сыходзіць з галавы. На другі дзень да іх зноў забег Кізік. Чым цяпер, у пару вайны, займаўся Кізік, Вольга дакладна не ведала, але ён зноў, відавочна, быў чалавекам надта занятым, бо і цяпер не хадзіў, як усе звычайныя людзі, а толькі бегаў. Гэтым разам Кізік забег да Пагудаў, каб паведаміць Вользе:
— А ты Саковічу надта спадабалася!
— Адкуль ты ведаеш? — спытала Вольга, трошкі злуючы на Кізіка за бесцырымоннасць, але адначасова і хаваючы ад яго, што гэтая навіна ёй прыемная.
— Сам казаў, — проста павёў Кізік. — Сказаў, што яму спадабалася адна сялянка, а потым, што сялянка — гэта ты.
Твар у Вольгі ўспыхнуў полымем. „Усё ж такі заўважыў, нягоднік, учора яе папільёткі і паколатыя іржышчам ногі!".

Пасля той нечаканай сустрэчы Вольга і не думала нават, што ёй давядзецца сустрэцца з Юльянам яшчэ раз. Не думала, што лёс увогуле звядзе іх разам. Яна ведала, што Юльян не жыў тады ў Маладэчне, ён жыў у Менску, такім чынам, верагоднасць сустрэцца зноў была вельмі малая, хоць недзе ў глыбіні душы Вольга марыла аб новай сустрэчы. Відаць, марыла аб ёй не толькі яна.
Вольга здагадвалася, што Юльян займае нейкую высокую пасаду. Ясная рэч, ніхто пра гэта з ёю не гаварыў, але ёй даводзілася чуць калі-нікалі размовы паміж братам Іванам і ягонымі сябрамі. Юльян, відаць, меў нейкае да іх дачыненне. Вольга лічыла, што яна не надта добра разбіраецца ў палітыцы, тым больш цяпер, калі разбірацца ў ёй было проста небяспечна, але ж яна і не была зусім наіўным дзяўчом. Тое-сёе ведала, аб нечым магла здагадвацца. Здагадвалася яна, што і яе брат, і

Юльян займаюцца беларускімі справамі. Гэта вельмі непакоіла Вольгу, хоць, безумоўна, і выклікала павагу. Сама Вольга не займалася гэтымі справамі, яна ніякіх братавых даручэнняў не выконвала. Той, вядома, проста не хацеў ублытваць яе ў свае небяспечныя справы. Вольга і не настойвала. У той час яна была ўпэўненая, што палітыка — гэта справа разумных мужчынаў, а людзі, якія займаюцца палітыкай — гэта незвычайныя, таленавітыя, амаль легендарныя людзі. І да такіх людзей яна інтуітыўна залічала Юльяна, пра якога не пераставала думаць.

Побач з такім чалавекам, як Юльян, павінна быць і жанчына, вартая яго. Ніякім чынам Вольга не магла падумаць, што такой жанчынай стане яна сама... Юльян, відаць, не жартаваў, калі казаў, што яму спадабалася яна, Вольга. Юльян на той час быў ужо дарослым чалавекам, ён так ці йнакш знайшоў бы нагоду, каб зноў сустрэцца з ёю. Але невядома, калі б гэта здарылася. Ды нездарма кажуць: не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло.

Стаяла першая восень вайны. Аднойчы да Пагудаў [illegible] Кізікаў бацька. Усхвалявана паведаміў, што немцы арыштавалі яго сына. Яго ўзялі разам з іншымі, каго абвінавачвалі ў дзеяннях супраць нямецкай улады. Якія дзеянні ўчыніў яго сын супраць немцаў, старэйшы Кізік не ведаў. Ён быў у страшэннай роспачы і прыбег да Пагудаў, бо не ведаў, да каго яшчэ можна звярнуцца па дапамогу. Калі немцы некага арыштоўвалі, выратаваць вязня было амаль што немагчыма... ...Раніца. Вольга бачыць, як вуліцаю ідуць эсэсаўцы. Паглядаюць на вокны хатаў. Прайшлі паўз дом Пагудаў. Раптам адзін з эсэсаўцаў вяртаецца. Абыходзіць вакол дома. Вольга сэрцам адчула, што гэты эсэсавец шукае яе. Яна прабегла паўз здзіўленую бабулю, забегла ў самую дальнюю каморку. Прычыніла за сабою дзверы, прыхінулася да сцяны, пачала прыслухоўвацца да таго, што робіцца ў доме. Сэрца калацілася недзе ў горле.

Эсэсавец увайшоў у дом. Па гуку яго гулкіх крокаў Вольга здагадвалася, што ён зазірае ў кожны пакой. У галоўным пакоі ён перамовіўся колькімі словамі са сваімі суайчыннікамі — немцамі. У Пагудаў, як і ў многіх іншых маладэчанцаў, жыў

* — Ён мой [illegible] (*нем.*)

** — Добра, добра (*нем.*)

тады немец — палкоўнік Эдмунд Флокерц.
Эсэсавец абышоў увесь дом, але ў каморку, дзе хавалася Вольга, на шчасце, не зазірнуў. Калі ён пайшоў, Вольга яшчэ колькі хвілін не верыла, што ён сапраўды сышоў. Пасля яна выйшла са свайго сховішча, зноў глянула ў вакно. Убачыла, як вуліцаю немцы вялі мясцовага хлопца, прозвішчам Нехвядовіч. Хлопец гэты быў сляпы на адно вока, надзвычай спакойны і не ўяўляў ніякай небяспекі для нямецкіх уладаў, але яго ўсё ж арыштавалі. Побач з Вольгай каля акна стаяў і Флокерц. Ён таксама бачыў, як па вуліцы вялі Нехвядовіча.
— Караць трэба толькі вінаватых, — заўважыў Флокерц, а Вольга не зусім зразумела, да каго ён звяртаецца: да яе, да сваіх падначаленых, што знаходзіліся ў гэтым пакоі, ці да сябе самога.
Праз імгненне да Пагудаў у дом уляцела заплаканая, напалоханая суседка Ганэцкая.
— Божухна, што ж гэта робіцца?! — лямантавала яна ды заломвала ў адчаі рукі. — Забралі Фаму, павялі невядома куды!
Усе Пагуды — то бок жаночая палова сям'і, бо ні бацькі, ні Івана на той момант дома не было — пачалі супакойваць суседку ды распытваць, што здарылася. Калі Вользіна маці трошкі яе супакоіла, Ганэцкая распавяла падрабязнасці таго пагрому, які адбыўся ў яе доме. У хату ўварваліся некалькі эсэсаўцаў, пачалі шукаць сына Шурыка. Навошта ён ім спатрэбіўся, бацькі, зразумела, не ведалі. Немцы перакапалі ўсю хату, залезлі нават у падстрэшша. Шурыка, дзякуй Богу, дома тады не было. Раз'юшаныя няўдачай немцы схапілі напалоханага, дрыжачага Фаму, Шурыкавага бацьку.
Пасля стала вядома, што ўсіх, каго схапілі ў той страшны дзень, расстралялі ды закапалі ў вялізнай брацкай магіле на могілках. Калі праз некалькі дзён Вольга разам з сяброўкай Зінай ішлі каля могілак, яны з жахам убачылі, што ўвесь пясок на могільніку быў прамочаны крывёю тых няшчасных ахвяраў. Пазней Вольга даведаецца, што ў той дзень немцы хапалі тых, хто быў занесены ў так званы спіс на ліквідацыю. У тым спісе была і яна, Вольга. Былі ў тым спісе і яе брат Іван, і бацька. Але іх тады не было дома, а Вольгу не знайшлі. Магчыма, гэтаму паспрыяў і Флокерц...
Таму, калі да Пагудаў уварваўся Кізікаў бацька з весткаю пра

арышт сына, усім было зразумела: калі хлопца не вызваліць з палону, яго расстраляюць. Трэба яго вызваліць, але як гэта зрабіць? Некалькі гадзін запар абмяркоўвалі самыя розныя планы выратавання. Падкупіць ахову было немагчыма, бо лагер, дзе трымалі вязняў, быў ачэплены эсэсаўцамі. З гэтай сама прычыны ўцячы Кізік, безумоўна, не мог. Вольга прапанавала звярнуцца па дапамогу да Флокерца, але Іван не пагадзіўся.

— Флокерц не карыстаецца сярод сваіх вялікай павагай, — паведаміў Іван, — яго самога маюць ледзь не за адшчапенца. Ён нам нічым не дапаможа.

Пасля працяглых спрэчак вырашылі, што Вольга разам з Зінай паедуць у Вілейку да гебітс-камісара. Да немцаў без пачастунку хадзіць было нельга. Узялі курыцу ды колькі яек. Вольга трошкі ведала нямецкую мову, яна павінна была весці перамовы. Зіна, як больш смелая ды какетная, павінна была, у выпадку патрэбы, уздзейнічаць на немцаў сваёй прыгажосцю. Сяброўкі выправіліся ў Вілейку. Што чакае іх там?

Яны без асаблівых цяжкасцяў трапілі ў будынак, дзе ў той час знаходзіўся гебітс-камісар. Відаць, курыца і яйкі сваю ролю адыгралі. Акрамя таго, дзве беларускія дзяўчыны, адна з якіх нядрэнна размаўляла па-нямецку, а другая толькі шчыра ўсміхалася немцам, не выглядалі для іх вялікай небяспекай. Адразу ў кабінет да гебітс-камісара дзяўчат, вядома, не пусцілі. Нейкі нямецкі службовец пацікавіўся ў іх, якую справу яны маюць да пана гебітс-камісара.

— *Er ist mein Gelibter,*[*] — адказала Вольга.

Немцы засмяяліся. Адзін з іх нават падышоў да Вольгі бліжэй, паляпаў яе па плячы.

— *Gut, gut!*[**] — пахваліў ён невядома за што дзяўчыну. І тут толькі яна здагадалася, чаго смяяліся немцы. Яна ж так хвалявалася, што адказала зусім не тое, што хацела. Сваім гэлібтам, безумоўна, яна мелася назваць Кізіка, а не гебітс-камісара. Вольга страшэнна сумелася, але нечакана гэтая яе памылка нават аказалася карыснаю.

Пасля таго, як немцы ўволю насмяяліся, адзін з іх правёў дзяўчат у кабінет да гебітс-камісара. Той спачатку ўважліва выслухаў іх, пасля доўга аб нечым раіўся са сваім падначаленым. Яны гаварылі паміж сабою вельмі ціха і вельмі хутка. Вольга не паспявала зразумець, пра што ідзе гаворка.

Нарэшце гебітс-камісар звярнуўся да Вольгі:
— Значыць, вы жадаеце, каб мы вызвалілі вашага сябра, нейкага Кізіка?

Вольга моўчкі хітнула галавою на знак згоды.
— Нават не ведаю, чым вам дапамагчы, шаноўная. У нашых паперах запісана, што ваш сябра быў дэпутатам пры Саветах. Гэта значыць, што ён быў камуністам. Ён — вораг нямецкай улады. А ворагаў мы караем.
Вольга кінулася апантана абараняць Кізіка, пераконваць немца, што яе сябра ніякі не камуніст.
— Што вы, гер афіцэр, — упэўнівала яна немца, — мой сябра ніколі не быў камуністам. Ён проста працаваў інспектарам у аддзеле адукацыі. Ён жа не быў вінаваты ў тым, што прыйшла савецкая ўлада, а працаваць трэба пры любой уладзе, ці не так? Я вас запэўніваю, што мой сябра ніколі не стане замінаць нямецкай уладзе!
Вольга размаўляла з гебітс-камісарам па-нямецку, Зіна практычна нічога не разумела, але не пераставала ўсміхацца памочніку гебітс-камісара. Раптам і гэта дапаможа! Напэўна, Вольга ўсё ж здолела пераканаць немца, што Кізік не вораг нямецкай улады, бо праз нейкі час яна пачула загад вызваліць Кізіка і яшчэ некалькі чалавек, за якіх яна таксама мела смеласць папрасіць. На развітанне гебітс-камісар паціснуў ёй руку і паведаміў:
— Я вызваляю гэтых людзей выключна таму, што за іх папрасіла такая цудоўная пані.

Такім вось амаль неверагодным чынам Вольга выратавала Кізіка, але не ведала, што наклікала бяду на сваю ўласную галаву. Немцы зацікавіліся яе асобай і даведаліся, што яна працавала ў савецкай школе. Дайшло да іх і тое, што яна была прафсаюзным сакратаром у гэтай школе. Гэта стала падставаю для таго, каб Вольга зноў трапіла ў лік тых, каго нямецкія ўлады завочна выраклі на смерць. Папаўзлі чуткі, што немцы рыхтуюць новыя спісы. Вольга, праўда, пра гэта яшчэ не ведала. Яна рэдка выходзіла на вуліцу (маці баялася, каб у такі трывожны час з ёю чаго не здарылася), а брата тады не было ў Маладэчне. Таму для яе стала поўнай нечаканасцю вестка ад яе былога вучня па прозвішчы Асіповіч. Хлопец забег да яе дамоў,

проста з парогу паклікаў дзяўчыну на вуліцу і там ціха ёй паведаміў:
— Вам трэба ўцякаць, Вольга Аляксееўна. Вы ў спісе на арышт!
Ён асцярожна перадаў Вользе нейкую паперку і знік у цемры вуліцы.
Вольга разгарнула паперку. На сваё здзіўленне і таемную радасць яна ўбачыла, што гэтая цыдулка была ад Юльяна. „Мая даражэнькая, — пісаў ён сваім хапатлівым почыркам, — будзь гатовая. Я прыеду!“. Вольга не зусім зразумела тады, да чаго яна павінна быць гатовай. Яна бачыла толькі гэтае цудоўнае слова „даражэнькая“, і нязвыклае хваляванне прыемна запаланіла яе сэрца. У гэтым хваляванні яна нават забылася пра папярэджанне Асіповіча.
Вольга вярнулася ў дом. Нешта незвычайнае, напэўна, адбівалася на яе твары, бо гэта адразу заўважыла Зіна, якая тады якраз завітала была да сяброўкі.
— Што з табою? — пацікавілася яна ў Вольгі. — Ты свецішся, нібы яснае сонейка.
— Так, нічога асаблівага, — не стала тлумачыць падрабязнасці Вольга. Яна не хацела раскрываць сваю тайну нават найлепшай сяброўцы.
Дзяўчына ўзяла нейкую кнігу з паліцы, паклала туды Юльянаву цыдулку. Зіна заўважыла гэтую маніпуляцыю.
— Што гэта? Нейкая цыдулка? Ад каго? — дапытвалася яна.
— Ад вучня майго, — адказала Вольга, — так, дробязь.
Па настроі сяброўкі Зіна зразумела, што тая хоча застацца адна, і хутка выправілася дамоў. Ды і каменданцкая гадзіна ўжо надыходзіла.
Вольга, як толькі Зіна пайшла, яшчэ некалькі разоў запар перачытала дарагую ёй цыдулку. Перачытвала яна яе і на наступны дзень. Але праз дзень цыдулка некуды знікла. Вольга добра памятала, што напярэдадні паклала яе, як звычайна, у кнігу. Назаўтра паперкі ў кнізе не было. Куды яна магла падзецца, Вольга не ведала. Страта цыдулкі непрыемна ўразіла дзяўчыну. Яна нібы страціла не шматок паперы, а нешта дарагое ёй. Было прыкра, але хутка Юльян сам заявіўся да Вольгі.
Гэта здарылася праз некалькі дзён пасля таго, як Асіповіч папярэдзіў яе аб небяспецы. Стаяў канец кастрычніка. Ужо добра бралася на восень. Вечарамі моцна халадала. Вольга

якраз варушыла вугольчыкі ў грубцы ў сваім пакоі, калі ў дзверы нечакана пастукалі. Яна не ведала, хто мог прыйсці ў такі позні час, але раптам у яе моцна забілася сэрца. На парозе стаяў Юльян і ўсміхаўся ёй сваёй незвычайнай усмешкай.
— Збірайся, — прамовіў Юльян, — толькі рэчаў ніякіх з сабою не бяры. Проста апраніся ды выходзім.
Вольга не стала нічога дапытвацца. Хуценька накінула на плечы палітончык, усунула ногі ў боцікі. Вось яна і гатовая. На вуліцы іх чакалі нейкія незнаёмыя хлопцы. Яны моўчкі ішлі ззаду за Юльянам і Вольгай ажно да самага чыгуначнага вакзалу.
Калі выйшлі на вуліцу, Юльян ціха спытаў:
— Ты атрымала маю цыдулку?
Вольга толькі моўчкі хітнула галавою. Яна не стала паведамляць Юльяну, што цыдулка некуды знікла. Не хацела турбаваць яго, да таго ж баялася пакрыўдзіць такой сваёй няўважлівасцю.
— Мне паведамілі, што табе пагражае небяспека. Тваё прозвішча занесенае ў спіс на арышт! — не ўстрымаўся Юльян.
— Але мы цябе выратуем. Цяпер ты будзеш жыць у Менску, там табе будзе больш бяспечна.
Вольга, вядома, не магла нават уявіць, якая небяспека ёй пагражае, але яна верыла Юльяну. Калі ён мяркуе, што ёй нешта пагражае, значыць, так яно і ёсць.

* * *

Яны не адразу паехалі ў Менск. Па дарозе заехалі ў Радашкавічы, дзе жыла ўдава Браніслава Тарашкевіча. Тая вельмі ўзрадавалася, калі ўбачыла Юльяна. Кінулася да яго, як да роднага, расплакалася: недзе знік яе сын. Яна вельмі хвалявалася. Юльян яе супакойваў, казаў, што нічога дрэннага з ім не здарылася і што ён хутка з'явіцца, хоць Вольга па яго вачах бачыла, што Юльян таксама вельмі ўстрывожаны. Матчына сэрца не падманула. Сын Тарашкевічаў тады загінуў. Нарэшце Вольга з Юльянам апынуліся ў Менску. Вырашылі, што пакуль Вольга застанецца жыць у Юльянавай кватэры. Ён баяўся пасяліць яе недзе ў іншым месцы. У першы ж вечар, калі Вольга, яшчэ саромеючыся ў чужой кватэры, адчувала сябе трошкі няёмка, Юльян пасля непрацяглага маўчання раптам

спытаў у яе за вячэраю:
— А чым ты хочаш займацца?
Вольга не чакала такога пытання, але адказ чамусьці сам у яе вырваўся:
— Я хачу быць настаўніцай.
Дзіўна, але Юльян нібы чакаў такога адказу.
— Добра. Заўтра раніцай пойдзеш на працу. У Менску ўжо ёсць адна беларуская школа. Там няма выкладчыка нямецкай мовы. Як ты, валодаеш трохі?
Вольга адказала, яшчэ не зусім верачы ў сур'ёзнасць прапановы:
— Так, трохі ведаю. Магу нават збольшага гаварыць па-нямецку.
— Вось і добра.
Вольга, вядома, не чакала, што лёс яе павернецца такім чынам. Усю ноч яна не спала, успамінала перажытае напярэдадні, хвалявалася перад заўтрашнім днём. І вось ён, яе першы ўрок у Менску. Перад вачыма Вольгі зусім незнаёмыя твары. Як яны, гэтыя дзеці, паставяцца да сваёй новай настаўніцы? Вольга пачала ўрок. Вельмі хвалявалася, голас трохі дрыжэў. Яна сама гэта адчувала, але справіцца са сваім хваляваннем пакуль што не магла. Нечакана дзверы расчыніліся, і на парозе ўзніклі трое: Юльян, дырэктар, з якім Вольга раніцай ужо пазнаёмілася, і немец, які, напэўна, кантраляваў гэтую школу. Вучні, усе як адзін, паўскоквалі са сваіх месцаў. „*Heil Hitler!*“ — у адзін голас дружна гаркнулі яны прывітанне. „*Heil!*“— адказаў немец і павярнуўся да Вольгі. Тая нечакана адказала:
— Жыве Беларусь! — і сама спалохалася сваіх слоў, бездапаможна глянула на Юльяна.
Той пахвальна хітануў галавою, немец усміхнуўся, павярнуўся ды выйшаў з класа. Увечары, калі Юльян з Вольгай вярнуліся дамоў, Юльян распавёў, што яны, перад тым як зайсці ў клас, хвілін пяць стаялі пад дзвярыма і слухалі, як Вольга праводзіць урок. Юльян за яе вельмі хваляваўся, але немцу спадабалася новая настаўніца, а яе прывітанне — найбольш.
Гэты перыяд у жыцці Вольгі стаў самым значным, самым трывожным, самым шчаслівым і самым няшчасным. Менавіта тут, у Менску, яна стала жонкай Юльяна. Іх збліжэнне адбывалася даволі цяжка. Безумоўна, яны ўжо кахалі адзін аднаго. Кахалі яшчэ з той, першай сустрэчы. Але ж яны не

маглі вось гэтак адразу кінуцца адзін аднаму на шыю. Вольга дык і ўвогуле не магла сама зрабіць першы крок, таму што была жанчынай, ёй гэта зрабіць не дазваляла прыродная сціпласць. Акрамя таго, яна ўсё ніяк не магла паверыць, што такі чалавек, як Юльян, можа пакахаць яе, такую простую і зусім звычайную дзяўчыну.
Але Юльян пакахаў яе. Вольга была той жанчынай, якую ён чакаў і гэтак доўга шукаў. І самы звычайны чалавек, і самы выбітны шукаюць таго адзінага, хто ім патрэбны больш за ўсё. Больш за кар'еру, больш за матэрыяльны дабрабыт. Вольга для Юльяна і стала той адзінай. Але Юльян баяўся ў гэтым прызнацца і самому сабе, і Вользе. Найперш ёй, Вользе.
На час сустрэчы з Вольгай тым жнівеньскім вечарам Юльян быў ужо далёка не хлапчуком. Ён меў больш за трыццаць гадоў. За плячыма ў яго быў вялікі багаж, і жыццёвы, і палітычны. Калі б Юльян быў простым чалавекам, якіх тысячы, дык нават розніца ў веку паміж ім і Вольгай яго б, зразумела, зусім не стрымлівала. Справа была ў іншым. Юльян не хацеў для Вольгі таго небяспечнага, неспакойнага жыцця, якое лёсам было наканаванае яму самому.
У кастрычніку 1941-га году, у той самы час, калі Юльян ратаваў Вольгу ад немінучай гібелі ў Маладэчне, яго ў Менску прызначылі начальнікам Адміністрацыйнага аддзелу Беларускай Народнай Самапомачы (БНС).

Як ні хавалі Юльян і Вольга адно ад аднаго свае пачуцці, як ні адцягвалі яны тое, што павінна было здарыцца, гэта ўсё роўна здарылася. Ні вайна, ні палітычная барацьба не змаглі перашкодзіць каханню. Прырода жыве паводле сваіх законаў. Юльян і Вольга сталі мужам і жонкай.
Вечарамі, застаўшыся сам-насам, яны часта проста размаўлялі. Юльян з недаверам ставіўся да каталікоў, незалежна ад таго, беларусамі яны былі ці палякамі. Юльян часта казаў, што толькі зусім нямногія беларусы-каталікі сапраўды дбаюць пра Беларусь.
— Той не беларус, — казаў Юльян, — хто лапай хрысціцца.
Недавер да каталікоў можна было патлумачыць тымі абставінамі, якія склаліся ў сям'і Юльяна. Яго маці была каталічкай, і не простай каталічкай, а фанатычнай, бацька ж

яго быў праваслаўным. Аднаму Богу вядома, чаму фанатычная каталічка згадзілася выйсці замуж за праваслаўнага хлопца, але шлюб іх адбыўся. І была дамова, што ўсіх сыноў яны будуць хрысціць у праваслаўнай веры, а дачок — у каталіцкай. Такое становішча ў сям'і не магло не паўплываць на самасвядомасць Юльяна. Тым не менш ён меў шмат сяброў і сярод каталікоў. У тым змаганні за Беларусь веравызнанне значэння не мела.

Такім было жыццё Вольгі і Юльяна ў Менску. Вольга не ўсё ведала з таго, чым займаўся Юльян, і не належала да ніводнай нелегальнай арганізацыі, якой кіраваў альбо якую арганізоўваў Юльян са сваімі сябрамі. Вольга была проста каханай жанчынай. Гэтага ёй было дастаткова. Тым больш што хутка ў яе з'явіліся новыя клопаты.
Неяк вечарам — было ўжо даволі позна — Вольга і Юльян вячэралі ўдваіх. Нечакана Вольга адчула нейкую незразумелую млявасць. Раптоўна пацямнела ў вачах. Пальцы аслабелі, і лыжка са звонам пакацілася па падлозе. Вольга спалохалася. Што гэта з ёю? Такога ніколі раней не здаралася! Праз імгненне млявасць адышла. Вольга ўздыхнула вальней. Хацела нахіліцца, каб падняць з падлогі лыжку. Юльян ласкава затрымаў яе руку.
— Ціха, ціха, — прамовіў ён, — не рабі рэзкіх рухаў. Не хвалюйся, даражэнькая, ты зацяжарала.
Сапраўды, як гэта яна сама не здагадалася, што ў яе арганізме пачаліся нейкія змены. Яна ўжо другі тыдзень адчувала, асабліва раніцай, што ёй неяк нядобрыцца. Але Вольга не надавала гэтаму значэння. Думала, што трохі прастыла. Яна была гэтак радая, што побач з ёю Юльян, што яна мае магчымасць кожны дзень яго бачыць, кожны дзень мець такое шчасце, што ёй нават у галаву не прыходзіла: яна можа стаць яшчэ шчаслівейшай. У яе будзе дзіцятка!
— Я цябе вельмі прашу, Вольга, — казаў Юльян, — беражыся! Крый Бог, каб нешта здарылася з табою ці з нашым маленькім! Хуткае нараджэнне дзіцяці — гэта было і велізарнае шчасце для іх абодвух, і яшчэ адно выпрабаванне. Вольга разумела, што час зараз надзвычай небяспечны, кожная хвіліна можа кардынальна змяніць жыццё. Не час быў для кахання, для сямейнага шчасця, але сэрца не пытаецца: час ці не час. Вольга ў тыя кароткія імгненні шчасця, што былі падараныя ёй лёсам,

забывала і пра вайну, і пра тое, што наўкола — амаль адны ворагі. Кожная хвіліна была цэлым багаццем.
Юльян жа адчуваў яшчэ больш складаныя пачуцці. Ён быў значна старэйшы, ён быў мужчынам, і ён нёс адказнасць і за яе, Вольгу, і за іх будучае дзіця.
Юльян кахаў Вольгу так, як можа кахаць дарослы мужчына: раз і назаўсёды. Ён хаваў ад Вольгі тое шчасце, якое запаланіла яг, калі ён даведаўся, што хутка стане бацькам. Гэта была яго найвялікшая мара. Гады ішлі, ён заставаўся адзінокім, а яму так хацелася, каб яго шыю абнялі маленькія, такія родныя ручкі, ручкі яго дзіцяці. Юльян марыў аб сваім бацькоўстве, але зараз, калі мара гэтая вось-вось павінна была здзейсніцца, ён стаў баяцца гэтага. Як вопытны палітык і вопытны змагар, Юльян не мог не разумець, што тая справа, якой ён зараз займаўся, можа загубіць яго ў кожны момант. Што тады будзе з яго сям'ёй? Але іншым чынам ён жыць не мог, і іншым шляхам пайсці таксама не мог.
Немцам не патрэбная была цалкам незалежная Беларусь. Над Юльянам навіслі чорныя хмары небяспекі. Усе даносы на яго ўважліва, з нямецкай педантычнасцю ды акуратнасцю праглядаліся і падшываліся ў асабістую справу яго нямецкім начальствам. Справа з кожным днём станавілася ўсё больш грубой. Немцы больш не давяралі Юльяну Саковічу, але пакуль што і не знішчалі яго. Яшчэ не прыйшла пара, каб проста так яго знішчыць: занадта значнай асобай паспеў ён стаць за кароткі час сваёй працы ў Самапомачы. Юльян здагадваўся, што яго чакае расправа. Пачаўшы займацца нелегальнай дзейнасцю яшчэ ў юнацтве, ён паспеў навучыцца прадчуваць небяспеку. Трывожнымі прадчуваннямі ён не дзяліўся ні з кім: ні з Вольгай, каб не напалохаць яе ў тым стане, у якім яна зараз была; ні з адным са сваіх лепшых сяброў і паплечнікаў Леанідам Мараковым, хоць той і сам пра ўсё здагадваўся, бо такая ж небяспека навісла і над ім самім.
...Адбывалася чарговае паседжанне ў камісарыяце, на якое былі запрошаныя ўсе чыны нямецкай адміністрацыі. Быў там і Кубэ — апальны гаўляйтар. Юльян Саковіч надзвычай узрушаны рэпрэсіямі супраць беларускага насельніцтва. Нервы напятыя, што струны. Юльян не вытрымлівае і пачынае на нямецкай мове лаяцца з найбольш агрэсіўнай часткай нямецкай адміністрацыі. Нямецкую лаянку ён перамешвае з добрым

славянскім матам. Немцы яго зразумелі. Зразумелі ўсё: і нямецкую мову, і беларускую. Гэта было ўжо занадта. Нахабны беларус, якому нямецкая ўлада аказала такі давер, занадта распусціўся. Такога немцы дараваць не маглі. Проста ў залі паседжання Юльян быў арыштаваны на пяць сутак за парушэнне субардынацыі. Гэта быў першы крок на шляху да гібелі. Юльян ужо тады быў упэўнены, што больш не вернецца з турмы да Вольгі і да маленькай дачкі, якая на той час ужо паспела нарадзіцца і радавала бацьку сваёй бяззубай усмешкай. Але тым разам Юльян яшчэ вярнуўся. Ён адседзеў свае пяць сутак і прыйшоў дамоў. Яшчэ не настаў час яго знішчыць, але і пакідаць яго ў Менску было непажадана. Юльян гэта разумеў і сам першы зрабіў захады, каб уратаваць калі не сябе, дык хоць сям'ю. Ён вырашыў, што будзе лепш, калі яны пераедуць жыць у Маладэчна. Цяпер Менск і Маладэчна памяняліся ролямі: раней Менск уратаваў Вольгу ад гібелі, зараз больш бяспечным месцам для яе было Маладэчна. Яна зноў апынулася ў бацькоўскай хаце. Родныя сцены на гэты раз далі прытулак не толькі ёй, але і яе сям'і.

Сам Юльян яшчэ лічыўся на пасадзе ў Менску, але жыў разам з Вольгай у Маладэчне. Тыя некалькі месяцаў пасля пераезду ў Маладэчна сталі найшчаслівейшымі ў жыцці Вольгі. Яе бацькі добра прынялі Юльяна. Яны бачылі, якое шчасце свяцілася ў вачах дачкі, бачылі, з якой любоўю ставіцца Юльян і да жонкі, і да дачкі, і радаваліся за яе.

Юльян усёй душою цешыўся са свайго сямейнага шчасця, першага і апошняга. Бацькі Вольгі дзівіліся той пяшчоце, якую Юльян, загартаваны ў палітычным змаганні мужчына, знаходзіў для сваёй маленькай дачкі. Побач з ёю ён быў зусім іншым чалавекам. Кудысьці знікала суворасць, напружанне. З дачкою ён быў проста добрым, пяшчотным бацькам.

Адразу пасля нараджэння маленькай Волечкі было заведзена, што купалі яе толькі ў прысутнасці Юльяна, і ён браў самы непасрэдны ўдзел у гэтай справе. Бацька Вольгі толькі ўсміхаўся такім дзівацтвам зяця. У беларускіх сем'ях не было прынята, каб мужчына хадзіў каля дзяцей. Гэта была выключна жаночая справа, мужчыны мелі шмат іншых турбот. Юльян жа Волечку купаў кожны дзень. Часам здаралася, што ён доўга недзе затрымліваўся, прыходзіў час купання, а яго ўсё не было. Маці Вольгі, шкадуючы ўнучку, якую трэба было класці спаць,

настойвала на купанні без Юльяна. Дзяўчынку купалі, кармілі і клалі спаць. Заяўляўся Юльян.
— Ну што, будзем купаць дачушку? — бадзёра пытаўся ён у родзічаў.
І яны не асмельваліся адабраць у яго тую маленькую радасць, якая ў яго яшчэ была. Ён так ніколі і не даведваўся, што дзіця ўжо выкупанае. Зноў маці Вольгі даставала з печы чыгунок з цёплай вадою. Прыносілі з сенцаў начовачкі. Маленькую Волечку купалі яшчэ раз, чым яна была надзвычай задаволеная. Неяк у нядзелю Юльяну не трэба было нікуды спяшацца. Надзвычай рэдкімі былі такія хвіліны, калі ён меў магчымасць заставацца разам з сям'ёю. Яны сядзелі разам з Вольгай на канапе. Юльян зняў з рукі гадзіннік.
— Гэта не звычайны гадзіннік, а іменны, — распавядаў Юльян, — я атрымаў яго яшчэ ў Віленскай беларускай гімназіі за поспехі ў вучобе. Прайшло гэтулькі гадоў, дзе ён толькі ні быў, гэты гадзіннік, у якія толькі абставіны ні трапляў, а я яго яшчэ ніводнага разу не рамантаваў.
Раптам маленькая Волечка, якая дагэтуль спакойна сядзела на бацькавых руках і нават трошкі прыдрамала, выхапіла з рук бацькі гадзіннік і з усяе сілы кінула ў кут. Ад гадзінніка ў розныя бакі пасыпаліся дэталькі. Вольга знямела: гэта ж рэліквія, талісман! Юльян некалькі імгненняў няўцямна пазіраў на тое, што яшчэ зусім нядаўна было яго гадзіннікам, а зараз стала грудком непатрэбнага друзу, а пасля зарагатаў. Ён рагатаў гэтак моцна, што з кухні прыбегла напалоханая маці Вольгі. Яна даўно ўжо не чула смеху ад свайго зяця.
— Паглядзіце, якая моцная ў мяне дачка! — усклікнуў Юльян і высока падкінуў пад столь Волечку, якая таксама ажно залівалася сваім дзіцячым шчаслівым смехам.

Гэта быў апошні раз, калі Юльян бавіў час разам з сям'ёю. Праз некалькі дзён ён вярнуўся ўвечары пахмурны, нейкі нават счарнелы, нібы ноч. Узяў на рукі Волечку, доўга прыціскаў яе да грудзей, цалаваў то ў адну пульхную шчочку, то ў другую. Хаваў ад жонкі твар, але яна заўважыла, як па мужавай шчацэ павольна пацякла буйная сляза. Сэрца трывожна затрымцела: нешта здарылася! Юльян моўчкі перадаў дачку на рукі Вользе, трошкі памаўчаў, нібы не асмельваючыся нешта паведаміць.

Пасля ціха прамовіў:
— Мяне пераводзяць у Ліду. Заўтра раніцай еду. Ты збяры мне ў валізу тое-сёе.
— А я? — ледзь не шэптам запытала Вольга. Нейкая незразумелая трывога запала ў душу. Юльян часцяком кудысьці ездзіў, але ніколі яшчэ Вольга так за яго не трывожылася, хоць кожны раз ён вельмі рызыкаваў.
— Ты з Волечкай пакуль што застанешся тут, у бацькоў. Я, як толькі ўладкуюся, адразу забяру вас, а пакуль што там няма дзе жыць, — Юльян намагаўся гаварыць спакойна, але гэта яму не вельмі ўдавалася.
Вольга моўчкі хітанула галавою ў знак таго, што ўсё зразумела, і пайшла прасаваць ды складваць у чамадан Юльянавы кашулі. Ён паедзе! Яна застанецца адна! Колькі часу ёй давядзецца быць без Юльяна? Тыдзень? Месяц? Вольга не ведала, што застанецца без яго на ўсё астатняе жыццё. Лёс рыхтаваў ёй расстанне з каханым чалавекам назаўсёды.
Юльян прысеў за стол, задумаўся, пасля пачаў нешта хуценька пісаць. Асадка толькі мільгала ў ягоных пальцах. Закончыў, перачытаў, звярнуўся да Вольгі:
— Я заўтра паеду. А гэтую паперку пакладу ў шуфляду. Ты, Волечка, заўтра, калі я ўжо паеду, пачытай яе. Гэта важна.
Вольга моўчкі пагадзілася. Гаварыць яна не магла. Слёзы душылі, не давалі вольна дыхаць.
Пасля настала ноч. Апошняя ноч, калі яны былі разам.

* * *

Назаўтра, калі Юльян паехаў, а Вольга разам з маці ўволю наплакаліся, нават не ведаючы, чаго яны плачуць, Вольгу раптам нібы працяло: яна ўспомніла пра тую паперку, якую ўчора напісаў Юльян. Што гэта за паперка? Можа, там нейкія важныя даручэнні, а яна забыла пра яе! Дрыжачымі ад хвалявання рукамі яна выцягнула з шуфляды невялікі белы чатырохкутнік. Разгарнула. Тое, што там было напісана, нібы маланкай ударыла яе. Невідушчымі вачыма Вольга хвілін дзесяць няўцямна пазірала на чорныя хуткія літары.

„Тэстамэнт. На выпадак маёй смерці спадчына.
Я, Саковіч Юльян, знаходзячыся ў добрай памяці і па добрай

волі, у выпадку маёй смерці аддаю ў спадчыну 40 гектараў зямлі, якія належаць мне ў фальварку Баўдуры, а таксама ўсю маю рухомую і нерухомую маёмасць маёй дачцы Маланцы (хрышчанай Вользе). Да дасягнення ёю паўналецця распараджацца маёй маёмасцю даручаю маёй жонцы Вользе Пагудзе.

Маладэчна 9 чэрвеня 1943 году“

На жудасны вокліч Вольгі з кухні прыбегла маці, з вуліцы ўскочыў у хату напалоханы бацька.
— Што здарылася? — захвалявалася маці. — Дзе Волечка?
Яна кінулася да ложка, дзе мірна пасопвала яе ўнучка. Убачыла, што з унучкай усё ў парадку, абвярнулася да дачкі.
— Волечка, дачушка, што здарылася? Скажы нам, дачушка! — трэсла яна за плячук бледную, не падобную да самой сябе Вольгу.
— Мама, — ледзь здолела вымавіць Вольга, — я больш ніколі не ўбачу Юльяна!
— Што ты такое гаворыш, дачушка! — паспрабавала супакоіць яе маці. — Чаму гэта ты яго больш не ўбачыш? Праз нейкі тыдзень прыедзе, забярэ вас з Волечкай. Ён жа цябе гэтак любіць!
Вольга не слухала таго, што казала ёй маці.
— Вось, глядзі, што ён мне пакінуў, — яна працягнула маці тэстамэнт.
...Калі ў хату раптам забегла напалоханая Зіна і адразу з парогу паведаміла: „Юльяна больш няма!“, Вольга нечакана спакойна адказала: „Я ведаю“. Праўда, пасля яна не памятала, што ў той дзень прыбягала Зіна і што яна першая прынесла гэтую жудасную вестку, як і не памятала Вольга свайго адказу сяброўцы.
Вольга была ў нейкім незразумелым стане. Тыя падзеі засталіся ў яе памяці не суцэльным шэрагам, а бязладнымі кавалкамі. Вольга то ўспамінала, то зноў забывала падрабязнасці таго жудаснага часу. Вось Зіна паведамляе ёй пра тое, што Юльян загінуў, вось нейкія людзі аб нечым перамаўляюцца з бацькамі Вольгі. Вось ёй дапамагаюць сабрацца, яна едзе ў цягніку. Едзе на пахаванне каханага чалавека. Побач з ёю дзве сястры Гурыновічаў, сяброў Юльяна. Яны, гэтыя маладзенькія

дзяўчаткі, ні на хвіліну не пакідаюць Вольгу адну. Зіны побач няма. Яна не паехала разам з сяброўкай, каб падтрымаць яе ў гэты цяжкі час. Шмат пазней яна патлумачыць гэта тым, што яе папярэдзіў Стэфан, каб яна ні ў якім разе не ехала ў Ліду на пахаванне. Там, казаў Стэфан, яе могуць забіць. Зіна не паехала, хоць Вольга доўгі час думала, што яна была побач. Вольга перыядычна трызніла ў той час, таму ў памяці яе засталіся толькі кароткія эпізоды. Шмат пра што яна змагла ўспомніць толькі з дапамогай сяброў.

...Яны прыехалі ў Ліду. Дабраліся да могілак, дзе святар ужо чытаў памінальную малітву. Вялікая брацкая магіла. Тры дамавіны. Каля дамавінаў Леаніда Маракова і хлопчыка, што быў разам з Юльянам і Леанідам у тую жудасную хвіліну, калі з-за вугла, па-зладзейску, іх расстраляў польскі тэрарыст, галосяць родныя. Сясцёр Гурыновіч папярэдзілі, каб яны не падпускалі блізка да Юльянавай дамавіны Вольгу. Тое, што на пахаванні прысутнічае Юльянава жонка, ведалі лічаныя людзі. Яе прысутнасць старанна хавалі ад старонняга вока. Забойцы былі побач.
Вольга чула жалобны гул званоў, плач, гоман людзей, бачыла нечыя твары. Раптам у вачах пацямнела, усё некуды паплыло: паплыла царква, дрэва, прыхінуўшыся да якога яна стаяла, паплыў людскі натоўп. Калі яна расплюшчыла вочы ды падняла галаву, натоўпу вакол ужо не было. Яна ўбачыла, што сядзіць на нейкай лаўцы, злева ад яе вялізная гара — насып на брацкай магіле, крыж. Насупраць яе стаіць хлопчык і ўважліва зазірае ёй у твар. Хлопчык заўважыў, што Вольга апрытомнела, прамовіў:
— Пайшлі, цёця.
Вольга не ведала, што гэта за хлопчык, куды ён яе запрашае. З цяжкасцю яна разумела, дзе знаходзіцца і навошта. Яны пайшлі па нешырокай сцяжынцы, якая падзяляла могілкі амаль што на дзве роўныя часткі. Выйшлі за вароты, перайшлі на другі бок вуліцы. Зайшлі ў нейкі двор. У хаце, у зусім незнаёмых Вользе людзей, адбывалася памінанне яе мужа і ягоных таварышаў, што загінулі разам з ім.
Вольга вярнулася назад у Маладэчна. Зноў цягнік, зноў побач Гурынавічанкі. Дома Вольга ўбачыла чорную хустку на галаве ў маці, апухлы ад слёз твар. Бацька маўчаў, толькі мацней

прыціскаў да грудзей маленькі жывы камячок, сваю ўнучку. Яны нічога не распытвалі ў Вольгі. Яна таксама маўчала, не вымавіла ані слова, вярнуўшыся у родную хату. Моўчкі пайшла ў свой пакой, які яшчэ некалькі дзён таму быў не толькі яе, але і Юльянавым. Маці паціху ўвайшла ў пакой услед за Вольгай, разаслала ложак.

— Паляжы, дачушка, адпачні, — скрозь слёзы прапанавала яна сваёй змарнелай, няшчаснай дачцы.

Тая паслухалася, прылегла. Але сон не ішоў. На сэрцы ляжаў велізарны камень. Ён не даваў дыхнуць. У галаве стаяла пустэча: ані думак, ані ўспамінаў. Маці прынесла з кухні талеркі, падсунула бліжэй да ложка зэдлік:

— Паеж, дачушка. Змарнела як!

Вольга моўчкі адвярнулася да сцяны. Так і ляжала да вечара, не павярнулася нават тады, калі маці паднесла да яе малую Волечку.

Пяць сутак Вольга ляжала моўчкі, ні да кога не паварочвалася, ні на што не рэагавала. Яна сама нібы памерла разам з Юльянам. Яна не спала, нічога не ела, адмаўлялася нават ад вады. Не плакала, хоць маці колькі разоў падыходзіла да яе, упрошвала:

— Паплач, дачушка, стане лягчэй.

Вольга, магчыма, і рада была б паплакаць, але ж дзе ўзяць тыя слёзы? У душы ўсё нібы высахла і ажно пякло ў грудзях страшэннай горыччу. Бацькі пачалі ўжо моцна хвалявацца за здароўе дачкі: каб хаця чаго не здарылася ўжо з ёю самой! Маці і ўпрошвала яе што-небудзь з'есці, падняцца з ложка ды выйсці на вуліцу падыхаць свежым паветрам. На вуліцы так хораша! Упрошвала патрымаць на руках малую Волечку, спадзявалася, што хоць дзіця верне Вольгу да жыцця. Пасля маці пачала нават лаяць Вольгу: ці ж мажліва гэтак перажываць! Юльяна ўжо не вернеш, а ёй жа трэба жыць, гадаваць дачушку. Вольга ніяк не рэагавала на ўпрошванні бацькоў. Як яны не разумеюць, што жыцця без Юльяна проста не можа быць?! Быў Юльян, было і жыццё, а зараз як можна жыць без яго?!

Увечары на пятыя суткі ляжання ў ложку, калі Вольга ўжо амаль што і не разумела, што з ёю здарылася, калі ад голаду і пакутаў яна ўвесь час траціла прытомнасць, яна раптам вельмі выразна пачула асцярожны стук у вакно. Вольга лёгка паднялася з ложка, хоць дагэтуль не магла ўжо без дапамогі

маці нават павярнуцца на іншы бок, пайшла паўз здзіўленых бацькоў, якія тым днём амаль што не адыходзілі ад яе ложка. Лёгка, нават не хістаючыся, нібы й не страціла столькі сілаў, Вольга падышла да акна. Адхінула фіранку. Там, за акном, стаяў Юльян і, як заўсёды, усміхаўся ёй сваёй незвычайнай усмешкай, якая так падабалася Вользе. Юльян быў такі, я заўсёды. Незвычайным быў толькі апрануты на ім светлы гарнітур. Вольга дакладна памятала, што такога гарнітура ў Юльяна ніколі не было. Ён увогуле апранаўся надзвычай строга.
Вольга гэтак узрадавалася, што зноў бачыць Юльяна, ёй так шмат трэба было яму распавесці! Але яна не паспела нічога яму паведаміць. Юльян першы звярнуўся да яе. Ён ласкава прамовіў:
— Не перажывай больш, Вольга. Гадуй нашую дачушку. А са мною ўсё добра.
Сказаў і знік, за акном засталася толькі чорная летняя ноч. У шыбу паціху пастуквала галінка старой грушы. Збіралася на навальніцу. Недзе далёка пабліскваліе маланкі. Вольга стаяла каля акна і дапытліва ўглядалася ў цемру, але Юльяна там больш не было. За яе спіною моўчкі стаялі бацькі. Яны назіралі, як дачка чамусьці ўглядалася ў цемру, але турбаваць яе пытаннямі не асмельваліся.
Вольга нарэшце адвярнулася ад акна, захінула фіранкі і звярнулася да маці:
— Мама, дай чаго павячэраць.
Трэба было жыць. Яна выхапіла з рук агаломшанага бацькі сваю Волечку і пачала апантана яе цалаваць. Юльян не пакінуў яе адну, ён пакінуў ёй Волечку.

* * *

Так пачалося жыццё Вольгі без Юльяна. Яна паднялася нарэшце з ложка, зноў пайшла працаваць у гандлёвую школу, дзе пачала была выкладаць нямецкую мову адразу пасля таго, як яны з Юльянам і дачушкай вярнуліся дамоў у Маладэчна. Першыя дні працы былі надта цяжкімі. Усе ўжо ведалі, якое няшчасце напаткала Вольгу, усе ёй спачувалі. Акрамя таго, многія ведалі і самога Юльяна. Вольга чытала спагаду ў вачах сваіх вучняў, у вачах выкладчыкаў, у вачах дырэктара школы.

Гэта адначасова і ўсцешвала яе, як цешыць кожнае шчырае спачуванне, і прыносіла ёй нясцерпны боль, таму што нагадвала пра яе страшную страту.
Не было, напэўна, такой хвіліны, каб Юльян сышоў з яе памяці. Чым бы яна ні займалася, ён знаходзіўся побач. Але зараз памяць аб ім была спакойнай, яна не раніла душу так, як раней. Для ўсіх Юльян загінуў, а для Вольгі ён быў жывы, толькі цяпер жыў у яе сэрцы. І туды, дзе быў зараз ён, яна не дапускала нікога старонняга.
Праз некаторы час Вольга атрымала ліст з Юльянавых Баўдуроў. Да Вольгі звяртаўся бацька Юльяна. Ён называў яе дачкою і запрашаў прыехаць пагасцяваць у Баўдуры. Пасля непрацяглых роздумаў яна вырашыла, што паедзе ў Баўдуры, хоць гэта было небяспечна. Вайна ж яшчэ не скончылася. Вольга адчула, што ёй вельмі трэба пазнаёміцца з Юльянавым бацькам. Дарэчы, бацька быў практычна адзіным чалавекам, пра якога Юльян успамінаў і пра якога ён часцяком распавядаў Вользе.

Цягнік у Баўдурах прыпынку не меў. Толькі трошкі сцішыў хаду. З вагонаў трэба было выскокваць проста на хаду. Вольга скокнула і ледзь не вывіхнула нагу. Ёй яшчэ ніводнага разу дагэтуль не даводзілася скакаць з цягніка, калі ён не стаіць, а рухаецца, няхай сабе і павольна. Паднялася, абтрэсла з каленяў пясок. Нагу, дзякуй Богу, не вывіхнула. Агледзелася па баках. Юльянаў бацька ў лісце прыблізна апісаў ёй, як знайсці фальварак. Яна і пайшла ў тым накірунку, куды, як меркавала, трэба было ісці. Па дарозе нагнала вялізны воз, нагружаны сенам. Так і ішлі некаторы час па пыльнай дарозе: яна і конь, што цягнуў цяжкі воз. Таго, хто высіўся ўгары на сене, яна не бачыла. Чалавек да яе таксама не адзываўся. Гэтак і падыйшлі моўчкі да варотаў. Чалавек зрабіў спробу саскочыць, бо вароты ў двор былі зачыненыя, але Вольга апярэдзіла яго, адчыніла. Насустрач ёй з хаты ўжо спяшаўся Юльянаў бацька. Падыйшоў, абняў, прыціснуў да грудзей.
— А ты такая, як цябе апісваў Юльян, — у голасе бацькі выразна чуліся слёзы, — прыгожая. Ну, заходзь, дачушка, у хату.
Дагэтуль Вольга ўсё ж не была ўпэўненая, ці правільна яна зрабіла, што вырашыла наведаць Баўдуры. Зараз яна

зразумела, што не памылілася. Тут жыў бацька Юльяна, і ён не падаўся ёй чужым чалавекам. Яна адразу адчула, што ён для яе і Волечкі будзе родным. Гэта быў бацька Юльяна, а значыць, і яе. Гэта быў дзядуля Волечкі.

Іншая справа была Юльянава маці. Захінутая з ног да галавы ў нейкае чорнае даўжэзнае адзенне, жанчына гэтая не падышла блізка да Вольгі, не абняла, толькі прамармытала нешта незразумелае на Вользіна прывітанне. Ужо сутонела. Падыходзіў час на вячэру. Сабралася ўся даволі вялікая сям'я. За сталом панавала нейкая гнятлівая атмасфера.

Маці Юльяна спачатку моўчкі жавала, пасля зусім нечакана, прынамсі, для Вольгі, адклала ўбок лыжку і аб'явіла, ні да кога не звяртаючыся:

— Ён быў супраць касцёлу, таму пан Бог пакараў яго такой смерцю!

Гэта было так нечакана, што Вольга не адразу ўцяміла: маці гаворыць пра свайго сына, пра Юльяна? Ніколі яшчэ нішто так не здзіўляла яе, як тое, што зараз выказала Юльянава маці. Няўжо маці можа такое гаварыць пра свайго сына, да таго ж пра нябожчыка?! Вольга ва ўсе вочы глядзела на яе, яна чакала нейкага тлумачэння. Але маці больш нічога не казала. Яна зноў працягвала сваю вячэру. Вольга не адводзіла вачэй ад маці, а бацька і ўсе астатнія, наадварот, паапускалі галовы яшчэ ніжэй у свае талеркі, хутчэй запрацавалі лыжкамі. Няёмкасць за сталом стала ўжо проста матэрыяльнаю. Есці ды ўвогуле сядзець за гэтым сталом Вольга не мела больш сілы. Яна паднялася, падзякавала за вячэру і выйшла ў двор. Ёй тэрмінова трэба было глынуць свежага паветра. Вольга стала на ганку, глянула на зорнае неба. Недзе там міргае ёй зорка, якою стаў зараз Юльян. Ляснулі дзверы, побач з ёю спыніўся Юльянаў бацька. Закурыў.

— Ты, дачушка, моцна не наракай на маці. Не думай, што яна такая чэрствая. Яна любіла Юльяна, вельмі любіла, як і кожная маці любіць сваё дзіця. Гэта ўсё ксёндз. Карыстаецца яе горам ды ўбівае ёй у галаву розную бязглуздзіцу. А яна нібы розумам кранулася, нічога зараз у хаце не робіць, усё ў касцёле прападае. Мы ёй усе зараз як чужыя. Не таму Богу молімся. Не разумее, бедная жанчына, што Бог адзін. Не караў ён Юльяна, а наадварот, я ведаю, што мой сын — герой, — бацька ледзь стрымліваў слёзы.

— Я заўтра паеду дамоў, — ціха паведаміла Вольга, — паеду да Волечкі.
— Я цябе падвязу да цягніка, — прапанаваў бацька.
Пасля ён трошкі памаўчаў і неяк вінавата папрасіў:
— Дазволь мне, як управімся з работай, прыехаць да цябе, паглядзець на ўнучку.
Гэта ўжо было невыносна. Вольга кінулася на грудзі гэтаму чалавеку, і яны доўга і ціха плакалі.
Трэба было яшчэ адну ноч і цэлую раніцу заставацца ў гэтым доме. Вольга старалася пазбегнуць размоваў з Юльянавай маці, асабліва пасля такога яе выказвання. Вольга адначасова і шкадавала гэтую жанчыну, і аніяк не магла ёй дараваць таго, што рэлігійны фанатызм яна паставіла вышэй за мацярынскія пачуцці. Вольга не хацела ніякай размовы са сваёй свекрывёю, тая таксама не выказвала вялікай цікавасці да нявесткі, але размова ўсё ж адбылася. Назаўтра раніцай, калі Вольга збіралася ад'язджаць дамоў, да яе раптам падышла Юльянавай маці з нейкім кошыкам у руках.
— Перадай гэта маёй унучцы, — папрасіла яна неяк вінавата,
— і не крыўдуй на нас.
— Дзякуй, — шчыра адказала Вольга і пацалавала маці ў шчаку. Зараз у яе душы засталася толькі шкадоба да гэтай няшчаснай жанчыны.
Воз паціху зарыпеў у бок чыгуначнай станцыі. Бацька засяроджана аб нечым маўчаў. Вольга таксама нічога не гаварыла. Хутка яны прыехалі на чыгуначную станцыю. Калі цягнік адыходзіў, бацька зноў абняў Вольгу.
— Калі, не дай Божа, будзе бяда якая ці патрэба, заўсёды звяртайся да нас. Мы ж самыя блізкія сваякі з табою. Я заўсёды ведаў, што мой Юльян ніколі не памыляецца. Не памыліўся ён і ў табе, дачушка.

* * *

Немцы адыходзілі. Да Пагудаў прыбягала па некалькі разоў на дзень суседка і паведамляла, які горад ці мястэчка ўжо зноў пад Саветамі. Адкуль яна ведала апошнія навіны, было невядома, але яе навіны адпавядалі рэчаіснасці.
Нарэшце і Маладэчна пакінулі апошнія нямецкія вайсковыя часткі. У горад увайшлі савецкія вайскоўцы. Іх радасна віталі.

Людзям надакучыла штодзённая і штоночная трывога, надакучыла чужая нямецкая мова. Пасля доўгай вайны яны спадзяваліся, што зараз прыйдзе мір, свабода і спакой. Гандлёвую школу, у якой апошнім часам працавала Вольга, зачынілі. Моладзь, што там вучылася, засталася пакуль што без занятку, як без занятку аказаліся зараз і выкладчыкі гэтай школы. Некаторыя з іх паехалі разам з немцамі. Хадзілі чуткі, што пры Саветах ім заставацца небяспечна. Прапаноўвалі з'ехаць і Вользе, але яна адмовілася. Тут яе бацькі, тут магіла Юльяна. Акрамя таго, яе сям'ю зноў напаткала вялікая бяда: некуды знік Іван, брат Вольгі. Амаль год ад яго не было аніякіх вестак. Апошні раз Вольга бачыла брата, калі адзначалі сорак дзён па Юльяну. А пасля ён нібы ў ваду кануў: няма ні почуту. Маці ўся, гаротная, спакутавалася ад чакання. А Івана ўсё не было. Вольга не ведала дакладна, чым ён займаецца. Ведала толькі, што ён меў нейкае дачыненне да той справы, якой займаўся і Юльян. Магчыма, Іван служыў беларускай справе сваёй прафесіяй: ён жа быў лекарам.
Вольга не паехала разам з сябрамі. Яна вырашыла заставацца ў Маладэчне. Меркавала жыць тут увесь час, але лёс распарадзіўся іначай. Ёй зноў прыйшлося ўцякаць са свайго роднага гарадку і зноў уначы, як тады з Юльянам.
Вайна скончылася. Усталёўвалася новая ўлада. Спадзяванні тых беларусаў, якія радасна сустракалі савецкія войскі, спраўджваліся не заўсёды. Зноў папаўзлі чуткі, што некаторых з тых, хто працаваў пры немцах, ужо арыштоўваюць. Праўда, з калегаў Вольгі, якія працавалі разам з ёю ў гандлёвай школе, пакуль нікога не забралі. Ніхто не прыходзіў і да Вольгі. Усё было ціха, таму Вольга думала, што гэтыя чуткі, магчыма, — проста страхі напалоханых людзей, якія яшчэ не забылі вайну і смерць на кожным кроку. Акрамя таго, Вольга была ўпэўненая ў тым, што ні яна, ні Юльян нічога дрэннага не зрабілі. Наадварот, яны марылі аб шчасці ды свабодзе свайго народу, беларусаў. Няўжо за гэта можна кагосьці караць?!

Тым днём Вольга вярталася дамоў з крамы, куды хадзіла па хлеб. Доўга давялося прастаяць у чарзе, пакуль атаварыла карткі. Вольга не любіла стаяць у чарзе. Натоўп, сваркі, якія амаль заўсёды чамусьці ўспыхвалі тут без дай прычыны — усё гэта не толькі раздражняла Вольгу, ёй рабілася фізічна млосна.

Калі Вольга, нарэшце выйшла на свежае паветра, у яе ажно закруцілася ў галаве. Ад паветра, што напаўняла цеснае памяшканне крамы, у якую людзей набівалася, нібы селядцоў у бочку, зусім няцяжка было і прытомнасць страціць. Вось у такім трошкі затлумленым стане яна павольна ішла па вуліцы, накіроўваючыся дамоў. Не спяшалася, хацела ўволю падыхаць свежым паветрам. Павярнула на сваю вуліцу. Да роднага дому заставаліся лічаныя крокі. Вольга не заўважыла, як побач з ёю праехала машына, дакладней, проста не звярнула на яе ўвагі. Машыны на вуліцах Маладэчна ў той час ездзілі, хоць і не надта часта. Нічога дзіўнага ў тым, што Вольгу абагнаў аўтамабіль, не было. Але раптам каля яе шчакі нешта пранізліва прасвістала. Вольга спачатку нават не адчула болю, толькі шчацэ стала горача, а пасля па ёй нешта пацякло. Абцершы гэтае нешта і глянуўшы на руку, яна ўбачыла, што рука ў крыві. Адкуль, што здарылася? Вользе і ў галаву не магло прыйсці, што ў яе толькі што стралялі і толькі цудам яна засталася жывой. Машына, з якой стралялі, даўно ўжо знікла з вачэй, а Вольга ўсё стаяла пасярод вуліцы і не магла крануцца з месца. У той момант яна нават і не думала пра тое, што стралялі акурат з машыны. Яна гэтак напалохалася, што ўвогуле не мела сілы пра нешта падумаць. І толькі дома, калі ўвайшла ў хату ды напалохала сваім скрываўленым тварам родных ды Зіну, якая якраз завітала да сяброўкі, Вольга зразумела, што палявалі на яе менавіта з той машыны. Першай да такой высновы прыйшла, як заўсёды, Зіна.
— У цябе стралялі! — без усялякага сумневу канстатавала яна, выціраючы сяброўцы скрываўленую шчаку. — Стралялі з той машыны.
Толькі з гэтага дня Вольга пачала па-сапраўднаму баяцца.

Пасля таго падарожжа да Юльянавых сваякоў Вольга больш ні з кім з іх не сустракалася. Не было нагоды, дый чым ёй маглі дапамагчы гэтыя людзі, якім самім патрэбная была дапамога. Над імі ж таксама навісла пагроза, як над сваякамі „ворага народу “. Але менавіта ад сям’і Саковічаў прыйшла Вользе дапамога. Лістападаўскай ноччу ў Маладэчна прыехаў стрыечны Юльянаў брат Аляксандр. Дагэтуль Вольга ніводнага разу яго не бачыла, але ведала пра яго, бо Юльян некалькі

разоў пра яго ўзгадваў. Аляксандр прыехаў, каб вывезці Вольгу з дачкою ў Літву, у Гялву. Літва на той час таксама была ўжо савецкай, але Аляксандр меркаваў, што там, па першым часе, Вольга будзе ў большай бяспецы. Заставацца надалей у Маладэчне ніяк не выпадала. Вольгу чакаў або лагер, або смерць. Савецкая ўлада не даравала правіны перад сабою і значна меншым „злачынцам“. Жонку Саковіча савецкая ўлада магла толькі знішчыць.

* * *

Літоўская Гялва дала прытулак дзвюм Вольгам, самым блізкім жанчынам Юльяна Саковіча. Вольга-старэйшая праз некаторы час уладкавалася ў школу.
Ішоў час. Вольга працавала. Дачушка падрастала і ўсё больш рабілася падобнай да Юльяна. Вольга замуж больш не выйшла і не збіралася гэтага рабіць, чым нямала здзіўляла і сваіх сваякоў, і Зіну, і проста знаёмых. Яны яе не разумелі, а Вольгу надзвычай раздражнялі іх допыты: чаму яна, такая прыгожая, адукаваная жанчына, настаўніца, не імкнецца знайсці сабе кавалера. Нават маці, якая звычайна добра разумела Вольгу, у гэтым пытанні далучылася да ўсіх астатніх. Маўляў, Вольга не павінна сябе хаваць раней часу. Прыкра было тое, што ніхто з блізкіх аніяк не мог зразумець, што Вольга зусім сябе не хавае, проста яна не можа быць побач з іншым чалавекам, не з Юльянам. Вольга спачатку намагалася патлумачыць гэта, але, сутыкнуўшыся некалькі разоў з тым, што яе проста не разумеюць, кінула гэтую справу. Цяпер, калі ў яе дапытваліся, чаму яна не выходзіць замуж — а прэтэндэнтаў на яе руку ставала, — яна проста адмоўчвалася або кідала ў адказ якую-небудзь нязначную фразу.
Вольга разумела, што сяброўка і родныя хочуць ёй толькі дабра. Не дзеля простай цікаўнасці задавалі яны такія балючыя пытанні, ранячы яе ў самае сэрца. Проста яны аніяк не маглі ўцяміць, што ў жыцці Вольгі ўжо было каханне, няхай сабе такое кароткае і няшчаснае — яно ў той жа час было і такім шчаслівым.

Жыццё як быццам пачало паціху наладжвацца. Паступова забываліся ўсе тыя перажыванні, якія, здавалася, не пакінуць сэрца ніколі. Але пакуль чалавек жыве, лёс рыхтуе яму ўсё

новыя і новыя выпрабаванні. Новая неспадзяванка напаткала Вольгу неўзабаве пасля яе перасялення ў Літву. Зусім выпадкова яна пачула ў настаўніцкай размову паміж сваімі калегамі. Адна з настаўніц распавядала сяброўцы, што ў іхнім мястэчку з'явіўся новы жыхар. Гэта зусім не зацікавіла б Вольгу, якая ўжо даўно заўважыла, што лепш ведаць менш і чуць менш, пагатоў калі гутарка не тычыццца цябе самой. Дый што цікавага магло быць у тым, што ў мястэчку пасяліўся новы лекар? У той час шмат людзей пераязджала з месца на месца, абжывала новыя сядзібы. Пасля вайны ўсё моцна перамяшалася. Але раптам Вольга пачула тое, што ўразіла яе і напоўніла яе збалелае ў апошні час сэрца надзеяю.
Да яе нечакана звярнулася адна з настаўніц:
— Вольга Аляксееўна, а вы нічога не чулі пра нашага новага лекара? — запытала яна ў Вольгі, — кажуць, што яго прозвішча Пагуда. Магчыма, гэта ваш сваяк?
Вольга не памятала, якім чынам яна апынулася каля дзвярэй амбулаторыі. На дзвярах ужо вісела шыльда: „Пагуда Іван Аляксеевіч". Няўжо брат знайшоўся?! Вользе надзвычай хацелася ўляцець у гэты пакой, за гэтыя дзверы, каб абняць брата, якога яна так даўно не бачыла, якога яна так даўно шукала, што ўжо пачала была страчваць надзею калі-небудзь яго знайсці. Але яна прымусіла сябе стрымацца. Аддыхалася, паправіла прычоску. Не хацелася выглядаць перад братам недагледжанай, раскудлачанай. Адчыніла дзверы. Перад ёю за сталом сядзеў зусім незнаёмы чалавек у белым медычным халаце. Глянуў на Вольгу, ветліва запрасіў:
— Заходзьце, калі ласка.
Але Вольга як стала ў самых дзвярах, гэтак там і застыла. Яна не магла зрабіць ані кроку. Гэта быў не яе брат! Але ж трэба было неяк патлумачыць гэтаму чалавеку сваё ўварванне ў ягоны кабінет. Вольга памалу, нібы на чужых нагах, падышла да стала. У той момант яна, напэўна, сапраўды выглядала на моцна хворую.
— На што скардзіцеся? — запытаў лекар, схіліўшыся над нейкімі паперамі на сваім стале. Пасля, зноў жа, не пазіраючы на Вольгу, павярнуўся да шафы, дзе былі складзеныя медычныя карты ўсіх жыхароў мястэчку.
— Як ваша прозвішча?
— Пагуда, — ледзь здолела прашаптаць Вольга. Яна яшчэ зусім

не адыйшла ад моцнага хвалявання. — Пагуда Вольга Аляксееўна.
— Як? — ажно падскочыў са свайго месца лекар. — Пагуда?! Ён раптам моцна захваляваўся. У яго відавочна задрыжэлі рукі, твар спачатку пачырванеў, пасля кроў адхлынула, і лекар зрабіўся белы, нібы папера. Што яго так напалохала? Вольга пазірала на гэтага чалавека, які за нейкае імгненне нават неяк пастарэў, і раптам ёй стала страшэнна душна ў гэтым даволі прахалодным кабінеце. Яна намацала краёчак табуреткі і асцярожна прысела. Лекар глядзеў у яе картку, але Вользе чамусьці падавалася, што ён нічога там не бачыць. Некалькі разоў лекар нібы рабіў спробу нешта сказаць, але спыняўся на паўслове. Гнятлівае маўчанне доўжылася некалькі хвілін. Нарэшце лекар усё ж загаварыў. Пытанне далося яму з відавочнай цяжкасцю.
— А вы даўно тут жывяце? Нарадзіліся ж, пэўна, не тут. Тут, кажуць, шмат прыезджых.
Вольга і чакала гэтага пытання, і пабойвалася яго, як і сам гэты незнаёмы лекар, але адказала, нечакана для сябе самой, спакойна:
— Так, я сюды прыехала. Амаль што ўсе спецыялісты ў гэтым мястэчку нетутэйшыя. Я дык раней у Маладэчне жыла.
— У Маладэчне? — у лекара быў такі выгляд, быццам медычная дапамога была ўжо патрэбная яму, але ён мужна працягваў размову.
— А на якой вуліцы вы там жылі?
— На Абухоўскай.
Лекар ускочыў, расчыніў фортку, хоць у пакоі хапала свежага паветра. Трохі пастаяў каля акна, павярнуўшыся да Вольгі спінаю.
— Вось дзіва, у нас з вамі аднолькавае прозвішча, — лекар спрабаваў сказаць гэта бадзёра, але ў яго не надта добра атрымалася, — такая прыемная нечаканасць. Я таксама з Маладэчна. Гэта трэба ж так: жылі ў адным горадзе, мелі аднолькавае прозвішча, нават на адной вуліцы жылі, а сустрэцца давялося толькі тут.
Лекар яшчэ доўга пра нешта гаварыў. Ён ужо не стараўся схаваць хваляванне. Ён распавядаў пра Маладэчна, пра гандлёвую школу (праўда, не паказваў, ці ведае, што там працавала Вольга). Яна з жахам чакала, калі ён пачне пытацца

пра Юльяна. Але, на шчасце, пра Юльяна ён не абмовіўся аніводным словам. Лекар гаварыў, а Вольга слухала, не перапыняла яго, нават не сказала яму, што ў Маладэчне з прозвішчам Пагуда жыла толькі іх сям'я. А на Абухоўскай вуліцы яна ведала кожную курыцу, і гэтага лекара ніколі там не бачыла.

Лекар памераў Вользе ціск, пацікавіўся, ці баліць ёй галава. На развітанне выпісаў рэцэпт. У Вольгі ад хвалявання і ўсяго толькі што перажытага сапраўды трохі разбалелася галава і нават падвысіўся ціск.

Вольга паволі, ледзь перастаўляючы ногі, нібы яна была не маладая, поўная жыцця жанчына, а старая, стомленая бабуля, сунулася ў бок школы. „Божа літасцівы, што яны зрабілі з маім братам?"

Яна нікому не сказала пра сваю сустрэчу з лекарам. На пытанне калегаў, ці гэта яе сваяк, адказала, што не бачыла яго, бо яго не было ў лякарні. А сама да канца ўрокаў, а пасля і дома ніяк не магла супакоіцца. І паводзіны гэтага чалавека, яго відавочны страх перад Вольгай, і тое, што ён носіць імя яе брата, амаль не пакідалі сумневу: брата ў Вольгі больш няма! Гэты чалавек проста скарыстаўся з яго дакументаў. Навошта яму гэта было трэба, Вольга не ведала, і няведанне яшчэ больш палохала. Што будзе зараз з ёю, з яе дачкою? „Ах, Юльяне, як мне патрэбная цяпер твая дапамога! Твая парада!"

Вольга не ведала, што ёй цяпер рабіць. Тое, што яна трапіла ў вялікую небяспеку, не выклікала сумневу. Але як ратавацца?! Трэба недзе схавацца, але дзе? Бацькі заставаліся ў Маладэчне, куды ёй вяртацца было нельга. Дый чым яны маглі ёй дапамагчы? Самі кожны дзень чакалі арышту. Сяброўка Зіна на той час ужо апынулася ў лагеры. Ёй прыпісвалі здраду Радзіме. Аляксандр, той, што прывёз Вольгу сюды, з'ехаў у Польшчу і там некуды знік, ужо даўно не даваў аб сабе аніякага знаку. Вольга не ведала, дзе яшчэ ёй схавацца ад савецкіх асабістаў. Хавацца больш не было дзе. Яна ўсё ж на ўсялякі выпадак сабрала ўсё самае неабходнае. Раптам прыйдзецца зноў некуды ўцякаць! Але гэтым разам уцякаць ёй не давялося. Назаўтра, калі яна прыйшла ў школу, там ужо абмяркоўвалі апошнюю навіну: нечакана некуды з'ехаў новы лекар. Не паспеў і тыдня адпрацаваць у іхнім мястэчку. Пэўны час Вольга яшчэ была ў трывожным чаканні: калі па яе прыйдуць? Але ніхто не

прыходзіў. Паступова яна супакойвалася, жыццё вярталася на звыклыя рэйкі. Шторанiцы Вольга ўваходзіла ў школьны клас, праводзіла ўрокі, вадзілася найбольш са сваімі вучнямі (апошнім часам яна старалася як мага менш бываць у настаўніцкай, там яна зараз чамусьці пачувалася не вельмі ўтульна).

Асабісты не прыйшлі тады па Вольгу, хоць яна іх чакала і была гатовая да іх прыходу маральна. Прыйшлі ж яны тады, калі яна перастала іх чакаць. Ужо ішоў 53-ці год, год смерці Сталіна. Вольга з дачкою жылі пры школе, займалі невялікі пакойчык. Спачатку ў школу прыехаў нейкі інспектар. Сядзеў у дырэктара цэлы дзень, нібыта правяраў нейкія паперы. Настаўнікі, напалоханыя і прыгнечаныя гэтым непажаданым госцем, толькі паціху перашэптваліся. Час быў такі, што з'яўленне інспектара магло шмат нашкодзіць кожнаму з іх, нават найлепшаму. Вольга, як толькі ўбачыла інспектара, адразу адчула: ён прыехаў па яе. Яна чула перашэптванні настаўнікаў, бачыла, якія яны напалоханыя, але не магла паведаміць ім, што гэтым разам яны могуць не палохацца. Інспектару трэба было толькі яе, Вольгу. Ёй ніхто нічога не паведамляў, яе не выклікалі ў дырэктарскі кабінет, жыццё цягнулася як звычайна, але яна была ўпэўненая, што гэтым разам не памылілася. З ёю такое здаралася: адчуванне бяды апярэджвала самую бяду.

Інспектар паехаў тым жа днём, але ягоны ад'езд спакою Вользе не прынёс. Яна амаль не спала ўначы. Наступным днём у іх школу заявіўся яшчэ адзін наведнік, таксама нібы школьны інспектар. Гэты аказаўся выкшталцоным дыпламатам. Адразу запрасіў Вольгу ў кабінет дырэктара. Ветлівы, прыемны ўва ўсіх адносінах чалавек. Усміхнуўся Вользе, калі тая ўвайшла.

— Прысядзьце, калі ласка, Вольга Аляксееўна, — ласкава запрасіў інспектар. Дырэктар у сваім кабінеце адчуваў сябе за госця.

Інспектар, які не назваў сябе, невядома нават, ці прадставіўся ён дырэктару, гартаў школьны журнал, у якім Вольга пазнала журнал свайго класа.

— Вас хваляць, шаноўная Вольга Аляксееўна, — інспектар не рабіў доўгіх уступаў, — хваліць і кіраўніцтва школы, і вашыя калегі, і вучні. („Калі гэта ты паспеў пагутарыць з вучнямі", — падумалася Вользе.) Гэта вельмі добра. Нам патрэбныя добрыя настаўнікі. Я вельмі задаволены вашай працай, задаволена вамі

і кіраўніцтва ў Міністэрстве асветы. Думаю, што вы заслугоўваеце ўзнагароды. Так што збірайцеся, Вольга Аляксееўна, паедзем разам са мною ў Вільню, у міністэрства.
Што магла адказаць Вольга гэтаму чалавеку? Што яна не хоча нікуды ехаць з ім? Яна сапраўды гэтага не хацела, але адмаўляцца не выпадала. Ён не рабіў ёй прапановы, нават і не пытаўся пра яе жаданні. Ягоны тон не пакідаў няпэўнасці: ён павінен прывезці Вольгу ў Вільню, і ён гэта зробіць.
Вольга выйшла з кабінету дырэктара, накіравалася ў свой пакойчык. Не ведала, што ўзяць з сабою. Узяла толькі дакументы ды фотаздымак маленькай Волечкі. Вельмі хацелася ўзяць яшчэ і фотакартку Юльяна, але яна перасіліла сябе і не ўзяла. Насіць з сабою ягоную картку было небяспечна. Акрамя таго, Вольга проста баялася, што гэтую картку ў яе могуць забраць. Вольга пацалавала Волечку, папрасіла прыбіральшчыцу, якая калі-нікалі прыглядвала за дзяўчынкай, каб забрала Волечку да сябе, пакуль яна не вернецца.
Прыбіральшчыца адказала:
— Не хвалюйцеся, Вольга Аляксееўна. З Волечкай усё будзе добра. Глядзіце, каб з вамі чаго не здарылася, — і гэтая паджылая жанчына чамусьці заплакала.
Вольга не ведала чаму, але ёй таксама горкі камяк засціў горла. Калі яна выходзіла з будынку школы, у школьным двары сабраліся ўсе: і настаўнікі, і прыбіральшчыцы, і нават школьны вартаўнік. Вокны школьнага будынку не маглі змясціць дзіцячых твараў, што папрыліпалі да шыбаў. Усе маўчалі, толькі, ужо сядаючы ў машыну, Вольга пачула голас вартаўніка:
— Яна больш не вернецца!

* * *

Машына спынілася каля будынку Міністэрства асветы. Яе суправаджальнік ціха, напаўголасу перамовіўся аб нечым з чалавекам у вестыбюлі, які, відавочна, іх чакаў. Пасля вярнуўся да Вольгі, прапанаваў:
— Пройдзем, Вольга Аляксееўна, у аддзел кадраў.
Яны спусціліся ў нейкае падвальнае памяшканне. Інспектар звярнуўся да супрацоўніцы:
— Знайдзіце, калі ласка, асабовую справу Вольгі Пагуды.

Супрацоўніца чамусьці вельмі напалохалася, калі пачула гэтае прозвішча, пачала дрыжачымі рукамі перабіраць карткі, адсоўваць ды зноў засоўваць нейкія шуфляды. Нарэшце знайшла патрэбныя паперы, працягнула іх інспектару, які, у адрозненне ад гэтай супрацоўніцы, зусім не хваляваўся, а спакойна чакаў. Інспектар забраў паперы, і яны разам з Вольгай падняліся на другі паверх, доўга ішлі цемнаватым калідорам міністэрства. Нарэшце спыніліся каля дзвярэй, на якіх не было ніякай шыльды. У гэтым пакоі, куды інспектар запрасіў увайсці Вольгу, было яшчэ двое маўклівых людзей. Адзін з іх адразу ўзяў асабовую справу, пачаў чытаць. Вольга з жахам падумала, што такое з ёю ўжо здаралася. Тады, у Менску.

Інспектар выцягнуў з шуфляды аркуш паперы, звярнуўся да Вольгі:

— Запоўніце, калі ласка, Вольга Аляксееўна, гэтую анкету.

Вольга зірнула на аркуш. Гэта была звычайная анкета, якія даводзілася запаўняць даволі часта. Надта папулярнымі ў тыя часы былі самыя розныя анкеты. Як даволі смела жартавала адна з Вользіных калегаў, кожны мусіў быць пісьменнікам і ўмець прыгожа пра сябе расказаць, каб спадабалася чытачу — спадабалася настолькі, каб той не знайшоў у анкеце нічога дрэннага. У такіх анкетах звычайна трэба было пазначаць звесткі пра месца працы, пра сям'ю, пра нацыянальнасць, партыйную прыналежнасць. Шмат чаго дзяржава праз гэтыя анкеты хацела даведацца пра свайго грамадзяніна — каб вырашыць, чаго гэты грамадзянін заслугоўвае: узнагароды ці пакарання.

Вольга адказала на ўсе пытанні анкеты. У графе пра сямейны стан напісала, што яна незамужняя, мае дачку. Калі яна адказала на ўсе пытанні анкеты і намерылася перадаць яе інспектару, паперку з яе рук перахапіў адзін з тых людзей, што сядзелі разам з імі ў пакоі. Вольга нічога не сказала, яна ж і сама адчувала, што галоўныя ў пакоі — якраз гэтыя маўклівыя людзі.

Чалавек уважліва прачытаў усё тое, што напісала Вольга, моўчкі перадаў паперу другому. Вольга адчула, як смяртэльны холад падступае да напалоханага сэрца. Нездарма яе анкетай гэтак падрабязна цікавяцца! Яна пачала ліхаманкава ўспамінаць, ці не напісала там чаго непатрэбнага.

Невядомыя людзі падняліся, адзін з іх ветліва прапанаваў Вользе:
— Пройдзем з намі.
— Куды? — не зразумела Вольга.
Той нічога не адказаў, а толькі моўчкі хітнуў галавою некуды ўглыб калідора. Так Вольга трапіла туды, куды ўвесь апошні час баялася трапіць. Зрэшты, Вольга ведала, што рана ці позна там апынецца. Яе зноў завялі ў нейкі кабінет. Інспектара, што прывёз яе сюды, у кабінеце не было, як не было і тых двух маўклівых маладых людзей, што так уважліва чыталі яе анкету. Зараз насупраць яе сядзеў зусім іншы чалавек, таксама малады і таксама прыемнага выгляду. Гэты чалавек не хаваў, што ён — супрацоўнік КГБ і што ён павінен дапытаць Вольгу. Ён так і паведаміў ёй — дапытаць. Праўда, не стаў удакладняць, з якой нагоды, а Вольга не стала ў яго цікавіцца, баючыся сваімі пытаннямі наклікаць на сябе яшчэ горшую бяду.
Чалавек выцягнуў з шуфляды нейкую папку і паклаў туды анкету. Вольга паспела заўважыць, што ў гэтай папцы ляжаць паперы не толькі на яе, але і на яе сваякоў. Зверху яна ўбачыла прозвішча бацькі.
Пачаўся допыт. Следчы першым чынам высветліў, ці сапраўды яна Вольга Пагуда, хоць было відавочна, што ён добра ведае, хто перад ім.
— Скажыце, калі ласка, чым вы займаліся падчас вайны? — гэта было першым пытаннем следчага, якое датычыла сутнасці справы.
— Я працавала ў школе, гадавала дачку, старалася неяк выжыць, — Вольга з усяе сілы намагалася не паказаць свайго хвалявання.
Следчы таксама відавочна хаваў свае пачуцці ад Вольгі. Таму, напэўна, практычна не падымаў твару ад папераў, нават калі нічога там не пісаў.
— Вам вядома што-небудзь пра Беларускую Незалежніцкую Партыю?
Пытанне было зададзенае такім тонам, што ў Вольгі нават сумневу не ўзнікла: гэты чалавек цудоўна ведае пра БНП усё, нават тое, што практычна ўсе паседжанні БНП адбываліся на той кватэры, дзе яна жыла разам з Юльянам. Адмаўляць тое, што яна ведае пра БНП, было бессэнсоўна.
Вольга як мага больш спакойна адказала:

— Я чула пра гэтую партыю.
Яна чакала, што следчы пачне дапытвацца пра кіраўніцтва БНП, пра Юльяна, але той чамусьці не стаў гэтага рабіць.
— Вы былі сябрам гэтай партыі? — запытаў ён.
— Не, — адказала Вольга, адчуваючы нават нейкую палёгку ад сваіх адказаў. Яна не падманвала следчага. Сапраўды, яна не была сябрам БНП.
Следчы, відаць, быў задаволены адказамі Вольгі. Ён не стаў дапытвацца, чаму яна не ўваходзіла ў БНП. Размова паміж імі адбывалася трошкі незвычайная. Адказы Вольгі былі надзвычай нешматслоўнымі. Найчасцей яна адказвала толькі „так“ ці „не“, тым не менш следчы пасля кожнага яе адказу засяроджана пісаў нешта ажно хвілін дзесяць. Следчы пісаў, а Вольга мусіла была моўчкі сядзець насупраць, чакаць наступнага пытання ды прыслухоўвацца да гукаў, што чуліся за сцяною. Нарэшце следчы скончыў пісаць ды зноў звярнуўся да Вольгі.
— Ці былі вы дэлегатам на з’ездзе БНП?
— Не, — адказала Вольга. Яна была настолькі напалоханая, што з цяжкасцю магла гаварыць. Язык не хацеў слухацца, вусны не расшчапляліся. — Я ж не была сябрам БНП, таму і дэлегатам быць не магла.
Вольга пачынала нервавацца. Цяпер пытанні пра БНП палохалі яе не менш, чым гукі за сцяною. Яна ўвесь час чакала пытанняў пра Юльяна. Але следчы цікавіўся пакуль што больш агульнымі рэчамі, што тычыліся БНП.
— Значыць, вам невядома, колькі дэлегатаў прысутнічала на з’ездзе?
— Не, невядома.
— Добра, — пагадзіўся следчы і зноў пачаў нешта пісаць сваім дробным хуткім почыркам. — А што вам вядома пра з’езд у Вільні, які адбыўся недзе пад восень 1944 году? — працягваў цікавіцца следчы.
Гэтым разам Вольга шчыра здзівілася пытанню. У 1944 годзе яна ўвогуле не ведала, што дзеялася ў свеце. Яна ўжо год жыла без Юльяна. Вольга тады практычна не сустракалася ні з кім з былых Юльянавых паплечнікаў, пагатоў большасці з іх ужо і не было ў Маладэчне. Хто з’ехаў за мяжу, хто загінуў, хто хаваўся ад савецкіх карных органаў, бо немцы тады ўжо адышлі, а Саветы ледзь не адразу пачалі шукаць тых, хто, на іх думку,

супрацоўнічаў з немцамі. Такім чынам, Вольга сапраўды нічога не ведала пра гэты з'езд у Вільні, а вось следчага надзвычай цікавіў акурат ён.
— Ну як жа вы нічога не ведаеце? — здзіўляўся следчы. — Гэта быў такі важны з'езд. На ім прысутнічала амаль 5000 дэлегатаў. На гэтым з'ездзе, паводле некаторых звестак, вырашана было адлучыць Беларусь ад Савецкага Саюзу. Ці так гэта?
— Вы нашмат больш за мяне ведаеце пра гэты з'езд, — у гэтым пытанні Вольга вырашыла сваіх пазіцый не аддаваць, а быць цвёрдай, бо яна казала праўду. Цяжка ёй было б толькі хлусіць, нават гэтаму следчаму. — Пра гэты з'езд упершыню я чую ад вас.
— Добра, пакінем гэты з'езд, калі вы пра яго нічога не ведаеце. Вы, Вольга Аляксееўна, жанчына разумная, інтэлігентная. Сустракаліся, напэўна, з многімі людзьмі, — перайшоў на іншую тэму следчы, — ці ведалі вы такога Яна Станкевіча?
Вольга ведала Яна Станкевіча, ён некалькі разоў заходзіў да Юльяна. Яна Станкевіча ведалі практычна ўсе, хто, як і Юльян, змагаўся за Беларусь у часе вайны. Станкевіч Вользе падабаўся. Адчувалася, што гэта надзвычай разумны і прыстойны чалавек. Юльян жа ад яго быў проста ў захапленні.
„Калі гэты гэбіст цікавіцца Станкевічам, — падумалася Вользе, — значыць, ні ў якім разе не варта нешта пра яго гаварыць. Скажаш, на тваю думку, нешта вельмі добрае пра чалавека, а яму пашкодзіш". Вольга ўжо ня раз упэўнівалася, што ў савецкай улады былі іншыя меркаванні наконт таго, што добра і што дрэнна, чым у звычайных людзей.
Яна не ўмела ілгаць, але цяпер у яе не было іншага выйсця. Яе адказ следчаму быў такі:
— Не, я ніколі не сустракалася з гэтым чалавекам.
— Але ж вы ведалі, хто ён такі?
— Я чула пра яго.
— Ад каго?
— Не памятаю ўжо. Здаецца, у гандлёвай школе нехта пра яго гаварыў.
Вольга казала няпраўду, але следчы яе праглынуў ці зрабіў выгляд, што праглынуў. Ён нешта напісаў, пасля ўзяў іншую папку, пагартаў яе, пачытаў. Нарэшце зноў звярнуўся да Вольгі, надзвычай напалохаўшы яе сваім пытаннем:

— А што вы можаце паведаміць нам пра Саковіча?
„Вось яно! Пачалося!“ Сцяна насупраць, ад якой Вольга чамусьці не магла адвесці вачэй, некуды паплыла. У вачах заскакалі жоўтыя і зялёныя матылькі. Нарэшце яны зацікавіліся Юльянам. Можа, проста маўчаць?! А раптам яе пачнуць біць, як тых людзей, што крычаць за сцяною?! Ці вытрымае яна?! Вольгу ніхто ніколі не біў ні ў дзяцінстве, ні пасля. Яна не ведала, ці здолее вытрымаць боль. Але пра Юльяна яна не скажа нічога.
— Што вы можаце паведаміць нам пра Аляксандра Саковіча, вашага мужа? — удакладніў следчы, які не падымаў галавы ад сваіх папераў і не бачыў, як напалохаў Вольгу сваім папярэднім пытаннем.
Калі папярэдняе пытанне выклікала ў Вольгі ледзь не шок, то гэтае яе здзівіла і нават развесяліла, калі магчыма было ўвогуле весяліцца ў такім стане. Аляксандр ніколі не быў яе мужам і не збіраўся ім быць, як і Вольга не мела намеру выходзіць за яго замуж. Аляксандр проста быў чалавекам, да якога Вольга магла звярнуцца па дапамогу.
— Аляксандр Саковіч ніколі не быў маім мужам, — адказала Вольга, — я не замужам.
— Значыць, Аляксандр Саковіч не з’яўляецца вашым мужам? — дапытваўся следчы. — Але ж нам вядома, што ён вам даводзіцца нейкім сваяком, хоць вы і настойваеце, што ён вам не муж. У вашай дачкі прозвішча Саковіч, гэта так?
— Так, — Вольга старалася гаварыць як мага спакайней, але сілы ўсё больш і больш пакідалі яе маленькае, зусім нямоцнае цела, — у маёй дачкі прозвішча Саковіч. Аляксандр Саковіч — наш далёкі сваяк.
— Ваш сваяк Аляксандр Саковіч з’ехаў з тэрыторыі Савецкага Саюзу. Нам вядома, што ў яго засталася нейкая маёмасць у нашай краіне, прынамсі, засталася зямля. Вы ж ведаеце, Вольга Аляксееўна, што ў нашай краіне цяпер актыўна ўтвараюцца калгасы. Людзі з ахвотаю ідуць у калгасы, але павінны добраахвотна аддаць туды сваю маёмасць, у тым ліку і зямлю. Дык вось, на зямлі Аляксандра Саковіча цяпер няма гаспадара, і мы не можам утварыць там калгас, як належыць. Яго зямля знаходзіцца якраз пасярод калгаснай зямлі і замінае калгаснікам, — пасля такога працяглага ўступу следчы нарэшце прыступіў да галоўнага, — ці не маглі б вы нам

паведаміць, дзе цяпер знаходзіцца Аляксандр і як з ім можна звязацца?
Вольга не вагалася ні хвіліны, адказала адразу:
— Я паняцця не маю, дзе зараз знаходзіцца Аляксандр. Я не падтрымліваю з ім аніякай сувязі.
— Але ж вы не выключаеце магчымасці, што ён можа вас калі-небудзь наведаць. Напрыклад, ён захоча наведаць сваю пляменніцу, вашую дачку, — разважаў следчы, — у нас да вас, Вольга Аляксееўна, ёсць невялікая просьба. Калі Аляксандр Саковіч раптам наведае вас, патэлефануйце, калі ласка, вось на гэты тэлефон. Трэба неяк дапамагчы калгаснікам.
Следчы працягнуў Вользе кавалачак паперы і падняўся з-за стала.
— А цяпер я выпішу вам пропуск. Вы можаце быць свабоднай.
Вольга не адразу зразумела сэнс яго апошніх слоў. Няўжо яе выпускаюць з гэтага жудаснага месца?! Можа, гэта нейкая правакацыя? Вольга чакала, што следчы засмяецца і паведаміць ёй, што ён пажартаваў, ён не адпускае яе, а арыштоўвае, як тых людзей, галасы якіх яна чула за сцяною і якіх ён назваў „ворагамі народу“. Але вось яна ўжо ідзе побач з маўклівым незнаёмым чалавекам, якому следчы даручыў правесці яе да выхаду. Гэты чалавек моўчкі адчыняе перад ёю адны дзверы за другімі.

Нарэшце яна апынулася на вуліцы. Спынілася пасярод тратуару і колькі хвілінаў не магла зразумець, у які бок ёй трэба. У вачах было цёмна, нібы ў яе раптам пагоршыўся зрок. У людзей, што праходзілі паўз яе па ходніку, яна не магла разгледзець ані твараў, ані вопраткі.
Так яна стаяла, пакуль не зразумела, што трэба як мага хутчэй бегчы далей ад гэтага месца. Яна ледзь і не пабегла, прынамсі, ішла вельмі хутка. Ёй было ўсё роўна, куды яна ідзе, толькі б далей адсюль. Вольга ішла, не звяртаючы ўвагі на тых, каго мінала яна сама і хто мінаў яе. Але раптам яна выпадкова глянула на той бок вуліцы і ўбачыла, што паралельна ёй з гэткай жа хуткасцю рушыць нейкі малады чалавек. Ён быў адзін на тым баку, таму і прыцягнуў яе ўвагу. Вольга спынілася, трохі пастаяла, каб перавесці дых, чалавек спыніўся таксама. Жанчыну працяў жах. Яна не ведала, што рабіць далей. Відавочна, што ўцячы ад гэтага чалавека ёй не ўдасца.

Дый навошта ўцякаць?! Што трэба ад яе гэтаму чалавеку? Мажліва, трэба было б падыйсці да яго ды запытаць, чаму ён крок у крок ідзе за ёю. Але Вольга не магла падыйсці да яго. Яе самым вялікім жаданнем было, каб гэты чалавек проста збочыў на іншую вуліцу і ніколі больш ёй не спаткаўся. Але чалавек працягваў ісці туды, куды ішла Вольга. І яна ішла, у глыбіні душы дзякуючы лёсу, што зараз не ноч, а раніца (асабісты пратрымалі Вольгу цэлыя суткі). Так і дайшла яна ў суправаджэнні ці то вартавога, ці то наглядальніка ажно да самага вакзалу.

Да аўтобуса дадому заставалася яшчэ больш за паўгадзіны. Як перажыць гэтыя паўгадзіны? Калі ўжо пад'едзе гэты аўтобус, колькі часу яна павінна яшчэ чакаць, калі ўбачыць, нарэшце, сваю Волечку? Вольга агледзелася па баках. Яе пераследнік кудысьці знік альбо хаваўся недзе так, што Вользе не было відаць. Ну і добра! Няхай сабе назірае за ёю, але так, каб яна яго не бачыла, бо на гэта ў Вольгі не было ўжо сілаў. Вольга прысела на лаўку ў самы куточак. Яна ні пра што не думала. Ні думак, ні нават пачуццяў у яе ўжо не заставалася. З гэтага напаўнепрытомнага стану яе вывеў нечый голас. Яна не адразу зразумела, што насупраць яе стаіць і нешта ёй кажа Колас, знаёмы яшчэ з Маладэчна святар.

— Вольга! Якім лёсам?! — радасна шчабятаў Колас. — Па справах у горадзе ці проста так?

„Каб ты ведаў, па якіх я тут справах!“ — падумала Вольга, але адказаць нічога не паспела. Колас падхапіў яе пад локаць, падвёў да рога нейкага будынку, агледзеўся па баках і пазмоўніцку прашаптаў:

— А ў мяне для цябе, Вольга, ёсць сюрпрыз.

Ён палез у кішэню пінжака, выцягнуў адтуль нейкую паперку.

— Гэта прасілі табе перадаць.

Вольга разгарнула паперчыну. Гэта была нейкая цыдулка.

„Вольга!

Прыходзь сёння да аўтобуснага прыпынку ў сем гадзін вечара. Мне трэба нешта табе паведаміць. Аляксандр!“.

Вольга зноў згарнула аркушык, працягнула яго назад Коласу.

— Гэта памылка. Гэтая цыдулка не мне, — паведаміла яна.

— Як не табе? — шчыра здзівіўся Колас. — Табе! Ад Аляксандра!

— Я не ведаю аніякага Аляксандра! — Вольга не змагла

схаваць у сваім голасе адчаю. „Што трэба ад мяне ўсім гэтым людзям?!“
Яна павярнулася і пайшла ад Коласа, не аглядалася і не бачыла, што ён рабіў і куды пайшоў. Вольга не ведала, ці сам Аляксандр напісаў гэтую цыдулку. Яна ніколі не бачыла яго почырка. Але яна была ўпэўненая, што ён сам аніяк не мог перадаць гэтую цыдулку Коласу. Аляксандр яго ледзь ведаў. Што азначала гэтая цыдулка? І раптам нечаканая думка працяла яе наскрозь: паміж цыдулкай і допытам была непасрэдная сувязь. Вольгу хацелі арыштаваць, але, напэўна, у следчых не было на яе дастаткова матэрыялаў. Таму ёй паспрабавалі наладзіць сустрэчу з Аляксандрам, якога, відавочна, ужо залічылі ў ворагі народу. Ці адбылася б гэтая сустрэча, калі б Вольга на яе пагадзілася, і хто б на яе прыйшоў, зразумела, заставалася загадкай.
Вольга падышла да касы, каб купіць білет дадому, але не змагла прамовіць ані слова. Адкрывала толькі рот, але язык яе не слухаўся. Касірка вырашыла, што яна нямая, і падала ёй аркушык паперы і аловак. Вольга напісала, куды ёй трэба ехаць. Нарэшце яна села ў аўтобус. Раз-пораз пазірала ў акно, ўсё яшчэ не верыла, што яна свабодная і едзе дамоў, да дачкі. Дарога цягнулася як ніколі доўга. Нарэшце аўтобус спыніўся ў мястэчку, дзе яна жыла. Насустрач Вользе бегла Волечка. Светлыя коскі, старанна заплеценыя прыбіральшчыцай, трапяталіся ззаду за спінаю...

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 9 (14) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **03-02-2001**
[image]